Вольга Іванова

# АСАБІСТЫЯ АРХІВЫ БЕЛАРУСІ канца XVIII – пач. XXI ст.

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2014

УДК 930.25
ББК 79.3
И18

Навуковы рэдактар:
кандыдат гістарычных навук *М. Ф. Шумейка.*

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук *Г. У. Папакін* (Кіеў),
доктар гістарычных навук *Дз. У. Караў (*Гродна),
кандыдат гістарычных навук *С. У. Жумар* (Мінск).

**ISBN 978-985-6992-59-2**

© Іванова, В., 2014.
© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2014.

# Змест


Ад аўтара .......... 5

Уводзіны .......... 7
Асабістыя архівы і захаванне памяці .......... 7
Межы і структура паняцця .......... 11
Крыніцы і літаратура .......... 17
Традыцыі захоўвання прыватных архіваў у розных краінах свету .......... 22
Гісторыя захоўвання асабістых архіваў на беларускіх землях з канца XVIII ст. па сённяшні час .......... 35
Фарміраванне і захоўванне асабістых архіваў у канцы XVIII– пачатку XX стст. .......... 35
Дакументы асабістага паходжання ў складзе ДАФ СССР .......... 46
Пачатак камплектавання архіваў, музеяў і бібліятэк Беларусі дакументамі асабістага паходжання (1918–1945 гг.) .......... 59
Збіранне і захоўванне асабістых архіваў у БССР у 1945–1991 гг. .......... 70
Стан захоўвання асабістых архіваў на сучасным этапе .......... 84
Дакументы асабістага паходжання ў дзяржаўных сховішчах Рэспублікі Беларусі.. .......... 84
*Дзяржаўныя і ведамасныя архівы* .......... 84
*Аддзелы рукапісаў бібліятэк і музеі* .......... 93
Асабістыя архівы на захоўванні грамадскіх установаў Беларусі .......... 99
Асабістыя архівы беларускага паходжання ў сховішчах іншых дзяржаў .......... 101
Шляхі выкарыстання асабістых архіваў для навуковых даследаванняў .......... 107
Асаблівасці фарміравання, камплектавання, навукова-тэхнічнай апрацоўкі, захоўвання і выкарыстання асабістых архіваў .......... 107
Асабісты архіў як гістарычная крыніца .......... 112
Рэканструкцыя асабістых архіваў як сродак пошуку і захавання .......... 121
Заключэнне .......... 128

ДАВЕДНІК .......... 130
А .......... 136
Б .......... 153
В .......... 174
Г .......... 185
Д .......... 199
Е .......... 211
Ж .......... 214
З .......... 219
І .......... 224
К .......... 226

Л ........................................ 258
М ........................................ 269
Н ........................................ 286
П ........................................ 292
Р ........................................ 310
С ........................................ 317
Т ........................................ 337
У ........................................ 344
Х ........................................ 348
Ц ........................................ 352
Ч ........................................ 355
Ш ........................................ 360
Я ........................................ 371

Спіс скарачэнняў ........................................ 375
Спіс сховішчаў, інфармацыя аб дакументах
якіх прадстаўлена ў даведніку ........................................ 377
Спіс выкарыстаных даведнікаў і аглядаў ........................................ 380
Імянны паказальнік ........................................ 385

*Дні чалавека падобныя да травы:*
*цвіце ён, быццам кветка ў полі.*
*Але вось павее вецер – і няма больш яго,*
*і месца, дзе быў, яго не пазнае.*
*Пс. 102*

## Ад аўтара

Сучаснае разуменне слова «архіў» звычайным абывацелем, а нават і тымі, хто працуе з дакументамі – архівістамі, гісторыкамі, архівазнаўцамі – часта зводзіцца да яго разгляду як дзяржаўнай установы, што захоўвае дакументы і дапамагае дзяржаве рэалізоўваць свае функцыі і хаваць свае сакрэты. Паводле такога разумення, у архіве захоўваюцца дакументы, патрэбныя дзяржаве для самаўзнаўлення, у тым ліку і ідэалагічнага. У пэўнай ступені такі погляд адлюстроўвае рэальную сітуацыю, якая з'яўляецца спадчынай савецкай рэчаіснасці.

Аднак, пачынаючы з XIX ст., калі архівазнаўства сфарміравалася як навуковая дысцыпліна, існавалі і існуюць іншыя погляды на ролю і месца архіваў у грамадстве. Адпаведна ім архівы выконваюць значна больш шырокія функцыі, і гісторыя архіўнай справы, у тым ліку і ў Беларусі, сведчыць якраз пра гэта. Пры гэтым дакумент можа мець каштоўнасць і разглядацца як з'ява культуры незалежна ад ідэалогіі, зместу, паходжання ці месца захоўвання.

У кнізе гаворка пойдзе не пра ўсе архівы, а толькі пра іх асобную групу, якая акрэслена тут як «асабістыя архівы». Асабістыя архівы ў большасці выпадкаў выконваюць культурніцкую функцыю, таму іх вывучэнне можа паспрыяць змене погляду на архівы як на «арсеналы ўлады».

Праца з архіўнымі дакументамі пачынаецца з тэарэтычных канцэпцый і вызначэння гістарычных тэндэнцый, а заканчваецца практычнымі пытаннямі архіўнага захоўвання і выкарыстання. Менавіта таму дадзенае даследаванне ўключае ў сябе характарыстыку асноўных тэндэнцый, якія ўздзейнічаюць на захоўванне асабістых архіваў у свеце, гісторыю і сучасны стан захоўвання асабістых архіваў беларускіх дзеячаў, аналіз асноўных праблем захоўвання і прапановы аб перспектывах іх выкарыстання.

Другая частка кнігі ўяўляе сабой даведнік па асабістых архівах дзеячаў, што зрабілі значны ўнёсак у развіццё беларускай навукі і культуры, удзельнічалі ў грамадска-палітычным жыцці, а таксама тых, чые архівы могуць стаць крыніцай беларусазнаўчых даследаванняў рознага кшталту. Сюды ўвайшлі звесткі аб частках аса-

бістых архіваў, якія захоўваюцца ў розных сховішчах Беларусі і замежных краін.

Даведнік таксама з'яўляецца спробай першапачатковай рэканструкцыі шэрагу архіваў, а яго структура адпавядае распрацаваным у архівазнаўстве тэарэтычным палажэнням.

Аўтар выказвае шчырую падзяку за дапамогу ў правядзенні даследаванняў Г. Запартыка, Т. Кекелевай (БДАМЛМ), В. Скалабану(НАРБ), З. Матвейчыку (НГАБ), А. Запартыка (БДАНТД), А. Беламу (НДАК НББ), Т. Жук (АРКР ЦНБ НАН БЕЛАРУСІ), Г. Качатковай (Дэпартамент па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь), В. Лебедзевай (Гомель), А. Смаленчуку (Гродна), доктару А. Кулецкай і А. Міхнаўцу (Варшава), М. Запартыка і В. Дзянісавай (Торунь), Л. Андросік (ГА «Дыярыуш»), доктару А. Мальдзісу, Х. Нюньцы, Л. Юрэвічу, Наталлі і Алегу Гардзіенкам, дыякану Віталю Дубягу. Асобныя словы ўдзячнасці хачу выказаць свайму нязменнаму настаўніку і дарадцу Міхаілу Фёдаравічу Шумейку, калегам з кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ і ўсім архівістам, працаўнікам музеяў і бібліятэк, з кім выпала працаваць пры падрыхтоўцы кнігі.

# Уводзіны

## *Асабістыя архівы і захаванне памяці*

Французскі сацыёлаг Морыс Хальбвакс параўнаў феномен памяці з марскімі хвалямі, якія разбіваюцца аб скалы. Калі хваля наступае, скалы пагружаюцца ў ваду, і застаюцца толькі невялікія лужыны паміж камянёў, якія становяцца крыніцай ведаў пра мінулае для наступных пакаленняў.

Індывідуальная памяць збірае з абрыўкаў штодзённых уражанняў унікальны погляд на рэчаіснасць, які значна адрозніваецца ад калектыўнага ці агульнагістарычнага. Ён можа супярэчыць агульным тэндэнцыям і фактам, а можа поўнасцю з імі супадаць, адлюстроўваючы тыповасць лёсу ці выступаючы як прадукт пэўнай ідэалагічнай сістэмы.

У XV–XVIII стст. у шляхецкіх сем’ях Вялікага Княства Літоўскага і Кароны Польскай ствараліся рукапісныя кнігі, г. зв. *silva rerum* ці *livres de raison*, што выкарыстоўваліся ў якасці памяткі аб эканамічнай і культурнай дзейнасці роду і перадаваліся ў спадчыну. *Silva rerum* ці «архівы сармацкай памяці» складаліся, як правіла, з г. зв. «эга-дакуменаў» і праз суб’ектыўны мікрасвет чалавека пакідалі нашчадкам памяць аб гісторыі сям’і[1]. Тое, што запісвалася ў *silva rerum* залежала ад сацыяльнага статусу, узроўню культуры, эканамічнага стану аўтараў, а таксама ад пэўных сацыяльных канонаў і стэрэатыпаў. Перадача асабістай памяці адбывалася з дапамогай камунікацыі, аповеду аб перажытым, што спрыяла яе трансфармацыі ў памяць калектыўную (сямейную).

Архівы ў гэтым кантэксце разглядаліся як сродак рэалізацыі патрэбнасці чалавека ў захаванні памяці аб сваім існаванні, дзейнасці, культуры, традыцыі і іх перадачы наступным пакаленням. Яны таксама выступалі як месца захоўвання памяці і з’яўляліся асновай для яе ўзнаўлення.

---

[1] Roszak S. Archiwa sarmackiej pamięci. Funkcje i znaczenie rekopiśmiennych ksiąg silva rerum w kulturze Rzeczypospolitej XVIII wieku. – Torun, 2004. – 285 s; Chorążyczewski W. Archiwa i pamięć. Nowa interpretacja archiwistyki (na marginesie XV Kongresu Archiwów w Wiedniu) // Archiwista Polski. – 2004. – Nr 4 (36). – S. 9–13; Chorążyczewski W. Archiwa i pamięć. Z dziejów polskich archiwów. // Archiwa, Kancelarie, Zbiory. – T. 1. 2005. – S. 13–27; Репина Л. П. Культурная память и проблемы историописания (историографические заметки). – М. 2003. – С. 20; Рикёр П. Память, история, забвение. – М., 2004. – С. 25–43; Wilson Jan E. Ordinary People and People Foggoten by the History: their (Shortfall in) Representation in Written Archives // Comma. – 2002. – № 1–2. – S. 163–165.

Усе архівы першапачаткова ўзнікалі пры дасягненні пэўнага ўзроўню развіцця грамадства, адлюстроўваючы пануючую ідэалагічную сістэму. Так, напрыклад, памяць старажытных грэкаў складалася з памяці аб героях, гарадах, жрацах. З цягам часу жывыя сведчанні трансфармаваліся ў архівы – матэрыяльныя аб'екты з магчымасцямі доўгатэрміновага захоўвання.

Пры адсутнасці дакументальных сведчанняў рэканструкцыя памяці і развіццё свядомасці асобы, сям'і і дзяржавы, як і пабудова ідэалагічнай сістэмы грамадства становіцца праблематычнай. Адсутнасць архіваў можа быць вынікам планамернай палітыкі па знішчэнні памяці, а таксама прыродных і гістарычных катаклізмаў. Памятаць ці забыць, захоўваць ці знішчыць архівы – гэта выбар, які робяць чалавек і супольнасць.

Аб асабістых архівах як самастойных комплексах дакументаў можна казаць пачынаючы з XVIII ст. Менавіта ў эпоху Асветніцтва ў сувязі з развіццём навукі і культуры дзейнасць навукоўца і творцы пачала разглядацца як асобная з'ява, а яго дакументы – як крыніца даследаванняў featurerознага кшталту[2].

Асабістыя архівы з часу іх стварэння адыгрываюць важную ролю ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці, канцэнтруючы памяць аб дзейнасці прадстаўнікоў нацыянальнай эліты, а стан іх захоўвання з цягам часу становіцца пэўным індыкатарам узроўню культурнага развіцця грамадства. Асабісты архіў паўстае як захавальнік усіх сведчанняў аб дзейнасці асобы, і адначасова ён адлюстроўвае асяроддзе, у якім жыў і працаваў творца.

Пачатак сталай традыцыі захоўвання асабістых архіваў можна аднесці да 20-х гг. XIX ст., калі вядомы нямецкі паэт Іаган Гётэ (1749–1832), пачаў упарадкаванне свайго архіва з мэтай выдання збору твораў. Праца вялася больш 10 гадоў. З дапамогай сябра паэта Тэадора Кройтэра была праведзена сістэматызацыя дакументаў, створаны каталогі, а вынікі апублікаваны ў 1822–1823 гг. на старонках часопіса «Über Kunst und Alternum» у артыкулах «Захаванне майго літаратурнага архіва» і «Захаванне майго літаратурнага архіва і падрыхтоўка поўнага збору твораў».

У 1823 г. Гётэ пісаў: *«Цяпер... падумаў нарэшце пра галоўнае: захаваць маю літаратурную спадчыну (архіў) і выдаць поўны збор твораў. Гэта было б немагчыма без прыгожых маладых гадоў, якія былі занатаваны. Зараз зразумела, што мае планы*

---

[2] Кононов Ю. Ф. История личных фондов государственных деятелей России XVIII–первой половины XIX вв.: учеб. пособие / под ред. Н. В. Бржостовской. – М.: МГИАИ, 1964. – С. 1, 4; Маяковский И. Л. Очерки по истории архивного дела в СССР / испр. и доп. для 2 изд. Н. В. Бржостовской [и др.] – М.: МГИАИ, 1960.– С. 308–310.

*здзейсніліся, і замест матэрыяльнага заробку, створана большае багацце, інтэлектуальна-разумовае»*[3].

На беларускіх землях пра неабходнасць сістэматычнага захоўвання дакументаў асабістага паходжання ў другой палове XIX ст. заявілі два выбітных калекцыянера Міхал Федароўскі і Аляксандр Ельскі. У прыватнасці А. Ельскі ў адным са сваіх артыкулаў, прысвечаных стогадоваму юбілею Адама Міцкевіча, пісаў: *«Немцы да такой ступені апекаваліся спадчынай сваіх песняроў, што нават дакладна запісалі колькасць бялізны, што засталася пасля вялікага Шылера ці знакамітага Гётэ. Ці ж не павінны і мы на раздарожжах лёсу паважна ставіцца да духоўнай спадчыны і памятак нашых вялікіх вешчуноў?»*[4]

Каштоўнасць асабістых архіваў узрасла падчас пошуку альтэрнатыўных крыніц памяці. У другой палове XIX ст. пытанне аб неабходнасці захоўвання асабістых архіваў як каштоўнай крыніцы па гісторыі філасофіі і духоўных рухаў было ўзнята прадстаўніком «філасофіі жыцця» Вільгельмам Дзільтэем. У артыкуле «Літаратурныя архівы і іх значэнне для вывучэння гісторыі філасофіі» (1889) аналізавалася карціна страты шэрагу архіваў і цяжкасці іх выкарыстання на прыкладзе архіваў Імануіла Канта, Хрыстыяна Вольфа, Лацаруса Морыца ды інш.

Між іншым у артыкуле адзначалася: *«Рукапісы выдатных духоўных дзеячаў, якіх дала Германія з часоў Гуманізму і Рэфармацыі, у большасці сваёй загінулі па прычыне існаваўшага да іх непаважлівага стаўлення... Калі супаставіць вялізнае значэнне, якое маюць рукапісы для гісторыі філасофіі і духоўных рухаў, і тую бесклапотнасць, якая панавала ў адносінах да іх, калі паглядзець на абумоўленае ёю знішчэнне большай часткі найважнейшых рукапісаў і рукапісных збораў, то ва ўсіх зацікаўленых асобаў узнікае жаданне, як мага хутчэй пакласці канец такому невыноснаму становішчу»*[5].

З канца XIX ст. гістарычная навука ў большасці еўрапейскіх краін знаходзілася пад моцным уплывам пазітывісцкіх і марксісцкіх ідэй. Яна арыентавалася на вывучэнне макрапрацэсаў, менавіта гісторыі сацыяльна-эканамічных фармацый, спосабаў вытвор-

---

[3] Flach Willy Goethes literarisches Archiv // Archivar und historiker. Studien zur archiv und geschichtswissenschaft. Zum 65 Geburgstag von Heinrich Otto Meisner. – Berlin, 1956. – S. 68.

[4] Jelski A. Wiadomości o niektorych pamiątkach po Adamie Mickiewiczu // Księga pamiąkowa na uczenie setnej rocznicy urodzin Adama Mickiewicza 1798–1898. – T. 1–2. – Warszawa-Peterburg-Kraków, 1899. – T. 2. – S. 59.

[5] Дильтей В. Литературные архивы и их значение для изучения истории философии // Вопросы философии. – 1995 – № 5. – С. 130.

часці, дзяржаў, класаў, палітыкі, грамадскіх інстытутаў, ідэалагічных сістэм, паставіўшы асобу на другі план. Толькі ў другой палове XX ст. чалавек стаўся аб'ектам сталага навуковага інтарэсу, а задача даследавання дзейнасці асобы перастала абмяжоўвацца толькі сацыяльна-палітычным кантэкстам. Актуальнымі сталі распрацоўкі біяграфій «маленькіх» людзей, вывучэнне іх паўсядзённага жыцця, збор вусных сведчанняў.

Антрапалагізацыя гуманітарных навук і гістарычнай навукі ў прыватнасці зрабіла актуальным пытанне антрапалагізацыі архіваў і «ачалавечання» архівазнаўства, што праявілася ў гуманізацыі архіватворчасці (суб'ектывізацыі працэсу стварэння, захоўвання і выкарыстання інфармацыі). Таксама моам казаць пра пэўную гуманізацыю стасункаў архіва і грамадства (забеспячэнне доступу да інфармацыі, кансультацыі па праблеме стварэння ўласных «збораў памяці»), а таксама ўзаемаадносінаў паміж архівістамі, што ўплывае на функцыянаванне архіўнай сістэмы, пра лібералізацыю доступу да дакументаў, пашырэнне выхаваўчай ролі архіваў ды інш.

Яшчэ адна тэндэнцыя праявілася напрыканцы 1980-х гг. У архівазнаўстве сацыялістычных краін пачаўся своеасаблівы «крызіс рэпрэзентацыі», бо дакументы, захаваныя ў межах дзяржаўнай архіўнай сістэмы адлюстроўвалі толькі ідэалагічна вызначаную рэчаіснасць. Тое, што выпадала з гэтых межаў захоўвалася фрагментарна або знішчалася. Постмадэрнісцкая тэндэнцыя, у адпаведнасці з якой не існуе аб'ектыўнай рэчаіснасці, якую можна рэканструяваць, а таксама змена палітычнай і ідэалагічнай сістэмы зрабілі актуальнай ідэю захоўвання кожнага дакумента ці комплексу дакументаў як адбітка суб'ектыўнай праўды гісторыі.

З распадам сацыялістычнага лагера, з'яўлення новых форм уласнасці і аслаблення жорсткай цэнтралізацыі архіўнай справы пачаўся пошук новых крыніц інфармацыі, якія б спрыялі пабудове новых нацыянальных дзяржаў. Права кожнага чалавека пакінуць аб сабе памяць увасобілася ў стварэнні і дзейнасці ў Маскве цэнтра дакументацыі «Народны архіў» (1988–2006), адным з асноўных накірункаў працы якога быў збор дакументаў асабістага паходжання (ліставанне, мемуары, асабістыя дакументы і г. д.) шэраговых грамадзян краіны.

Збор крыніц, што адлюстроўвалі г. зв. альтэрнатыўную гісторыю ў гэты час пачаў ажыццяўляцца польскім навукова-культурным цэнтрам *KARTA*. У 1999 г. украінскія архівісты распачалі праект «Эліта Ўкраіны XVIII–XX ст.: нацыянальны рэестр асабістых архіваў. Анатаваны даведнік і база дадзеных». Стварыўся рэестр, які ўключаў анатацыі на больш чым 3,6 тыс. асабістых архіўных

фондаў, што захоўваліся ў цэнтральных, галіновых і абласных архівах Украіны, установах сістэмы Акадэміі навук Украіны, дзяржаўных музеях[6].

З пачатку 1990-х гг. пошук новых крыніц і метадаў у асвятленні падзей гісторыі і культуры, а таксама вывучэнне ролі асобы ў фарміраванні нацыянальных каштоўнасцей сталі актуальнымі для беларускай рэчаіснасці. У 1996 г. на базе грамадскага аб’яднання «Наша ніва» быў створаны «Архіў найноўшай гісторыі», мэтай якога былі збор і захоўванне дакументаў, якія адлюстроўвалі працэс пабудовы грамадзянскай супольнасці ў незалежнай Беларусі, гісторыю паўсядзённасці другой паловы XX ст., жыццё і дзейнасць шэраговых грамадзян і вядомых дзеячаў.

У 2004 г. па ініцыятыве вядучай архіўнай установы Рэспублікі Беларусь Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ), які захоўвае дакументы асабістага паходжання, была праведзена канферэнцыя «Архівы асабістага паходжання – складовая інфармацыйнага рэсурсу грамадства». Удзел у ёй прынялі вядомыя гісторыкі, літаратуразнаўцы, архівісты і архівазнаўцы краіны[7].

Да юбілейных дат жыцця славутых прадстаўнікоў культуры Беларусі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Напалеона Орды, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ды інш. на сайце «Архівы Беларусі» былі зроблены віртуальныя рэканструкцыі іх асабістых архіваў. Таксама наладжваліся кантакты з дзеячамі эміграцыі, а іх архівы перадаваліся ў Беларусь.

## *Межы і структура паняцця*

У архівазнаўстве існуе шэраг паняццяў для азначэння комплексаў дакументаў асабістага паходжання, менавіта «прыватны архіў», «асабісты архіў», «сямейны архіў», «фамільны архіў», «літаратурны архіў», «архіўны фонд асабістага паходжання», «калекцыя». Яны з’яўляюцца роднаснымі, але маюць шэраг адрозненняў у структуры, тэматыцы храналагічных рамках, сродках і ўмовах захоўвання і прынцыпах укладання матэрыялаў.

---

[6] Еліта України XVIII–XX ст.: Національний реєстр особових архівів. Анотований довідник і база даних [Электрон. рэсурс] / Архіви України – Київ, 2008. – Режим доступа: http://www.archives.gov.ua/BranchProgs/ELITA.php – Дата доступа: 10.10.2007.

[7] Архіўныя чытанні І–ІІІ: матэрыялы навуковых канферэнцый, Мінск, 2003–2005 гг. / укл.: Г. В. Запартыка [ды інш.]; навук.рэд. А. В. Мальдзіс – Мінск, 2006. – 227 с.; Метадычныя рэкамендацыі па рабоце архіваў з дакументамі асабістага паходжаня / аўт.-склад. Г. В. Запартыка; навук. рэд. С. У. Жумар. – Мінск, 2005. – 200 с.

Структура кожнай з разнавіднасцяў архіваў асабістага паходжання залежыць ад дамінавання пэўнай групы дакументаў у яго складзе – біяграфічных, творчых, маёмасна-гаспадарчых ці калекцыйных. Адпаведна, комплекс дакументаў асабістага паходжання можа вызначацца як асабісты, сямейны, фамільны (ці родавы), маёнткавы архіў альбо як калекцыя. Тэматыка дакументаў архіва можа быць вельмі шырокай, адлюстроўваць дзейнасць адной ці некалькіх асобаў. Храналагічна такія архівы ахопліваюць значны прамежак часу – да некалькіх стагоддзяў. Права ўласнасці на дакументы першапачаткова мае асоба ці асобы, але яны могуць перадавацца і на дзяржаўнае захоўванне, а таксама ўключацца ў склад Нацыянальнага архіўнага фонда.

Яшчэ адна адметнасць у тым, што калі фонды дзяржаўных архіваў першапачаткова фарміруюцца на падставе архівазнаўчага прынцыпа паходжання, то комплексы асабістых дакументаў заўсёды маюць у сваім складзе значную «пертыненцыйную частку», то бок дакументы суадносяцца паміж сабой на падставе другога асноватворнага прынцыпа архівазнаўства – прынцыпа прыналежнасці (пертыненцыі). Гэтая асабліваць інфармацыйных сувязяў паміж дакументамі захоўваецца і пры передачы іх на дзяржаўнае захоўванне і стварэнні архіўных фондаў асабістага паходжання.

Трэба таксама адзначыць, што характэрныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага і культурнага развіцця розных краін абумовілі наяўнасць разыходжанняў у азначэннях, эвалюцыю дадзеных паняццяў ды іх несінанімічнасць у розных мовах – рускай, польскай, нямецкай, англійскай.

Узнікненне прыватных архіваў, якое адносіцца да XV–XVI стст., было абумоўлена неабходнасцю пацвярджэння правоў на маёмасць, фіксацыі гістарычнай, гаспадарчай і творчай дзейнасці групы асобаў (сям'я, род), рэалізацыі збіральніцкіх патрэб. Сярод асноўных відаў прыватных архіваў у залежнасці ад складу і колькасці дакументаў вылучаюцца родавыя (фамільныя), сямейныя, маёнткавыя (сядзібныя), асабістыя архівы, а таксама калекцыі і зборы[8].

Пачынаючы з XV ст. асноўным відам прыватнага архіва на беларускіх землях з'яўляліся фамільныя архівы магнатаў Радзі-

---

[8] Zielińska T. Archiwalia przywatne (pojęcie, zakres gromadzenia, metody opracowania) // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawom archiwalnym / Naczelna Dyrekcja Archiwów Państwowych. – T. 59. – Warszawa, 1971. – S. 74. Краткий словарь архивной терминологии / ред. кол. В.И. Кострикин [и др.] – М.-Л., 1968.– С. 55; Метадычныя рэкамендацыі па рабоце архіваў з дакументамі асабістага паходжання / аўт.-склад. Г.В. Запартыка; навук. рэд. С.У. Жумар. – Мінск, 2005. – С. 22.

вілаў, Сапегаў, Храптовічаў, Любецкіх ды інш. Як правіла, тут захоўваліся дакументы больш чым трох пакаленняў сям'і, траплялі дакументы іншых сем'яў, звязаных шлюбнымі адносінамі. Фамільныя архівы магнатаў, адлюстроўваючы фактычнае становішча прадстаўнікоў роду на працягу стагоддзяў, таксама характарызавалі ўзровень грамадска-культурнага развіцця рэгіёна.

У першай палове XIX ст. прыкметным становіцца існаванне г. зв. сядзібных архіваў. Менш значныя па складу крыніц, яны выконвалі пераважна эканамічныя функцыі. Аднак, пачынаючы з 30-х гг. XIX ст., паступова на пярэднім плане апынулася сацыяльна-прававая функцыя, абумоўленая неабходнасцю пацвярджэння шляхецкага паходжання. Менавіта сядзібныя архівы сталіся асяродкам захоўвання гістарычных дакументаў і творчай спадчыны многіх беларускіх дзеячаў.

Калекцыяніраванне як мэтанакіраванае выяўленне, набыццё і сістэматычнае камплектаванне аднародных прадметаў, якія маюць навуковае, гістарычнае, мастацкае або пазнавальнае значэнне – з'ява старажытная. Аднак як сталы від дзейнасці вядомае з XVIII ст. Аб'ектамі калекцыяніравання выступалі творы духоўнай і матэрыяльнай культуры. Паняцце «калекцыя» акцэнтуе ўвагу на штучнасці паходжання комплексу дакументаў, аб'яднанага па тэматычнай, храналагічнай ці іншай прыкмеце. Яно ілюструе дзеянне архіўнага прынцыпу прыналежнасці (пертыненцыі), але шырока выкарыстоўваецца па-за межамі архівазнаўства.

Найбольш багатыя калекцыі дакументаў і прадметаў пачалі стварацца на беларускіх землях у XIX ст. Сярод іх вызначаюцца калекцыі Яўстаха і Канстанціна Тышкевічаў у Лагойску, Адама Плятара ў Краславе, Міхаіла Румянцава ў Гомелі, Эмерыка Чапскага ў Станькаве, Вандаліна Шукевіча ў Начы, Аляксандра Ельскага ў Замосці ды інш.

Пасля 1917 г. прыватныя архівы пачалі прымацца на дзяржаўнае захоўванне і атрымавалі статус архіўнага фонду. Тэрмін «прыватны» паступова выйшаў з ужытку і выкарыстоўваўся, толькі ў дачыненні да комплексаў дакументаў, што існавалі ў папярэдні перыяд. Родавы архіў разглядаўся як комплекс дакументаў, якія адклаліся ў выніку дзейнасці прадстаўнікоў аднаго роду, фамільны – як комплекс дакументаў прадстаўнікоў аднаго роду больш за тры пакаленні і г. д.

Традыцыйна ў тэарэтычных і гістарычных працах прадстаўнікоў савецкай школы архівазнаўства С. С. Дзмітрыева, Ю. Ф. Кананава, Э. В. Коласавай, У. В. Цапліна ды інш. асабісты архіў выступаў як першасны комплекс дакументаў асабістага паходжання

ў асяродку бытавання, з якога фарміраваўся асабісты архіўны фонд, а таксама як крыніца камплектавання дзяржаўных архіваў[9].

Тэарэтычнае абгрунтаванне паняцця, зместу і складу асабістага архіва (ням. Nachlass, польс. spuścizna – спадчына) было зроблена ў 1950 – пач. 1960-х гг. нямецкімі архівазнаўцамі Г. О. Мейснерам, В. Леешам, В. Мамзенам, а ў 1960–1970-я гг. польскімі архівістамі А. Піберам і Ж. Каланкоўскім. Асноўнай заслугай апошняга з'яўляецца тэарэтычнае вызначэнне паняцця і яго асаблівасцей на падставе характарыстыкі структурных, храналагічных і тэматычных межаў. Асабісты архіў быў акрэслены як комплекс дакументаў, што мае самастойную навуковую каштоўнасць, быў створаны ў выніку і ў сувязі з дзейнасцю пэўнай асобы і рэпрэзентуе асноўныя накірункі яе жыцця, працы і інтарэсаў.

Цэласнае захаванне асабістага архіва з'яўляецца немагчымым. На практыцы даводзіцца мець справу з фрагментамі асабістых архіваў, што прымаюцца на захоўванне ў якасці асабістых архіўных фондаў. Адначасова інтэгральнай часткай асабістага архіва лічыцца кожны дакумент, які тычыцца дзейнасці асобы, і аб якім маюцца пэўныя звесткі.

У склад асабістага архіва акрамя дакументаў архіваўтваральніка, уваходзяць дакументы іншай прыналежнасці (пертыненцыі), менавіта дакументы іншых асоб (карэспандэнцыя, дакументы сям'і), а таксама дакументы, што ілюструюць сферу інтарэсаў асобы, афіцыйныя дакументы калекцыі і пасмяротныя дакументы.

Такім чынам, асабісты архіў уяўляе сабой цэласны комплекс правеніенцыйных і пертыненцыйных матэрыялаў, да якога дапасуюцца інтэгральныя пертыненцыйныя дакументы. Тэматычныя межы асабістага архіва вызначаюцца ў залежнасці ад накірунку дзейнасці ўтваральніка з анатаваннем іншай прыналежнасці[10].

---

[9] Дмитриев С. С. Личные архивные фонды. Виды и значение их как исторических источников // Вопросы архивоведения. – 1965. – № 4. – С. 35; Колосова Э. В., Цаплин В. В. Основные требования к комплектованию государственных архивов фондами личного происхождения // Материалы всесоюзного совещания-семинара по комплектованию государственных архивов материалами личного происхождения, экспертизе их ценности и фондированию / Глав. арх. упр. при СМ СССР. – М., 1965.– С. 3; Житомирская С. Что мы оставим в наследство? // Лит. газ. – 1976. – 8 сент. – С. 6; Метадычныя рэкамендацыі па рабоце архіваў з дакументамі асабістага паходжання / аўт.-склад. Г. В. Запартыка; навук. рэд. С. У. Жумар. – Мінск, 2005. – С. 3–4.

[10] Piber A. Spuścizna archiwalna – jej istota, zawartość, uklad, metody porządkowania // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawom archiwalnym / Nachelna Dyrekcja Archiwów Pańsstwowych. – T. 42. – 1965. – S. 43–62; Kolankowski Z. Granice spuścizny archiwalnej // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawom archiwalnym / Nachelna Dyrekcja Archiwów Pańsstwowych. – T. 57. – 1972. – S. 53–73.

Асноўным аб'ектам разгляду і навуковага асэнсавання савецкіх архівазнаўцаў з'яўляўся архіўны фонд, што фарміраваўся выключна на падставе прынцыпу паходжання (правеніенцыі). У рамках тэорыі аб дакументнай рэтраспектыўнай інфармацыі, фонд разглядаўся як генетычна цэласны комплекс дакументаў, што грунтуецца на прынцыпе правеніенцыі. Яго асаблівасць заключалася ў адлюстраванні мінулага праз прызму інфармацыйных сувязей канкрэтнага фондаўтваральніка. Фонд – гэта своеасаблівы інфармацыйны злепак дзейнасці ўтваральніка, а фондаўтварэнне – гэта з'ява, якой уласцівы рысы натуральна-гістарычнага працэсу[11].

Прафесар С. С. Дзмітрыеў аддзяляў уласна асабісты фонд ад пертыненцыйных дакументаў, якія да яго дапасоўваліся. Асобна разглядаліся групы дакументаў, што ілюстравалі збіральніцкую дзейнасць фондаўтваральніка і дакументы сям'і і якія, паводле меркавання аўтара, не з'яўляліся арганічнай часткай асабістага архіўнага фонду і не павінны былі ўключацца ў яго склад[12].

У 1980-х гг. імкненне да жорсткай уніфікацыі савецкай архіўнай тэрміналогіі прывяло да выключэння з нарматыўных стандартаў паняцця «архіў» як сукупнасці дакументаў. За ім было зафіксавана толькі адно азначэнне – арганізацыя ці яе структурнае падраздзяленне, якое ажыццяўляе захоўванне дакументаў. Адпаведна, паняцце «асабісты архіў» страціла «афіцыйнае значэнне» і перайшло ў разрад выключна навуковых[13]. У той жа час, на думку Ў. М. Аўтакратава, хібай савецкіх тэрміналагічных стандартаў 1980-х гг. быў разгляд шэрагу архівазнаўчых паняццяў у адрыве ад іх тэарэтычнай прыроды[14].

Нягледзячы на тое, што паняцце «асабісты архіў» было выключана з нарматыўнай савецкай тэрміналогіі, яно працягвала існаваць у гістарычных і тэарэтычных архівазнаўчых працах, тэрміналагічных слоўніках. Сярод прычын рэпрэсіі паняцця «асабісты

---

[11] Автократов В. Н. Теоретические проблемы отечественного архивоведения – М.: РГГУ, 2001. – С. 121.

[12] Дмитриев С. С. Личные архивные фонды. Виды и значение их как исторических источников // Вопросы архивоведения.– 1965.– № 4.– С. 35–48.

[13] Хан-Пира Э. И. Архивоведческое терминоведение // Археографический ежегодник за 1987 / АН СССР. Отделение истории. Археограф комис.; редкол. С. О. Шмидт (отв. ред.) [и др.] – М., 1988. – С. 105–106; ГОСТ 16487–83. Делопроизводство и архивное дело. Термины и определения. – М.: Изд-во стандартов, 1987. – С. 5.

[14] Автократов В. Н. Теоретические проблемы отечественного архивоведения. – М.: РГГУ, 2001. – С. 110, 126; Автократов В. Н. Понятие происхождения в архивоведении // Археографический ежегодник за 1978 год / АН СССР. Отделение истории. Археограф. комис.; редкол. С. О. Шмидт [и др.] – М.: Наука, 1979. – С. 142–149.

архіў» у савецкія часы можна назваць адмену права прыватнай уласнасці, у тым ліку і на дакументы, а таксама немагчымасць рэгламентацыі складу і зместу дакументаў асабістага архіва, які характарызуецца непрадказальнасцю тэматычных і структурных межаў. У той час асоба разглядалася як частка зладжанага дзяржаўнага механізма, а яе дзейнасць, адлюстраваная ў дакументах – як крыніца папаўнення жорстка цэнтралізаванага Дзяржаўнага архіўнага фонда (ДАФ), толькі ў зададзеных тэматычных рамках.

Такім чынам, можна казаць, што паняцце «асабісты архіўны фонд» супярэчыць асноўным архіўным прынцыпам правеніенцыі і недрабімасці фонду. У яго склад уваходзяць пертыненцыйныя дакументы. Акрамя таго дакументы адной асобы могуць захоўвацца і захоўваюцца ў некалькіх фондах. Асабісты архіўны фонд з'яўляецца фрагментам асабістага архіва, прынятага на дзяржаўнае захоўванне, і ў адпаведнасці з нарматыўным азначэннем і тэарэтычнай прыродай павінен уключаць у сябе толькі дакументы, якія маюць пертыненцыйную (генетычную) сувязь з утваральнікам, г. зн. толькі рукапісы твораў, ліставанне, мемуары і маёмасна-гаспадарчыя дакументы.

Сярод адметных рысаў асабістага архіва, што вызначаюць яго сярод іншых комплексаў дакументаў асабістага паходжання можна адзначыць прыналежнасць дакументаў да дзейнасці адной асобы; адлюстраванне асноўных накірункаў яе жыцця, дзейнасці і інтарэсаў; несупадзенне храналагічных межаў асабістага архіва з датамі жыцця архіваўтваральніка; уключэнне ў склад асабістага архіва пасмяротных дакументаў і дакументаў членаў сям'і, калекцый.

Таксама трэба згадаць наяўнасць розных тыпаў крыніц у залежнасці ад формы фіксацыі інфармацыі (пісьмовых, выяўленчых, друкаваных, рэчавых ды інш.), а таксама магчымасць вылучэння груп дакументаў у залежнасці ад адлюстравання накірунку дзейнасці ўтваральніка і прынцыпа паходжання (біяграфічныя дакументы, дакументы службовай і творчай дзейнасці, ліставанне, калекцыі, маёмасна-гаспадарчыя дакументы, мемуары). Варта адзначыць і тое, што фрагменты аднаго асабістага архіва могуць захоўвацца ў складзе розных фондаў і калекцый, як у дзяржаўных сховішчах, так і ў прыватнай уласнасці, а таксама практычную немагчымасць захоўвання асабістага архіва ў яго першапачатковай цэласнасці.

## *Крыніцы і літаратура*

Зыходнай кропкай вывучэння асабістых архіваў і крыніцай для гэтай кнігі сталі іх фрагменты, якія захоўваюцца ў дзяржаўных сховішчах Беларусі і краін замежжа. Формы захоўвання асабістых архіваў, крыніцы і методыка іх даследавання адрозніваюцца ў залежнасці ад сховішча (архіва, бібліятэкі ці музея).

Найбольш цэласным і арганічным комплексам дакументаў з'яўляецца асабісты фонд, які ўключае дакументы, што адлюстроўваюць асноўныя этапы жыцця і дзейнасці адной асобы. Калекцыі, створаныя пэўнай асобай, характарызуюць інтарэсы ці адзін з накірункаў дзейнасці, а таксама могуць утрымліваць біяграфічныя, творчыя ці іншыя дакументы з асабістага архіва.

Малакалькасныя асабістыя архівы і іх фрагменты, прынятыя на дзяржаўнае захоўванне, таксама аб'ядноўваюцца ў калекцыі. У гэтым выпадку ў яе складзе можа апынуцца некалькі комплексаў дакументаў, што характарызуюць дзейнасць шэрагу асоб. Дакументы персанальнага збору, створанага архівістамі, як правіла, вызначаюць толькі некаторыя кірункі жыцця і дзейнасці асобы.

Пры якаснай навукова-тэхнічнай апрацоўцы фонду, калекцыі ці збору біяграфічная інфармацыя і звесткі па гісторыі асабістага архіва ўключаюцца ў прадмову да вопісу ці справу фонда. Таксама звесткі ўтрымліваюцца непасрэдна ў архіўных дакументах і дадатковай літаратуры. Праўда, у апошнім выпадку дакладную і поўную інфармацыю па гісторыі архіва атрымаць амаль немагчыма.

Такім чынам, асноўнымі крыніцамі даследавання захоўвання і выкарыстання асабістых архіваў беларускіх дзеячаў з'яўляліся навукова-даведачны апарат у архівах, менавіта вопісы, справы фондаў, у т. л. дамовы, акты-прыёма перадачы, спісы фондаў, каталогі, базы дадзеных. У музеях такімі крыніцамі былі інвентарныя кнігі і картатэкі персаналій, у бібліятэках – каталогі і вопіс, а таксама бягучая справаводная дакументацыя, дакументы фондаў асабістага паходжання (ліставанне, тэстаменты, дзённікі). Таксама трэба назваць справаздачы, пратаколы пасяджэнняў, дакладныя запіскі, даклады ды іншыя матэрыялы аб захоўванні дакументаў асабістага паходжання ў фондзе органа кіруючага архіўнай справай, фондах архіўных устаноў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ), Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ).

Былі вывучаны і прааналізаваны гісторыя і склад дакументаў асабістага паходжання больш 100 сховішчаў Беларусі і краін замежжа. Інфармацыя аб больш чым 1400 асабістых архівах была

ўнесена ў базу дадзеных, якая стала другаснай крыніцай інфармацыі для асноўных накірункаў даследавання.

Спектр апублікаваных крыніц і літаратуры, неабходнай для асвятлення абранай праблематыкі, дастаткова шырокі і ўключае даследаванні гісторыкаў, архівазнаўцаў, архівістаў, літаратура-знаўцаў, спецыялістаў па крыніцам, а таксама заканадаўчыя акты, метадычныя распрацоўкі і даведачныя матэрыялы.

Гістарыяграфічны агляд дае падставы вылучыць некалькі перыядаў узрастання цікавасці з боку беларускага грамадства, архівістаў і навукоўцаў да праблем захоўвання архіваў асабістага паходжання. Першы перыяд ахоплівае пачатак 1920-х гг., калі адбываліся працэсы «беларусізацыі». У гэты час ішоў пошук захаваных прыватных архіваў, фарміравалася дзяржаўная архіўная сістэма, вяліся даследаванні па праблеме захоўвання беларускіх архіваў.

У другі перыяд (канец 1950-х – першая палова 1960-х гг.) была звернута ўвага на культурныя здабыткі беларускага грамадства, створана сховішча асабістых архіваў дзеячаў беларускай літаратуры і мастацтва, а таксама з'явіліся першыя нарматыўныя і метадычныя распрацоўкі, даведнікі і гісторыка-архівазнаўчыя працы. І, нарэшце, напрыканцы 1980-х – у 1990-я гг. цікавасць да асабістых архіваў была звязана з утварэннем незалежнай Рэспублікі Беларусь і ростам усведамлення грамадствам каштоўнасці дзейнасці прадстаўнікоў беларускай інтэлектуальнай эліты. У гэты час пачалося абмеркаванне праблем захоўвання асабістых архіваў у Беларусі на тэарэтычным узроўні.

Тэарэтычныя аспекты, якія ўключалі пытанні вызначэння асноўных паняццяў, размежавання функцый архіваў, музеяў і бібліятэк у справе захоўвання асабістых архіваў, а таксама захоўвання дакументаў асабістага паходжання і навуковай рэканструкцыі дакументальных збораў, закраналіся ў працах савецкіх, расійскіх, польскіх, беларускіх архівазнаўцаў У. Аўтакратава, Т. Хархордзінай, С. Дзмітрыева, Э. Хан-Піры, А. Колабава, М. Шумейкі, А. Пібера, Ж. Каланкоўскага, П. Банькоўскага, А. Сцябельскага, А. Кулецкай, Г. Рабуткі ды інш.[15]

---

[15] Автократов В.Н. Теоретические проблемы отечественного архивоведения. – М.: РГГУ, 2001. – 396 с.; Дмитриев С. С. Личные архивные фонды. Виды и значение их как исторических источников // Вопросы архивоведения. – 1965. – № 4. – С. 35–48; Хан-Пира Э. И. Архивоведческое терминоведение // Археографический ежегодник за 1987 / АН СССР. Отделение истории. Археограф комис.; редкол. С. О. Шмидт (отв. ред.) [и др.] – М., 1988. – С. 105–106; Колобов А. А. Комплектование и опиисание документов личного происхождения (на примере архивов УССР): автореф. дис. канд. ист. наук: 05.25.02 Моск. ист.-арх. ин-т. – М., 1990. – 28 с.; Piber A. Spuścizna archiwalna – jej istota, zawartość, uklad, metody porządkowania // Archeion. – T. 42. – 1965. – S. 43–62; Шумейко М.Ф. Из истории выявления и собирания

Гісторыя захоўвання архіваў асабістага паходжання ў Расіі і СССР комплексна даследавалася ў працах Ю. Кананава, І. Маякоўскага, У. Бонч-Бруевіча, Л. Сырчанкі, У. Мамонава ды інш., у Польшчы – Я. Вішнеўскага, А. Кулецкай, ва Ўкраіне – В. Ульяноўскага, Г. Папакіна, у Беларусі – Т. Трухіной, К. Жоравай, К. Някраш, Т. Лявонцьевай, Г. Запартыкі, М. Шумейкі[16].

Лёс шэрагу архіваў асабістага паходжання згадваўся ў даследаваннях па гісторыі асобных архіўных сховішчаў, у біяграфічных і комплексных крыніцазнаўчых і гістарыяграфічных даследаваннях Міколы Ўлашчыка, Дзмітрыя Карава, Язэпа Янушкевіча, Генадзя Кісялёва, Адама Мальдзіса, Кастуся Цвіркі, Ганны Запартыкі ды інш.[17]

---

документов революционного движения в России во второй половине XIX–начале XX вв. (по материалам архива В. Я. Богучарского): автореф. дис. канд. ист. наук: 07.00.09. / Моск. ист.-арх. ин-т. – М., 1980. – 25 с.; Kolankowski Z. Granice spuścizny archiwalnej // Archeion. – T. 57. – 1972. – S. 53–73; Bańkowski P. Archiwa. Ośrodki dokumentacyjne. Biblioteki. Muzea. Stosunki wzajemne. Proby rozgraniczenia // Archeion. – T. 19–20. – 1951. – S. 217–230; Stebelski A. Rękopis archiwalny i biblioteczny // Archeion. – T. 19–20. – 1951. – S. 230–240; Kulecka A. Spuścizny w archiwach, bibliotekach i muzeach w Polsce // Archeion. – T. 100. – 1999. – S. 70–96; Robótka H. Wprowadzenie do archiwistyki – Toruń: Wyd. Uniw. M. Kopernika, 2003.– 160 s.

16 Кононов Ю. Ф. Организация хранения личных фондов в архивах СССР // Труды научной конференции по вопросам архивного дела в СССР. Т. 1–2. – М., 1965–1966. – Т. 1. – 1965. – С. 267–276; Мамонов В. М. О собирании документов личного происхождения государственными архивами СССР // Археографический ежегодник за 1979 / АН СССР. Отделение истории. Археограф. комис.; редкол. С. О. Шмидт (отв. ред.) [и др.] – М.: Наука, 1981. – С. 3–25; Сырченко Л. Г. К истории комплектования государственных архивов СССР документальными материалами деятелей литературы (1918–1941) // Труды Московского государственного историко-архивного института / ред. В. В. Максаков [и др.] – Т. 15: Вопросы архивоведения и археографии. – М., 1962. – С. 345–377; Wiśniewski J. Archiwalia w bibliotekach i muzeach. – Poznań, 2000. – 136 с.; Жорова К. С. О некоторых вопросах комплектования ЦГАЛИ БССР // Труды научной конференции по вопросам архивного дела в СССР. Т. 1–2. – М., 1966. – Т. 1.– 1965. – С. 391–398; Запартыка Г. В. Да гісторыі камплектавання дзяржаўных архіваў Беларусі дакументамі асабістага паходжання. // Архіўныя чытанні I–III: матэрыялы навуковых канферэнцый, Мінск, 2003–2005 гг. / укл.: Г. В. Запартыка [ды інш.]; навук. рэд. А. В. Мальдзіс – Мінск, 2006. – С. 64–68; Шумейко М. Ф. Ещё раз о личных архивных фондах // Архіўныя чытанні I–III: матэрыялы навуковых канферэнцый, Мінск, 2003–2005 гг. / укл.: Г. В. Запартыка [ды інш.]; навук.рэд. А. В. Мальдзіс – Мінск, 2006. – С. 69–72 ды інш.

17 Улашчык Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода – М.: Наука, 1973. – 303 с.; Карев Д. В. Белорусская и украинская историография конца XVIII– начала 1920-х гг. XX в., в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев – Вильнюс: ЕГУ, 2007. – 312 с.; Кісялеў Г. Ад Чачота да Багушэвіча: праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 426 с. ды інш.

Гісторыя захоўвання асабістых архіваў ва ўніверсітэтах, інстытутах Акадэміі навук, бібліятэках, архівах, музеях, а таксама прыватных калекцыях і зборах асвятлялася ў сведчаннях супрацоўнікаў і даследчыкаў гісторыі дадзеных устаноў Антона Луцкевіча, Браніслава Эпімах-Шыпілы, Язэпа Дылы, Міхаіла Мялешкі, Аляксандра Цвікевіча, Ганны Запартыкі, Вадзіма Свярчкова, Галіны Шостак ды інш.[18]

Стварыць прыкладную карціну страт архіваў асабістага паходжання даюць магчымасць працы Эдварда Хвалевіка, Міхала Федароўскага, Францішка Радзішэўскага, Рамана Афтаназі, публікацыі Аляксандра Жыркевіча, Аляксандра Шлюбскага, Міхаіла Шумейкі ды інш.[19] Асабістыя архівы беларусаў замежжа і тыя, што патрапілі на захоўванне ў замежныя сховішчы, вывучаліся Ганнай Запартыка, Наталляй Гардзіенка, Вольгай Гарбачовай, Адамам Мальдзісам ды інш.

Заканадаўчыя і метадычныя асновы захоўвання дакументаў асабістага паходжання ў дзяржаўных сховішчах адлюстраваліся ў зборніках дакументаў і асобных нарматыўных прававых актах[20], метадычных рэкамендацыях, інструкцыях і артыкулах архівістаў, супрацоўнікаў бібліятэк і музеяў[21]. Склад дакументаў асабістага

---

[18] Мялешка М. Архіўная справа ў БССР да сучаснага моманту // Працы Першага з'езду даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі. 17–18 студзеня 1926 г. / Інстытут Беларускай культуры. Гістарычна-археалагічная камісія. – Менск, 1926. – С. 60–68; Запартыка Г. Перспектывы навуковай рэканструкцыі музея імя І. Луцкевіча ў Вільні // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей, праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): Матэрыялы Міжнар. навук. канфер., якая адбылася ў Мінску пад эгідай UNESCO 19–20 чэрвеня 1997. Вяртанне–4 / рэд. кал. А. Мальдзіс (гал. рэд.) [ды інш.] – Мінск, 1997. – С. 178–183; Свярчкоў В. А. Камплектаванне Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь дакументамі асабістага паходжання: вынікі // Архівы і справаводства.– 2000. – № 1.– С. 22–25 ды інш.

[19] Шлюбскі А. Матэрыялы да крыўскай гісторапісі. Доля кнігасховаў і архіваў // Спадчына. – 1992. – № 3. – С. 56–61; Chwalewik E. Zbiory Polskie archiwa, biblioteki, gabinety, galerje, muzea i inne zbiory pamiątek przesłości w ojczyżnie i na obczyznie. W porżądku alfabetycznym wedlug miejscowości ułożone. – Warszawa-Kraków: Wyd-wo J. Mortkowicza, 1926. – T. 1–2.; Шумейко М. Ф. Собрать рассеянное. О реституции белорусских архивов в прошлом и настоящем – Минск: БелНИИДАД, 1997. – 155 с. ды інш.

[20] Архивное дело в БССР (1918–1968): Сб. законодательных и руководящих документов / под ред. А. И. Азарова [и др.] – Минск, 1972. – 141 с.; О внесении изменений и дополнений в Закон Респ. Беларусь «О Национальном архивном фонде и архивах в Республике Беларусь», 6 октяб. 1994 г., № 3277–XII: В ред. Закона Респ. Беларусь от 6 января 1999 г., № 236–З // Нар. газ. – 1999. – 23 верасня. – С. 2–3 ды інш.

[21] Методическое пособие по научно-технической обработке фондов учёных в Архиве Академии наук СССР / Ю.А. Виноградов, З.Н. Нагорова; отв. ред. Г.А. Князев – М.-Л., 1960.– 93 с.; Методические рекомендации по работе с документами личного

паходжання ў розных сховішчах быў ахарактарызаваны ў шэрагу міжархіўных і архіўных даведнікаў, аглядаў дакументаў[22]. Важнай крыніцай фарміравання, захоўвання і пошукаў асабістых архіваў сталі таксама ўспаміны[23], матэрыялы перапіскі дзеячаў навукі і культуры[24], перыядычны друк[25].

---

происхождения (литература и искусство) / Э. Р. Коган [и др.]; Гл. арх. управ. при СМ СССР. – М., 1990. – 256 с.; Метадычныя рэкамендацыі па рабоце архіваў з дакументамі асабістага паходжання / аўт.-склад. Г. В. Запартыка; навук. рэд. С. У. Жумар. – Мінск, 2005.– 200 с. ды інш.

[22] Личные архивные фонды в государственных хранилищах СССР: указатель: в 3-х тт./ ред. кол. Ю. И. Герасимова [и др.]; сост. Э. В. Колосова [и др.] – М., 1962–1980. Т. 1–3; Государственные архивы Республики Беларусь (1944–1997): крат. справ. / Гос. ком. по архивам и делопроизводсту Респ. Беларусь, БелНИИДАД; авт. сост. А. Н. Михальченко [и др.] – Минск: БелНИИДАД, 2000.– 473 с.; Краткий словарь архивной терминологии / ред. кол. В. И. Кострикин [и др.] – М.-Л., 1968.– 68 с.; Словарь современной архивной терминологии социалистических стран: в 2 вып. / ВНИИДАД. – М., 1982–1988. – Вып. 1–2 ды інш.

[23] Пецюкевіч М. Успаміны пра Віленскі музей // Спадчына.– 1995. – № 2.– С. 77–105; Wojniłłowicz E. Wspomnenia. 1847–1928 / wyd. J. Iwaszkiewicz. – Cz. 1. – Wilno, 1931– 354 s. ды інш.

[24]Ельскі А. Выбранае / уклад. Н. Мазоўка, У. Казберук; прадм. У. Казберук, К. Цвірка. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2004. – 496 с.; Улашчык М. Выбранае / уклад. А. Каўкі і А. Улашчыка; навук. рэд. Г. Кісялёў і В. Скалабан; прадм. і камент. А. Каўкі. – Мінск: «Беларускі кнігазбор», 2001.– 608 с.

[25] Вітэк Д. Навуковая спадчына А. Сапунова // Савецкая Беларусь. – № 237. – 1924. – 12 кастр. – С. 3.; Жорава К.С. Архіў – сховішча надзейнае // Літаратура і мастацтва. – 1964. – 12 чэрв. – С. 4; Житомирская С. Что мы оставим в наследство? // Лит. газ.– 1976.– 8 сент.– С. 6; Сурмач Г. Лёс нашай спадчыны. Час вярнуць нацыянальныя гістарычныя каштоўнасці з суседніх сховаў // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 3 верасня – С. 14–15 ды інш.

# Традыцыі захоўвання прыватных архіваў у розных краінах свету

Традыцыі захоўвання дакументаў асабістага паходжання, уключаючы гістарычныя, этычныя і заканадаўчыя аспекты маюць шэраг агульных і спецыфічных рысаў у розных краінах свету. Яны з'яўляюцца паказчыкам узроўню свядомасці грамадства і яго адносінаў да неабходнасці захоўвання дакументальнай спадчыны.

У шматмоўных тэрміналагічных архівазнаўчых слоўніках адсутнічае падзел на асабістыя і прыватныя архівы, што ў першую чаргу тлумачыцца спецыфікай гістарычных умоў фарміравання дакументальных комплексаў у краінах Заходняй Еўропы і ЗША, фактарам прыватнай уласнасці, а таксама адсутнасцю адзінай цэнтралізаванай дзяржаўнай сістэмай захоўвання дакументаў асабістага паходжання. Паняцці «асабісты архіў» і «асабісты фонд» у слоўніках асобна не вылучаюцца[26].

Найбольш распаўсюджаныя ў англамоўнай архівазнаўчай літаратуры тэрміны «прыватныя дакументы» ці «архівы» (private records / papers / archives), а таксама «асабістыя дакументы» ці «архівы» (personal records / papers / archives), якія ў сваім агульным значэнні супрацьпастаўляюцца афіцыйным дакументам устаноў. Выкарыстоўваюцца паняцці «фамільнага» ці «сядзібнага архіва» (family/estate archive) як архіва адной ці некалькіх родных сем'яў ці асоб, што адлюстроўвае іх грамадскую і гаспадарчую дзейнасць.

У першых архівазнаўчых працах галандцаў С. Мюллера, І. Фэйта, Р. Фруіна (1898) і англічаніна Х. Джэнкінсана (1922) да прыватных архіваў належалі, у першую чаргу, гаспадарчыя, царкоўныя і гандлёвыя архівы, якія разглядаліся як антытэза архівам публічным. У пазнейшых працах, асабліва пасляваеннага перыяду італьянца Э. Казановы (1928), француза Р. Бацье (1961), амерыканца Т. Шэленберга (1965) у склад прыватных архіваў уключаліся фамільныя і асабістыя архівы, аднак па-ранейшаму прыватныя архівы супрацьпастаўляліся публічным.

На міжнародным узроўні пытанне аб захоўванні прыватных архіваў было пастаўлена ўжо на І Міжнародным кангрэсе архіваў

[26] Словарь современной архивной терминологии социалистических стран: в 2 вып. / ВНИИДАД. – Вып. 1. – 1980. – с. 208, 442; Dictionary of archival terminology. Dictionnaire de terminologie archivistique. English and French with equiwalents in Dutch, German, Italian, Russian and Spanish / International Council on Archives; ed. Peter Walne // ICA Handbook series. – 2nd edition. – Munchen, New York, London, Paris, 1988. – Vol. 7 . – S. 40, 65, 114

у Парыжы ў 1950 г. у дакладах Х. Джэнкінсана (Вялікабрытанія) і Ж. Бурджына (Францыя). Аднак найбольш актыўна пытанне абмяркоўвалася на III Міжнародным кангрэсе ў Фларэнцыі ў 1956 г. пасля дакладу італьянскага архівіста Рыкарда Філангіеры. Ён выказаў думку, што захоўванне прыватных архіваў патрабуе пільнай увагі дзяржавы, бо прыватныя архівы таксама выконваюць адну з важнейшых сацыяльных функцый, менавіта функцыю захоўвання памяці, і павінны разглядаюцца як важны элемент культуры.

Да іх былі аднесены архівы прыватных установаў і грамадскіх аб'яднанняў, фамільныя архівы, асабістыя архівы (літаратурныя і навуковыя архівы)[27], а ў некаторых выпадках таксама царкоўныя архівы. Аднак пэўны стандарт адсутнічаў. Так, напрыклад, у Іспаніі да прыватных архіваў адносілі натарыяльныя архівы, у Францыі і Вялікабрытаніі – гаспадарчы, у Германіі – архівы грамадскіх аб'яднанняў і партый[28].

У гэтым кантэксце архівістамі таксама шырока выкарыстоўваецца паняцце «архівы літаратуры і мастацтва» ці «літаратурныя архівы» (literary archives). Да іх належаць архівы пісьменнікаў, літаратурных арганізацый, а таксама ўстановы, што займаюцца іх камплектаваннем і захоўваннем. У 2004 г. у рамках Міжнароднага савета архіваў (МСА) была створана секцыя архіваў літаратуры і мастацтва, прызваная каардынаваць дзейнасць міжнароднай архіўнай супольнасці ў гэтым накірунку.

Традыцыйна архівы літаратуры і мастацтва захоўваюцца ў аддзелах рукапісаў бібліятэк, музеях ці спецыялізаваных установах. Так, напрыклад, мемарыяльныя (літаратурныя) музеі выдатных прадстаўнікоў грамадства, якія захоўваюць у т. л. дакументы, існуюць амаль у кожнай краіне свету. У Індыі – гэта музеі Гандзі, у Францыі (Руан) – музеі Карнеля і Флабера, Германіі (Дзюсельдорф) – музеі Гётэ і Гейнэ, у Вялікабрытаніі (Лондан) – Дзікенса, Кейта, Дарвіна ды інш.

---

[27] Асабістыя архівы разам з іншымі відамі прыватных архіваў разглядаліся як крыніца для даследаванняў гісторыкаў, разам з іншымі відамі літаратурных і навуковых архіваў як аснова літаратуразнаўчых даследаванняў, а таксама для даследаванняў у іншых галінах навукі. Навуковы архіў – гэта архіў установы, што займаецца навуковымі даследаваннямі, і іх адміністрацый, а таксама архіваў вучоных.

[28] Filangieri R. Les archives privees // Archivum. Revue internationale des archives publiées avec le concours financier de l'UNESCO et sous les auspices du Conseil International des Archives. – Vol. VI. – Paris, 1958. – S. 43–70. The Private Archives and Archival Materials in the Central and East European Countries. Materials of the International Conference, Mądralin, October 8–11, 1998 / ed. W. Stępniak. – Warszawa, 1999. – 230 s. Archives among the Memory Institutions. Papers of the International Conference, Warsaw, May 28–29, 2004 / edited by A. Biernat, I W. Stępniak. – Warszawa, 2004. – 249 s.

Праблема размежавання сферы ўплыву архіваў ад бібліятэк і музеяў уздымалася архіўнай супольнасцю на VII Міжнароднай канферэнцыі Круглага стала архіваў у 1962 г. Першы раз у навуковым форуме архівістаў удзельнічалі прадстаўнікі міжнароднай бібліятэчнай асацыяцыі. У якасці асноватворнага быў вызначаны крытэрый арганічнасці, згодна з якім архівазнаўчы падыход разглядаў дакумент як частку цэлага, а бібліятэкі і музеі – як незалежную ізаляваную адзінку. Аднак архівісты падкрэслівалі, што архіўныя дакументы незалежна ад іх месцазнаходжання павінны захоўвацца згодна з архіўнымі правіламі[29].

На VII Міжнародным кангрэсе архіваў, які праходзіў у 1972 г. у Маскве дырэктарам ЦДАЛМ СССР Н.Б. Волкавай быў зроблены даклад, прысвечаны захоўванню асабістых архіваў дзеячаў літаратуры і мастацтва ў складзе дзяржаўных архіваў, музеяў і бібліятэк[30]. Праблеме інтэграцыі і стварэння агульнай сістэмы інфармацыі паміж архівамі, бібліятэкамі і музеямі быў прысвечаны асобны нумар часопіса «Archivum» (1984), дзе асноўны акцэнт быў зроблены на агульнасці функцый архіваў, музеяў і бібліятэк па збіранні, захоўванні і забеспячэнні доступу да інфармацыі[31].

IV Міжнародная канферэнцыя 1998 г. з серыі «Colloquia Jerzy Skowronek dedicata»[32], арганізатарам якой з'яўляецца Генеральная дырэкцыя дзяржаўных архіваў Польшчы, была цалкам прысвечана праблемам прыватных архіваў у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Архівісты 15 краін абмяркоўвалі юрыдычны статус прыватных архіваў і заканадаўства ў розных дзяржавах, кампетэнцыі дзяржаўных органаў кіравання архіўнай справай, спецыфіку практычнай дзейнасці архівістаў, якая ўплывае на захоўванне прыватных архіваў.

Праблемы захоўвання, выкарыстання і прававога статусу дакументаў асабістага паходжання станавіліся прадметам абмеркавання таксама шэрагу іншых міжнародных сустрэч архівістаў.

---

[29] Altman Henryk Archiwa. Ośrodki dokumentacyjne. Biblioteki. Muzea. Stosunki wzajemne. Proby rozgraniczenia // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawom archiwalnym / Nachelna Dyrekcja Archiwów Państwowych. – T. 38. – Warszawa, 1962. – S. 7–9.

[30] Волкова Н.Б. Архивы литературы и искусства // Советские архивы.– 1973.– № 1.– С. 18–22.

[31] Bloomfield B.C. Relations between Archives and Libraries // Archivum. International Review on Archives. – T. XXX: Archives, Libraries, Museums and Documentation Centers. – München–New-York–London–Paris. – 1984. – S. 28–35.

[32] The Private Archives and Archival Materials in the Central and East European Countries. Materials of the International Conference, Mądralin, October 8–11, 1998 / ed. W. Stępniak. – Warszawa, 1999. – 230 s.

У 1987 г. у межах адной з праграм ЮНЭСКА было праведзена даследаванне стану захоўвання прыватных архіваў у 38 сховішчах 28 краін Еўропы, Амерыкі, Афрыкі, Азіі і Аўстраліі. Гэта цэнтральныя і рэгіянальныя дзяржаўныя архівы, цэнтральныя і ўніверсітэцкія бібліятэкі ды інш. Да катэгоры прыватных архіваў былі аднесены асабістыя архівы, калекцыі аўтографаў, фамільныя і сядзібныя архівы, літаратурныя архівы, навуковыя архівы, архівы культурных, навуковых і рэлігійных устаноў, бізнес-архівы, архівы прафсаюзаў і ўніверсітэтаў. Было адзначана, што асабістыя архівы захоўваюцца ў 36, а літаратурныя рукапісы – у 27 з акрэсленых сховішчаў.

Таксама была дадзеная характарыстыка парадку камплектавання, умоваў захоўвання, парадку доступу, асаблівасцям заканадаўства і працы з прыватнымі архівамі. На дзяржаўнае захоўванне дакументы перадаваліся пераважна без аплаты (66% усіх дакументаў), на аснове куплі-продажу (13%), на дэпазітарнае захоўванне (9%) і ў выніку перамяшчэння (10%). Больш паловы ўстаноў мелі даведнікі па прыватных архівах і рукапісах. Прыватныя дакументы, як правіла, захоўваліся асобна ад дакументаў арганізацый. Большасць устаноў (62%) звярталі ўвагу на парадак доступу да дакументаў і аўтарскія правы. У некаторых выпадках сховішчы былі звязаны воляй уладальніка. Парадак доступу залежаў таксама ад палітыкі ўстановы, якая захоўвала дакументы, і ад заканадаўства дзяржавы.

У 14 краінах вяліся г. зв. «рэестры прыватных архіваў», а ў некаторых (ЗША, Канада, Нарвегія, Індыя) існавала практыка штогадовай публікацыі дапаўненняў у рэестры. У большасці краін архіўнае заканадаўства закранала пытанні прыватных архіваў. Пры гэтым улічваліся два асноўныя прынцыпы, менавіта павага да прыватнай уласнасці і магчымасць шырокага выкарыстання дакументаў на карысць дзяржавы, навукі і культуры.

У Францыі, напрыклад, пачынаючы з часоў Французскай рэвалюцыі, дзяржава апякуецца, як публічнымі, так і прыватнымі архівамі. У большасці былых сацыялістычных краін законы не ўлічвалі розніцы паміж публічнымі і прыватнымі архівамі, якія з'яўляліся часткай агульнага Дзяржаўнага архіўнага фонду. У англа-саксонскіх краінах палітыка адносінаў да прыватных архіваў вызначалася выключна архівамі публічнымі.

У 90-я гг. ХХ ст. выявілася тэндэнцыя разгляду прыватных архіваў як часткі нацыянальнай архіўнай спадчыны. У большасці з гэтых краін архівы абавязаныя прымаць на захоўванне прыватныя дакументы, якія маюць гістарычную каштоўнасць, а таксама сачыць за іх перамяшчэннямі. У Алжыры, Аўстраліі, Батсване,

Францыі, Грэцыі, Італіі, Партугаліі, Нідэрландах, Вялікабрытаніі існуе практыка рэгістрацыі прыватных архіваў. У Чэхіі, Славакіі і Фінляндыі нацыянальныя архівы маюць права канфіскацыі прыватных архіваў у выпадку пагрозы іх захаванасці.

Асноўнымі праблемамі ў справе захоўвання прыватных архіваў, якія патрабавалі пэўнага вырашэння ў канцы 80-х гг. XX ст., сталі неабходнасць павышэння архіўнай свядомасці грамадства, асабліва ўладальнікаў прыватных архіваў; удасканаленне прафесійнай падрыхтоўкі архівістаў, якія працавалі з прыватнымі архівамі; пошук сродкаў на забеспячэнне захоўвання прыватных архіваў; папулярызацыя захаваных прыватных архіваў і іх навуковае выкарыстанне; стварэнне рэестраў такіх архіваў у тых краінах, дзе іх не было; стандартызацыя метадаў упарадкавання і апісання прыватных архіваў.

Былі прыняты рашэнні пра мінімалізацыю абмежаванняў у доступу да матэрыялаў прыватных архіваў[33]. Таксама былі вызначаны пэўныя межы паміж прыватнымі і публічнымі архівамі, рэгламентаваліся іх стасункі, пашыралася супрацоўніцтва паміж установамі, якія захоўвалі прыватныя архівы[34]. Пільная ўвага была звернута на праблему раскіданасці прыватных архіваў і іх знаходжання па-за межамі дзяржавы, дзе яны былі створаны[35].

Заканадаўцам традыцыі дзяржаўнага захоўвання прыватных архіваў з'яўляецца Францыя. Архіўная служба гэтай краіны сутыкнулася з пытаннем захоўвання прыватных дакументаў адразу пасля стварэння Нацыянальнага архіва ў 1789 г. Па дэкрэту 1793 г. маёнткі эмігрантаў разам з іх архівамі пераходзілі ў валоданне дзяржавы. Колькасць такіх архіваў была даволі значнай, але яны падвяргаліся стыхійнаму знішчэнню. Нацыянальнаму архіву давялося таксама разглядаць прэтэнзіі спадчыннікаў, што вярталіся на радзіму.

У XIX ст. пачалося актыўнае вывучэнне прыватных (фамільных) архіваў гісторыкамі, што абумовіла супрацоўніцтва навукоў-

---

[33] The Preservation and Administration of private archives:a RAMP study. 1984. [Электрон. рэсурс] / UNESCO – 1995–2010. – Рэжым доступу: // http://unesdoc.unesco.org/images/0005/000596/059687E.pdf

[34] The Private Archives and Archival Materials in the Central and East European Countries. Materials of the International Conference, Mądralin, October 8–11, 1998 / ed. W. Stępniak. – Warszawa, 1999. – 230 s.; Archeion. – T. CIX. Problemy archiwistyki: archiwa a prywatność. Dostęp do zbiorów w świetle ustawodawstwa o ochronie danych osobowych. – Warszawa, 2006. – 408 s.

[35] Kitching Christopher Archives and frontieres? The worldwide dispersion of British private papers // Miscellanea in honorem Caroli Kecskemeti / Joannis Booms, Joannis Favier. – S. 253–272.

цаў з уладальнікамі архіваў. У гэты час дакументы прыватных архіваў паступалі на дзяржаўнае захоўванне на ўмовах падаравання (каля 60%) ці продажу (каля 40%). На пакупку прыватных архіваў напрыканцы стагоддзя дзяржавай выдаткоўваліся значныя грашовыя сродкі. Адной з папулярных формаў захоўвання быў дэпазыт.

Новая хваля цікавасці да прыватных архіваў назіралася пасля Другой сусветнай вайны. У 1949 г. у Нацыянальным архіве ў Парыжы была створана асобная падсекцыя гаспадарчых і прыватных архіваў. Серыя прыватных архіваў увабрала ў сябе комплексы дакументаў, якія адкладаліся ў выніку грамадскай, палітычнай, літаратурнай і навуковай дзейнасці асобаў (сем'яў). Генеральны дырэктар французскіх архіваў Шарль Брабант ініцыяваў стварэнне Камітэту аховы прыватных архіваў, у які ўвайшлі прадстаўнікі ўніверсітэтаў (дзе пераважна захоўваліся архівы), уладальнікі прыватных архіваў, а таксама гісторыкі і архівісты. Камітэт зрабіў вялікую справу ў накірунку ўліку і забеспячэння захоўвання прыватных архіваў. Была створана цэнтральная картатэка прыватных архіваў, пачалося мікрафільмаванне дакументаў і перадача копій для выкарыстання ў Нацыянальны архіў[36].

Асабістыя архівы Францыі сёння захоўваюцца не толькі ў Нацыянальным архіве і архівах дэпартаментаў, але найчасцей у бібліятэках, музеях, акадэмічных архівах[37].

У французскай архівазнаўчай літаратуры асабістыя архівы разглядаюцца як адзін з відаў прыватных архіваў і важная крыніца гістарычных даследаванняў[38]. Асноўнай заканадаўчай праблемай на сённяшні дзень у Францыі з'яўляецца праблема ўсталявання межаў паміж архівамі публічнымі і прыватнымі. Яна вырашалася ў архіўных законах ад 25 чэрвеня 1794 г., ад 3 снежня 1979 г. і ад 15 ліпеня 2008 г. У адпаведнасці з імі, прыватнымі з'яўляюцца ўсе непублічныя, г. зн. недзяржаўныя архівы. Прыватныя архівы, якія маюць гістарычную каштоўнасць, могуць атрымаць спецыяльны статус «гістарычных архіваў». У гэтым выпадку яны падлягаюць захоўванню пад кантролем дзяржаўнай архіўнай службы.

---

[36] Gołembiowski M. Zagadnenie archiwaliów prywatnych we francuskiej literaturze i praktyce archiwalnej (Wybrane problemy) // Acta Universitatis Nicolai Copernici. Historia XXV. – Nauki humanistyczno-społeczne. – Z. 236. – 1991. – S. 71– 82.

[37] Kulecka A. Archiwista w Laboratorium. (Przegląd francuskiej literatury archiwalnej dotyczącej archiwów naukowych) // Kwartalnik Historii Nauki i Techniki / Polska Akademia Nauk. Instytut historii nauki. – Warszawa, 2000. – R. 45. – S. 47–69.

[38] Manuel d'archivistique. Théoire et pratique des Archives publiques en France. – Paris, 1970. – S. 407.

Мадыфікацыя ці перамяшчэнне такіх архіваў без дазволу дзяржавы не дапускаюцца[39].

Асобны артыкул апошняга закона быў прысвечаны парадку абавязковай перадачы на дзяржаўнае захоўванне службовых архіваў палітычных дзеячаў, якое ажыццяўляецца на падставе падпісання дамовы з архіваўтваральнікам.

Аднак праблема заключаецца не толькі ў тым, каб пазбегнуць адзяржаўлення прыватных архіваў, але і ў тым, каб не дапусціць прыватызацыі дзяржаўных архіваў. Новы закон увёў больш жорсткія правілы захоўвання для прыватных архіваў (як асабістых, так і архіваў устаноў). Тым не менш у Францыі не існуе жорсткай схемы кантролю і перадачы найбольш каштоўных прыватных архіваў. Фактычна, гэты працэс залежыць ад свядомасці і волі архіваўтваральніка.

Германія з'яўляецца лідэрам у распрацоўцы тэарэтычных архівазнаўчых праблем, звязаных з асабістымі архівамі, дзякуючы такім навукоўцам як А. Брэнеке, О. фон Харнак, О. Веніг, Г. Мейснер, В. Момзен, Г. Шрэер ды інш.[40] У пачатку 1970-х гг. Вольфгангам Момзенам быў створаны даведнік па асабістых архівах у дзяржаўных архіўных сховішчах Германіі, куды ўвайшлі дадзеныя аб 7 тыс. архівах асабістага паходжання.

Пазней на аснове даведніка была распрацавана база дадзеных *«Nachlassdatenbank»*[41]. У 2004 г. яна ўключала інфармацыю пра больш чым 25 тыс. асабістых архіваў з 1 тыс. сховішчаў краіны. База дадзеных абнаўляецца раз у некалькі год. Актуальным для яе папаўнення застаецца пытанне пра неабходнасць уключэння таксама інфармацыі пра асабістыя архівы або іх часткі, што захоўваюцца ў бібліятэках. Менавіта бібліятэкі і музеі з'яўляліся асноўнымі цэнтрамі канцэнтрацыі архіваў музыкантаў, пісьменнікаў, навукоўцаў і мастакоў, пачынаючы з XIX ст. і да другой паловы XX ст. Толькі ў пасляваенны час было пастаўлена пытанне аб неабход-

---

[39] Храмцовская Н. А. Новый французский закон об архивах: России есть чему поучиться // Делопроизводство и документооборот на пердприятии. – 2008. – № 9. – С. 54–66; Libera P. Kryzys francuskiej polityki udostępniania materiałów archiwalnych – u żródeł nowej ustawy archiwalnej we Francji // Archeion. – T. 109. – Archiwa a prywatność. – Warszawa, 2006. – S. 193–213; Прозорова В. Новый закон об архивах во Франции // Отечественные архивы. – 2010. – № 1.

[40] Robótka H. Archiwa Prywatne w powojennej archiwistyce NRD i RFN // Acta Universitatis Nicolai Copernici. Historia XXV. – Nauki humanistyczno-społeczne. – Z. 236. – 1991. – S. 41–70.

[41] Zentrale Datenbank Nachlässe. [Электрон. рэсурс] / Das Bundesarchives. – Berlin, 2004–2005. – Рэжым доступу: http://www.nachlassdatenbank.de – Дата доступу: 20.01.2010.

насці сістэматычнага захоўвання дакументаў палітыкаў і вайскоўцаў, якія пачалі прымацца архівамі.

У Італіі пытанне аб захоўванні прыватных архіваў паўстала ў міжваенны перыяд. У 1926 г. Нацыянальным архівам Неапаля архіву сям'і Пігнатэлі Арагона Картэс быў нададзены статус гістарычнай каштоўнасці. Закон, у адпаведнасці з якім і сёння ажыццяўляецца кіраванне архівамі, быў прыняты ў 1963 г. Паводле яго, прыватныя архівы, створаныя больш 70 год таму, набываюць статус «помнікаў гісторыі» і падлягаюць дзяржаўнай апецы. Апекай архіваў такога кшталту займаюцца Цэнтральная адміністрацыя архіваў, Генеральнае кіраўніцтва помнікаў гісторыі і Генеральнае кіраўніцтва музеяў[42].

У Вялікабрытаніі пад прыватнымі архівамі разумеюць, у першую чаргу, архівы сем'яў і асобаў, а таксама бізнес-архівы і архівы грамадскіх аб'яднанняў. Першы крок па арганізацыі захоўвання прыватных архіваў быў зроблены ў 1869 г. Каралеўскай камісіяй па гістарычных рукапісах, дзякуючы якой шэраг прыватных рукапісаў быў перададзены ў дзяржаўныя сховішчы. Цікавасць да прыватных архіваў узрасла са стварэннем у 1932 г. Брытанскай Асацыяцыі па дакументах (BRA), якая займаецца кансультаваннем уладальнікаў архіваў па іх аптымальным захоўванні, рэстаўрацыяй дакументаў, пошукам месцаў для часовага альбо сталага захоўвання, правядзеннем выстаў, стварэннем публікацый і вядзеннем рэгістра прыватных архіваў[43]. Нацыянальны рэгістр, куды ўвайшлі звесткі аб усіх прыватных архівах Вялікабрытаніі, пастаянна папаўняецца[44].

Праблема неабходнасці размежавання функцый паміж архівамі, што ўзнікалі па прыватнай ініцыятыве, і дзяржаўнымі публічнымі ўстановамі, найбольш востра праявілася ў сітуацыі з прэзідэнцкімі архівамі ў ЗША. Доўгі час амерыканскія прэзідэнты, пакідаючы пасаду забіралі тыя дакументы, што знаходзіліся ў іх кабінеце. У выніку шматлікія архівы загінулі. У 1938 г. прэзідэнт Франклін Рузвельт прыняў рашэнне пра будаўніцтва бібліятэкі-архіва і перадачы туды дакументаў, што тычыліся яго дзейнасці як прэзідэнта.

---

[42] Filangieri R. Les archives privées // Archivum. Revue internationale des archives publiées avec le concours financier de l'UNESCO et sous les auspices du Conseil International des Archives. – Vol. VI. – Paris, 1958. – S. 46.

[43] Private archives. The work of the British Records Association for private archives in Great Britain // Archivum. Revue internationale des archives publiées avec le concours financier de l'UNESCO et sous les auspices du Conseil International des Archives. – Vol. VI. – Paris, 1958. – S. 71–74.

[44] The National Archives http://www.nationalarchives.gov.uk/nra/default.asp

Сёння прэзідэнцкія бібліятэкі – гэта не бібліятэкі ў поўным сэнсе, а сабраныя ў адным месцы архіўныя і музейныя артэфакты дзейнасці 10 амерыканскіх прэзідэнтаў і іх адміністрацыі. У адпаведнасці з заканадаўствам матэрыялы бібліятэк даступныя для навуковага вывучэння, а самі бібліятэкі падпарадкаваныя NARA (Нацыянальнай адміністрацыі архіваў і дакументаў)[45].

У ЗША таксама арганізаваны прыватныя эканамічныя архівы. Дакументы асабістага паходжання прымаюцца на захоўванне архівамі, універсітэтамі і навуковымі цэнтрамі праз пасрэдніцтва і выключна па ініцыятыве ўладальнікаў[46].

Захоўванне прыватных (асабістых) архіваў у краінах былога сацыялістычнага лагера мела пэўныя асаблівасці. Гэта, у першую чаргу, адзяржаўленне прыватных архіваў і перадача іх у склад адзінага метакомплекса архіўных дакументаў, што належаць дзяржаве – Дзяржаўнага (альбо Нацыянальнага) архіўнага фонду.

Традыцыйнымі сховішчамі, куды перадаваліся на захоўванне дакументы асабістага паходжання, напрыклад, у Польшчы з XIX ст. з'яўляліся бібліятэкі і музеі. Архіўнае права ў міжваенны перыяд было закладзена актамі 1918–1919 гг. аб арганізацыі дзяржаўных архіваў і апецы над прыватнымі архіўнымі дакументамі. Аддзел дзяржаўных архіваў пры Міністэрстве рэлігійных спраў і асветы меў права дзеля захоўвання прыватных архіваў набываць іх у дзяржаўную ўласнасць ці браць на дэпазітарнае захоўванне са згоды ўладальнікаў. Рабіліся таксама апісанні прыватных архіваў, аказвалася метадычная дапамога.

Пасля вайны, у 1952 г. у Польскай Рэспубліцы быў створаны Дзяржаўны архіўны фонд, у склад якога ўвайшлі ўсе архіўныя дакументы, што мелі гістарычнае значэнне, у т. л. фамільныя, сямейныя і асабістыя архівы. Прыватныя архівы пачалі масава перадаваць на дзяржаўнае захоўванне. Пры гэтым вызначылася спецыялізацыя сховішчаў, што захоўвалі прыватныя дакументы розных сфер ідзейнасці.

У 1983 г. была прынята Пастанова аб Нацыянальным архіўным фондзе, які складаўся з дзяржаўнай і недзяржаўнай частак. Прыватныя дакументы ўваходзілі ў склад недзяржаўнай часткі Нацыянальнага архіўнага фонду Польшчы. Уладальнікі дакумен-

---

[45] Прэзідэнцкія бібліятэкі //http://www.archives.gov/presidential-libraries; Старостин Е. В. Зарубежное архивоведение: проблемы истории, теории и методологии – М.: Инф.-изд. агенство «Русский мир», 1997. – 332 с.

[46] Фурсенко А. А. Архив Рокфеллеров // Вспомогательные исторические дисциплины: сборник статей / АН СССР; редкол. С. Н. Валк (отв.ред.) [и др.] – Т. VII. – Ленинград, 1976. – С. 319–329; Беларускі цуд у Нью-Ёркаўскай Публічнай бібліятэцы // Беларус. – 2009. – № 559. – С. 4–5.

таў, уключаных у рэестр недзяржаўнай часткі, мелі дадатковыя абавязкі па іх захоўванню. Права захоўвання архіўных дакументаў мелі таксама архівы і бібліятэкі.

Праблема прыватных архіваў застаецца актуальнай для Польшчы. Спадчыннікі сем'яў, архівы якіх былі перададзеныя ва ўласнасць дзяржавы ў пасляваенны час, патрабуюць вяртання ім права ўласнасці на перададзеныя дакументы. Паўстае пытанне наладжвання дзяржаўнай апекі над прыватнымі архівамі ў адпаведнасці са спецыфікай дакументаў. Апошняе датычыць царкоўных архіваў, архіваў грамадскіх аб'яднанняў, асабістых і сямейных архіваў[47].

У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. з распадам сацыялістычнага блока і стварэннем незалежных дзяржаў, цэнтралізацыя архіўнай справы стала менш жорсткай, пачаўся пошук новых крыніц інфармацыі, важных для выпрацоўкі нацыянальнай ідэі новых дзяржаў. Так, напрыклад, у 1988 г. у Маскве быў створаны Цэнтр дакументацыі «Народны архіў», які праіснаваў да 2006 г. Адным з асноўных накірункаў яго працы быў збор дакументаў асабістага паходжання шэраговых грамадзян (ліставанне, мемуары, асабістыя дакументы і г. д.), г. зн. комплексаў тых дакументаў, якія не ўваходзілі ў сферу камплектавання дзяржаўных архіваў і толькі зрэдку станавіліся крыніцай даследаванняў па гісторыі савецкага грамадства.

Аналагічныя задачы з канца 1980-х гг. вырашаліся польскім навукова-культурным цэнтрам *KARTA* і Радай грамадскіх архіваў пры Галоўнай дырэкцыі дзяржаўных архіваў Польшчы.

У гэтым жа накірунку праводзіцца праца і ва Ўкраіне. У 1999 г. тут быў распачаты праект «Эліта Ўкраіны XVIII–XX ст.: нацыянальны рэестр асабістых архіваў. Анатаваны даведнік і база дадзеных».

Эліта Ўкраіны – гэта выдатныя дзеячы навукі, культуры, грамадска-палітычнай сферы, прадстаўнікі інтэлігенцыі, асабістыя архівы якіх ствараюць падмурак для яскравага і рэльефнага адлюстравання гісторыі Ўкраіны. Рэестр пабудаваны па прынцыпу прыналежнасці дакументаў да дзейнасці адной асобы і ўключае анатацыі на асабістыя архіўныя фонды, якія захоўваюцца ў цэнтральных, галіновых і абласных архівах Украіны (больш за 2 тыс.

---

[47] Kulecka A. Spuścizny w archiwach, bibliotekach i muzeach w Polsce // Archeion / Nachelna Dyrekcja Archiwów Państwowych; red. Stefan Krzyszytof Kuczyński. – T. 100. – 1999. – S. 70–96; Górak R. Archiwa osobiste. Problemy gromadzenia, opracowania i udostępniania. // Problemy archiwistyki. – 2009. – № 2. – S. 22–30.

фондаў), установах сістэмы Акадэміі навук Украіны (больш 1 тыс. фондаў), дзяржаўных музеях (каля 600 фондаў)[48].

Актуальнай для постсавецкіх краін таксама з'яўляецца прablема заканадаўчай рэгламентацыі статуса прыватных архіваў, якая стала адной з цэнтральных пры прыняцці архіўных законаў у Літве (1995), Балгарыі (1993), Славеніі (1997), Харватыі (1991, 1997), Латвіі (1991), Румыніі (1996), Югаславіі (1998), Чэхіі (1992), Расійскай Федэрацыі (1993, 2004) і ва Ўкраіне (1994, 2003).

Рэгламентавалася права ўласнасці на архіўныя дакументы і ўсталёўваўся пэўны кантроль дзяржавы за гэтымі працэсамі. Дакументы, што знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, могуць быць перададзены ва ўстаноўленым парадку ў дзяржаўныя архівы, як без аплаты, так і шляхам продажу. Прадугледжваецца таксама адказнаць уладальніка за захоўванне прыватных архіваў, як неад'емнай часткі нацыянальнай архіўнай спадчыны.

Фарміраванне асабістых архіваў дзеячаў беларускай навукі і культуры канцы XVIII – пачатку XX ст. адбывалася ў сітуацыі, калі Беларусь не з'яўлялася самастойнай дзяржавай і не мела ўласнай сістэмы захоўвання архіўных дакументаў. Пасля 1918 г. гэтыя дакументы сталіся часткай створанай цэнтралізаванай архіўнай сістэмы і былі ўключаны ў склад Дзяржаўнага архіўнага фонду (ДАФ). Апошні разглядаўся як адзіны метакомплекс архіўных дакументаў, якія належалі дзяржаве, і быў створаны на падставе прынцыпу цэнтралізацыі захоўвання дакументаў.

Па прыкладу РСФСР 4 жніўня 1922 г. у БССР была прынята пастанова «Аб архіве», якая ўпершыню вызначыла паняцце і склад ДАФ БССР. 28 мая 1928 г. у адпаведнасці з Палажэннем аб ДАФ БССР, найбольш каштоўныя прыватныя архівы падлягалі абавязковай рэгістрацыі ў Цэнтрархіве. Пачаўся працэс нацыяналізацыі, які прывёў да выключэння з ужытку самога паняцця «прыватны архіў». Комплекс дакументаў адной асобы, які прымаўся на захоўванне ў дзяржаўныя сховішчы, вызначаўся як «прыватны фонд», а пазней як «асабісты фонд».

Паняцце і склад Нацыянальнага архіўнага фонду (НАФ) Рэспублікі Беларусь упершыню былі вызначаны адпаведным законам у 1994 г. (другая рэдакцыя 1999 г.). НАФ вызначаўся як сукупнасць дакументаў, створаных у Рэспубліцы Беларусь у працэсе эканамічнай, грамадска-палітычнай, сацыяльна-культурнай і іншай дзей-

---

[48] Еліта України XVIII–XX ст.: Національний реєстр особових архівів. Анотований довідник і база даних [Электрон. рэсурс] / Архіви України – Київ, 2008. – Режим доступа: http://www.archives.gov.ua/BranchProgs/ELITA.php – Дата доступа: 10.10.2007.

насці дзяржавы на розных этапах яе развіцця, якія адлюстроўвалі матэрыяльнае і духоўнае жыццё беларускага народа. Да НАФ Рэспублікі Беларусь адносяцца таксама архіўныя дакументы, якія з'яўляюцца гістарычнай і культурнай спадчынай беларускага народа і захоўваюцца ў архівах, музеях і бібліятэках іншых дзяржаў, а таксама знаходзяцца ў прыватнай уласнасці грамадзян і ў адпаведнасці з міжнародным правам падлягаюць вяртанню ў Рэспубліку Беларусь.

Статус архіваў асабістага паходжання ў Беларусі істотна не змяніўся і пасля прыняцця новага архіўнага закона ў 2011 г. Такія архівы могуць належаць, як да дзяржаўнай, так і недзяржаўнай часткі НАФ. Часткі асабістага архіва, што знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, пры прыёме на дзяржаўнае захоўванне набываюць статус асабістага архіўнага фонду ці ўключаюцца ў склад калекцый, збораў і становяцца дзяржаўнай часткай НАФ Рэспублікі Беларусь.

Шэраг асабістых архіваў дзеячаў, якія спрыялі развіццю беларускай навукі і культуры, захоўваюцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь. Яны адлюстроўваюць культурнае і духоўнае жыццё беларускага народа і з'яўляюцца патэнцыйнай крыніцай папаўнення НАФ Рэспублікі Беларусь. Перадача дакументаў можа адбывацца як непасрэдна на падставе волевыяўлення ўладальніка, так і ў выглядзе копій. У адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі асабістыя архівы становяцца недзяржаўнай часткай НАФ пасля іх унясення ў спіс крыніц камплектавання дзяржаўнага архіва, ці дзяржаўнай часткай НАФ – пры перадачы дакументаў (копій дакументаў) на захоўванне ў дзяржаўны архіў.

Такім чынам, існаванне асабістых архіваў і забеспячэнне іх захаванасці ў большасці краін свету звязана з захоўваннем г. зв. прыватных архіваў (у т. л. эканамічных, літаратурных, навуковых, царкоўных архіваў, архіваў грамадскіх арганізацый і г. д.).

Доўгі час дакументы асабістага паходжання былі прадметам увагі, у першую чаргу, калекцыянераў, бібліятэказнаўцаў і музеязнаўцаў. Пачынаючы з другой паловы XX ст. цікавасць да дакументаў такога кшталту, пачаў актыўна праяўляць Міжнародны савет архіваў (МСА). З гэтага часу найбольш актуальнымі сталі пытанні прававога статусу і ролі дзяржавы ў іх захоўванні.

У краінах Заходняй Еўропы і ЗША назіраецца пэўнае супрацоўніцтва дзяржавы і ўладальнікаў асабістых (сямейных) архіваў, а самымі актуальнымі пытаннямі з'яўляюцца пытанні ўліку і заканадаўчага размежавання паўнамоцтваў паміж дзяржавай і ўладальнікамі архіваў, а таксама іх пераходу ва ўласнасць дзяржавы..

У краінах былога сацыялістычнага лагеру, у т. л. у Беларусі ў 90-я гг. XX ст. праблема прыватнай уласнасці на дакументы і неабходнасці захоўваць каштоўныя дакументальныя сведчанні асабістых архіваў была звязана з пытаннем заканадаўчага акрэслення паняцця недзяржаўнай часткі Нацыянальнага архіўнага фонду. Сёння механізм нарматыўнага рэгулявання перадачы дакументаў асабістага паходжання на дзяржаўнае захоўванне найбольш упарадкаваны.

# Гісторыя захоўвання асабістых архіваў на беларускіх землях з канца XVIII ст. і па сённяшні дзень

Гісторыя захоўвання асабістых архіваў на беларускіх землях распачынаецца з канца XVIII ст., калі дзейнасць асобы пачала набываць асаблівую каштоўнасць, а вынікі гэтай дзейнасці, якія адлюстроўваліся ў асабістых архівах, ператвараліся ў каштоўную крыніцу для правядзення навуковых даследаванняў.

Развіццё архіўнай справы на беларускіх землях з XVIII ст. прайшло некалькі этапаў – канец XVIII – пач. XX ст., 1918–1941, 1941–1945, 1945 –1991 і пасля 1991 г. Яны адпавядаюць агульнай перыядызацыі гісторыі Беларусі і з’яўляюцца храналагічнымі рамкамі даследавання.

Канец XVIII – пачатак XX ст. – перыяд, калі беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, уваходзілі ў склад Расійскай імперыі. У гэты час адбывалася фарміраванне комплексаў дакументаў асабістага паходжання (фамільных, сядзібных, сямейных, асабістых архіваў), якія пасля 1918 г. сталі часткай ДАФ БССР (СССР), заснаванага на прынцыпе цэнтралізацыі.

Захоўванне дакументаў асабістага паходжання на беларускіх землях у XX ст. адбывалася пад моцным уплывам тэарэтычных ідэй, заканадаўства і традыцый, якія фарміраваліся ў РСФСР і СССР. Структура архіўнага захоўвання фарміравалася на саюзным узроўні. Магчымасць правядзення самастойнай палітыкі ў гэтым накірунку ў Беларусі з’явілася толькі ў 1991 г.

## *Фарміраванне і захоўванне асабістых архіваў напрыканцы XVIII – пачатку XX ст.*

Канец XVIII – пачатак XX ст. – гэта перыяд калі беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай уваходзілі ў склад Расійскай імперыі і не з’яўляліся самастойнай дзяржавай, якая мае ўласную сістэму захоўвання архіўных дакументаў.

Да XVIII ст. дакументы вышэйшых службовых асоб і творцаў у Расіі захоўваліся, як правіла, у складзе архіваў устаноў, фамільных і сядзібных архіваў. У XVIII–XIX стст. некаторыя асабістыя архівы дзяржаўных дзеячаў паступілі ў Пецярбургскі дзяржаўны і Маскоўскі галоўны архівы Міністэрства замежных спраў, Ваеннанавуковы архіў ды інш., навукоўцаў – у архіў Акадэміі навук, дзея-

чаў літаратуры і мастацтва – у рукапісны аддзел Пецярбургскай публічнай бібліятэкі і Румянцаўскага музея.

Актыўным з'яўлялася таксама прыватнае калекцыя-ніраванне[49]. У апошняй чвэрці XIX – пачатку XX ст. значная колькасць асабістых архіваў трапіла ў спецыялізаваныя архівасховішчы, менавіта ў Палітэхнічны, Гістарычны і Рускі музеі, Трацякоўскую галерэю, Тэатральны музей А. Бахрушына і Пушкінскі дом. Таксама ствараліся мемарыяльныя музеі-архівы[50].

Амаль адначасана ў Варшаве паўсталі вялікія зборы друкаваных і рукапісных дакументаў, уключаючы і дакументы асабістага паходжання, заснаваныя прадстаўнікамі родаў Красінскіх, Замойскіх, Пшэздзецкіх. У бібліятэцы ардынацыі Замойскіх захоўваліся дакументы Міхала Баброўскага і Уладзіслава Трэнбіцкага, у бібліятэцы ардынацыі Красінскіх – копіі Статута ВКЛ з асабістага архіва Ігната Даніловіча, у бібліятэцы Пшэздзецкіх – дакументы мінскага ваяводы А. Хмары.

Зборам архіваў асабістага паходжання займаліся таксама грамадскія ўстановы, універсітэты і музеі Варшавы, Вільна, Кракава ды інш. Таварыства сяброў навук у Варшаве ў 1818 г. атрымала ў адпаведнасці з тастаментам вялікі архіў генерала Яна Генрыха Дамброўскага (1755–1818), які ўтрымліваў інфармацыю па гісторыі напалеонаўскіх войнаў, лісты і загады французскіх і расійскіх военачальнікаў[51].

У бібліятэку Віленскага ўніверсітэта на пачатку стагоддзя па ініцыятыве рэктара, астранома і матэматыка Яна Снядэцкага паступілі дакументы гісторыкаў Мацея Догеля (1715–1760) і Яна Альбертрандзі (1731–1808), Тадэвуша Чацкага (1765–1813), архіў матэматыка і астранома з Брэслау Іагана Шэйбеля[52]. У Ягелонскую бібліятэку ў Кракаве трапіла карэспандэнцыя Іяхіма Лялевеля, частка збораў Аляксандра Ельскага, уключаючы архіў мінскага ваяводы А. Хмары. На падставе збораў Эмерыка Гутэн-Чапскага, які ў 1894 г. перавёз сваю калекцыю ў Кракаў, быў арганізаваны Нацыянальны музей[53].

[49] Никифоров Е. И. Частное собирательство документальных материалов в России в первой половине XIX в. // Советские архивы. – 1972. – № 3. – С. 40–42.

[50] Кононов Ю. Ф. Организация хранения личных фондов в архивах СССР // Труды научной конференции по вопросам архивного дела в СССР. – Тт. 1–2. – М., 1966. – Т. 1. – С. 267–269.

[51] Wiśniewski J. Archiwalia w bibliotekach i muzeach. – Poznań, 2000. – S. 32–33.

[52] Brensztejn M. Biblioteka Uniwersitecka w Wilnie do roku 1832. – Wilno, 1925. – 160 s.

[53] Wiśniewski J. Archiwalia w bibliotekach i muzeach. – Poznań, 2000. – S. 43–46, 326.

Лёсы асобных архіваў многіх грамадскіх і палітычных дзеячаў складваліся па-рознаму. Не абыходзілася і без страт. У 1818 г., згодна з тастаментам, архіў Тадэвуша Касцюшкі (1746–1817) быў знішчаны ў прысутнасці натарыуса. У XIX ст. вялікі комплекс дакументаў аб яго дзейнасці быў нанова сабраны Польскім музеем у Раперсвілі (Швейцарыя), але большая частка загінула падчас Другой сусветнай вайны разам са зборамі Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве[54]. Рэшткі архіва зараз захоўваюцца ў некалькіх сховішчах.

Архіў караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага (1732–1798) (Архіў Кабінета караля, архіў Каралеўства Польскага, Archivum de Varsovie і г. д.) складаўся па большай частцы з афіцыйных дакументаў Рэчы Паспалітай, дакументаў каралеўскага двара, прыватнай карэспандэнцыі, калекцыі рукапісаў і можа быць толькі ўмоўна аднесены да архіва асабістага паходжання. Тым не менш у яго складзе захаваліся асабістыя архівы гісторыкаў Яна Альбертрандзі (1731–1808) і Адама Нарушэвіча (1733–1796). Пасля смерці Панятоўскага архіў перайшоў ва ўладанне яго брата Юзафа, потым апынуўся ў розных сховішчах. Частка была вывезена ў Пецярбург, частка захоўвалася ў Порыцкай бібліятэцы Чацкага (потым у музеі князёў Чартарыйскіх)[55].

Значным зборам, які ўтрымліваў дакументы дзеячаў літаратуры, з'яўляўся г. зв. «Архіў філаматаў», сабраны Ануфрыем Пятрашкевічам (1793–1863). Пасля яго смерці дакументы перайшлі да віленскіх сваякоў. У канцы 1950-х гг. частка архіва была перададзена спадкаемцамі ў аддзел рукапісаў Віленскага ўніверсітэта, другая – у бібліятэку Каталіцкага ўніверсітэта ў Любліне. Яшчэ адна трапіла ў Музей літаратуры імя Адама Міцкевіча ў Варшаве. Дакументы філаматаў захоўвалі Францішак Малеўскі (1800–1870) і Тамаш Зан (1796–1855). Гэтыя часткі захоўваюцца ў Музеі літаратуры імя Адама Міцкевіча ў Варшаве і ў Бібліятэцы імя Ўрублеўскіх Акадэміі навук Літвы ў Вільні. У архіве акрамя дакументаў па гісторыі Таварыства філаматаў, захаваліся творы і ліставанне Адама Міцкевіча, Яна Чачота, Тамаша Зана, Ануфрыя Петрашкевіча, Казіміра Пясецкага ды інш.[56]

Свае асаблівасці мелі архівы гісторыкаў-навукоўцаў, якія для напісання працы збіралі гістарычныя крыніцы (копіі і выпіскі з архіўных дакументаў, творы і г. д.). Менавіта гэтыя дакументы

---

[54] Jedynakiewicz K. Osobowość i życie codzienne Tadeusza Kościuszki. – Łódż, 1996. – S. 15.

[55] Bańkowski, P. Archiwum Stanisława Augusta. – Warszawa, 1958. – S. 5–10.

[56] Korespondencja filomatów. Wybor. – Wrocław-Warszawa-Kraków, 1999. – C. XXXI–XXXII.

з цягам часу станавіліся асноўнай і найбольш каштоўнай часткай асабістага архіва, да якой далучаліся творы і біяграфічныя дакументы дзеяча. Адной з першых такіх калекцый сталі г. зв. «тэкі Нарушэвіча», аўтара «Гісторыі польскага народа», якія складаліся з 230 тамоў копій дакументаў ад 1140 г. да другой паловы XVIII ст.

Зборам і захоўваннем гістарычных дакументаў займаліся прафесары Віленскага ўніверсітэта Ігнат Анацэвіч (1780–1845), Міхал Баброўскі (1784–1848), Ігнат Даніловіч (1787–1843), Іван Лабойка (1786–1861), Іосіф Ярашэвіч (1793–1860), якія стаялі ля вытокаў беларускага мовазнаўства, правазнаўства, археаграфіі, гістарыяграфіі. У іх асабістых архівах адклалася вялікая колькасць матэрыялаў па гісторыі Беларусі.

Пасля смерці сваіх уладальнікаў архівы часта станавіліся прадметам куплі-продажу і разыходзіліся па руках калекцыянераў. Напрыклад, частка дакументаў Ігната Анацэвіча (уключаючы дакументы з архіваў Пецярбурга, Кёнігсберга, Дзярэчына, Пулаў, ліставанне Станіслава Панятоўскага, папскія булы, дакументы па гісторыі дома Ягелонаў, дакументы аб дыпламатычных зносінах Расіі і Польшчы ў XVI–XVIII стст. ды інш.) была перададзена калекцыянеру К. Свіндзіцкаму. Іншая частка патрапіла да гродзенскага калекцыянера Слізня. Некаторыя дакументы апынуліся ў зборы Эдварда Рачынскага і Рамуальда Падбярэзскага.

Рукапісная спадчына Міхала Баброўскага разышлася па руках адразу пасля яго смерці (найбольшая колькасць – да бібліяфіла Ў. Трэнбіцкага). Неапублікаваныя рукапісы Ігната Даніловіча былі набытыя Яўстахам Тышкевічам для Віленскага музея старажытнасцей у 50-я гг. XIX ст.[57]

Што тычыцца дакументаў заснавальніка навуковай археалогіі, этнографа і славіста Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага (1784–1825), то яны перайшлі да М. Палявога, а потым да М. Пагодзіна, якія займаліся калекцыяніраваннем. Значная іх колькасць трапіла ў рукі польскіх, украінскіх і расійскіх калекцыянераў[58].

Асабісты архіў члена Румянцаўскага гуртка гісторыка і археографа Івана Грыгаровіча характарызуецца наяўнасцю вялікай колькасці капійных дакументаў з архіваў Полацка, Магілёва, Ві-

[57] Карев Д. В. Белорусская и украинская историография конца XVIII – начала 1920-х гг. XX в., в процессе генезиса и развития национального исторического сознания белорусов и украинцев. Вильнюс, 2007. С. 94–95; Николаев С. И. О колекции Игнатия Онацевича // Духовная культура славянских народов. Литература. Фольклор. История. Сб. статей к IX международному съезду славистов. – Ленинград, 1983. – С. 197–208.

[58] Maślanka J. Zorian Dołenga-Chodakowski jego mejsce w kulturze Polskiej i wpływ na polskie piśmennictwo romantyczne. – Wrocław-Warszawa-Kraków, 1965. – S. 143–145.

цебска, Оршы, якія рыхтаваліся для публікацыі. Пасля яго смерці дакументы захоўваліся ў сына Мікалая Грыгаровіча, а ў 1872 г. былі перададзены ў Румянцаўскі музей (зараз Навукова-даследчыцкі аддзел рукапісаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі). Вялікая частка архіва апынулася ў прыватных зборах краснаярскага бібліяфіла Г.В. Юдзіна[59].

У другой палове XIX ст. пачалося стварэнне сховішчаў, якія значна садзейнічалі захоўванню дакументаў выдатных дзеячаў краю. Як правіла, гэта была прыватная ініцыятыва, якая гуртавала вакол сябе прадстаўнікоў мясцовай інтэлектуальнай эліты. Так, у 1856 г. у Вільні былі адчынены Музей старажытнасцяў і Віленская археалагічная камісія пад кіраўніцтвам Яўстаха Тышкевіча. Яе супрацоўнікамі з'яўляліся Тэадор Нарбут, Юзаф Крашэўскі, Мікалай Маліноўскі, Ігнат Ходзька, Платон Кукальнік, Адам Кіркор, Іосіф Ярашэвіч ды інш.

У Віленскі музей у якасці дабраахвотных ахвяраванняў былі перададзены ад А. Важынскага некалькі аўтографаў вядомых у краі асоб, ад А. Вейнерта – уласны твор у 4 тамах пад назвай «Starożytności Warszawskie», ад А. Кастравіцкага – аўтограф Францішка Карпінскага, ад Тэадора Нарбута – «Гісторыя Літвы» у 9 тамах (выданне ў багатым пераплёце), а таксама чарнавы рукапіс тома 4 і чарніліца, якая ўжывалася падчас напісання твора. У 1866 г. пры разборы дакументаў Віленскага музея старажытнасцей і стварэнні Віленскай публічнай бібліятэкі П. Гільтэбрандтам быў знойдзены архіў Сапегаў з Дзярэчына і ліставанне мясцовых магнатаў XVIII ст.[60]

У другой палове XIX – пачатку XX ст. працавалі Віленская археаграфічная камісія, Віленскі і Віцебскі цэнтральныя архівы старажытных актавых кніг, Віцебская вучоная архіўная камісія, што займаліся ў асноўным захаваннем і вывучэннем дакументаў устаноў, але часам і прыватных (фамільных) архіваў і збораў[61].

---

[59] Іванова В. Дакументальная спадчына протаіерэя Іаана Грыгаровіча // Праваслаўе. – 2004. – № 12–13. – С. 78–85; Іванова В. Лісты з асабістага архіва Івана Грыгаровіча // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 8. – Мінск, 2007. – С. 222.

[60] Гильтебрандт П. Рукописное отделение Виленской публичной библиотеки. – Вып. 1. Церковно-славянские рукописи. Русские пергамены. – Вильна, 1871. – С. VII–XXIV.

[61] Так, напрыклад, VII I VIII тт. «Археографического сборника документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси», што выдаваліся Віленскай археаграфічнай камісіяй былі складзены з дакументаў Нясвіжскага і Кейданскага архіваў Радзівілаў. У прыватным архіве Е. Тышкевіча захоўваліся дакументы гродзенскіх прысутных местаў, якія былі передадзены ў Віленскі цэнтральны архіў старажытных актавых кніг // Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 596. – Воп. 1. – Адз. зах. 669.

У 1898 г. у Вільні быў створаны г. зв. «Мураўёўскі музей», мэтай якога была канцэнтрацыя дакументаў аб дзейнасці графа Міхаіла Мураўёва ў г. зв. «Паўночна-Заходнім краі» у 1863–1865 гг. Пры музеі існаваў архіў, які камплектаваўся дакументамі па гісторыі паўстання, дзе захавалася каля 47,5 тыс. спраў. Гэта былі дакументы ўстаноў, створаных у сувязі з паўстаннем, часткі матэрыялаў палітычнага аддзялення Канцылярыі генерал-губернатара, а таксама асабістыя дакументы і рэчы М. Мураўёва, дакументы ўдзельнікаў паўстання.

Мураўёўскі музей стаўся адным з першых прыкладаў выкарыстання постаці дзеяча і сведчанняў аб яго дзейнасці (дакументаў, прадметаў) у ідэалагічных мэтах[62].

Захаваннем гістарычных памятак у другой палове XIX ст. на беларускіх землях актыўна займаліся збіральнікі, якія, хоць і не мелі значных матэрыяльных сродкаў, але былі перакананы ў неабходнасці калекцыяніравання дзеля захавання і вывучэння нацыянальнай культуры.

Менавіта Аляксандр Ельскі і Міхал Федароўскі ўпершыню паставілі пытанне аб неабходнасці захавання дакументальнай спадчыны асобы і сям'і. Ствараліся спісы наяўных і страчаных архіўных, бібліятэчных, мастацкіх збораў[63]. Канстатуючы факты знішчэння цэлага шэрагу фамільных архіваў пасля 1863 г. Міхал Федароўскі лічыў галоўнай прычынай тое, што *«злачынцы-ўнукі не перанялі ад сваіх дзядоў іх паважлівага стаўлення да старажытных дакументаў»*[64].

Найбольш вядомай на беларускіх землях у сярэдзіне XIX ст. была калекцыя Аляксандра Ельскага (1834–1916) у Замосці, якая налічвала больш за 20 тыс. аўтографаў знакамітых асоб з усёй Еўропы. Тут захоўваліся часткі асабістых архіваў Адама Міцкевіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Адама Кіркора (каля 5 тыс. лістоў),

---

62 Шумейка М. Як захоўвалі дакументальную спадчыну Мураўёва-вешальніка // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – № 1. – С. 8–11; Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 249. – Воп. 5. – Адз. зах. 681; Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 439. – Воп. 1. – Адз. зах. 33, 74.

63 Federowski M. Materialy do historii życia umyslowego na Litwie – niszczenie dzieł sztuki i zabytków kultyralnych // Gabinet Rękopisów. Biblioteka Uniwersitecka w Warszawie. – № 448/2; Radziszewski F. Wiadomość historyko-statystyczna o znakomitych bibliotekach i archiwach publicznych i przywatnych, tak kiedyś byłych jako i obecnie istniejących w krajach dawną Polskę skladajacych, a mianowicie: w Królewstwie Polskiem, Galicyi, W. Ks. Poznańskim i Zachodnich guberniach Państwa Rossyjskiego. – Kraków: W drukarni Wł. L. Anczyca i Sp., 1875. – 124 s.

64 Federowski M. O lekkomyślem niszczeniu starych dokymentów // Księga pamiąkowa na uczenie setnej rocznicy urodzin Adama Mickiewicza 1798–1898. – Tt. 1–2. – Warszawa-Peterburg-Kraków, 1899. – T. 2. – S. 16.

Станіслава Манюшкі, братоў Францішка і Антонія Смуглевічаў, фамільныя архівы Прозараў, Ельскіх, Заранкаў, Хмараў ды інш.

Акрамя таго Аляксандр Ельскі збіраў дакументы філаматаў, зрабіў апісанне асабістага архіва Казіміра Пясецкага, шкадаваў, што не здолеў здабыць дзённік Дз. Манюшкі, які мусіў быць *«каштоўнай крыніцай [гісторыі] пераважна мясцовасці, дзе жыў і дзейнічаў Манюшка, яшчэ напалеонаўскага перыяду»*[65]. Па сведчанні калегі і біёграфа А. Ельскага Ю. Талькі-Грынцэвіча: *«У паперах, што засталіся пасля Ельскага, ёсць сорак папак, дзе змяшчаюцца яго нататкі, манаграфіі, запіскі і карэспандэнцыі аб людзях і фактах. З цягам часу яны будуць мець вялікую каштоўнасць для гісторыі», – па сутнасці гэта апісанне асабістага архіва самога калекцыянера*[66].

Для сваіх збораў Аляксандр Ельскі распрацаваў пэўную сістэматызацыю. Таксама праводзілася іх навукова-тэхнічная апрацоўка. Фамільныя архівы, уключаючы асабіста-сямейныя, публічныя і маёнткава-гаспадарчыя дакументы захоўваліся ў фасцыкулах і звязках, а таксама мелі інвентары ці сумарыушы.

Калекцыя была сістэматызаваная па тэматычна-асабоваму прынцыпу і ўключала больш за 100 тэматычных раздзелаў. Сярод іх варта назваць наступныя: «Літоўскія ваяводы і кашталяны», «Польская філасофія», «Рускія саноўнікі і духоўныя асобы», «Царская папка», «Французская папка», «Падзеі 1861–1863 гг.» ды інш. У раздзелах дакументы былі згрупіраваны па папках, на кожнай з якіх пазначалася прозвішча і імя асобы, сфера яго дзейнасці, а таксама змест і дата дакумента. Прозвішчы падкрэсліваліся чырвоным алоўкам, ставілася пячатка *«Biblioteka i museum Aleksandra Jelskiego w Zamościu»*[67].

У зборах этнографа Міхала Федароўскага (1853–1923) было сабрана шмат дакументаў з расійскіх устаноў, ліставанне В. Маеўскага, З. Глогера, фамільныя (сядзібныя) архівы Віленскага, Навагародскага, Полацкага ды інш. паветаў, сем'яў Коханаў, Краснікаў, Бутаўтаў, Эйсмантаў, Шчытоў-Забельскіх ды інш. Даволі вялікай была частка асабістых папер Міхала Федароўскага, менавіта зборы

---

[65] Ельскі А. Выбранае. – Мінск, 2004. – С. 135, 147.

[66] Кісялеў Г. Ад Чачота да Багушэвіча: праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. – Мінск, 2003. – С. 79.

[67] Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. – Ф. 1135. – Воп. 21. – Адз. зах. 64. – Л. 383–385; Дзяржаўны архіў старажытных актаў (Варшава). – Ф. 376. – 144 адз. зах. за 1560–1915 гг.

фальклору, падрыхтоўчыя матэрыялы да выдання «Ludu Białoruskiego», карэспандэнцыя, біяграфічныя матэрыялы[68].

Шмат фамільных і асабістых архіваў, іх частак захоўваліся ў віленскіх калекцыянераў Л. Марашэўскага (частка Дзярэчынскага архіва Сапегаў, архівы Ордаў, Стравінскіх, Вайніловічаў, Палубінскіх), А. Заштаўта (архівы Пацаў, Радзівілаў, Сапегаў), Л. Уземблы (матэрыялы філаматаў і філарэтаў, карэспандэнцыя прафесараў Віленскага ўніверсітэта і іншых прадстаўнікоў Віленскай інтэлігенцыі), Т. Урублеўскага (часткі калекцый Г. Татура, В. Федаровіча).

Дзякуючы калекцыянерам захаваліся дакументы многіх пісьменнікаў: у Рамуальда Зямкевіча – рукапісы Аляксандра Рыпінскага, Арцёма Вярыгі-Дарэўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, у Вацлава Федаровіча – рукапісы Яна Баршчэўскага, у Міхаіла Піятуховіча – рукапісы А. Рыпінскага[69].

Адным з найбольш вядомых віленскіх калекцыянераў XIX ст. быў ваенны юрыст і літаратар Аляксандр Жыркевіч (1857–1927), які яшчэ гімназістам пачаў збіраць рукапісы і прадметы даўніны. Ён перадаваў іх у музеі, архівы і бібліятэкі Гродна, Коўна, Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга. Ягелонскай бібліятэцы ў Кракаве ён падараваў аўтографы Тадэвуша Касцюшкі і Адама Міцкевіча, Віленскай публічная бібліятэцы – рукапісы Стэфана Баторыя, Станіслава Аўгуста Панятоўскага, Кацярыны II, Адама Кіркора, Юзафа Крашэўскага і Людвіка Кандратовіча[70].

Ён стаў адным з ініцыятараў і арганізатараў стварэння музея Міхаіла Мураўёва ў Вільні і Ваеннага музея пры Віленскім ваенным сходзе. А. Жыркевіч даследаваў гісторыю дакументальных архіўных страт[71], выказваў клопат аб захоўванні гістарычных дакументаў: *«...Вы знаете каково воевать за старую бумагу! Но тяжело и воевать, когда видишь равнодушие»*[72].

Яго вялікі асабісты архіў, што зараз захоўваецца ў музеі Льва Талстога ў Маскве, утрымлівае цікавыя крыніцы па гісторыі Беларусі.

---

[68] Спадчына Федароўскага // Савецкая Беларусь. – № 156. – 1923. – 11 ліп. – С. 6.

[69] Buika M. Wileńscy kolekcionerzy zabytków i pamiątek historycznych na przełomie XIX–XX wieku // Zeszyty naukowe Uniwersitetu Jagiełońskiego. Prace historyczne. – Z. 134. – Kraków, 2007. – S. 81–90; Кісялеў Г. Ад Чачота да Багушэвіча: праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. – Мінск, 2003. – С. 44–82.

[70] Аддзел рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта. – Ф. 48. – Адз. зах. 1–306 за 1303–1964.

[71] Жиркевич А. В. Свежо предание, а верится с трудом. – СПб., 1902. – 45 с. Жиркевич А.В. Смоленские архивы в 1812 году // Смоленская старина. – Т. 1. – 1909. – С. 345–377.

[72] Аддзел рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта. – Ф. 6. – Адз. зах. 26. – Л. 57.

На пачатку XX ст. зборам дакументаў асабістага паходжання заняліся таксама культурна-грамадскія арганізацыі. Так, Варшаўскае таварыства сяброў навук, якое было ўтворана яшчэ ў пачатку XIX ст., прыняло на захоўванне дакументы кАлекцыянераў Міхала Федароўскага і Зыгмунта Глогера.

У 1907 г. па ініцыятыве прафесара А. Парчэўскага ўзнікла Таварыства сяброў навук у Вільні, якое праіснавала да 1922 г. Сюды перадалі свае зборы Міхал Брэнштэйн, Аляксандр Ельскі, Яўстах і Канстанцін Тышкевічы, С. Кастравіцкая. Тут захоўвалася ліставанне Адама Кіркора, Тадэвуша Касцюшкі, Яна Карловіча, дакументы Тэадора Нарбута, Тамаша Зана, І. і К. Кантрымаў ды інш.[73]

Калекцыянеры клапаціліся аб лёсе збораў пасля сваёй смерці ці на выпадак грамадскіх і гістарычных трансфармацый. Так, напрыклад, Аляксандр Ельскі перадаў вялікую карэспандэнцыю Адама Кіркора (больш 5 тыс. лістоў) у Таварыства сяброў навук у Вільні пры ўмове, што пры спыненні ці змяненні характару дзейнасці Таварыства, дакументы павінны быць вернуты ахвярадаўцу ці яго спадчыннікам[74].

Вельмі клапатліва ставіўся да свайго асабістага архіва загадчык Віленскага цэнтральнага архіва старажытных актавых кніг Іван Спрогіс (1833–1918). Яго архіў утрымліваў багатае ліставанне, дзённікі, якія адлюстроўвалі не толькі інтэлектуальнае, духоўнае і культурнае жыццё г. зв. «рускай Вільны», але і стасункі з вядомымі навукоўцамі таго часу ў кантэксце гістарычных і ідэалагічных узаемадзеянняў.

Перад самай вайной у лістах да свайго сябра Аляксандра Жыркевіча Іван Спрогіс ставіў пытанне аб лёсе свайго архіва, мяркуючы яшчэ пры жыцці перадаць яго ў Віленскую публічную бібліятэку. Гэта выклікала даволі рэзкую рэакцыю А. Жыркевіча: *«Ваше распоряжение при вашей жизни явно несообразно с литературными обычаями... Только когда пройдет 25–50 лет после вашей смерти можно разрешить ими пользоваться, а так при жизни Вы наживете себе врагов... Убедительно прошу Вас во всяком случае вернуть мне мои письма, не позволяя рыться в них посторонним... Я ничего не буду иметь против, если вы*

[73] Brensztejn M. Biblioteka Towarzystwa przyjaciól nauk w Wilnie. 1907–1931. – Wilno: Zakł. graf. „Znicz», 1932. – С. 13–15; Chwalewik E. Zbiory Polskie archiwa, biblioteki, gabinety, galerje, muzea i inne zbiory pamiątek przesłości w ojczyżnie i na obczyznie. W porządku alfabetycznym wedlug miejscowości ułożone. – Warszawa-Kraków: Wyd-wo J. Mortkowicza, 1926. – T. 1. – S. 472–473.

[74] Кісялёў Г. Замосце: скарбы Аляксандра Ельскага. Генрых Ельскі пра музей свайго дзеда // Шляхам гадоў: гіст.-літ. зб. / уклад. Г. Кісялёў. – Мінск, 1990. – С. 303.

*соберете и при мне ўничтожите, т.е. сожжете, дав мне их предварительно пересмотреть и перечитать»*[75].

У выніку Іван Спрогіс, каб захаваць канфідэнцыяльнасць перадаў дзевяць сшыткаў сваіх дзённікаў на захоўванне А. Жыркевічу з умовай перадаць іх пасля сваёй смерці ў Віленскую публічную бібліятэку. Трэба меркаваць, што сам архіў быў перададзены ў бібліятэку да 1915 г., калі бібліятэка была вывезена ў сувязі з наступленнем нямецкіх войскаў. Пазней яе зборы папоўнілі фонд Бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта[76]. Аляксандр Жыркевіч не выканаў запавет Івана Спрогіса адносна дзённікаў, і яны трапілі на захоўванне ў Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі[77].

Аднак нават клопат уладальнікаў не заўсёды выратоўваў архівы ад знішчэння. Так, архіў Аляксандра Ельскага і вялікая колькасць фамільных архіваў Чапскіх, Ваньковічаў, Вайніловічаў, Мілашаў ды інш. былі знішчаны падчас Першай сусветнай вайны і рэвалюцыі.

Фрагменты захаваўшыхся асабістых архіваў таксама даюць магчымасць меркаваць аб пэўных тэндэнцыях у захоўванні дакументаў «простых» людзей, што прадстаўляюць значную цікавасць для ўзнаўлення гісторыі эпохі. Так, у аддзеле рукапісаў Бібліятэкі імя Асалінскіх у Вроцлаве ўтрымліваюцца «Думкі» мінчаніна, беларускага і польскага паэта Ігнацiя Легатовіча, успаміны жыхара Віцебска Максіміліяна Маркса, успаміны пра домік лідскіх піяраў Язафата Вайшвілы, успаміны жыхара Слуцка Станіслава Шантыра, карэспандэнцыя і асабістыя дакументы польскага пісьменніка і мемуарыста Эдуарда Паўловіча з Навагрудчыны, успаміны Г. Велявейскага з Любчы.

У Курніцкай бібліятэцы захоўваецца карэспандэнцыя жыхара Случчыны, мастака і рэвалюцыянера Браніслава Залескага[78], у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (НГАБ) – ліставанне мінскай настаўніцы Яўгеніі Іоэльсан, у Навукова-даследчым ад-

---

[75] Аддзел рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта. – Ф. 6. – Адз. зах. 26. – Л. 137.

[76] Аддзел рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта. – Ф. 6. – 136 адз. зах.

[77] Іванова В. Асабістыя архівы ў Латвійскіх сховішчах як крыніца па гісторыі Беларусі // Сучасныя праблемы дакументазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі: матэрыялы навук.-практ. канф., прысвеч. 85-годдзю Дзярж. архіўн. службы і 80-годдзю Нац. архіва Рэсп. Беларусь. (Мінск, 12 красавіка 2007) / склад. В. С. Пазднякоў, П. П. Журкевіч. – Мінск, 2007. – С. 162–168; Іванова В. С. З асабістага архіва І. Я. Спрогіса (лісты Дз. І. Даўгялы да І. Я. Спрогіса ў Бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта) // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 11. / Гал. рэд. Э. М. Савіцкі [ды інш.] – Мінск, 2010. – С. 177–190.

[78] Выяўленне, сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў замежных краінах. Вяртанне-6 / пад. рэд. А. Мальдзіса. – Мінск, 1999. – С. 150–158.

дзеле кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НДАК НББ) – дзённік мінскага архіепіскапа Міхаіла Галубовіча. У статыстычных апісаннях беларускіх губерній, што праводзіліся ў XIX ст., утрымліваецца інфармацыя аб захоўванні асабістага архіва Іосіфа Ярашэвіча ў яго ўдавы ў Бельскім павеце, дакументаў айца Гарбацэвіча са Слуцкага павета, што складаліся з ліставання па гісторыі ўніі ў 1596 г., дакументаў дырэктара Беластоцкай гімназіі Кулакоўскага ды інш.[79]

Такім чынам, у XVIII – пач. XX ст. дакументы асоб, якія ўплывалі на грамадска-палітычныя працэсы на беларускіх землях, а таксама спрыялі развіццю беларускай навукі, літаратуры і мастацтва, захоўваюцца ў складзе архіваў дзяржаўных і грамадскіх устаноў Расійскай імперыі і Каралеўства Польскага, прыватных архівах і калекцыях. Найбольш вядомымі калекцыянерамі-захавальнікамі дакументаў асабістага паходжання з'яўляліся М. Румянцаў, М. Пагодзін, У. Транбіцкі, А. Жыркевіч, А. Ельскі, І. Каладзеў, Г. Юдзін ды інш. Дакументы асабістага паходжання ўтрымліваліся таксама ў фамільных і сядзібных архівах, публічных і прыватных зборах (Віленская публічная бібліятэка, Мураўёўскі музей, Бібліятэкі ардынацый Замойскіх, Красінскіх, Бібліятэцы Пшэздзецкіх), грамадска-культурных установах (Таварыствы аматараў навук у Вільні і Варшаве).

Працэс фарміравання асабістых архіваў яскрава прасочваецца на прыкладзе архіваў грамадска-палітычных дзеячаў, літаратараў і навукоўцаў, і, у першую чаргу, гісторыкаў. Асаблівасцю апошніх, з'яўляюцца зборы гістарычных крыніц ранейшага паходжання. У другой палове XIX ст. на беларускіх землях пачалі фарміравацца прыватныя калекцыі Аляксандра Ельскага, Міхала Федароўскага, братоў Тышкевічаў, Аляксандра Жыркевіча ды інш., уладальнікі якіх усвядомілі неабходнасць захавання памятак па гісторыі краю ў т. л. і асабістых архіваў дзеячаў літаратуры, навукі і культуры. Калекцыяніраванне стала адной з асноўных формаў пошуку, сістэматызацыі, захоўвання і выкарыстання асабістых архіваў у гэты перыяд.

Большасць асабістых архіваў, што фарміраваліся ў канцы XVIII – пач. XX ст., не захавалася ў сваёй цэласнасці. Іх часткі страчаныя ці раскіданыя па сховішчах Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, а вывучэнне вымагае рэканструкцыі іх гісторыі і складу, а таксама збору звестак аб сучасных месцах захоўвання.

---

[79] Гильтебрандт П. Рукописное отделение Виленской публичной библиотеки. Вып. 1. Церковно-славянские рукописи. Русские пергамены. – Вильна, 1871. – С. VII–XXIV.

У Беларусі сёння знаходзяцца фрагменты асабістых архіваў гісторыка і археографа Івана Грыгаровіча, паэта Адама Гурыновіча, пісьменніка Каруся Каганца, частка калекцыі Аляксандра Ельскага і сямейнага архіва Багдановічаў (БДАМЛМ), архівы бабруйскага купца М. Кагановіча, настаўніцы Я. Іоэльсон (НГАБ), а таксама асобныя дакументы ў складзе калекцый і фамільных фондаў.

## *Дакументы асабістага паходжання ў складзе Дзяржаўнага архіўнага фонду СССР*

Пасля ўсталявання савецкай улады на тэрыторыі былой Расійскай імперыі востра паўстала пытанне аб стварэнні новай сістэмы захоўвання архіўных дакументаў, як былых афіцыйных устаноў, так і прыватных архіваў. Паводле дэкрэту СНК РСФСР «Аб рэарганізацыі і цэнтралізацыі архіўнай справы ў РСФСР» (1918) з дакументаў былых імперскіх устаноў на аснове прынцыпу цэнтралізацыі ствараўся Адзіны дзяржаўны архіўны фонд (АДАФ).

Прыняццю дакумента папярэднічала шырокая дыскусія ў асяродку спецыялістаў, дзе абмяркоўваліся два асноўныя падыходы да арганізацыі архіўнай справы ў краіне: дэцэнтралізацыі і цэнтралізацыі. Дэцэнтралізацыя захоўвання архіўных дакументаў тлумачылася неабходнасцю выкарыстання дакументаў у бягучай дзейнасці. Аднак яна не знайшла падтрымкі. Склад АДАФ паступова павялічваўся з прыняццем новых заканадаўчых актаў. Ён пачаў уключаць дакументы мясцовых органаў, былых вайсковых фарміраванняў, савецкіх устаноў і грамадскіх аб'яднанняў.

У 1919 г. была зроблена спроба пачаць збор дакументаў асабістага паходжання (асабістых, сямейных, сядзібных архіваў) і ўключыць іх у склад АДАФ. Пры Галоўархіве РСФСР было створана сховішча прыватных архіваў. Нацыяналізацыя асабістых архіваў творчай эліты адбылася з прыняццем 29 чэрвеня 1919 дэкрэта «Аб адмене прыватнай уласнасці на архівы памерлых рускіх пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў і вучоных, што захоўваюцца ў бібліятэках і музеях»[80].

Дэкрэты, прынятыя ў 1923 г., прадугледжвалі абавязковую перадачу ў архівасховішчы Цэнтрархіва дакументаў сям'і Раманавых, а таксама г. зв. «дзеячаў контррэвалюцыі» і эмігрантаў.

Аб неабходнасці ашчаднага стаўлення да дакументаў асабістага паходжання было заяўлена ў вядомай праграмнай брашуры

---

[80] Савин В. А. Хранить, нельзя уничтожить. Формирование и организация ГАФ РСФСР–СССР. 1918–1950-е. – М.: РГГУ, 2000. – С. 14–16.

Ў. Бонч-Бруевіча «Захоўвайце архівы» (1920). Між іншым у ёй адзначалася неабходнасць *«старанна захоўваць архівы прыватных асоб, асабліва архівы, якія знаходзяцца ў маёнтках былых землеўладальнікаў, таму што шмат хто з іх займаўся зборам матэрыялаў па розных пытаннях, а таксама ліставання з выдатнымі дзеячамі свайго часу»*[81].

Шэраг заканадаўчых актаў, прынятых у першыя гады савецкай улады, па ацэнках сучасных даследчыкаў спынілі тэндэнцыю рэвалюцыйнага знішчэння, але адначасна яны ж стварылі базу для прымусовай нацыяналізацыі дакументаў у жорстка цэнтралізаванай сістэме архіўнага захоўвання[82].

Для паляпшэння збору і ўліку дакументаў АДАФ быў падзелены на секцыі. У 1921 г. IX секцыяй АДАФ стала Гісторыка-літаратурная (пазней у складзе Гісторыка-культурнай), якая збірала дакументы па гісторыі рускай літаратуры.

У складзе апарата Галоўархіва была створана інспекцыя, у задачы якой уваходзіла выяўленне, улік і канцэнтрацыя дакументаў асабістага паходжання. У студзені 1922 г. упраўленне Цэнтрархіва накіравала ва ўсе губернскія архівы спецыяльны цыркуляр, які прапаноўваў даць дакладныя звесткі аб архівах, што раней належалі палітычным арганізацыям і асобам.

Па прычыне дрэннага ўліку на месцах большасць адказаў было адмоўнымі. Тым не менш Цэнтрархіў інтэнсіўна папаўняўся матэрыяламі. Быў складзены пералік з 700 вядомых у дарэвалюцыйнай Расіі сядзібных архіваў і з дадзенымі аб публікацыі дакументаў[83]. У 1920-я гг. рукапісныя аддзелы Пецярбургскай публічнай бібліятэкі, Румянцаўскага музея, Пушкінскага дома павялічыліся амаль удвая за кошт дакументаў асабістага паходжання. Была створана вялікая колькасць музеяў, якія захоўвалі асабістыя архівы дзеячаў рэвалюцыйнага руху, членаў камуністычнай партыі ды інш.

У гэты час змяняліся ўяўленні пра архіў як сховішча выключна афіцыйных папераў. Таксама бібліятэкі і музеі перасталі ўспрымацца толькі як сховішча дакументаў асабістага паходжання. На канферэнцыі архівістаў 1921 г. па дакладу І. Л. Маякоўскага

---

[81] Бонч-Бруевич В. Сохраняйте архивы. – М.: Гос. изд-во, 1920. – С. 10.

[82] Горяева Т. М. Проблема собирания документов личного происхождения: как мы её понимаем сегодня // Отечественные архивы.– 2004. – № 1. – С. 35.

[83] Сырченко Л. Г. К истории комплектования государственных архивов СССР документальными материалами деятелей литературы (1918–1941) // Труды Московского государственного историко-архивного института / ред. В. В. Максаков [и др.]. – Т. 15: Вопросы архивоведения и археографии. – М., 1962.– С. 358; Максаков В. В. История и организация архивного дела в СССР (1917–1941) / предисл. Ю. Ф. Кононова. – М.: Наука, 1969. – С. 72.

было вырашана стварыць міжведамасны савет з прадстаўнікоў Галоўархіва, Галоўмузея і Аддзела бібліятэк для распрацоўкі інструкцыі для работы і размежавання функцый дадзеных устаноў.

I і II з'езды архівістаў РСФСР (1926, 1929) прынялі рашэнні аб спыненні працы музеяў і бібліятэк па збіранні дакументаў асабістага паходжання і перадачы апошніх у дзяржаўныя архівы. Была адзначана выключная гістарычная роля музеяў і бібліятэк у справе захоўвання дакументаў у дарэвалюцыйны перыяд, падчас рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Аднак адзначалася, што *«архівы, бібліятэкі і музеі павінны ратаваць і збіраць усе гістарычныя каштоўнасці..., але не змешваць іх ратаванне і збіранне з размеркаваннем, якое павінна праводзіцца на падставе функцыянальнага размежавання»*[84].

У 1925 г. калегія Цэнтрархіва РСФСР прыняла Палажэнне аб арганізацыі АДАФ, у адпаведнасці з якім дакументы асабістага паходжання захоўваліся ў Архіве народнай гаспадаркі, культуры і быту, Аддзеле прыватных фондаў Сховішча старажытных актаў, Архіве рэвалюцыі і знешняй палітыкі ды інш. У 1926 г. СНК РСФСР прыняў пастанову аб здачы ў Цэнтрархіў усіх былых прыватных архіваў, замацаваўшы яго права на захоўванне дакументаў такога кшталту, якое аспрэчвалася шэрагам устаноў. У 1927 г. было заключана пагадненне паміж Галоўархівам і Галоўнавукай аб перадачы дакументаў асабістага паходжання ў архівы.

Палажэнне аб архіўным упраўленні РСФСР (1929) упершыню комплексна зафіксавала склад ДАФ рэспублікі, у які ўваходзілі таксама дакументы царскай сям'і, дзеячаў «контррэвалюцыі» і эміграцыі, былыя сядзібныя архівы, безгаспадарныя дакументы асабістага паходжання, а таксама рукапісы, забароненыя для публікацыі. Палажэнне зафіксавала абавязковую перадачу дакументаў асабістага паходжання з бібліятэк і музеяў у дзяржаўныя архівы (акрамя закаталагізаваных).

У канцы 1920-х гг. стала актуальным пытанне аб захоўванні асабістых архіваў дзеячаў літаратуры або г. зв. літаратурных архіваў. На II з'едзе архівістаў (1929) у сувязі з дакладам У. В. Максакава было прынята рашэнне аб стварэнні ў Маскве Архіва гісторыі літаратуры. У гэтым жа годзе калегія Цэнтрархіва зацвердзіла правілы прыёму на захоўванне архіўных матэрыялаў ад прыватных асоб. У канцы 1930-х гг. вялікая колькасць фондаў дзеячаў літаратуры захоўвалася ў Дзяржаўным архіве феадальна-прыгон-

[84] Маяковский И. Архив, библиотека, музей. // Архивное дело. – Вып. VII. – 1926. – С. 21.

ніцкай эпохі, аднак асноўная праца ў гэтым накірунку працягвалася ў бібліятэках і музеях.

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Ў. Бонч-Бруевіч прааналізаваў сітуацыю з захоўваннем літаратурных архіваў і прапанаваў стварыць на базе музея адзінае сховішча дакументаў такога кшталту. Праўда, таксама існуе меркаванне, што пераўтварэнне Дзяржлітмузея ў Цэнтральны дзяржаўны літаратурны архіў у 1941 г. было здейснена дзеля адстаўкі Бонч-Бруевіча, які актыўна выступаў супраць знішчэння архіваў арыштаваных літаратараў[85].

У справе захоўвання асабістых архіваў дзеячаў літаратуры СССР асаблівае значэнне мела ўзнікненне ў другой палове 1930-х гг. г. зв. «адзіных архіваў» (ці мемарыяльных музеяў) Аляксандра Пушкіна, Льва Талстога, Аляксея Горкага ў Расіі, Тараса Шаўчэнкі і Івана Франко ва Ўкраіне[86].

У 1930 г. быў створаны Архіў АН СССР, што захоўваў асабістыя архівы акадэмікаў і навукоўцаў, якія працавалі ў сістэме навукова-даследчых устаноў АН СССР. У Палажэнні аб архіве быў вызначаны парадак перадачы на дзяржаўнае захоўванне, правы бакоў, склад дакументаў ды інш. Першае афіцыйнае рашэнне аб захоўванні асабістых архіваў акадэмікаў было прынята 22 мая 1926 г. Прэзідыумам АН СССР[87] .

У 1941 г. у Палажэнні аб ДАФ СССР было замацавана права дзяржаўных архіваў на камплектаванне дакументамі асабістага паходжання грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў СССР, выдатных прадстаўнікоў навукі, літаратуры, мастацтва, працаўнікоў гаспадаркі, Герояў Сацыялістычнай працы, прадстаўнікоў асобных дваранскіх фамілій.

Вызначаліся асноўныя катэгорыі дакументаў, якія падлягалі дзяржаўнаму захоўванню. Да іх належалі афіцыйнае і прыватнае ліставанне, рукапісы твораў, мемуары і дзённікі, кінафотафонадакументы. Дакументы, сабраныя рукапіснымі аддзеламі бібліятэк

---

[85] Хорходина Т. И. История и архивы – М.: РГГУ, 1994. – С. 258.

[86] Бонч-Бруевич В. Д. Об архивных фондах литературных деятелей // Архивное дело.– 1939.– № 2.– С. 16; Межова К. Г. Деятельность В. Д. Бонч-Бруевича по собиранию документов личного происхождения // Советские архивы. – 1973. – № 3. – С. 37; Кононов Ю. Ф. Организация хранения личных фондов в архивах СССР // Труды научной конференции по вопросам архивного дела в СССР. Т. 1–2 / Глав. арх. упр. при СМ СССР. – М., 1966. – Т. 1. – С. 270–271.

[87] Киселева Л. Н., Ржезникова М. Я. Комплектование личных фондов учёных – одна из важнейших сторон деятельности Академического архива // Академические архивы СССР за 50 лет Советской власти. Труды 1-го совещания архивистов Академии наук СССР и академий наук союзных республик, 17–23 мая 1967 г. / Совет по орган. комплектов. и использов. арх. материалов АН СССР; Архив АН СССР. – М., 1968. – С. 133, 140.

і музеяў, архівамі інстытутаў і іншых установ, былі ўключаны ў склад Дзяржаўнага архіўнага фонду і падлягалі канцэнтрацыі ў дзяржаўных архівах.

Ліквідаваўся ДАФ РСФСР (таксама, як і ДАФы іншых саюзных рэспублік), замест яго быў утвораны ДАФ СССР, у склад якога ўвайшлі дакументы саюзных рэспублік. Стваралася новая сетка дзяржаўных архіваў і ў яе складзе – Цэнтральны дзяржаўны літаратурны архіў (ЦДЛА) СССР, куды пачалі паступаць адпаведныя дакументы з архіваў, бібліятэк, музеяў ды інш. установ, а таксама Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў (ЦДГА) СССР у Ленінградзе, Цэнтральны дзяржаўны архіў старажытных актаў (ЦДАСА), Цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі (ЦДАКР) СССР.

ЦДЛА СССР з'яўляўся найбольш буйным сховішчам асабістых архіваў у СССР. Напрыканцы 1980-х гг. у ім налічвалася больш 1300 фондаў.

Бібліятэкі і музеі з гэтага часу мелі права камплектавацца толькі дакументамі, якія захоўваліся ў прыватнай уласнасці[88].

Пытанне аб захоўванні асабістых архіваў сучаснікаў, сведкаў ці ўдзельнікаў гістарычных падзей было ўпершыню пастаўлена на Ўсесаюзнай канферэнцыі гісторыкаў-архівістаў, прысвечанай 25-годдзю савецкай архіўнай справы ў чэрвені 1943 г. Рэзалюцыя, прынятая па дакладу Ў. Максакава, ставіла задачу збірання дакументаў грамадзян адзначаных узнагародамі савецкага кіраўніцтва.

Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе не прынесла істотных змен у прававы статус дакументаў асабістага паходжання ў складзе ДАФ СССР. Пэўныя зрухі ў гэтым накірунку адбыліся ў канцы 50-х гг. ХХ ст. Улетку 1958 г. на нарадзе працаўнікоў архіўных установ В. М. Скварцова ўпершыню выказала ідэю аб стварэнні адзінага навукова-даследчыцкага цэнтра для распрацоўкі праблем, звязаных з сістэматызацыяй і фандзіраваннем дакументаў асабістага паходжання.

Наступны крок быў звязаны з прыняццем у 1958 г. новага Палажэння аб ДАФ СССР. У артыкуле 2б сцвярджалася, што ў склад ДАФ разам з дакументамі арганізацый уваходзяць дакументы дзеячаў навукі, мастацтва ды інш., што ўтварыліся ў сувязі з іх дзейнасцю і паступілі ва ўласнасць дзяржавы ў выніку нацыяналі-

---

[88] Мамонов В. М. О собирании документов личного происхождения государственными архивами СССР // Археографический ежегодник за 1979 / АН СССР. Отделение истории. Археограф. комис.; редкол. С. О. Шмидт (отв. ред.) [и др.] – М., 1981. – С. 4; Волкова Н. Б. Комплектование ЦГАЛИ СССР материалами личного происхождения деятелей литературы и искусства // Советские архивы. – 1971. – № 6. – С. 18.

зацыі па актах дарэння ці на іншай аснове[89]. Было зафіксавана, што яны не могуць быць аб'ектам куплі-продажу паміж асобамі. Галоўархіў СССР, рэспубліканскія і мясцовыя архіўныя органы атрымалі права вырашаць пытанне аб тэрмінах і парадку перадачы ў адпаведныя дзяржаўныя архівы дакументаў ДАФ, што часова захоўваліся ў музеях, аддзелах бібліятэк, галіновых архівах ды іншых навуковых установах.

У 1957 г. Галоўархіў СССР сумесна з іншымі навуковымі ўстановамі пачаў распрацоўку даведніка, які б адлюстроўваў аб'ёмы і структуру фондаў асабістага паходжання, што захоўваліся ў дзяржаўных сховішчах СССР[90]. У падрыхтаваных трох тамах змяшчаліся звесткі аб асабістых фондах і калекцыях больш чым 500 сховішчаў СССР. Гэта былі дзяржаўныя і акадэмічныя архівы, бібліятэкі, музеі, установы Міністэрстваў культуры і асветы па стану з 1957 па 1975 гг.

У пачатку 1960-х гг. у саюзных рэспубліках па ўзору ЦДАЛМ СССР пачалі ўзнікаць спецыялізаваныя дзяржаўныя ўстановы для захоўвання асабістых архіваў – архівы літаратуры і мастацтва. Першым у 1960 г. пачаў працу архіў у Беларусі, у 1966 г. – ва Украіне і Азербайджане, у 1968 г. – у Літве, у 1969 г. – у Ленінградзе, у 1970 г. – у Грузіі, у 1986 г. – у Арменіі[91]. Да канца 1980-х гг. у СССР дзейнічала восем архіваў літаратуры і мастацтва, два з якіх (у Беларусі і Украіне) набылі статус архіва-музея. Яны атрымалі шырокія магчымасці для ажыццяўлення экспазіцыйнай дзейнасці. Найвялікшым сярод пералічаных архіваў з'яўляўся Архіў літаратуры і мастацтва ва Украіне (1103 фонды асабістага паходжання). Гэты архіў меў таксама свой філіял – Літаратурна-мемарыяльны дом-музей А. Карнейчука (1972).

У канцы 1950-х – першай палове 1960-х гг. на старонках перыядычных выданняў і падчас канферэнцый разгарнулася шырокае тэарэтычнае абмеркаванне праблем камплектавання архіваў фондамі асабістага паходжання. У выніку былі акрэслены асноўныя праблемы дадзенага накірунку, менавіта прыём на дзяржаў-

---

[89] Хорходина Т. И. История и архивы – М.: РГГУ, 1994. – С. 304; Белов Г. А., Максаков В. В. Архивное строительство на новом этапе // Исторический архив. – 1959. – № 2. – С. 170; Положение о Государственном архивном фонде Союза ССР. Утв. Постановлением СМ СССР № 914 от 13 августа 1958 и пояснения к нему. // Вопросы архивоведения. – 1959. – № 1. – С. 4–15.

[90] Личные архивные фонды в государственных хранилищах СССР: указатель: в 3-х тт./ ред. кол. Ю. И. Герасимова и др.; сост. Э. В. Колосова и др. – М., 1962–1980. – Т. 1–3.

[91] Государственные архивы СССР: справочник: в 2 ч. / Глав. арх. упр. при СМ СССР; ред. кол. Ф. М. Ваганов (пред.) и др. – М.: Мысль, 1989. – Ч. 1.– 603 с.

нае захоўванне малакаштоўных фондаў і неабходнасць вызначэння крытэрыяў каштоўнасці асабістых фондаў, адсутнасць у архівах асабістых фондаў працаўнікоў гаспадаркі, удзельнікаў Другой сусветнай вайны, раскіданасць асабістых архіваў па розных сховішчах ды інш.

У якасці шляхоў вырашэння праблем прапанавалася стварэнне Цэнтральнага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі (ЦДАНТД) СССР дзеля захоўвання асабістых архіваў дзеячаў навукі і тэхнікі, стварэнне пры ЦДАЛМ і ЦДАНТД навуковых саветаў з прадстаўнікоў мемарыяльных, навуковых, творчых устаноў, ператварэнне некаторых мемарыяльных музеяў у філіялы ЦДАЛМ, арганізацыя выяўлення і цэнтралізаванага ўліку прыватных збораў, стварэнне міжведамаснага савета па каардынацыі працы з дакументамі асабістага паходжання, удасканаленне працы з дапамогай планаў камплектавання архіваў, правядзенне асветніцкай дзейнасці сярод насельніцтва ды інш. У 1980-я гг. была таксама ўзнята праблема драблення фондаў, звернута ўвага на неабходнасць захавання інфармацыйных сувязяў унутры комплексаў дакументаў асабістага паходжання[92].

У маі 1963 г. пры ГАУ СССР з прадстаўнікоў архіўнага ўпраўлення, Акадэміі навук, Міністэрства культуры ды іншых устаноў быў створаны Міжведамасны навукова-метадычны савет па набыцці дакументаў ва ўласнасць дзяржавы. Яго асноўнай функцыяй стала выяўленне і цэнтралізаваны ўлік асабістых архіваў і калекцый, а таксама іх размеркаванне па дзяржаўных сховішчах. Аднак яго рэкамендацыі не мелі абавязковай сілы[93].

У 1981 г. паўнамоцтвы Савета былі пашыраны і ахапілі ўсе этапы працы з дакументамі асабістага паходжання, менавіта камплектаванне, апісанне, улік, захоўванне і выкарыстанне. Было прынята рашэнне аб стварэнні аналагічных Саветаў і на рэспубліканскім узроўні, аднак яно так і не знайшло рэалізацыі. Савет прымаў рашэнні аб захоўванні дакументаў на магнітных носьбітах і фотадакументаў у складзе асабістых фондаў, рэкамендаваў рукапісным

---

[92] Кононов Ю.Ф. Организация хранения личных фондов в архивах СССР // Труды научной конференции по вопросам архивного дела в СССР. Т. 1–2 / Глав. арх. упр. при СМ СССР. – М., 1966. – Т. 1. – С. 274–275; Новикова А.А. О комплектовании государственных архивов фондами личного происхождения // Вопросы архивоведения. – 1959. – № 2. – С. 15–20; Сиротинская И.П. Особенности работы с документами личного происхождения // Советские архивы. – 1986.– № 1.– С. 14–16.

[93] Жорова К.С. О некоторых вопросах комплектования ЦГАЛИ БССР // Труды научной конференции по вопросам архивного дела в СССР. Т. 1–2 / Глав. арх. упр. при СМ. СССР.– М., 1966.– Т. 1.– С. 391–398.

аддзелам музеяў і бібліятэк устрымацца ад прымання іх на захоўванне з мэтай прадухілення драблення, прыцягваў да ўдзелу ў метадычных распрацоўках усе буйныя архівасховішчы краіны.

18–22 мая 1965 г. у Маскве ГАУ СССР быў праведзены Ўсесаюзны семінар па камплектаванні дзяржаўных архіваў дакументамі асабістага паходжання, які выявіў значную цікавасць з боку архівістаў да дадзенай праблемы[94]. Адным з найбольш дыскусійных стала пытанне аб неабходнасці браць на захоўванне асабістыя архівы «простых» людзей. У выніку быў распрацаваны спіс катэгорый архіваўтваральнікаў, вызначаліся крыніцы камплектавання.

У максімальным аб'ёме было прызнана мэтазгодным прымаць толькі дакументы найбольш славутых асоб, якія мелі характар рэліквіі. Уключэнне той ці іншай асобы ў спіс камплектавання было абумоўлена наяўнасцю ў яго ўзнагарод, званняў, дасягненняў у творчай або прафесійнай дзейнасці, сваяцкіх сувязяў з выдатнымі асобамі, а таксама наяўнасцю ў іх каштоўных збораў дакументаў. З архіваў *«актыўных, але шэраговых членаў грамадства»* рэгіянальным архівам было прапанавана ствараць калекцыі.

Таксама ўпершыню быў вызначаны склад дакументаў, што прымаліся на захоўванне, уводзіўся іх падзел на дакументы ўсесаюзнага, рэспубліканскага і мясцовага значэння, на дакументы асоб розных сфер дзейнасці, была распрацавана схема сістэматызацыі ўнутры фонду.

У 1960-я гг. на саюзным узроўні было пастаўлена пытанне аб крытэрыях размеркавання архіваў па адпаведных сховішчах. Пры гэтым адзначалася сувязь паміж дакументамі асабістага паходжання і фондамі ўстаноў, дзе працаваў архіваўтваральнік, а таксама сцвярджалася неабходнасць захаваць фонды адной тэматыкі ў адным дзяржаўным архіве. Адпаведна, фонды дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў СССР дарэвалюцыйнага перыяду былі аднесены да сферы камплектавання Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Масквы (ЦДГАМ), Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Ленінграда (ЦДГАЛ), Цэнтральнага дзяржаўнага архіва старажытных актаў (ЦДАСА), найбуйнейшых бібліятэк Масквы і Ленінграда.

Фонды дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў савецкага перыяду трапілі ў сферу камплектавання Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі (ЦДАКР), Цэнтральнага дзяржаўнага

[94] Материалы всесоюзного совещания-семинара по комплектованию государственных архивов материалами личного происхождения, экспертизе их ценности и фондированию / Глав. арх. упр. при СМ СССР. – М., 1965. – 218 с.; Колосова Э.В., Цаплин В.В. Государственные архивы и документы личного происхождения // Вопросы архивоведения.– 1965.– № 4.– С. 14–23.

архіва народнай гаспадаркі (ЦДАНГ), Цэнтральнага партыйнага архіва, Музея рэвалюцыі. Фонды дзеячаў літаратуры і мастацтва сталі прэрагатывай ЦДАЛМ, рукапісных аддзелаў бібліятэк, Інстытута сусветнай літаратуры, мемарыяльных музеяў, фонды навукоўцаў – да архіва Акадэміі навук і ЦДАКР.

Створаны ў 1967 г. ЦДАНТД СССР пачаў прымаць на захоўванне асабістыя архіўныя фонды найбуйнейшых вучоных-хімікаў, электратэхнікаў і вучоных іншых галін[95].

Пытанні захоўвання асабістых архіваў вырашаліся бібліятэкамі і музеямі. Мемарыяльныя музеі сталі адной з найбольш папулярных формаў захоўвання творчай спадчыны дзеячаў навукі і культуры ў Расіі, Беларусі і Украіне. Намаганні супрацоўнікаў бібліятэк, дзяржаўных і акадэмічных архіваў былі скіраваны на вырашэнне супольнай задачы стварэння аднастайнай сістэмы апісання, уліку дакументаў асабістых фондаў і інфармавання аб іх складзе, на падставе аналізу асаблівасцей навукова-даведачнага апарата кожнай з устаноў.

24–26 верасня 1974 г. адбылася навуковая канферэнцыя па праблемах камплектавання дакументальнымі крыніцамі дзяржаўных архіваў СССР. Спецыяльная секцыя была прысвечана праблемам камплектацыі па асабоваму складу і паходжанню. Яе рашэнні атрымалі практычную рэалізацыю ў накірунку камплектавання архіўных устаноў асабістымі архівамі дзеячаў рэгіянальнага маштабу.

У 1976–1977 гг. абмеркаванне пытання аб асабістых архівах і іх значэнні ў кантэксце захавання культурнай спадчыны разгарнулася на старонках «Литературной газеты» і прыцягнула ўвагу грамадскасці да неабходнасці беражлівага стаўлення да архіўнай спадчыны.

Дыскусія пачалася з артыкула загадчыцы аддзела рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі СССР С. Жытомірскай «Што мы пакінем у спадчыну?» і сканцэнтравалася на праблеме захоўвання дакументаў не толькі выдатных асоб, але і «простых» людзей. Гэту ідэю падтрымалі пісьменнікі Г. Шторм, Н. Эйдельман, Я. Гордзін ды інш. Тым не менш намеснік дырэктара Цэнтральнага дзяржаўнага архіва народнай гаспадаркі (ЦДАНГ) У. Цаплін і супрацоўнік Цэнтральнага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва (ЦДВГА) А. Шнэйдэр з пункту гледжання архівістаў-практыкаў адзначылі, што захапленне збіральніцтвам прывядзе да перагрузкі архіваў.

---

[95] Сырченко Л. Г. К проблеме научной организации документов деятелей русской литературы и искусства // Археографический ежегодник за 1979 / АН СССР. Отделение истории. Археограф. комис.; редкол. С. О. Шмидт (отв. ред.) [и др.] – М., 1981. – С. 13–25.

Яны палічылі немэтазгодным камплектаванне архіваў вялікай колькасцю дакументаў шараговых грамадзян, назваўшы іх «макулатурай асабістага паходжання».

1980-я гг. – гэта новы этап развіцця заканадаўчай базы, што тычылася пытанняў захоўвання дакументаў асабістага паходжання. Палажэннем аб ДАФ СССР 1980 г. было замацавана, што дакументы такога кшталту маюць права захоўваць архівы, музеі і бібліятэкі, Акадэміі навук, ведамасныя архівы.

Асноўныя правілы работы дзяржаўных архіваў СССР (1984) акрэслілі патрабаванні па камплектаванні, экспертызе каштоўнасці і размеркаванні асабістых архіўных фондаў паміж сховішчамі ў адпаведнасці з профілем. Правілы карыстання дакументамі ДАФ СССР (1984), якія знаходзіліся на сталым захоўванні бібліятэк і музеяў Міністэрства культуры СССР, прадугледжвалі, што дакументы з'яўляюцца народным здабыткам, ахоўваюцца дзяржавай у адпаведнасці з Законам «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» (1976) і прадстаўляюцца для выкарыстання даследчыкам.

Да канца 1980-х гг. у саюзных, рэспубліканскіх, абласных і краявых архівах было сканцэнтравана каля 9 тысяч фондаў асабістага паходжання (каля 1 млн. адз. зах.). Штогод гэта колькасць павялічвалася на 80–100 тысяч адз. зах. З гэтага шэрагу 51% складалі фонды дзеячаў літаратуры і мастацтва, 20% – дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, 13% – удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Другой сусветнай войнаў, 10% – вучоных розных галін; 6% – працаўнікоў гаспадаркі[96].

Асноўнымі задачамі ў працы з дакументамі асабістага паходжання ў гэты перыяд з'яўляліся навуковае абгрунтаванне складу асабістых дакументаў, што прымаліся на дзяржаўнае захоўванне, размеркаванне дакументаў на комплексы саюзнага, рэспубліканскага і мясцовага значэння, ліквідацыя раскіданасці архіўных фондаў і калекцый, стварэнне адзінай сістэмы даведнікаў па асабістых фондах. Асноўным метадычным пытаннем, якое вырашалася, стала вызначэнне сістэмы крытэрыяў экспертызы каштоўнасці і катэгаравання фондаў, якое вызначала ступень паўнаты іх прыёму на дзяржаўнае захоўванне.

Адным з асноўных тэарэтычных і практычных накірункаў працы з асабістымі архівамі ў дзяржаўных сховішчах СССР з'яўлялася распрацоўка метадычных рэкамендацый на падставе досведу працы архіваў, музеяў і бібліятэк. Першы нарматыўна-метадычны

---

[96] Мамонов В. М. Работа по собиранию документов личного происхождения // Советские архивы.– 1987.– № 4.– С. 47, 51.

зборнік, які ўключаў у сябе інструкцыю па апрацоўцы асабістых фондаў XVIII–XX стст., што захоўваліся ў Аддзеле рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі СССР (А. М. Коншына), быў выдадзены ў 1955 г.[97] У ім былі прапанаваны азначэнні паняццяў фондаў асабістага паходжання (асабісты, сямейны, родавы) у адрозненне ад калекцыі, а таксама прапанаваны тыповыя схемы сістэматызацыі.

У 1958 г. Галоўным архіўным упраўленнем СССР на падставе досведу працы з дакументамі асабістага паходжання дзяржаўных архіваў, Аддзела рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі ім. У. Леніна, Цэнтральнага партыйнага архіва Інстытута марксізму-ленінізму пры ЦК КПБ, Архіва АН СССР была распрацавана інструкцыя па навукова-тэхнічнай апрацоўцы, дзе ўпершыню на міжведамасным узроўні былі сфармуліраваны асноўныя паняцці і вызначаны этапы працы з архівамі асабістага паходжання пры іх паступленні на дзяржаўнае захоўванне.

На падставе тэарэтычных даследаванняў і практыкі работы з дакументамі асабістага паходжання дзяржаўнымі архівамі быў распрацаваны шэраг метадычных рэкамендацый. У 1967 г. супрацоўнікамі ЦДАМЛМ СССР пры ўдзеле архівістаў саюзных рэспублік былі падрыхтаваны Метадычныя рэкамендацыі па працы з фондамі асабістага паходжання. У 1969 г. у адпаведнасці з рашэннем Міжведамаснага навукова-метадычнага савета па набыццю дакументальных матэрыялаў ва ўласнасць дзяржавы пры ГАУ СССР з'явіліся рэкамендацыі па працы з асабістымі фондамі толькі на этапе камплектавання, характарызуючы склад дакументаў асабістых фондаў, вызначаючы крытэрыі экспертызы каштоўнасці і іх адбору на дзяржаўнае захоўванне.

У 1971 г. сумесна з Міністэрствам культуры і Архівам АН СССР былі падрыхтаваны метадычныя рэкамендацыі па навукова-тэхнічнай апрацоўцы дакументаў асабістага паходжання. Значным крокам на шляху абагульнення практычнага досведу архіваў у працы з асабістымі фондамі стала выданне ў 1990 г. новых метадычных рэкамендацый па працы з дакументамі асабістага паходжання ў галіне літаратуры і мастацтва, якія характарызавалі ўсе этапы працы ад камплектавання да выкарыстання.

На падставе агульнасаюзных распрацовак дзяржаўнымі архівамі Ленінграда, Уладзіміра, Саратава, а таксама Херсонскай, Львоўскай, Ровенскай абласцей Украіны, Калінінскай вобласці РСФСР, Брэсцкай вобласці БССР у канцы 1970-х – пачатку

[97] Инструкция по научно-технической обработке документальных материалов фондов личного происхождения / ГАУ МВД СССР; АН СССР; Отд. культ.-просветит учреждений Министерства культуры СССР. – М., 1958. – 51 с.

1980-х гг. з улікам накопленага досведу былі падрыхтаваны метадычныя дапаможнікі па розных аспектах працы[98].

Навукова-тэхнічная апрацоўка асабістых фондаў дзеячаў розных накірункаў патрабавала спецыфічных падыходаў, якія былі зафіксаваны ў шэрагу метадычных распрацовак Архіва АН СССР, дзе вызначаны асаблівасці працы з фондамі вучоных (1960), ЦДАМЛМ СССР – з творчымі дакументамі рэжысёраў, мастакоў, акцёраў, кампазітараў (1962), ЦДА ЎзССР – з фондамі гісторыкаў.

У 1986 г. калегія ГАУ, разглядзеўшы пытанні арганізацыі працы па захоўванні дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Другой сусветнай вайны, канстатавала адсутнасць неабходнай каардынацыі дзеянняў дзяржаўных архіваў, школ, музеяў, бібліятэк, грамадскіх аб'яднанняў у гэтым накірунку і адсутнасць кантролю за гэтым працэсам з боку дзяржаўных архіўных устаноў. Было прынята рашэнне аб стварэнні міжведамаснага грамадскага савета, правядзенні праверкі ўмоў захоўвання і перадачы найбольш каштоўных дакументаў (арыгіналы ці копіі) на захоўванне ў дзяржаўныя архівы. У 1990 г. былі выдадзены метадычныя рэкамендацыі па камплектаванні дзяржаўных архіваў дакументамі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

У 1981 г. супрацоўнікамі аддзела рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі СССР быў абагульнены досвед працы з асабістымі архіўнымі фондамі. Камплектаванне бібліятэкі рэгламентавалася Статутам, шэрагам палажэнняў аб аддзелах рукапісаў, дакументамі аб ДАФ СССР, рашэннямі і метадычнымі рэкамендацыямі Міжведамаснага савета па набыцці дакументальных матэрыялаў ва ўласнасць дзяржавы. На захоўванні ў бібліятэцы павінны былі знаходзіцца архівы дзеячаў дарэвалюцыйнага перыяду (дзяржаўных і палітычных, літаратуры і мастацтва, вучоных-гуманітарыяў, сямейныя і родавыя архівы), дзеячаў савецкага перыяду (бібліятэчнай і музейнай справы); гісторыкаў, літаратуразнаўцаў (пры каардынацыі з Архівам АН СССР і ЦДАЛМ СССР), прадстаўнікоў іншых сацыяльных груп[99].

---

[98] Зданевич В.Г. Методические указания по отбору на госхранение и научно-технической обработке документов личного происхождения. 1980. // ДА Брэсцкай вобласці. Даведачна-інфармацыйны фонд. – № 304; Научно-техническая обработка документов фондов личного происхождения (методические рекомендации) / сост. И.Н. Петрова; Госархив Калининской обл. 1979 // НАРБ. Даведачна-інфармацыйны фонд – № 851.

[99] Экспертиза научной ценности материалов личных архивных фондов. Методические рекомендации / Гос. библиотека СССР им. В.И. Ленина; сост Ю.И. Герасимова [и др.] – М., 1981. – 46 с.

Увядзенне адзінага міжгаліновага стандарта па ўліку і арганізацыі захоўвання ДАФ СССР стала асноўнай задачай стварэння правіл працы музеяў з пісьмовымі дакументамі. Асноўнымі ўліковымі адзінкамі дакументаў ДАФ СССР у музеі былі вызначаны архіўны фонд, калекцыя і адзінка захоўвання.

У комплексе з пісьмовымі дакументамі асабістага паходжання павінны былі ўлічвацца ўзаемазвязаныя з імі друкаваныя выданні з аўтографамі і паметамі, фотаздымкі, карты і прадметы. Пры гэтым улік мусіў ажыццяўляцца не толькі па музейнай кнізе ўліку паступленняў дакумента, але і па архіўным вопісу, які ў музеі выступаў на правах навуковага інвентару і замацоўваў вынікі навуковай апрацоўкі фонду, сістэматызацыю адзінак захоўвання ўнутры фонду. Пісьмовыя дакументы, што захоўваліся ў музеях, падвяргаліся абавязковаму ўліку ў цэнтральным фондавым каталогу ГАУ СССР[100].

Такім чынам, у склад ДАФ (АДАФ), створанага на падставе дамінуючага ў СССР прынцыпа цэнтралізацыі архіўнай справы, паступова ўключаліся комплексы дакументаў асабістага паходжання (прыватныя, асабістыя, фамільныя архівы), якія пасля 1941 г. сталі адной з крыніц яго сталага камплектавання.

Цэнтралізацыя архіўнай справы і фарміраванне ДАФ СССР у 1920–1930-я гг. суправаджалася вострымі дыскусіямі аб размежаванні паўнамоцтваў архіваў, музеяў і бібліятэк у справе захоўвання архіваў асабістага паходжання. У другой палове XX ст. супрацоўніцтва дадзеных устаноў вялося на тэарэтычным і метадычным узроўнях. Найбольш актуальнымі праблемамі ў гэты час з'яўляліся раскіданасць архіваў па розных сховішчах і неабходнасць спалучэння архіўнага, музейнага і бібліятэчнага падыходаў у іх захоўванні, неабходнасць захоўвання архіваў прадстаўнікоў розных накірункаў дзейнасці і шэраговых членаў грамадства, метадычныя пытанні вызначэння крытэрыяў каштоўнасці, катэгорый, сістэматызацыі дакументаў фонду ды інш.

Для каардынавання дзейнасці ў захоўванні асабістых архіваў быў створаны Міжгаліновы метадычны савет, а дзеля ўліку інфармацыі аб колькасці і складзе асабістых фондаў падрыхтаваны даведнік «Асабістыя архівы ў дзяржаўных сховішчах СССР».

Пытанне аб захоўванні асабістых архіваў выклікала цікавасць грамадства і аб'яднала не толькі архівістаў, працаўнікоў музеяў і бі-

---

[100] Правила работы музеев по учёту и организации хранения письменных документов государственного архивного фонда СССР / Мин. культуры, ГАУ при СМ СССР; ред. А. В. Елпатьевский и др. – М., 1990. – 47 с.

бліятэк, але і больш шырокія колы інтэлігенцыі. Агульнасаюзная сістэма захоўвання асабістых архіваў у дзяржаўных сховішчах вызначанага профілю, заканадаўства, асноўныя тэарэтычныя прапановы падчас канферэнцый, а таксама метадычныя распрацоўкі знаходзілі рэалізацыю на ўзроўні рэспублік і рэгіёнаў краіны.

Метадычныя рэкамендацыі па працы з дакументамі асабістага паходжання, створаныя прадстаўнікамі архіваў, музеяў і бібліятэк, грунтаваліся на аднастайнасці падыходаў у вызначэнні фонду асабістага паходжання, яго складу, правілаў уліку і захоўвання ў адпаведнасці з заканадаўствам аб ДАФ СССР.

## *Пачатак камплектавання архіваў, музеяў і бібліятэк Беларусі дакументамі асабістага паходжання (1918–1945 гг.)*

У XIX – пач. XX ст. захоўванне дакументаў на беларускіх землях адбывалася ў архівах дзяржаўных устаноў (губернскіх праўленняў, казённых палат, судоў і г. д.), гістарычных архівах (Віцебскім і Віленскім архівах старажытных актаў), манастырскіх і царкоўных, фамільных і сядзібных архівах. У выніку ваенных дзеянняў і змены дзяржаўнага ладу былая сістэма спыніла сваё існаванне. Пачаў стварацца цэнтралізаваны ДАФ БССР.

Яго фарміраванне адбывалася на падставе заканадаўчых актаў рэспубліканскіх органаў улады па прынцыпах, закладзеных дэкрэтам СНК РСФСР ад 1 чэрвеня 1918 г. У студзені 1919 г. Часовы Рабоча-сялянскі ўрад БССР выдаў дэкрэт «Аб перадачы культурных каштоўнасцей навукі і мастацтва, што знаходзяцца ў маёнтках і розных установах, Камісарыяту па асвеце і аб арганізацыі іх уліку, аховы і збірання», па якому перадачы падлягалі ўсе калекцыі і асобныя прадметы, што маюць значэнне для навукі і мастацтва, бібліятэкі і г. д.

Упершыню дэкрэт аб цэнтралізацыі архіўнай справы на ўзроўні рэспублікі быў прыняты СНК ССРЛіБ 13 сакавіка 1919 г. Дэкрэт не быў рэалізаваны, але вызначыў тэндэнцыю ў фарміраванні ДАФ у Савецкай Беларусі. Цэнтрархіў і ДАФ БССР былі арганізаваны пастановай ад 4 жніўня 1922 г. (па аналогіі з РСФСР ад 1 чэрвеня 1918 г.)[101].

[101] Архивное дело в БССР (1918–1968): Сб. законодательных и руководящих документов / под ред. А. И. Азарова [и др.] – Минск, 1972.– С. 12–13, 29–31

У 1920-я гг. быў распачаты шырокі пошук і канцэнтрацыя архіўных дакументаў у дзяржаўных сховішчах на прынцыпах цэнтралізацыі.

Працаўнікі архіваў, бібліятэк, музеяў пачалі абследаванне зруйнаваных сядзіб. Сядзібы – унікальная з'ява сацыяльна-культурнага жыцця Беларусі XIX – пачатку XX ст., – захоўвалі вялікую колькасць бібліятэчных, архіўных і музейных каштоўнасцей, а сядзібныя архівы сталі асяродкам зберажэння не толькі маёнткавых і сямейных дакументаў, але таксама калекцый гістарычных матэрыялаў, творчай і навуковай спадчыны асобы.

Праблемай захоўвання і ўзнаўлення страчанай дакументальнай спадчыны прыватных архіваў заняліся ў гэты перыяд вучоныя гісторыкі і архівісты І. Барашка, М. Мялешка, А. Шлюбскі, грамадскія і культурныя суполкі і ўстановы.

У большасці справаздач атрыманых Цэнтрархівам БССР з месцаў адзначалася, што фамільныя і сядзібныя архівы знішчаны падчас рэвалюцыі і ваенных дзеянняў, вывезены ўладальнікамі ці іх лёс невядомы[102]. Шмат дакументаў пасля рэвалюцыі былі перамешчаны самімі ўладальнікамі і грамадскімі ці дзяржаўнымі ўстановамі ў сховішчы Расіі і Польшчы. Так, у Петраград трапіў архіў Ф. Плятара з Бельмонта, у Маскву – зборы І. Каладзеева з Новага Барысава, М. Гутэн-Чапскай са Станькава, а таксама архівы Браніцкіх, Патоцкіх, Убраў, у Варшаву – архіў Тызенгаўзаў з Паставаў, у Кракаў – Пачобутаў-Адляніцкіх з Цялошы.

Падчас вайны і рабаванняў загінулі архівы Мілашаў у Чарэі, Крашэўскіх (з вялікім зборам аўтографаў) у Долхах, Манюшкаў у Смілавічах, Храптовічаў у Бешанковічах, Вайніловічаў у Савічах[103] ды інш.

Захаваныя сядзібныя архівы павінны былі апісвацца і паступаць на ўтрыманне саўгасаў і камун, а таксама мясцовых музеяў, архіўных аддзелаў і краязнаўчых арганізацый[104]. Дзякуючы нама-

---

[102] Справаздачы Віцебскага губернскага архіва аб працы за 1919–1923 і акруговых аддзелаў за 1924–1925, Барысаўскага, Слуцкага, Чэрвенскага павятовага аддзелаў за 1923–1924. // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 1. – Адз. зах. 24–30. – Л. 24–27.

[103] Chwalewik E. Zbiory Polskie archiwa, biblioteki, gabinety, galerje, muzea i inne zbiory pamiątek przesłości w ojczyżnie i na obczyznie. W porządku alfabetycznym wedlug miejscowości ułożone. – Warszawa-Kraków: Wyd-wo J. Mortkowicza, 1926. – T. 1–2; Wojniłłowicz E. Wspomnenia. 1847–1928 / wyd. J. Iwaszkiewicz. – Cz. 1. – Wilno, 1931. – S. 200–201.

[104] Ліставанне Цэнтраархіва з рознымі ўстановамі аб абследаванні і ўзяцці на ўлік архіваў былых манастыроў і цэркваў. 1923 // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 1. – Адз. зах. 45. – Л. 11, 27; Акты па вывучэнні сядзібаў на тэрыторыі Беларусі, для складання даведніка «Навука і навуковыя работнікі Віцебшчыны». Апытальныя лісты аб

ганням архіўных аддзелаў пры павятовых выканкамах Мазыра, Чэрвеня, Слуцка, Барысава, Бабруйска ды інш. у канцы 1922 – пач. 1923 г. у архівы Беларусі паступілі дакументальныя фонды Завішаў, Немаршанскіх, Ельскіх, Любамірскіх, Вейсенгофа, Зіберга, Абуховіча, Пачкоўскага, Прозара, Хмараў з Сёмкава гарадка[105].

Паводле каталогу ДАФ БССР, у 1935 г. у Гомельскім архіве захоўваліся таксама дакументы князёў Паскевічаў, землеўладальніка з Нароўлі Горвата, у Мінскім архіве – княгіні Ю. Н. Любамірскай-Радзівіл, землеўладальнікаў Завішаў, уладальніка маёнткаў Лошыца і Сенніца К. З. Сямашкі (1911–1917), мінскага прысяжнага паверанага І. С. Назаранкі (14 адз. зах. за 1913–1914 гг.), навукоўца-лесавода І. А. Фелінскага (за 1807–1815), удзельніка Сярэдне-Амурскай золатапрамысловай кампаніі А. Ф. Барталамея (1 адз. зах. за 1873–1878 гг.)[106].

З пералічанага на сённяшні дзень у беларускіх архівах захаваліся толькі фрагменты архіваў Хмараў, Любамірскіх, Зібергаў, Завішаў (НГАБ), Слізняў, Быхаўцаў, Булгакаў (НГАБ у г. Гродне). Акрамя гэтага часткі архіваў Абуховічаў, Каменскіх, Пачобутаў, П. Майота ды інш. – у Гродзенскім гісторыка-культурным музеі, Ю. Талстога – у Гомельскім абласным краязнаўчым музеі, Багаткаў – у Пінскім абласным краязнаўчым музеі. Архіў Слізняў першапачаткова захоўваўся ў Ваўкавыскім ваенна-гістарычным музеі, Быхаўцаў – у Слонімскім краязнаўчым музеі, Любамірскіх – у Аршанскім краязнаўчым музеі.

У Віцебску пошукам архіваў займаўся вядомы гісторык Аляксей Сапуноў. Яго дакументальная спадчына пасля смерці ў 1924 г. была перададзена ў Віцебскі краязнаўчы музей. У выніку анкетавання і праведзеных экспедыцый тут былі ўзяты на ўлік архіў А. Балкашынава з Лускінопаля, які складаўся з гаспадарчых дакументаў і метэаралагічных назіранняў за 20 гадоў, Лужыцкіх з Любашкава (гаспадарчыя дакументы, палітычныя дакументы за 1839–1848 гг. ды інш.). У маёнтках Лускінопаль і Берднікі Віцеб-

---

царкоўных і манастырскіх архівах Віцебскай губерніі. 1925. // ДА Віцебскай вобл. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Адз. зах. 19. – Л. 97, 99, 101.

[105] Ліставанне з кіраўніцтвам фермай сельскагаспадарчага інстытута «Сёмакава», Сёмкава-Гарадзецкай воласці Мінскага пав., аб неабходнасці перадачы на дзяржаўнае захоўванне дакументаў, што захоўваюцца ў былым маёнтку Сёмкава. 1923. // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 1. – Адз. зах. 49; Мялешка М. Архіўная справа ў БССР да сучаснага моманту // Працы Першага з’’езду даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі. 17–18 студзеня 1926 / Інстытут Беларускай культуры. Гістарычна-археалагічная камісія. – Менск, 1926. – С. 60–68.

[106] Каталог Дзяржаўнага архіўнага фонда БССР. Ч. 1. 1935. // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 1 – Адз. зах. 671.

скага пав. быў створаны часовы архіў, куды звозіліся і дзе апрацоўваліся дакументы з навакольных мясцін[107] .

Падчас пошукаў здараліся знаходкі найкаштоўнейшых дакументаў асабістага паходжання, якія пасля перадаваліся ў расійскія сховішчы, адпаведна з нарматыўнымі дакументамі. Так, у 1918 г. у Магілёве на гарышчы Марыінскай гімназіі была выпадкова знойдзена частка асабістага архіва Мікалая II – ліставанне з сям'ёй, з Распуціным, вышэйшымі ваеннымі і дзяржаўнымі чыноўнікамі (усяго 1796 лістоў і тэлеграм за 1915–1917 гг.). У 1922 г. гэтыя дакументы былі перададзены ў Маскву.

У 1926 г. у архіве Віцебскай вучонай архіўнай камісіі сярод дакументаў памешчыка Чысцякова, быў знойдзены дванаццаціаркушавы сшытак за подпісам дзекабрыста Кандрація Рылеева, які спачатку быў перададзены ў Цэнтрархіў БССР[108], а потым – у Маскву.

У сярэдзіне 1930-х гг. паміж У. Бонч-Бруевічам як дырэктарам Дзяржаўнага літаратурнага музея ў Маскве, які на той час з'яўляўся цэнтрам збірання асабістых архіваў дзеячаў літаратуры і мастацтва, і беларускім грамадскім і культурніцкім дзеячам Язэпам Дылам, які жыў і працаваў у Саратаве, наладзілася супрацоўніцтва ў галіне збору і перадачы дакументаў асабістых архіваў. Некаторыя матэрыялы, у т. л. рукапісы Аляксандра Пушкіна і дакументы па гісторыі беларускага тэатра, якімі валодаў Я.Дыла, былі перададзены ў маскоўскі музей[109].

У 1924 г. СНК БССР была выдадзена пастанова «Аб абавязковай перадачы ў Цэнтрархіў БССР архіўных матэрыялаў асоб былой царскай сям'і, актыўных дзеячаў контррэвалюцыі і г. д.» У дэкрэце дакладна вызначаліся віды дакументаў, што падлягалі захоўванню, менавіта афіцыйныя дакументы, мемуары, дзённікі, асабістае ліставанне, рукапісы навуковых прац і даследаванняў, нататнікі, фотаздымкі.

У сувязі з прыняццем 28 мая 1927 г. пастановы аб АДАФ, супрацоўнікамі архіваў, музеяў і краязнаўчых арганізацый было ўзнята пытанне аб эфектыўным пошуку і канцэнтрацыі дакументаў, у т. л. і былых прыватных архіваў у дзяржаўных архівах, і неабходнасці шчыльнага супрацоўніцтва ў гэтым накірунку.

---

[107] Вітэк Д. Навуковая спадчына А. Сапунова // Савецкая Беларусь. – № 237. – 1924. – 12 кастр. – С. 3; Матэрыялы аб стане архіваў Віцебскага, Сенненскага і Аршанскага паветаў. 1919–1920 // ДА Віцебскай вобл. – Фонд. 289. – Воп. 1. – Адз. зах. 17. – Л. 1–4.

[108] Ліставанне аб выяўленні сшытка з запісамі К. Ф. Рылеева ды інш. пытаннях. 1926. // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 1. – Адз. зах. 115. – с.28–29.

[109] Лісты У. Бонч-Бруевіча Я. Дыле. 1934. // НДАР РДБ. – Фонд 369. – Карт. 145. – Адз. зах. 63. – Л. 1–3.

Статус архіваў асабістага паходжання ў межах цэнтралізаванай дзяржаўнай архіўнай сістэмы быў канчаткова вызначаны Палажэннем аб архіўным упраўленні БССР 1930 г., у адпаведнасці з якім у склад ДАФ БССР былі ўключаны архівы былых землеўладальнікаў, рукапісы, забароненыя для публікацыі, безгаспадарчыя, вымарачныя, канфіскаваныя ды інш. матэрыялы, якія мелі навукова-культурную ці гістарычную каштоўнасць (рукапісы, прыватнае ліставанне, дзённікі і г. д.), а таксама дакументы, што знаходзіліся па-за межамі БССР, але былі створаныя на дадзенай тэрыторыі.

Трэба адзначыць, што заканадаўчыя рэформы 1918–1919 гг. і наступных гадоў, скіраваныя на суцэльную нацыяналізацыю і цэнтралізацыю, а таксама ліквідацыя права прыватнай уласнасці на дакументы не спрыялі фарміраванню і эфектыўнаму захоўванню асабістых архіваў.

У 1920–1930-я гг. своеасаблівым цэнтрам збірання асабістых архіваў дзеячаў беларускай літаратуры і мастацтва стаў беларускі аддзел Дзяржаўнай бібліятэкі БССР. З бібліятэкай супрацоўнічалі такія выдатныя дзеячы таго часу як рэжысёр Еўсцігней Міровіч, музыказнаўца Ю. Дрэйзін, рэжысёр Уладзіслаў Галубок, грамадскі дзеяч і пісьменнік Язэп Дыла, паэты Язэп Пушча, Уладзімір Жылка, пісьменнік Змітрок Бядуля. Працаўнікамі бібліятэкі былі Станіслаў Шушкевіч, Яўгенія Пфляўмбаўм, Зміцер Астапенка, Мікола Ўлашчык ды інш., што клапаціліся аб захоўванні дакументальнай спадчыны і стварылі пэўны культурны асяродак.

Янка Купала перадаў загадчыцы аддзела беларускай літаратуры Ю. Бібіле свае рукапісы: *«Аднойчы адчыняюцца дзверы аддзела і з'яўляецца Купала: у адной руцэ адмысловы кіёк, у другой вялікі пачак папер. Перадаючы яго мне, ён сказаў: «Гэта мае рукапісы. У вас яны лепей захаваюцца»*[110]. Гэта былі рукапісы зборнікаў «Жалейка», «Шляхам жыцця» і асобныя дакументы.

У гэты ж час вучоным і мовазнаўцам Язэпам Лёсікам, які займаўся разборам літаратурнай спадчыны Каруся Каганца і публікацыяй яго твораў, у Дзяржаўную бібліятэку быў перададзены асабісты архіў пісьменніка. З 1931 г. тут захоўваліся таксама некаторыя рукапісы Цішкі Гартнага (Зміцера Жылуновіча), а з 1940–1941 гг. – Змітрака Бядулі (Самуіла Плаўніка).

У 1920-х гг. навуковыя сілы Беларусі канцэнтраваліся ў асноўным вакол Інстытута Беларускай культуры (Інбелкульта), які меў

---

[110] Запіска Ю. Бібілы ў Дзяржаўную бібліятэку імя У.І. Леніна аб лёсе рукапісаў Я. Купалы. 1974. // НДАК НББ. – Фонд 2. – Воп. 1. – Адз. зах. 51. – Л. 1; Бібіла Ю. Старонкі памяці. Першыя вёрсты. // Літаратура і мастацтва. – 1967. – 5 ліст. – С. 6.

права ствараць архівы, музеі і бібліятэкі, праводзіць навуковыя канферэнцыі, арганізоўваць раскопкі і экспедыцыі.

Першапачаткова ў 1921 г. у складзе Наркамасветы быў створаны Акадэмічны цэнтр, які аб'яднаў вучоных, што мелі дачыненне да вывучэння і аховы гісторыка-культурнай спадчыны, кіраваў дзейнасцю навукова-даследчых, мастацкіх устаноў, меў музейную, бібліятэчную і архіўную камісіі. Заснаваная ў 1925 г. у яго складзе Літаратурная секцыя і адпаведная Камісія збіралі рукапісы беларускіх пісьменнікаў. Тут захоўваліся дакументы Аляксандра Прушынскага, Антона Лявіцкага і Паўлюка Труса.

Гісторыка-археалагічная секцыя набыла рукапісы, што засталіся пасля смерці музыканта А. Чартовіча[111]. Сюды былі перададзены М. Касяровічам з Віцебска – рукапісы Івана Насовіча, Адамам Багдановічам з Яраслаўля – рукапісы сына Максіма, з Віцебскага музея – копіі лістоў Яна Баршчэўскага, з Бабруйска – сшытак з творамі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча («Гапон» і некалькі асобных вершаў).

Пры мастацкай секцыі, якую ўзначальваў Язэп Дыла, у 1925 г. была арганізавана Гістарычна-музейная камісія, што актыўна збірала матэрыялы па гісторыі тэатра ў Беларусі і распрацавала дзеля гэтага спецыяльныя абвесткі. Камісія заснавала Тэатральны музей Інбелкульта, куды перадалі ўласныя дакументы Ф. Ждановіч, Ч. Родзевіч, Я. Дыла, М. Ільінскі, М. Красінскі, А. Паўловіч ды інш. Браніслаў Эпімах-Шыпіла, Паўліна Мядзёлка і Іван Краскоўскі абяцалі перадаць свае зборы .

У 1926–1929 гг. музей атрымаў ад Вацлава Ластоўскага архіў тэатра Ігната Буйніцкага, ад Уладзіслава Галубка – архіў яго ўласнай трупы, ад М. Ільінскага – матэрыялы пра жыццё і творчасць Францішка Аляхновіча. У 1925 г. ва ўтворанай пры Інбелкульце бібліятэцы захоўваўся архіў грамадскага дзеяча і палітыка Алеся Бурбіса[112].

Папулярызацыі ідэі збірання і захоўвання гістарычных дакументаў паспрыяла правядзенне Першага навуковага беларускага кангрэса, які звярнуўся з адпаведным заклікам да грамадзян Беларусі. Размова ішла пра збіранне беларускіх старажытнасцей

---

[111] Інстытут беларускае культуры. Гісторыя стварэння. Сучасная структура. Навукова-даследчыцкая дзейнасць / А. І. Цьвікевіч. – Мінск: Дзяржвыд. Беларусі, 1926. – 72 с.; Бываеўскі Н. Скарбы творчасці пісьменніка (атрыманыя рукапісы М. Багдановіча) // Савецкая Беларусь. – № 134 (831).– 1923. – 16 чэрв. – С. 3–5.

[112] Пратакол першага пасяджэння гістарычна-музейнай камісіі тэатральнай падсекцыі Інбелкульта. 16.03.1925 // ЦНА НАНБ. – Фонд. 67. – Воп. 1. – Адз. зах. 6. – Л. 5.

(рэчаў, кніг, рукапісаў) з мэтай іх выкарыстання падчас выстаў, а таксама магчымага набыцця іх музеем ці бібліятэкай[113].

Асабістыя архівы савецкіх грамадскіх і палітычных дзеячаў не збіраліся цэнтралізавана. У фондах устаноў захаваліся толькі асобныя дакументы або іх невялікія часткі. Службовыя дакументы (лісты, даклады ды інш.) М. Гікалы, К. Гея, У. Ігнатоўскага, А. Мяснікова, А. Чарвякова знаходзяцца сёння ў фондзе Інстытута гісторыі партыі ў НАРБ. Сярод асабістых дакументаў асаблівую цікавасць прадстаўляюць дзённік Васіля Каржа за 1941–1942 гг. і яго ўспаміны, дзённік і рукапісы Сымона Рак-Міхайлоўскага, рукапісы нарысаў і нататкі Браніслава Тарашкевіча ды інш.

Асабісты архіў Палуты Бадуновай, што ўключаў дакументы па гісторыі беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху, быў у 1926 г. набыты Музеем рэвалюцыі Гістпарта пры садзейнічанні Цэнтрархіва ў асобах Зміцера Жылуновіча і Міхаіла Мялешкі[114].

У 1930-х гг. у БССР падчас рэпрэсій асабістыя архівы знішчаліся, канфіскоўваліся, асядалі ў архівах НКУС, часам станавіліся аб’ектам куплі-продажу. Так, у асабістым архіве літаратуразнаўцы Лукаша Бэндэ захаваліся дакументы рэпрэсаваных паэтаў і пісьменнікаў Сяргея Грахоўскага, Максіма Гарэцкага, Уладзіміра Дубоўкі, Янкі Журбы (Івана Івашына), Язэпа Пушчы (Іосіфа Плашчынскага) ды інш.[115]

Лёсы архіваў асабістага паходжання беларускіх дзеячаў па-за межамі ўласна БССР склаліся па-рознаму. Адныя трапілі на захоўванне ў створаныя ў пачатку XX ст. навуковыя таварыствы. Так, напрыклад, Аддзел рукапісаў бібліятэкі Таварыства сяброў навук у Вільні пачаў камплектавацца ў 1907 г. Першым паступленнем

---

[113] Справаздача камісіі па арганізацыі Першага беларускага навуковага кангрэсу. жнівень 1925 – люты 1926. // ЦНА НАНБ. – Фонд. 67. – Воп. 1. – Адз. зах. 18. – Л. 33–35; Адозва Камісіі па скліканні Першага навуковага Беларускага кангрэсу да грамадзян Беларусі аб зборы і дастаўцы на выставу кангрэса гістарычных матэрыялаў. [1920-я]. // БДАМЛМ. – Фонд 53. – Воп. 1. – Адз. зах. 330. – Л. 1.

[114] Матэрыялы беларускіх паслоў і працоўнай «Грамады». Дзённік і рукапісы С. Рак-Міхайлоўскага, копіі судовай дакументацыі і апеляцый П. Мятлы, касацыйнай скаргі М. Бурсевіча ды інш. 1926–1931. // НАРБ. Фонд 242. – Воп. 1. – Адз. зах. 108; Рукапісы, лісты, артыкулы і кароткая біяграфія Б. Тарашкевіча. 1930. // НАРБ. – Фонд 242. – Воп. 1. – Адз. зах. 371; Дзённік і ўспаміны В.З. Каржа. Успаміны аб барацьбе з белапалякамі ў 1922–1925, удзеле ў арганізацыі партызанскага руху ў Заходняй Беларусі барацьбе на акупаванай тэрыторыі ў 1941–1945, сваёй працоўнай дзейнасці. 1941–1966. // НАРБ. – Фонд 4683. – Воп. 3. – Адз. зах. 712–713; Гесь А. М., Калеснік Н. Я. Як трапілі ў архіў дакументы Палуты Бадуновай // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. / рэдкал. Ю. М. Бохан [ды інш.] – Мінск, 2007. – Вып. 5 – С. 14–20.

[115] Матэрыялы розных асоб, што адклаліся ў фондзе Л. А. Бэндэ. 1859–1960. // Фонд. 66. – Воп. 1. – Адз. зах. 1249–1501.

стала калекцыя з 5 тыс. лістоў Адама Кіркора, перададзеная Аляксандрам Ельскім. У 1931 г. тут захоўвалася 804 тт. фасцыкулаў і 1 906 дакументаў, падараваных 205 асобамі, сярод якіх знаходзіліся лісты Тадэвуша Касцюшкі да генерала Ю. Серакоўскага (1814–1817), карэспандэнцыя Яна Карловіча, дакументы сям'і Занаў (у тым ліку Тамаша Зана), архіў сям'і Лапацінскіх з Сар'і[116] ды інш. Пералічаныя дакументы, а таксама матэрыялы Элізы Ажэшкі, Міхала Брэнштэйна, Альфонса Парчэўскага ды інш. знаходзяцца сёння ў фондзе Таварыства ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы.

Адным з першых сховішчаў асабістых архіваў беларускіх грамадскіх, палітычных і культурных дзеячаў стаў Беларускі музей імя Івана Луцкевіча ў Вільні, арганізаваны ў 1921 г. У аддзеле рукапісаў музея знаходзіліся часткі асабістых архіваў Алаізы Пашкевіч (Цёткі), Вацлава Ластоўскага, Браніслава Тарашкевіча, Аляксандра Цвікевіча, Кляўдуша Душ-Душэўскага, Лявона Дубейкоўскага, Паўла Жаўрыда, братоў Івана і Антона Луцкевічаў, Аркадзя Смоліча ды інш.

Таксама там апынуліся аўтографы, рукапісы беларускіх паэтаў, пісьменнікаў, мовазнаўцаў і фалькларыстаў Яна Чачота, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Адама Гурыновіча, Янкі Лучыны, Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Максіма Танка, Піліпа Пестрака, Змітрака Бядулі, Міхася Машары, Максіма Гарэцкага, Еўдакіма Раманава. Знаходзіліся тут і часткі фамільных архіваў Тышкевічаў (XVI–XIX стст.), Сапегаў (1571–1728), Радзівілаў (XVII–XVIII стст.), Кастравіцкіх (1600–1837), Касцюшкаў (1530–1906).

Паводле сведчання загадчыка музея Янкі Шутовіча, беларускія творцы пакідалі свае дакументы на часовае захоўванне, а потым мелі магчымасць забраць іх. У адпаведнасці з вопісам, што быў складзены супрацоўнікамі музея ў 1944 г., у скрынках №№ 28–31 захоўваліся дакументы амаль 70-ці дзеячаў, у тым ліку комплекс дакументаў, што застаўся пасля смерці Францішка Аляхновіча. Пасля расфарміраванння музея некаторыя дакументы разышліся па прыватных зборах. Напрыклад асабісты архіў фалькларыста Антона Грыневіча знаходзіўся ва ўласнасці А. Разанава ў Вільні, і ў 1979 г. быў набыты Бібліятэкай АН БССР.

Сёння дзве асноўныя дакументальныя часткі музея захоўваюцца ў Віленскім беларускім фондзе Аддзела рукапісаў ЦБАН Літ-

[116] Brensztejn M. Informator o towarzystwach naukowych, oświatowych, artystyczno-popularnych, filantropijnych, wzajemnej pomocy, sportowych i klubach na Litwie i Rusi Białej. – Wilno: Druk Lozefa Zawadskiego, 1914. –S. 39.

вы, а таксама ў Калекцыі рукапісаў БДАМЛМ. Яны ўтрымліваюць часткі асабістых архіваў больш 100 асоб[117].

У міжваенны перыяд былі створаны мемарыяльныя музеі Адама Міцкевіча ў Навагрудку (1938), Тадэвуша Касцюшкі ў Мерачоўшчыне (1920-я гг.), Элізы Ажэшкі ў Гродне (1930-я, расфарміраваны ў 1939 г.), зборы якіх загінулі падчас вайны.

Захаванне асабістых архіваў дзеячаў беларускай эміграцыі цесна звязаны з дзейнасцю Беларускага замежнага архіва (БЗА), які быў створаны ў 1928 г. у Празе і лічыцца страчаным. Спробы ўпарадкавання архіва прадпрымаліся ў 1943 г. Іванам Ермачэнкам і Кастусём Езавітавым былі ўзняты пытанні аб пошуку і метадах захоўвання асабістых архіваў дзеячаў нацыянальнага руху: *«Калі думаеце сабраць дакументы толькі шляхам прымусовага канфіскавання іх, дык можа здарыцца, што архівы будуць гэтак захаваны, што мы не здабудзем іх нават у копіях, бо нямала ёсць людзей, якія не пажадаюць іх здаваць. Яны для іх складаюць асабістую або фамільную памяць. І гэтае права ўласнасці трэба шанаваць!»*[118]

Кастусь Езавітаў меў вялікі асабісты архіў, большая частка якога не знойдзена. Захаваліся часткі асабістых архіваў Вацлава Ластоўскага, Язэпа Варонкі, Антона Луцкевіча, Кастуся Езавітава. Страчаны архівы Янкі Серады, Язэпа Лёсіка, Пётра Крэчэўскага, Васіля Захаркі, Аляксандра Цвікевіча[119].

У склад Рускага замежнага гістарычнага архіва (РЗГА), перададзенага ў 1945 г. у Маскву з Прагі, уваходзілі дакументы аб дзейнасці БНР і частка архіва Івана Ермачэнкі. У склад РЗГА трапілі таксама дакументы ўраджэнца Беларусі, навукоўца і дзеяча між-

---

[117] Картатэчны вопіс рукапісаў і кніг Беларускага музея ў Вільна. // АРРК ЦНБ НАНБ. – Фонд 23. – Воп. 1. – Адз. зах. 559; З успамінаў Янкі Шутовіча // Спадчына. – 1995.– № 1. – С. 42; Запартыка Г. Перспектывы навуковай рэканструкцыі музея імя І. Луцкевіча ў Вільні // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей, праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): Матэрыялы Міжнар. навук. канфер., якая адбылася ў Мінску пад эгідай UNESCO 19–20 чэрвеня 1997. Вяртанне-4 / рэд. кал. А. Мальдзіс (гал. рэд.) [ды інш.] – Мінск: ННАЦ, 1997.– С. 178–183; Лабынцаў Ю. А. Архіў Беларускага Адраджэння (Дакументальныя помнікі беларускай царкоўнай і грамадзянскай гісторыі ў зборах Музея імя І. Луцкевіча ў Вільні) – Мінск, 1993. – С. 26–29.

[118] Сурмач Г.І. Беларускі загранічны архіў // Беларускі гістарычны часопіс. – 1993. – № 1. – С. 22.

[119] Мальдзіс А. Пра лёс архіва К. Езавітава // Вяртанне-3: зборнік артыкулаў і дакументаў / Беларускі фонд культуры. – Мінск, 1996. – С. 244–248; Архівы Беларускай Народнай рэспублікі: у 2-х кн. / Беларускі ін-т навукі і мастацтва, Тав-ва беларускага пісьменства; уклад. С. Шупа – Вільня–Нью-Йорк–Менск–Прага, 1998. – Т. 1, Кн. 1. Фонд № 582. Дзяржаўнага архіву Літвы (Рада мінстраў Беларускай народнай рэспублікі) – С. XVII

народнага руху М. Судзілоўскага, мемуары эсэра Г. Аронсана, якія былі прыняты на захоўванне Дзяржаўным архівам Віцебскай вобл. (пасля 1953 г.) Да гэтай жа групы можна аднесці архіў генерал-маёра царскай арміі А. Асецкага, што трапіў у ЦДАКР БССР. Часткі асабістых архіваў дзеячаў нацыянальнага руху Канстанціна Езавітава, Васіля Русака, Тамаша Грыба, Івана Ермачэнкі, Антона Адамовіча трапілі ў ЦДАКР ужо пасля вайны і характарызаваліся як *«комплекс матэрыялаў белай эміграцыі»*[120].

Асабістыя архівы дзеячаў беларускага нацыянальнага руху з'яўляюцца адной з найкаштоўнейшых крыніц аб дзейнасці эміграцыйных беларускіх уладаў і ўтрымліваюць не толькі асабістыя, але і афіцыйныя дакументы беларускіх арганізацый за мяжой. Так, у фондзе В. Русака захаваліся дакументы Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Беларускай грамады ў Празе; у фондзе К. Езавітава – дакументы ваенна-дыпламатычнай місіі БНР, Міністэрства беларускіх спраў, у фондзе І. Ермачэнкі – дакументы па гісторыі Беларускай партыі эсэраў, ліставанне (за 1920–30-я гг.), у якім адлюстраваны ўдзел дзеячаў БНР у тагачаснай еўрапейскай палітыцы; у асабістым архіве В. Захаркі – каштоўныя дакументы аб дзейнасці БНР, а таксама асабісты архіў П. Крэчэўскага. З другога боку асабістыя дакументы знаходзяцца таксама і ў фондах устаноў. Напрыклад, дакументы Язэпа Варонкі знаходзяцца ў фондзе БНР.

Збіраннем асабістых архіваў у гэты час займаліся калекцыянеры, навукоўцы, пісьменнікі, грамадскія дзеячы і палітыкі Я. Арлоўскі, А. Брадоўскі, М. Гарэцкі, Р. Зямкевіч, Я. Карскі, А. Луцкевіч, М. Піятуховіч, Б. Тарашкевіч, А. Шлюбскі, Я. Шутовіч, Б. Эпімах-Шыпіла, Ю. Ядкоўскі ды інш., якія разумелі вялікую каштоўнасць сваіх збораў. Так, прафесар Браніслаў Эпімах-Шыпіла, багацейшыя зборы якога не захаваліся, пісаў: *«Астаўшыся тут [у Пецярбургу – В. І.] адзінокім, ... каб ня ксіонжкі і зьбёры, у што я ўлажыў усю сваю душу, пехатой нават паплёўся б*

[120] Ліставанне з ГАУ МУС СССР, АУ МУС ЛітССР, Дзяржаўным архівам Смаленскай вобл., дзяржархівамі БССР аб выяўленні дакументаў па гісторыі Беларусі з мэтай іх мікрафотакапіравання, перадачы няпрофільных фондаў у іншыя архівы ды інш. 1957–1958. // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 5. – Адз. зах. 680. – С. 37; Стужынская Н. Матэрыялы па гісторыі Беларусі ў рускім замежным гістарычным архіве // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей, праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): Матэрыялы Міжнар. навук. канфер., якая адбылася ў Мінску пад эгідай UNESCO 19–20 чэрвеня 1997. Вяртанне–4 / рэд. кал. А. Мальдзіс (гал. рэд.) [ды інш.] – Мінск, 1997.– С. 184–187.

*у Бацькаўшчыну, але не мог гэтага зрабіць, бо жалеў кідаць дарагое для сябе сабранне беларушчыны»*[121].

Менавіта на аснове прыватных калекцый у 1918–1920 гг. былі арганізаваны дзяржаўныя музеі. Напрыклад, у Гродне – са збораў Юзэфа Ядкоўскага і Яўстаха Арлоўскага, у Віцебску – Антона Брадоўскага, Вацлава Федаровіча, Еўдакіма Раманава, Аляксея Сапунова, у Гомелі – князя Івана Паскевіча.

Такім чынам, у акрэслены перыяд захоўванне асабістых архіваў у складзе сядзібных і фамільных архіваў, а таксама грамадскіх аб'яднанняў і ўстаноў, якія існавалі да 1917 г. было спынена. Па прыкладу агульнарасійскай была створана заканадаўчая база БССР, згодна з якой у склад ДАФ БССР былі ўключаны таксама архівы асабістага паходжання. У рамках стварэння адзінай цэнтралізаванай архіўнай сістэмы яны пачалі прымацца на захоўванне новымі дзяржаўнымі інстытутамі памяці – архівамі, музеямі і бібліятэкамі.

Прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі разумелі неабходнасць захоўвання асабістых архіваў дзеячаў літаратуры, мастацтва, навукі, культуры, грамадска-палітычнага жыцця. Установамі і прыватнымі асобамі былі зроблены захады па збіранню архіваў асабістага паходжання, аднак складаныя гістарычныя ўмовы (ваенныя дзеянні, змена грамадска-палітычнага ладу, падзел тэрыторыі Беларусі паміж Польшчай і СССР, рэпрэсіі 1930-х гг. ды інш.) прыводзілі да драблення, вывазу, поўнага ці частковага знішчэння большасці з іх.

Захоўванне асабістых архіваў па-за межамі БССР адбывалася ў Беларускім музеі імя Івана Луцкевіча ў Вільні, у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР, Інбелкульце, Беларускім замежным архіве, фондах дзяржаўных устаноў, прыватных калекцыях. Асабістыя архівы станавіліся асяродкам захоўвання архіваў грамадска-палітычных арганізацый і ўстаноў. З імёнамі Язэпа Варонкі, Вацлава Ластоўскага, Кастуся Езавітава, Антона Луцкевіча звязана захоўванне архіваў БНР.

У другой палове XX ст., дзякуючы намаганням супрацоўнікаў архіваў, музеяў і аддзелаў рукапісаў бібліятэк, на дзяржаўнае захоўванне паступілі асабістыя архівы дзеячаў гэтага перыяду А. Бабарэкі, М. Васілька, З. Верас, М. Гарэцкага, У. Дубоўкі, К. Каганца, А. Клімовіча, І. Краскоўскага, Л. Клейнбарта, А. Станкевіча, У. Пігулеўскага, Я. Пушчы, П. Глебкі, М. Чарота, Я. Шутовіча, сямейны

---

[121] Ліст Б. Эпімаха-Шыпілы да Я. Дылы. 21 жніўня 1922. // БДАМЛМ. – Фонд 53. – Воп. 1. – Адз. зах. 239.

архіў Багдановічаў ды інш. Стварэнне мемарыяльных музеяў Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча пасадзейнічала рэканструкцыі страчанай рукапіснай спадчыны славутых песняроў.

## *Збіранне і захоўванне асабістых архіваў у БССР у 1945–1991 гг.*

Другая сусветная вайна прынесла значныя страты дакументальнай архіўнай спадчыне Беларусі, якая скарацілася амаль удвая. Асноўныя цэнтры канцэнтрацыі асабістых архіваў – Дзяржаўная бібліятэка БССР, Акадэмія навук БССР і Беларускі музей імя Івана Луцкевіча ў Вільні – прыпынілі сваю працу. Фонды бібліятэкі, у т. л. і рукапісныя, былі амаль цалкам знішчаны.

Беларускі музей у Вільні быў расфарміраваны, а яго экспанаты і дакументы прыняты на захоўванне ў дзяржаўныя архівы і музеі Літвы і Беларусі. Напалову загінулі зборы Віцебскага і Гродзенскага абласных музеяў. Быў цалкам страчаны фонд Магілёўскага музея, які захоўваў асабістыя архівы прадстаўнікоў мясцовай інтэлігенцыі, а таксама мемарыяльнага музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку.

Вайна знішчыла багатыя калекцыі Рамуальда Зямкевіча, Юзава Галомбкі, архівы Міхала Баброўскага, паэтаў і пісьменнікаў Францішка Багушэвіча, Максіма Багдановіча, Вінцэся Каратынскага, грамадска-палітычнага дзеяча Алеся Бурбіса, архівіста і гісторыка Баляслава Брэжгі ды інш.

Збіранне ацалелых дакументаў, прадметаў і кніг пачалося адразу пасля вызвалення, але толькі ў канцы 1950-х гг. праца архіваў музеяў і бібліятэк Беларусі ў гэтым накірунку дасягнула належнага ўзроўню. Гэты перыяд вызначыўся актыўнай працай па пошуку і ўліку крыніц беларускай гісторыі ў архівах, бібліятэках і музеях саюзных рэспублік і Польшчы. У архіўнай галіне актыўна ажыццяўляўся абмен дакументамі з цэнтральнымі архівамі СССР і Літоўскай ССР. Быў таксама завершаны працэс фарміравання цэнтралізаванай сістэмы архіўнага захоўвання ў БССР.

Дзяржаўныя архівы Беларусі ў першай палове ХХ ст. амаль не камплектаваліся асабістымі архівамі. Гэты працэс фактычна пачаўся толькі ў другой палове ХХ ст.

У 1945 г. у аддзелы сакрэтных фондаў ЦДАКР усіх савецкіх рэспублік, у т. л. і БССР, паступілі спецыяльна распрацаваныя схемы агляду фондаў асабістага паходжання, дзе была дадзена харак-

тарыстыка іх асаблівасцяў, вызначаны спіс асоб, чые архівы браліся на дзяржаўны ўлік, што значна паспрыяла іх захаванню[122].

У верасні 1945 г. у Гомельскім абласным дзяржаўным архіве захоўваўся адзін фонд асабістага паходжання Румянцавых-Паскевічаў. У 1946 г. пры разборы архіва, вернутага з г. Мыславіцы (Польшча) былі знойдзены рукапісы вершаў Янкі Купалы, якія ў далейшым былі перададзены ў музей паэта[123].

Да канца 1950-х гг. на захоўванні ў дзяржаўных архівах БССР знаходзіліся ў асноўным фамільныя фонды, некалькі асабістых фондаў грамадскіх дзеячаў, і цалкам адсутнічалі асабістыя фонды дзеячаў навукі і культуры.

Пазней фондамі асабістага паходжання пачаў камплектавацца Дзяржаўны архіў Мінскай вобл., куды першапачаткова былі прыняты дакументы былога Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў, фамільны архіў князёў Друцкіх-Любецкіх, а таксама асабісты фонд беларускага калекцыянера і публіцыста Аляксандра Ельскага. У ЦДГА трапілі фонды Булгакаў, Любамірскіх і перададзеныя з Гомеля дакументы Румянцавых-Паскевічаў. Філіял ЦДГА ў Гродне папоўніўся фондамі землеўладальнікаў Гродзенскай губерні Быхаўцаў і Слізняў. На сакрэтным захоўванні ў ЦДАКР БССР знаходзіліся дакументы *«буржуазных нацыяналістаў»* К. Езавітава, В. Русака, У. Сядуры, Т. Грыба, Ант. Адамовіча, А. Салаўя.

У 1956 г. кіраўнік дзяржаўнай архіўнай службы БССР А. І. Азараў, упершыню ў складзе савецкай дэлегацыі ўдзельнічаў у III Міжнародным кангрэсе архіваў у Фларэнцыі, дзе таксама закранална праблема захоўвання прыватных архіваў. У межах падрыхтоўкі да кангрэсу было падрыхтавана кароткае паведамленне аб шляхах і стане захоўвання прыватных архіваў у БССР[124], якое па сутнасці мела дэкларатыўны характар. У ім узгадваліся толькі дакументы Янкі Купалы, што захоўваліся ў мемарыяльным музеі.

---

[122] Рэзалюцыя куставай нарады начальнікаў аддзелаў сакрэтных фондаў дзяржархіваў рэспублік ад 18 чэрвеня 1945 г. аб стане выкарыстання сакрэтных фондаў у аператыўных мэтах, агляды працы архіўных устаноў НКУС БССР аб выкарыстанні дакументаў у народагаспадарчых мэтах і ліставанне з АУ НКУС БССР. 1944–1945. // НАРБ. – Фонд 250. – Воп. 6. – Адз. зах. 3. – Л. 1–3; Ліставанне з АУ МУС БССР аб камплектаванні архіваў сакрэтнымі дакументамі і перадачы няпрофільных фондаў. 1953. // НАРБ. – Фонд 250. – Воп. 6. – Адз. зах. 120. – Л. 1–2.

[123] Ліставанне з ЦК КПБ і ЦДАКР БССР аб перадачы музею Я. Купалы рукапісаў вершаў паэта. 1946. // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 5. – Адз. зах. 82. – Л. 1, 5.

[124] Дакументы аб падрыхтоўцы і ўдзеле дэлегацыі АУ БССР у прыцы III Міжнароднага кангрэса архіваў у Фларэнцыі (1956 г.), Круглага стала архіваў у Загрэбе (1957 г.), Вісбадэне і Франкфурце на Майне (1958 г.) // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 5. – Адз. зах. 540. – Л. 20–21.

У сваёй справаздачы па выніках кангрэсу Азараў адзначаў: *«Вялікая ўвага кангрэса была прысвечана абмеркаванню даклада Р. Філангіеры «Прыватныя архівы». Гэтае пытанне з'яўляецца найбольш вострым у сучасным архівазнаўстве. Тут у канфлікт уваходзяць два прынцыпы: прынцып прыватнай уласнасці і прынцып грамадскай зацікаўленасці»*[125].

У маі 1958 г. А. І. Азараў прыняў удзел у працы IV Міжнароднай канферэнцыі круглага стала архіваў у Вісбадэне і Франкфурце-на-Майне (ФРГ), дзе разглядаліся праблемы захоўвання архіваў літаратуры і мастацтва. У падрыхтоўцы даклада з аглядам стану захоўвання дакументаў асабістага паходжання ў БССР удзельнічалі беларускія архівісты[126]. Пры абмеркаванні гэтай тэмы выступіў таксама кіраўнік савецкай дэлегацыі Л. Якаўлеў, які распавёў аб дзейнасці ЦДАЛМ СССР. У рэзалюцыі канферэнцыі адзначалася неабходнасць актыўнай працы ў накірунку стварэння архіваў літаратуры і мастацтва.

Дадзеныя падзеі бясспрэчна аказалі значны ўплыў на працу беларускіх архівістаў у накірунку захоўвання дакументаў асабістага паходжання, якая была шырока разгорнута пачынаючы з 1958 г., а яе кульмінацыяй стала стварэнне 9 чэрвеня 1960 г. Цэнтральнага дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва БССР – першага архіва такога кшталту сярод саюзных рэспублік.

Пасля правядзення XX з'езда КПСС (1956) у СССР сталі з'яўляцца першыя прыкметы пэўнай лібералізацыі архіўнай справы, менавіта пачалася распрацоўка новага Палажэння аб ДАФ.

6 сакавіка 1958 г. кіраўнікам архіўных упраўленняў МУС рэспублік ад імя кіраўніка ГАУ МУС СССР Г. Бялова быў разасланы цыркуляр, у якім адзначалася: *«У мэтах карэннага паляпшэння працы па выяўленні і збіранні дакументальных матэрыялаў асабістых фондаў... прапануецца вывучыць дадзенае пытанне і абмеркаваць яго на навуковым савеце ў 1958 г.»*[127]

13 жніўня 1958 г. было прынята Палажэнне аб ДАФ і сетцы цэнтральных дзяржаўных архіваў СССР, якое выключала магчымасць ператварэння дакументаў дзеячаў навукі і мастацтва ў аб'ект куплі-продажу паміж асобамі. Палажэнне было замацавана ды-

---

[125] Азараў А. Да вынікаў III Міжнароднага кангрэса архівістаў // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 5. – Адз. зах. 479. – Л. 306–312.

[126] Падрабязней гл.: Запартыка А.М., Запартыка Г.В. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Пачатак (да 50-годдзя заснавання) // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 11. / гал. рэд. Э.М. Савіцкі [ды інш.] – Мінск, 2010. – С. 6.

[127] Дакументы па распрацоўцы праблем канцэнтрацыі ў дзяржархівах фондаў асабістага паходжання і ўстанаўлення профіля камплектавання ЦДАЛМ БССР. 1958–1960 // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 5. – Адз. зах. 682. – Л. 1–1 адв.

рэктывай, якая паставіла перад дзяржаўнымі архівамі практычную задачу збірання асабістых архіваў.

Неабходна звярнуць увагу на актыўнасць даследчыкаў беларускай літаратуры. Так, у 1957 г. супрацоўнікі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР узнялі пытанне аб неабходнасці сістэматычнага збірання і забеспячэння захаванасці архіваў літаратурных дзеячаў, праца па збіранні якіх распачалася яшчэ ў 1954 г. Менавіта тады супрацоўнікі сектара рукапісаў і выданняў гэтага Інстытута звярнуліся да выдавецтваў, рэдакцый газет і часопісаў з прапановай набыцця і захавання творчай спадчыны беларускіх пісьменнікаў. Пры гэтым асноўны акцэнт рабіўся на неабходнасці сістэматычнага захоўвання архіваў выдавецтваў, у якіх адкладваліся шматлікія рукапісы, таму што *«немагчыма колькі-небудзь сур'ёзна вывучыць творчасць пісьменніка і прасачыць яго творчую эвалюцыю, не маючы яго рукапісаў»*[128].

У 1958 г. у рамках мерапрыемстваў па арганізацыі беларускага архіва літаратуры і мастацтва ў Інстытуце літаратуры АН БССР, дзе ўжо знаходзіліся матэрыялы рэдакцый часопісаў «Беларусь», «Маладосць», «Полымя» і газеты «Літаратура і мастацтва», былі складзены даведкі аб стане захоўвання літаратурных дакументаў і разасланы лісты ўсім пісьменнікам Беларусі з прапановай аб перадачы асабістых архіваў.

Напрыканцы 1950-х гг. у сувязі з пастаноўкай задачы канцэнтрацыі асабістых фондаў архіўнай службай БССР была праведзена праца па абследаванні розных сховішчаў, а вынікі выкладзены ў грунтоўным дакладзе Т.А. Трухінай[129].

У Аддзеле рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі Беларусі былі выяўлены дакументы Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Мітрафана Доўнар-Запольскага, Самуіла Маршака, Каруся Каганца; у БДМГВАВ – дзённікі герояў Савецкага Саюза К. Заслонава і Г. Дакутовіч, у Гомельскім краязнаўчым музеі – дакументы ўдзельнікаў рэвалюцыі, грамадзянскай і Другой сусветнай вайны, у Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі – архівы землеўладальнікаў Сразнеўскіх, Абуховічаў, Каменскіх, Чацвярцінскіх, П. Майота, В. Дулевіча.

---

[128] Фролова Н. О литературных архивах // Советская Белоруссия. – 1957. – 1 окт. – С. 3.

[129] Дакументы па распрацоўцы праблем канцэнтрацыі ў дзяржархівах фондаў асабістага паходжання і ўстанаўлення профіля камплектавання ЦДАЛМ БССР. 1958–1960 // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 5. – Адз. зах. 682. – Л. 23–42; Запартыка А. М., Запартыка Г. В. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Пачатак (да 50-годдзя заснавання) // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 11. / гал. рэд. Э. М. Савіцкі [ды інш.] – Мінск, 2010. – С. 17–27.

У выніку перад Міністэрствам культуры БССР было пастаўлена пытанне аб перадачы выяўленых дакументаў на захоўванне ў дзяржаўныя архівы. Так, з Навагрудскага і Слонімскага музеяў былі перададзены фонды Быхаўцаў і Слізняў.

У 1960 г. архіўная служба БССР перайшла ў падпарадкаванне Савета Міністраў, а з мэтай паляпшэння захоўвання асабістых архіваў дзеячаў літаратуры і мастацтва і ўстаноў культуры быў заснаваны ЦДАЛМ БССР. Створаны па прыкладу ЦДАЛМ СССР, ён з цягам часу стаў адзіным спецыялізаваным сховішчам асабістых архіўных фондаў у БССР. Упершыню ў друку ідэя стварэння рэспубліканскага архіва, які б займаўся сістэматычным камплектаваннем дакументамі асабістага паходжання прагучала ў артыкуле міністра ўнутраных спраў С. Сікорскага, дзе звярталася ўвага на неўпарадкаванасць іх захоўвання[130].

У гэты ж час узнікла ідэя арганізацыі аддзела асабістых фондаў у складзе ЦДАКР, але яна так і не была рэалізавана.

ЦДАЛМ БССР быў створаны ў адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў ад 9 чэрвеня 1960 г. У яго функцыі ўваходзілі збор і захоўванне асабістых архіваў беларускіх літаратараў і мастакоў, дакументаў дзяржаўных і грамадскіх устаноў культуры, а таксама арганізацыя іх выкарыстання[131].

У 1976 г. ЦДАЛМ набыў статус архіва-музея і атрымаў магчымасць браць на захоўванне музейныя прадметы і арганізоўваць выставы. У адрозненне ад ЦДАЛМ СССР, створанага на базе багатых калекцый Дзяржаўнага літаратурнага музея, ён не меў такой спадчыны.

Пошук дакументаў ажыццяўляўся не толькі ў Беларусі. Была арганізавана перадача дакументаў са сховішчаў саюзных рэспублік. Так, з ЦДА Літоўскай ССР паступілі дакументы рукапіснага аддзела Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні, з ЦДАМЛМ СССР – дакументы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Івана Грыгаровіча.

Асаблівую цікавасць прадстаўляе гісторыя калекцыі Аляксандра Ельскага, якая трапіла спачатку ў Дзяржаўны архіў Мінскай вобл. (1955), а потым была перададзена ў ЦДАЛМ[132]. З ЦДАКР БССР паступілі дакументы літаратурнага аб'яднання

---

[130] Сикорский С. И. О состоянии работы и задачах архивных учреждений БССР // Вопросы архивоведения.– 1959.– № 2. – С. 18–19.

[131] Пратаколы № 1–3 паседжанняў экспертна-ацэначнай камісіі ЦДАЛМ БССР. 25 кастрычніка 1960 – 24 чэрвеня 1961. // БДАМЛМ. – Архіў архіва. – Воп. 1. – Адз. зах. 1. – Л. 1–5.

[132] Запартыка Г. В. Да гісторыі калекцыі аўтографаў з бібліятэкі і музея старажытнасцей А. К. Ельскага ў Замосці // Беларускі археаграфічны штогоднік. / рэд. кал. Р. П. Платонаў (гал. рэд.) [ды інш.] – Мінск, 2001.– Вып. 2. – С. 41–42.

«Маладняк», Беларускага таварыства пісьменнікаў і кампазітараў, рукапіс твора Зміцера Жылуновіча «Бацькава воля». Архіў таксама стаў камплектавацца дакументамі Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Інстытута літаратуры АН БССР і цэлага шэрагу рэдакцый часопісаў і газет.

Першым асабістым фондам прынятым у ЦДАМЛ на захоўванне стаў фонд вядомага беларускага паэта, удзельніка нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі Міхася Машары. Пасля былі прыняты дакументы М. Васілька, М. Засіма, А. Жаўрука, Я. Брайцава ды інш.

У архіве была створана экспертна-ацэначная камісія, у склад якой увайшлі прадстаўнікі творчай эліты Беларусі, менавіта пісьменнікі В. Валынскі і С. Александровіч, музыказнаўца І. Нісневіч, мастацтвазнаўца Л. Мазалеўская, загадчык аддзела мастацкага музея, мастацтвазнаўца і мастак П. Герасімовіч. Асноўнай задачай камісіі было вырашэнне пытанняў набыцця і ацэнкі асабістых архіваў. Быў складзены спіс крыніц камплектавання, праведзена выяўленне дакументаў профілю архіва ў ЦДАЛМ СССР, Аддзелах рукапісаў бібліятэк Масквы і Ленінграда, Інстытуце сусветнай літаратуры АН СССР, у музеях А. Бахрушына і М. Глінкі, у АР ЦБАН Літвы, краязнаўчых музеях Беларусі.

У сярэдзіне 1960-х гг. вызначыліся асноўныя праблемы і накірункі працы ЦДАЛМ. Яны ўключалі пошук дакументаў для прыняцця на захоўванне, распрацоўку крытэрыяў каштоўнасці дакументаў для прыёму на ўмовах куплі-продажу, камплектаванне архіва фотадакументамі ды інш.

Дырэктар архіва К. Жорава звярнулася да грамадскасці Беларусі з заклікам уважліва ставіцца да захоўвання дакументаў па гісторыі беларускай літаратуры і мастацтва, спрыяць пошуку такіх дакументаў[133] . У адной з справаздач дырэктар адзначала: *«З першых дзён працы мы пачалі збіраць асабістыя архівы пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў... Шляхі збірання былі самыя розныя: асабістыя кантакты, афіцыйныя звароты да прадстаўнікоў беларускай культуры праз друк, пошукі праз друк і радыё, набыццё ў спадчыннікаў, мікрафільмаванне. У пачатку працы мы зрабілі шэраг паведамленняў аб мэтах і задачах працы архіва на сходах творчых работнікаў саюзаў рэдакцый і тэатрах. Шляхам асабіс-*

---

[133] Жорава К.С. Архіў – сховішча надзейнае // Літаратура і мастацтва. – 1964. – 12 чэрв. – С. 4; Жорава К.С. Захаваныя скарбы // Літаратура і мастацтва. – 1968. – 31 мая.– С. 1; Жорова К.С. О комплектовании Центрального государственного архива литературы и искусства // Материалы совещания работников архивных учреждений Белорусской, Молдавской, Украинской ССР, Юга и Поволжья СССР. Орджоникидзе, 26–29 октября 1962 / ГАУ при СМ СССР. – М., 1962. – С. 197–202.

*тых дамоўленасцяў атрымалі дакументальныя матэрыялы ад М. Танка, А. Русака, М. Машары, У. Дубоўкі, артыстаў З. Бандарчык, Т. Давыдава, М. Цурбакова і інш... Паэт С. Шушкевіч падказаў некалькі адрасоў асоб, якія маюць дакументы. Атрымалася адшукаць і прыняць у архіў 23 лісты Якуба Коласа... Адказны рэдактар Саюза пісьменнікаў І. Нісневіч расказаў аб тым, што ў Маскве жывуць родныя беларускіх кампазітараў Клумава і Палонскага...»*[134]

У 1970–1990-я гг. вёўся актыўны пошук дакументаў па ўсім СССР. З Масквы былі атрыманы архіў паэткі Канстанцыі Буйло, перакладчыка Я. Мазалькова, скульптара А. Грубэ, спявачкі Л. Аляксеевай ды інш. З Ленінграда – крытыка і літаратуразнаўцы Л. Бэндэ, перакладчыкаў Б. Кежуна і П. Кабзарэўскага, акцёраў Я. Палосіна і Л. Веснінай; з Пяцігорска – пісьменніка В. Гарбука; з Растова-на-Доне – паэта А. Жаўрука; з Яраслаўля – сям'і Багдановічаў; з Саратава – Я. Дылы; з Ташкента – перакладчыка С. Ліхадзіеўскага; з Вільні – пісьменніцы Людвікі Сівіцкай (Зоські Верас). З Польшчы з дапамогай вядомага навукоўца Адама Мальдзіса быў перададзены архіў Адама Гурыновіча. Таксама перадалі свае дакументы беларускі пісьменнік з Беластока Сакрат Яновіч і гісторык з Варшавы Юры Туронак. З Балгарыі паступілі дакументы перакладчыка Г. Вылчава, з Чэхаславакіі – опернага спевака М. Забэйды-Суміцкага, з США – паэта М. Сяднёва і спевака Б. Андрусішына (Данчыка)[135].

Напрыканцы 1960-х – пач. 1970-х гг. пытанне аб захоўванні дакументальнай спадчыны, у т. л. і асабістых архіваў стала ўздымацца ў кнігах Адама Мальдзіса і яго публікацыях на старонках газеты «Літаратура і мастацтва»[136]. Распавядаючы аб літаратуразнаўчых пошуках, аўтар даваў ацэнку стану і перспектываў захоўвання гістарычных крыніц асноўнымі інстытуцыямі грамадскай памяці: музеямі, бібліятэкамі, архівамі. Таксама закраналіся важныя пытанні гісторыі захоўвання асабістых архіваў беларускіх пісьменнікаў у XIX – пач. XX ст. у калекцыях А. Ельскага, Р. Зямкевіча, Ю. Галомбка ды інш.

---

[134] Жорова К. С. Опыт работы по комплектованию архива личными фондами. 1962. // БДАМЛМ. Даведачна-інфармацыйны фонд. – № 55. – С. 3–7.

[135] Запартыка Г. В. Да гісторыі камплектавання дзяржаўных архіваў Беларусі дакументамі асабістага паходжання // Архіўныя чытанні I–III: матэрыялы навуковых канферэнцый, Мінск, 2003–2005 гг./ укл. Г. В. Запартыка [ды інш.]; навук. рэд. А. В. Мальдзіс – Мінск, 2006. – С. 67.

[136] Мальдзіс А. Сляды продкаў // Літаратура і мастацтва. – 1970. – 16, 23, 30 кастр., 11, 25 снеж.

Да абмеркавання далучыліся гісторык, краязнавец, намеснік дырэктара Мінскага абласнога краязнаўчага музея ў Маладзечне Генадзь Каханоўскі, магілёўскі краязнавец І. Філіповіч, мастак А. Тычына, супрацоўнікі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Аддзела рукапісаў і рэдкай кнігі Фундаментальнай бібліятэкі АН БССР. Дзякуючы гэтаму адбыліся новыя знаходкі, пашырыліся магчымасці збірання, быў зроблены значны крок да абуджэння гістарычнай свядомасці грамадства.

Беларускія архівісты прымалі ўдзел у мерапрыемствах, што праходзілі на саюзным узроўні і тычыліся праблем захоўвання фондаў асабістага паходжання. У 1965 г. адбылася Ўсесаюзная нарада-семінар па камплектаванні дзяржаўных архіваў матэрыяламі асабістага паходжання, экспертызе каштоўнасці і фандзіраванні. На ім архівісткай Тамарай Лявонцьевай быў зроблены даклад аб структуры дакументаў фонду князёў Радзівілаў у ЦДГА БССР у Мінску, К. Някраш распавяла аб фондзе Лукаша Бэндэ ў ЦДАЛМ[137].

У сувязі з падрыхтоўкай першых тамоў даведніка «Асабістыя архіўныя фонды ў дзяржаўных сховішчах СССР» у архівах БССР былі складзены сціслыя даведкі, у якія ўносілася інфармацыя пра зборы, сямейныя і фамільныя фонды, калекцыі і ўласна асабістыя фонды чатырох беларускіх архіваў, менавіта ДА Мінскай вобл., ЦДАЛМ, ЦДГА ў Гродне і Магілёве.

У трэцім томе (1980 г.) былі ўлічаны больш 400 комплексаў дакументаў асабістага паходжання (большасць з іх малакалькасныя, ад 5 адз. зах.), што знаходзіліся на захоўванні ў БДМГВАВ (125), архіве Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў г. Горкі (1), Бібліятэцы Інстытута літаратуры АН БССР (1), Бабруйскага (13), Брэсцкага (1), Віцебскага (14), Слонімскага (3) і Слуцкага (4) краязнаўчых музеяў, Фундаментальнай бібліятэкі імя Якуба Коласа АН БССР (4), Дзяржаўнага музея БССР (111), Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея (27), ЦДАМЛМ (87) і ЦДГА БССР (4).

У 1960-я гг. на захоўванне ў Аддзел тэатра Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР была перададзена частка асабістага архіва вядомага грамадскага дзеяча і пісьменніка Язэпа Дылы, архіў удавы вядомага фалькларыста, этнографа і педагога Сяргея Сахарава. Пазней сюды трапіў архіў даследчыка беларускага тэатра, міністра культуры БССР С. Пятровіча.

У 1965 г. асабісты архіў акадэміка Ў. Перцава ў колькасці 25 адз. зах. (навуковыя працы і матэрыялы да іх, службовыя даку-

[137] Материалы всесоюзного совещания-семинара по комплектованию государственных архивов материалами личного происхождения, экспертизе их ценности и фондированию / Глав. арх. упр. при СМ СССР. – М., 1965. – С. 146–154; С. 138–142.

менты, выразкі з газет) быў перададзены ў ЦНА АН БССР, другая частка, што ўтрымлівала ўасноўным біяграфічныя дакументы, трапіла ў Дзяржаўны музей БССР.

У адрозненні ад агульнасавецкай сістэмы, дзе збіранне асабістых архіваў навукоўцаў праводзілася Архівамі Акадэмій навук, у Беларусі гэтая справа была распачата супрацоўнікамі Акадэмічнай бібліятэкі. Так, у 1968 г. з мэтай захавання творчай спадчыны выдатных дзеячаў навукі і культуры Фундаментальнай бібліятэцы АН БССР было даручана арганізаваць працу па збіранню асабістых архіваў, якую ўзначаліла загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Л. Збралевіч[138]. У 1969–1970 гг. пад яе кіраўніцтвам былі здзейснены экспедыцыі на поўдзень Беларусі. Дзякуючы гэтаму на захоўванне паступілі асобныя дакументы Ўладзіслава Сыракомлі і Георгія Каніскага.

Пошукам і апрацоўкай асабістых фондаў у сектары рукапісаў доўгі час займалася Я. Кісялёва. Асабістыя архівы паступалі як цэлымі комплексамі, так і ў выглядзе асобных дакументаў, якія тычыліся гісторыі і культуры Беларусі. У некаторых выпадках перадаваліся часткамі на працягу 10–20 гадоў.

Адным з першых на захоўванне паступіў архіў вядомага беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага, перададзены ў дар бібліятэцы яго ўдавой, пісьменніцай Л. Чарняўскай і дачкой Г. Гарэцкай. Паступілі таксама іншыя каштоўныя архівы, у прыватнасці мастака і этнографа Язэпа Драздовіча, беларускіх грамадскіх і культурных дзеячаў з Латвіі і Літвы С. Сахарава, Уладзіміра Пігулеўскага, Янкі Шутовіча, Адама Станкевіча ды інш., акадэмікаў М. Мацэпуры, І. Краўчанкі, Кандрата Крапівы ды інш. Адным з нешматлікіх фондаў з багатымі даваеннымі матэрыяламі стаў архіў Пятра Глебкі, перададзены яго жонкай у 1985 г.

У пасляваенны час у аддзеле рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі зборам дакументаў дзеячаў літаратуры і мастацтва займалася загадчык Ніна Ватацы. Асобныя дакументы (лісты С. Маршака і С. Шувалава) пасля вайны былі знойдзены сярод кніг, вывезеных з Германіі. З сабраных рознымі шляхамі дакументаў дзеячаў навукі і культуры была сфарміравана калекцыя, у якую ўвайшлі дакументы Ўладзіміра Пічэты, Мітрафана Доўнар-Запольскага, Еўдакіма Раманава, Аляксандра Семянтоўскага ды інш. Таксама быў

[138] Жук Т.И., Лис М.М. Вопросы организации работы с фондами личного происхождения в отделе редких книг и рукописей ЦНБ НАН Беларуси [Электронный ресурс] // Б-ка нац. акад. наук: пробл. функционирования, тенденции развития. – Киев, 2005. – Вып. 3. – Режим доступа: http://www.nbuv.gov.ua/articles/2005/05jticnb.html. – Дата доступа: 19.06.2007.

прыняты на захоўванне асабісты архіў бібліятэказнаўцы Яўгена Хлябцэвіча.

Накірунак камплектавання адпавядаў метадычным рэкамендацыям Дзяржаўнай бібліятэкі СССР 1981 г. Тым не менш Дзяржаўная бібліятэка БССР у гэты перыяд страціла статус адной з вядучых установ па збіранні і захоўванні архіваў асабістага паходжання.

Актыўны працэс камплектавання абласных і занальных архіваў Беларусі асабістымі архівамі распачаўся толькі ў канцы 1970-х гг. Хоць ДА Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей дакументы асабістага паходжання прынялі на захоўванне яшчэ ў 1950 і 1966 г. Пасля навуковай канферэнцыі 1974 г. па праблемах камплектавання дакументальнымі крыніцамі дзяржаўных архіваў СССР, ЦДАКР БССР дзяржаўныя архівы ў Гродне, Лідзе, Навагрудку, Глыбокім, Мінску распрацавалі праграмы па выяўленні і ўзяцці на ўлік асабістых архіваў дзеячаў навукі, культуры і палітычнай сферы[139].

Камплектаванне абласных і занальных архіваў дакументамі асабістага паходжання ішло па двух асноўных накірунках. Ствараліся асабістыя фонды і фарміраваліся калекцыі з малакалькасных асабістых архіваў якія, як правіла, мелі назву *«Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху і грамадзянскай вайны ў Расіі, Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі»*. У іх склад уключаліся дакументы дзеячаў вобласці ці раёна.

У маі 1964 г. ЦК КПСС прыняў пастанову «Аб павышэнні ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных», у якой былі замацаваны асноўныя накірункі музейнай палітыкі. Гаворка ішла пра стварэнне аддзелаў савецкага перыяду, адлюстраванне перамог камуністычнага будаўніцтва ў СССР, пашырэнне масава-асветніцкай працы ды інш. Яны вызначалі ідэалагічны характар музейнай справы.

У гэты ж час пры Міністэрстве культуры СССР быў створаны Навукова-метадычны савет па працы музеяў, у які ўвайшлі вядомыя навукоўцы краіны. У БССР падобны Савет існаваў пад кіраўніцтвам акадэміка Кандрата Атраховіча (Кандрата Крапівы) пры прэзідыуме АН БССР.

---

[139] Дакументы аб камплектаванні дзяржархіваў рэспублікі асабістымі фондамі, выкананні рэкамендацый навуковых канферэнцый па праблемах камплектавання дакументальнымі крыніцамі дзяржархіваў СССР. 1973–1975. // НАРБ. – Фонд 249. – Воп. 5. – Адз. зах. 1458. – Л. 53–64.

У 1978 г. быў прыняты закон «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры», у адпаведнасці з якім пачаў ажыццяўляцца дзяржаўны ўлік дакументальных помнікаў, што захоўваліся ў музеях, бібліятэках і архівах, а таксама знаходзіліся ў прыватнай уласнасці. Упаўнаважанымі органамі аховы помнікаў сталі Міністэрства культуры, Галоўнае архіўнае ўпраўленне пры Савеце міністраў БССР ды інш. дзяржаўныя органы.

Дакументы і копіі дакументаў з асабістых архіваў з'яўляліся асноўнай часткай літаратурных і мемарыяльных музеяў Элізы Ажэшкі ў Гродне (адноўлены ў 1940 г.), Адама Міцкевіча ў Навагрудку (адноўлены ў 1934 г.), Янкі Купалы ў Мінску (1944), Канстанціна Заслонава ў Оршы (1948), Якуба Коласа ў Мінску (1956), Пятруся Броўкі ў Мінску (1980), Максіма Багдановіча ў Мінску (1981) ды інш.[140]

Мэтанакіраваны збор дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Другой сусветнай вайны ажыццяўляўся камісіяй створанай пры ЦК КП(б)Б, якой у 1943 г. быў створаны БДМГВАВ. Дзяржаўны музей БССР (цяпер Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі) і абласныя краязнаўчыя музеі пачалі прымаць на захоўванне дакументы з асабістых архіваў у першай палове 1960-х гг. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры (ДМГБЛ) і Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музыкальнай культуры (ДМГТМК) камплектаваліся адпаведна з 1987 і 1990 гг.

Цікавасць шырокай грамадскасці да праблем захоўвання асабістых архіваў значна пашырылася ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. Паводле ацэнкі дырэктара ЦДАМЛМ БССР Ганны Сурмач, асабістыя архівы ў гэты перыяд набылі асаблівую вагу: *«Большасць людзей на працягу свайго жыцця збірае і захоўвае звесткі пра сябе... Яны выяўляюць неардынарнасць асобы, яе асаблівасць і непаўторнасць. Нішто не дасць такога поўнага ўяўлення пра чалавека, як яго асабісты архіў... Пісьмы, паштоўкі, фотаздымкі будуць нагадваць пра той асяродак, у якім праходзіла жыццё чалавека, захоўваць памяць аб дарагіх яму людзях, ці наадварот пра тое, што ўскладняла яго жыццё...»*[141]

У публікацыях адзначалася, што ва ўмовах засакрэчанасці значнай колькасці архіваў, а таксама тэндэнцыйнасці і заідэалагізаванасці самога працэсу камплектавання дакументамі дзяржаў-

[140] Музейныя сшыткі. Беларускія музеі. Гісторыя. Хроніка. Сучаснасць / уклад. А. М. Калбаска; Мін. культ. Рэсп. Беларусь; Бел. ін-т праблем культуры. – Мінск, 1998. – С. 73–122

[141] Сурмач Г. Лёс нашай спадчыны. Час вярнуць нацыянальныя гістарычныя каштоўнасці з суседніх сховаў // Літаратура і мастацтва. – 1991. – 3 верасня – С. 14–15.

ных архіваў у савецкі час, найбольшую значнасць набываюць менавіта асабістыя архівы[142].

У гэты час пачалося рассакрэчванне дакументаў і пошук архіваў рэпрэсаваных дзеячаў. У фондах архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі ў 1988 г. знайшліся рукапісы твораў пісьменніка Лукаша Калюгі. Пазней з архіва КДБ у БДАМЛМ былі перададзены дакументы беларускіх пісьменнікаў і паэтаў Б. Мікуліча, У. Дубоўкі, С. Дарожнага, М. Багуна, С. Ракіты (Законнікава), А. Якшэвіча, А. Пальчэўскага, У. Хадыкі, М. Серады – рукапісы, біяграфічныя і іншыя матэрыялы.

У 1980–1990-я гг. у Беларусі пачалася праца па збіранні асабістых архіваў дзеячаў культуры, што апынуліся па-за межамі дзяржавы. Дзякуючы намаганням пісьменніка Барыса Сачанкі, паэта Сяргея Панізніка, навукоўцаў Лідзіі Савік, Адама Мальдзіса, дзейнасці Камісіі «Вяртанне» пры Беларускім фондзе культуры, архівістаў Ганны Сурмач, Ганны Запартыкі, родных і саміх утваральнікаў у Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ) былі перададзены архівы спевака Міхася Забэйды-Суміцкага з Прагі, паэта Майсея Сяднёва і спевака Данчыка з ЗША, паэта Адама Гурыновіча з Польшчы, паэта П. Сакола, мастака, пісьменніка В. Целеша і мастака М. Калініна з Латвіі, С. Яновіча з Польшчы, А. Алехніка з Аўстраліі. Гэта надзвычай каштоўныя крыніцы да вывучэння культурнага жыцця Беларусі, развіцця яе культуры па-за межамі краіны, а таксама ўзаемадачынняў яе творцаў з дзеячамі культуры іншых народаў.

Так, напрыклад, архіў Сакрата Яновіча які змяшчае амаль 9 тысяч дакументаў аб літаратурна-грамадскім жыцці Польшчы і Беларусі, а разам з тым і Еўропы. У лісце Сакрата Яновіча ў БДАМЛМ ад 28 лютага 1981 г. паведамлялася: *«Спадзяюся, што ўсё, пасланае мною ў адрас Вашага архіва, Вы атрымалі акуратна... Беларускіх пісьменнікаў членаў Саюза польскіх пісьменнікаў зараз налічваецца чатырох. Творчасць іх ужо займае трывалае месца ў культуры, і таму, так я лічу, быў бы сэнс усіх іх ахапіць Вашай архіўнай апекаю. Беларуская рэспубліка з'яўляецца тым цэнтрам, да якога натуральным чынам імкнецца і будзе імкнуцца ўся сусветная беларусеча, не толькі з Еўропы»*[143].

---

[142] Каржанеўская Г. Праўда з першых рук. // Літаратура і мастацтва. – 1988. – 2 верасня – С. 5–6.

[143] Запартыка Г. В. Архівы беларускай эміграцыі // Замежная архіўная беларусіка. Матэрыялы міжнароднай навук. канф. / Дзяржкамітэт па архівах і справаводству РБ; БелНДІДАС; Бел. асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА [ды інш.] – Мінск: БелНДІДАС, 1998.– С. 12–22; Запартыка Г. Асабісты архіў Сакрата Яновіча і яго роля ў ацэнках

У 2005 г. у Беларусь быў перададзены архіў грамадскага дзеяча эміграцыі і выдаўца Дзмітрыя Касмовіча (1909–1991), што пражываў у Штутгарце (Германія). За год да гэтага ўдава Надзея Касмовіч звярнулася да Вітаўта Кіпеля ў Нью-Йорк з просьбай прыняць гэтыя дакументы на захоўванне ў архіў Беларускага Інстытуту навукі і мастацтва. Пасля гэтага частка дакументаў была перададзена даверанай асобе В. Кіпеля і перавезены ў Варшаву. Паколькі тэрмінова перадаць дакументы ў Нью-Йорк не было магчымасці імі апекавалася кіраўніцтва Рады Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына».

Пасля перадачы дакументы былі ў цэлым сістэматызаваны і апісаны і захоўваюцца ў архіве ЗБС у Мінску. У дадзены комплекс дакументаў увайшлі дакументы грамадскай і даследчыцкай дзейнасці (рукапісы ўспамінаў, даследчыцкіх прац, матэрыялы Згуртавання беларускіх патрыётаў і Беларускага вызвольнага фронту, матэрыялы аб удзеле ў міжнародных канферэнцыях), а таксама ліставанне з рознымі асобамі і ўстановамі[144]. На сённяшні дзень часткі архіва дзеяча захоўваюцца ў Штутгарце, Варшаве і Мінску.

Такім чынам, пасля Другой сусветнай вайны, якая прынесла значныя страты архіўнай спадчыне Беларусі, дзяржаўныя архівы, музеі і бібліятэкі пачалі сістэматычнае камплектаванне дакументамі асабістых архіваў. Архіўная сістэма БССР, створаная па прыкладу агульнасаюзнай, была заснавана на метадычных, нарматыўных і тэарэтычных распрацоўках савецкіх архівазнаўцаў у галіне працы з асабістымі архівамі.

Адразу пасля вайны беларускія архівісты вырашалі пытанні пошуку страчаных архіваў, прыняцця на сакрэтнае захоўванне асабістых архіваў нацыянальных дзеячаў, фамільных архіваў, што захоўваліся ў міжваенны перыяд у прыватнай уласнасці, размеркавання архіваў паміж дзяржаўнымі архівамі, музеямі і бібліятэкамі.

У сярэдзіне 1950-х гг. было пастаўлена пытанне аб неабходнасці захоўвання архіваў літаратуры і мастацтва. Таксама ўпершыню давалася ацэнка стану захоўвання архіваў асабістага паходжання ў Беларусі. Цэнтральнай падзеяй стала стварэнне ў 1960 г. ЦДАЛМ БССР, які, дзякуючы намаганням архівістаў, стаўся своеасаблівым культурніцкім цэнтрам, што аб’яднаў высілкі архівістаў, дзеячаў навукі, літаратуры і мастацтва ў справе збірання і захоўвання асабістых архіваў.

---

літаратурна-грамадскага жыцця Беласточчыны // Annus Albaruthenicus. 2010. Год беларускі. 2010. – Т. 11. – С. 157–168.

[144] Гардзіенка Н. Архіў Дзмітрыя Касмовіча // Запісы. Беларускі Інстытут навукі й мастацтва / рэдкал. Н. Гардзіенка [ды інш.]. – Т. 32. – Нью-Йорк–Мінск, 2009. – С. 482–498.

Да справы збірання асабістых архіваў далучыўся Аддзел рукапісаў ЦНБ АН БССР, а пазней таксама рэспубліканскія, абласныя і занальныя архівы. Вядучая роля ў справе пошуку і захоўвання асабістых архіваў у другой палове XX ст. перайшла ад музеяў і бібліятэк да дзяржаўных архіваў.

Беларускія архівісты, гісторыкі, супрацоўнікі музеяў і бібліятэк вырашалі задачу пошуку і ўліку асабістых архіваў дзеячаў беларускай навукі і культуры ў БССР, саюзных рэспубліках і за мяжой. Найбольш значную ролю ў гэтым адыгралі кіраўнік архіўнай службы БССР А. Азараў, кіраўнік аддзела камплектавання АУ Т. Трухіна, дырэктары архіва літаратуры і мастацтва К. Жорава, Г. Сурмач, Г. Запартыка, супрацоўнік Г. Турко, загадчыца аддзела рукапісаў акадэмічнай бібліятэкі Л. Збралевіч, загадчыца аддзела рукапісаў Дзяржаўнай бібліятэкі Н. Ватацы, навукоўцы Адам Мальдзіс, Генадзь Каханоўскі, Генадзь Кісялёў, Віталь Скалабан, Н. Вусава ды інш.

Дзякуючы гэтай працы, у другой палове XX ст. захоўванне асабістых архіваў беларускіх дзеячаў і ўсведамленне іх каштоўнасці, дасягнула найбольш высокага ўзроўню ў параўнанні з папярэднімі перыядамі.

# Стан захоўвання асабістых архіваў на сучасным этапе

## *Дакументы асабістага паходжання ў дзяржаўных сховішчах Рэспублікі Беларусь*

### *Дзяржаўныя і ведамасныя архівы*

Дакументы асабістых архіваў сёння прымаюцца на захоўванне дзяржаўнымі архівамі, музеямі і бібліятэкамі Беларусі. Кожная з устаноў мае пэўныя крытэрыі адбору, спосабы і мэты захоўвання. У адпаведнасці з профілем камплектавання, які вызначаецца часам стварэння і формай дакумента, характарам і маштабам дзейнасці ўтваральніка, асабістыя архівы прымаюцца на дзяржаўнае захоўванне рэспубліканскімі, абласнымі і занальнымі архівам і атрымліваюць статус фондаў асабістага паходжання ці ўваходзяць у склад калекцыі. Профіль архіва вызначае спецыфіку і тэматыку архіўных дакументаў, іх папулярнасць сярод карыстальнікаў, архіваўтваральнікаў і архіваўладальнікаў, эфектыўнасць і накірункі выкарыстання дакументаў.

Вядучай установай у рэспубліцы, якая захоўвае асабістыя архівы дзеячаў беларускай культуры з'яўляецца БДАМЛМ, які пачаў сваю працу ў 1960 г. Тут налічваецца больш за 460 фондаў і калекцый асабістага паходжання (асабістых і сямейных)[145], уключаючы неапрацаваныя. На захоўванне штогод прымаецца 12–14 асабістых архіваў, што складае звыш 1700 адз. зах. Яны перадаюцца ў дзяржаўнае сховішча на ўмовах дарэння ці куплі-продажу.

Разам з пісьмовымі дакументамі паступаюць музейныя прадметы і друкаваныя матэрыялы. Некаторыя фонды, як напрыклад фонды пісьменнікаў Янкі Брыля і Аляксея Кулакоўскага, зачынены для выкарыстання ў адпаведнасці з рашэннем утваральнікаў.

Архівісты праводзяць працу па выяўленні асабістых архіваў і ўключэнні іх у склад недзяржаўнай часткі НАФ шляхам унясення ў спіс крыніц камплектавання архіва, які налічвае больш за 630 адзінак. У архіве захоўваюцца дакументы аб дзейнасці выдатных беларускіх паэтаў і пісьменнікаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Максіма Танка, Івана Мележа, Аркадзя Куляшова, Алеся Гаруна, мастакоў Валянціна Волкава, Арлена Кашкурэвіча, Яўгена Красоўскага, кампазітараў Яўгена Цікоцкага, Яўгена Глебава, Аляксея Туранкова, акцёраў Фларыяна Ждановіча, Ла-

[145] Тут і далей колькасныя дадзеныя пададзены на пачатак 2008 года.

рысы Александроўскай, Аляксандры Клімавай, кінарэжысёра Ўладзіміра Корш-Сабліна, мастака і пісьменніка Каруся Каганца, археографа Івана Грыгаровіча ды інш.

Гэтыя матэрыялы адлюстроўваюць асноўныя накірункі развіцця беларускай літаратуры, мастацтва, навукі ў другой палове XIX–XX ст. Фонды БДАМЛМ актыўна выкарыстоўваюцца для навуковых і папулярных публікацый, арганізацыі выстаў, тэле- і радыёперадач. Яны з'яўляюцца найкаштоўнейшай крыніцай для даследчыкаў літаратуры і розных галін мастацтва, папулярызацыі творчай спадчыны, гістарычных даследаванняў. За 1995–2005 гг. толькі колькасць археаграфічных публікацый архіва склала каля 60-ці[146] .

Сучасны НАРБ аб'яднаў фонды ЦДАКР БССР і Цэнтральнага партыйнага архіва КПБ. Пачатак камплектавання архіва дакументамі асабістага паходжання адносіцца да другой паловы 1940-х гг., калі на сакрэтнае захоўванне ЦДАКР паступілі дакументы беларускіх грамадска-палітычных дзеячаў у эміграцыі Кастуся Езавітава, Васіля Русака, Івана Ермачэнкі. У 1968 г. у партыйным архіве былі сабраныя зборы дакументаў Веры Харужай і Сяргея Прытыцкага.

Сістэматычнае камплектаванне ЦДАКР дакументамі асабістага паходжання пачалося ў 1975 г. Першым фондам прынятым на захоўванне стаў фонд удзельніка грамадзянскай і Другой сусветнай войнаў М. Зецюкова (1977).

У 1989 г. пры аддзеле ведамасных архіваў, камплектавання і экспертызы каштоўнасці была створана група асабістых фондаў, у 1995 г. – аддзел асабістых фондаў. У 2004 г. у архіве знаходзілася 44 фонды і калекцыі асабістага паходжанням (на студзень 2008 г. – 55). Гэта былі асабістыя фонды партыйных, дзяржаўных, грамадскіх дзеячаў краіны А. Аксёнава, М. Аўхімовіча, Ц. Кісялёва, П. Машэрава, гісторыкаў М. Арэхвы, А. Карпачова, З. Капыскага, В. Чапко, навукоўцаў М. Аляксандрава, У. Сікорскага, Ф. Фёдарава, архівістаў В. Жыгалава, Т. Лявонцьевай, М. Камінскага. Таксама трэба назваць калекцыі, якія аб'ядноўвалі малаколькасныя архівы вучоных, грамадска-палітычных дзеячаў ды інш.

---

[146] Запартыка Г. В. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 6. Кн.2: Усвея – Яшын; Дадатак – Мінск, 2003. – С. 335–336; Кекелева Т. В. Культурна-асветніцкая і навуковая дзейнасць БДАМЛМ // Архіўныя чытанні I–III: матэрыялы навук. канф., Мінск, 2003–2005 гг. / Беларус. дзярж. архіў-музей літаратуры і мастацтва; укл. Г.В. Запартыка [ды інш.], навук. рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск, 2006. – Вып. 1. – С. 15–20; Кулажанка У. Археаграфічная дзейнасць БДАМЛМ у 1960–2005 гг. // Беларускі археаграфічны штогоднік / рэд. кал. У. І. Адамушка [ды інш.] – Мінск, 2007. – Вып. 8. – С. 12–23.

Права абмежавання доступу да дакументаў было выкарыстана старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1992–1994) Станіславам Шушкевічам, часткова гісторыкам Расціславам Платонавым.

Штогод архіў папаўняецца на 4–5 асабістых фондаў (каля 700 адз. зах.), якія перадаюцца на ўмовах дарэння. Дакументы асабістых фондаў выкарыстоўваюцца пры арганізацыі выстаў, тэле- і радыёперадач, падрыхтоўцы публікацый, у меншай ступені – у чытальнай зале[147].

Сховішчам фондаў асабістага паходжання з'яўляецца БДАНТД, які пачаў камплектавацца фондамі асабістага паходжання ў 1982 г. Тут захоўваецца 36 фондаў (больш за 3 тыс. адз. зах.) архітэктараў У. Караля, В. Волчака, В. Гусева, Г. Лаўрова, канструктараў Б. Шапашніка, М. Пігулеўскага, фізікаў Б. Кіта, Л. Барысаглебскага, калекцыя дакументаў І. Лангбарда ды інш. Дакументы актыўна выкарыстоўваюцца даследчыкамі-гісторыкамі архітэктуры і мастацтва, супрацоўнікамі рэстаўрацыйна-праектнага інстытута, студэнтамі, а таксама ў навуковых публікацыях. Так, за 2000 г. з ліку фондаў асабістага паходжання было выдадзена 660 адз. зах.[148]

У НГАБ на сённяшні дзень захоўваецца 12 фамільных фондаў. Гэта фонды Радзівілаў, Румянцавых, Булгакаў, Горватаў, Друцкіх-Любецкіх, Яленскіх, Любамірскіх, Паскевічаў, Плятар-Зібергаў, Хмараў, Цеханавецкіх, Чарнышовых і асабістыя архівы Я. Іоэльсон, М. Кагановіча, М. Мялешкі, У. Брахоцкага. У НГАБ у Гродне знаходзяцца фамільныя фонды Булгарынаў, Слізняў і Быхаўцаў. Некаторыя з іх не маюць у сваім складзе дакументаў асабістага паходжання і могуць быць вызначаны як маёнткавы архіўны фонд. Дакументы фамільных фондаў выкарыстоўваюцца ў археаграфічных і навуковых публікацыях.

---

147 Сверчков В. А. Комплектование Национального архива Республики Беларусь документами участников Великой Отечественной войны // Пра вайну апошняе слова не сказана: па матэрыялах пасяджэнняў «круглых сталоў«, прысвечаных распрац. гісторыі Вялікай Айчынай вайны (май 2004 г., май 1990 г.) / БелНДІДАС; адк. рэд.: Ю. У. Несцяровіч, У. В. Фядосаў.– Мінск, 2005.– С. 102–105; Сверчков В. А. Популяризация документов личного происхождения (на примере деятельности НАРБ) // Архивы и общество сегодня: материалы [IV] Междунар. науч.-практ. конф. (Минск 11–12 нояб. 2003 г.)/ сост. В. В. Федосов, П. П. Журкевич. – Минск: БелНИИДАД, 2004. – С. 111–113; Запартыко А. М. Ценности личных фондов // Наша история: Национальный архив Республики Беларусь, 1927–2007 гг. / В. Д. Селеменев и др. – Минск, 2007. – С. 93–96.

148 Шостак Г., Горшкова Е. Личные фонды в Белорусском государственном архиве научно-технической документации // Архівы і справаводства.– 2001.– № 5.– С. 100–105; Архитектура во имя жизни: сб. биогр. очерков и док. известных деятелей белорус. архитектуры / Белорус. гос. архив научно-технической документации; сост. Г. И. Шостак. – Минск: Изд. Центр БГУ, 2007. – 159 с.

У Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў (БДАКФФД) захоўваецца шэсць калекцый, заснаваных на дакументах асабістага паходжання.

У 1978 г. у Дзяржаўным архіве Мінскай вобл. пачала ствараццa *«Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху і грамадзянскай вайны ў Расіі, Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобласці»*. Яна налічае 462 адз. зах. (за 1917–2003 гг.). Большасць з іх была перададзена ўдзельнікамі апошняй вайны, якія працавалі пасля вайны ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, вайсковай сферы, юстыцыі[149]. Захаваліся ўспаміны, пасведчанні, фотаздымкі, ліставанне, якія належаць удзельніку кастрычніцкіх падзей 1917 г. у Петраградзе І. Карасёву, удзельнікам апошняй вайны А. Сапунову, В. Кліменку, І. Якубенку ды інш.

Калекцыя ўключае ў сябе дакументы 51 асобы і кожны год папаўняецца ў сярэднім на 12 адз. зах. Комплексы дакументаў асоб у складзе калекцыі невялікія па аб'ёму (у сярэднім па 8 адз. зах.). Выкарыстоўваюцца яны зрэдку.

Дзяржаўныя архівы Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей пачалі прымаць на захоўванне дакументы асабістага паходжання ў канцы 1950 – пачатку 1960-х гг. У архівах Брэсцкай, Гомельскай, Магілёўскай абласцей малакалькасныя комплексы дакументаў асабістых архіваў былі аб'яднаны ў калекцыі.

У архіве Віцебскай вобласці захоўваецца 38 самастойных асабістых фондаў, сярод якіх вызначаюцца фонды краязнаўцаў А. Падліпскага і В. Газіна, музеязнаўцы і педагога В. Зейлерта, грамадскага дзеяча А. Міндліна, цэлы шэраг фондаў акцёраў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа. Таксама да іх належаць фонды грамадскіх і партыйных дзеячаў, што былі прынятыя на захоўванне ў партыйны архіў і сем калекцый[150], у складзе якіх можна вылучыць некалькі самастойных комплексаў асабістых дакументаў. Яны належалі лідэру рэгіянальнай аргані-

[149] Кушнова Е. В. Война в воспоминаниях участников Великой Отечественной войны (по документам государственного архива Минской области) // Пра вайну апошняе слова не сказана: па матэрыялах пасяджэнняў «круглых сталоў», прысвечаных распрац. гісторыі Вялікай Айчынай вайны (май 2004 г., май 1990 г.) / БелНДІДАС; адк. рэд.: Ю. У. Несцяровіч, У. В. Фядосаў. – Мінск, 2005. – С. 79–81.

[150] Сярод іх: дзве Калекцыі ўспамінаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны (Ф. 9742 п. – Воп. 1–7. – 362 адз. зах.; Ф. 745. – Воп. 1–2. – 82 адз. зах.), Калекцыя дакументаў остарабайтараў (Ф. 1620. – Воп. 1–7), Калекцыя фотаздымкаў па гісторыі Віцебскай абласной партыйнай арганізацыі (Ф. 9741 п. – 50 адз. зах.), Калекцыя лістоў грамадзян у абласную і раённыя газеты Віцебскай вобл. (Ф. 134. – 107 адз. зах.)

зацыі ЗГА «Бацькаўшчына» Ю. Сцяпанаву[151], удзельнікам апошняй вайны І. Янчанку, М. Кузьміну, М. Сімакову[152].

У архіве Гродзенскай вобласці захоўваецца цяць асабістых фондаў (гісторыкаў Якава Мараша, Валерыя Чарапіцы, архівіста Аляксандра Плешавені, філосафа Аляксандра Макавельскага, гісторыка медыцыны Вітольда Бржэскага) і калекцыя, у склад якой уваходзяць дакументы 13 асоб.

Колькасць адзінак захоўвання адной асобы ў складзе калекцый абласных архіваў, як правіла, не перавышае 50. Колькасць адзінак захоўвання асабістых фондаў вагаецца ад 35 (журналіст А. Песін, ДА Віцебскай вобл.) да 350 (Я. Мараш, В. Бржэскі, ДА Гродзенскай вобл.). Дакументы фондаў і калекцый асабістага паходжання выкарыстоўваюцца ў навуковых публікацыях[153].

Дзяржаўныя архівы грамадскіх арганізацый (ДАГА) Магілёўскай, Гродзенскай і Гомельскай абласцей, створаныя ў 1996 г., пачалі камплектаванне асабістымі архівамі грамадска-палітычных (партыйных) дзеячаў адпаведна ў 1996, 2000 і 2001 гг. У ДАГА Гомельскай вобл. была створана калекцыя з дакументаў пяці асоб у сярэднім па 5–6 адз. зах. У іншых двух архівах захоўваецца восем фондаў, якія налічваюць ад 5 да 70 адз. зах.

Занальныя дзяржаўныя архівы (ЗДА) пачалі камплектавацца дакументамі асабістага паходжання з 1970 г. (ЗДА ў г. Рэчыца), але найбольш актыўны перыяд прыйшоўся на сярэдзіну 1980-х гг. (ЗДА ў Кобрыне, Барысаве, Слуцку, Навагрудку). Другая хваля актыўнага прыёму на захоўванне асабістых фондаў адносіцца да пачатку новага стагоддзя (ЗДА ў Глыбокім, Оршы, Бабруйску, Крычаве, Лідзе).

ЗДА ў Маладзечне пачаў камплектавацца фондамі асабістага паходжання ў 1986 г. Першым асабістым фондам архіва стаў фонд гісторыка Генадзя Каханоўскага. Архіў захоўвае 10 асабістых фондаў, штогод папаўняецца на 5 адз. зах. з ліку дакументаў асабістага паходжання, фонды вызначаюцца нешматлікасцю (у сярэднім па

---

[151] ДА Віцебскай вобл. Ф. 1281 (Калекцыя дакументаў палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў Віцебшчыны і іх лідэраў). – Воп. 2. – Адз. зах. 1–102 за 1987–2002.

[152] ДА Віцебскай вобл. Ф. 1281 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны). – Воп. 1–3. 37 адз. зах. за 1922–1988.

[153] Витебщина архивная: история, фонды, персоналии (середина XIX–XX вв.) / сост. М. В. Пищуленок; науч. ред. М. Ф. Шумейко.– Минск, 2002.– 187 с.; Крэнь І. П. «Замежная архіўная беларусіка» ў асабістым фондзе доктара гістарычных навук прафесара Я. Н. Мараша ў Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці // Замежная архіўная беларусіка. Матэрыялы міжнароднай навук. канф. / Дзяржкамітэт па архівах і справаводству Рэсп. Беларусь; БелНДІДАС; Бел. асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА ды інш. – Мінск, 1998. – С. 270–280.

20 адз. зах.) і практычна не выкарыстоўваюцца. Фонды паэта, перакладчыка і краязнаўцы П. Бітэля, паэтэсы Г. Новік, паэта-франтавіка В. Носава, урачоў Ф. і Э. Світа, рэдактара і грамадскага дзеяча М. Казлоўскага, адлюстроўваючы асноўныя сферы жыцця і дзейнасці асобы, могуць выкарыстоўвацца для характарыстыкі культурнага жыцця горада Маладзечна і раёна, папулярызацыі яго гісторыі, вывучэння гісторыі апошняй вайны, гісторыі беларускай навукі і г. д.

Архівістамі вядзецца актыўная праца па выяўленні асабістых архіваў, плануецца ўзяць на захоўванне дакументы кампазітара А. Атрашкевіча, пісьменніка Я. Галубовіча, урача Л. Путырскага ды інш. [154]

Самастойныя асабістыя архіўныя фонды створаны таксама ў ЗДА ў Оршы, Рэчыцы[155], Навагрудку.

Кожны з фондаў занальных архіваў налічвае ад 8 (паэт і перакладчык П. Бітэль, ЗДА ў г. Маладзечна) да 108 адз. зах. (удзельнік вайны, грамадскі дзеяч раёна Ф. Цімкаева, ЗДА ў г. Оршы). Калекцыі могуць уключаць у сябе дакументы больш 20 асоб, колькасць адзінак захоўвання, што тычацца адной асобы, вагаецца ад 4 да 130 (адпаведна фонды настаўніцы Л. Цімкевіч і рэжысёра В. Нагорнай, ЗДА ў г. Полацку).

Такім чынам, на захоўванне ў абласныя і занальныя архівы Рэспублікі Беларусь прымаюцца толькі асабістыя архівы дзеячаў XX ст., вядомых сваім унёскам у развіццё культуры, гаспадаркі, у грамадскае жыццё асобнай вобласці, горада ці раёна. На сённяшні дзень тут захоўваецца 68 фондаў асабістага паходжання і 22 калекцыі, у склад якіх уваходзяць дакументы 318 асоб. Пры гэтым неабходна ўлічваць той факт, што колькасныя характарыстыкі фондаў асабістага паходжання і комплексаў дакументаў асобы, што ўваходзяць у калекцыю могуць супадаць. Аднак, калі калекцыі дакладна вызначаюць тэматыку дакументаў у яе складзе, то асабістыя фонды вольныя ад першапачатковай тэматычнай зададзенасці і характарызуюць асноўныя накірункі культурнага і гра-

---

[154] Кондрошова О. В. Фонды личного происхождения в Зональном государственном архиве г. Молодечно // Архіўныя чытанні I–III: матэрыялы навуковых канферэнцый, Мінск, 2003–2005 гг./ укл.: Г. В. Запартыка [ды інш.]; навук.рэд. А. В. Мальдзіс. – Мінск, 2006. – С. 88–94.

[155] Кобец Ю., Окружилова Е. Комплектование и использование личных фондов в Зональном государственном архиве в г. Речица // «Пятыя Міжнародныя Доўнараўскія чытанні», міжнародная навук. канф. (2005, Рэчыца): прысвеч. дзейнасці і навуковай спадчыне вучонага-славіста М. В. Доўнар-Запольскага і гісторыі Рэчыцкага края / рэдкал.: В. М. Лебедзева (адк. рэд.) [ды інш.] – Гомель, 2005. – С. 379–383.

мадска-палітычнага жыцця вобласці ці раёна праз прызму дзейнасці асобы.

Асабістыя архівы прымаюцца на захоўванне ў ведамасныя[156] і навуковыя архівы, якія адносяцца да ліку ўстаноў, што захоўваюць дакументы Нацыянальнага архіўнага фонду. Дакументальныя зборы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору і Музея старажытнабеларускай культуры ўтрымліваюць часткі асабістых архіваў этнографаў, мастацтвазнаўцаў, краязнаўцаў. Маюцца дадзеныя аб архівах чатырох асоб.

У 2001 г. у архіў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь паступілі копіі дакументаў беларуса Іосіфа Гашкевіча, першага консула Расійскай імперыі ў Японіі[157]. У ЦНА НАНБ знаходзіцца асабісты фонд гісторыка Уладзіміра Перцава.

Архіў Нацыянальнага мастацкага музея (НММ) Рэспублікі Беларусь быў створаны ў 1994 г. для захоўвання справаводнай дакументацыі музея. Аднак хутка ён стаў месцам захоўвання асабістых архіваў мастакоў, мастацтвазнаўцаў і супрацоўнікаў музея. Фрагменты асабістых архіваў і комплексы дакументаў, якія адкладаліся ў музеі пры падрыхтоўцы выстаў, сфарміраваны ў дзве тэматычныя калекцыі.

Калекцыя дакументаў супрацоўнікаў музея ўтрымлівае каштоўныя архівы дырэктараў М. Міхалапа, А. Аладавай, Ю. Карачуна, старэйшых супрацоўнікаў Н. Бараноўскай, А. Васілеўскай, А. Рэсінай ды інш. Яны з’яўляюцца не толькі ілюстрацыяй навуковай і творчай дзейнасці дадзеных асоб, але і працы музея на працягу паўстагоддзя. Унікальным комплексам з’яўляецца архіў В. Бялыніцкага-Бірулі, які паступіў ад дырэктара музея А. Аладавай і стаў асноўным дакументальным комплексам пры арганізацыі мемарыяльнага музея ў Магілёве ў 1978 г. Ён утрымлівае неапублікаваныя ўспаміны з 1900 г., у т. л. з аповядам пра Маскоўскае вучылішча жывапісу, мастакоў А. Айвазоўскага, А. Васняцова, І. Рэпіна ды інш.

Цікавы архіў Заіра Азгура знаходзіцца на ўліку ведамаснага архіва, але захоўваецца ў мемарыяльным музеі скульптара. У якасці асабістых архіўных фондаў вылучаны дакументы мастакоў

---

[156] Згодна нарматыўных актаў Рэспублікі Беларусь тэрмін «ведамасныя архівы» ў 2011 годзе быў заменены на паняцце «архівы арганізацый і ўстаноў». У рамках дадзенага даследавання выкарыстоўваецца тэарэтычна абгрунтавы архівазнаўчы тэрмін «ведамасныя архівы».

[157] Жумарь С.В. Ведомственные архивы и отраслевые фонды Республики Беларусь. – Минск: БелНИИДАД, 2005. – С. 50.

Я. Ціхановіча, Б. Басава, С. Каткова, А. Тычыны, А. Мазалёва ды інш., перададзеныя самімі архіваўтваральнікамі і іх сем'ямі[158].

Характэрнай асаблівасцю камплектавання з'яўляецца актыўны ўдзел супрацоўнікаў музея ў фарміраванні фондаў і калекцый, што надае шэрагу комплексаў рысы персанальнага збору. Дакументы актыўна выкарыстоўваюцца ў навуковых даследаваннях.

Дадзеныя па колькасці і складзе фондаў асабістага паходжання ў дзяржаўных архівах Беларусі на пачатак 2008 г. можна прадставіць у выглядзе табліцы[159].

Табліца 1. *Колькасць і склад фондаў асабістага паходжання ў дзяржаўных архівах Беларусі. 2008 г.*

| назва | пачатак камплек. фондамі асабістага паходжання | асабістыя фонды | сямейныя фонды | фамільныя (родавыя) фонды | асабістыя архівы аб'яднаныя ў калекцыі | калекцыі, сабраныя асобай/ архівам |
|---|---|---|---|---|---|---|
| рэспубліканскія архівы | | | | | | |
| НАРБ | 1947, 1968, 1975 | 45 | 4 | | 6(21)[160] | |
| НГАБ | 1939[161] | 4 | | 12 | | |
| НГАБ у Гродне | 1955 | | | 3 | | |
| БДАМЛМ | 1960 | 335 | 32 | | 5(74) | 25 |
| БДАНТД | 1982 | 36 | | | 1 | |
| БДАКФФД | 1963 | | | | | 6 |
| абласныя і занальныя архівы | | | | | | |
| ДА Брэсцкай вобл | 1977 | 2 | | | 2(10) | 1 |

[158] Баслык В. Ф. Дакументы архіўнага фонду музея // Паведамленні Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Навукова-інфармацыйнае выданне. – Вып. 5, 2004. – Мінск: ТАА «Белпрынт», 2007. – С. 217–218.

[159] Табліца складзеная на падставе ўласных дадзеных на пачатак 2008 г., пры ўліку інфармацыі даведніка: Фонды и коллекции документов личного происхождения в государственных архивах Республики Беларусь / сост. Т. И. Седляревич. – Минск: БелНИИДАД, 2009. – 172 с. – што ўтрымлівае звесткі на пачатак 2007 г.

[160] Дзве калекцыі, сабраныя архівістамі ўтрымліваюць 13 асабістых архіваў.

[161] Дата апрацоўкі першага фамільнага фонда.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ДА Віцебскай вобл. | 1950, 1987 | 34 | 4 | | 7(4) | |
| ДА Гомельскай вобл. | 1966 | 1 | | | 1(31) | |
| ДА Гродзенскай вобл. | 1980 | 5 | | | 1(13) | |
| ДА Мінскай вобл. | 1978 | | | | 1 (46) | |
| ДА Магілёўскай вобл. | 1966 | 1 | | | 1(27) | |
| ДАГА Гомельскай вобл. | 2001 | | | | 1(5) | |
| ДАГА Гродз. вобл. | 2000 | 5 | | | | |
| ДАГА Магілёўскай вобл. | 1996 | 7 | | | | |
| ЗДА ў г. Баранавічах | 1978 | | | | 1(23) | |
| ЗДА ў г. Кобрыне | 1986 | | | | 1(10) | |
| ЗДА ў г. Пінску | 1978 | | | | 2(36) | |
| ЗДА ў г. Полацку | 1989 | | | | 1(26) | |
| ЗДА ў г. Глыбокае | 2003 | | | | 1(13) | |
| ЗДА ў г. Оршы | 1987 | 4 | | | 1(3) | |
| ЗДА ў г. Мазыры | 1976 | | | | 1(19) | |
| ЗДА ў г. Жлобіне | 1977 | | | | 1(19) | |
| ЗДА ў г. Рэчыцы | 1970 | 8 | | | | |
| ЗДА ў г. Барысаве | 1985 | | | | 1(19) | |
| ЗДА ў г. Маладзечне | 1986 | 10 | | | | |
| ЗДА ў г. Слуцку | 1985 | | | | 1(21) | |
| ЗДА ў г. Лідзе | 2007 | | | | 1(2) | |
| ЗДА ў г. Наваградку | 1985 | 1 | | | | |
| ЗДА ў г. Бабруйску | 2005 | | | | 1(6) | |
| ЗДА ў г. Крычаве | 2005 | | | | 1(2) | |
| ведамасныя і навуковыя архівы | | | | | | |
| ЦНА НАНБ | 1965 | 1 | | | | |
| Збор інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора | пач.1960 | 4 | | | | |
| Архіў МУС | 2001 | 1 | | | | |
| Архіў НММ РБ | 1994 | больш 8 | | | 2 (больш 20) | |
| Усяго | | 512 | 40 | 15 | 40(больш 456) | 33 |

Такім чынам, усяго ў дзяржаўных і ведамасных архівах Беларусі захоўваецца больш 624 фондаў і калекцый асабістага паходжання. Пры гэтым  пераважная большасць 397 фондаў – у БДАМЛМ. Таксама захоўваецца 77 калекцый, якія ўтрымліваюць дакументы больш 450 асоб.

Трэба адзначыць, што ў даведніку па фондах у калекцыях дакументаў асабістага паходжання[162] падаецца агульная колькасць фондаў – 605, пры гэтым апісана толькі 522. Вялікая розніца ў колькасці фондаў БДАМЛМ. Іх у даведніку толькі 295. Тым не менш, канчатковая агульная лічба – гэта больш 600 фондаў і калекцый асабістага паходжання што захоўваюцца ў дзяржаўных і ведамасных архівах Рэспублікі Беларусь.

### *Аддзелы рукапісаў бібліятэк і музеі*

Складовай Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца асабістыя архівы, якія захоўваюцца ў аддзелах рукапісаў бібліятэк і музеях[163].

У Аддзеле рэдкай кнігі і рукапісаў Цэнтральнай Нацыянальнай Бібліятэкі Акадэміі навук сабрана больш за 60 асабістых архіваў і калекцыя асабістага паходжання, у якіх утрымліваецца больш 40 тыс. адз. зах. З іх 45 фондаў даступныя для выкарыстання і каля 15 фондаў яшчэ не апрацаваны (П. Панчанкі, І. Чыгрынава, В. Сербенты ды інш.).

Асабістыя архівы паступаюць як на ўмовах куплі-продажу, так і на ўмовах дарэння[164].

У склад «Калекцыі матэрыялаў па гісторыі навукі і культуры»[165] уваходзяць часткі асабістых архіваў больш 20 асоб. У аддзеле захоўваюцца асабістыя фонды былога прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі акадэміка В. Купрэвіча (неапрацаваны), акадэмікаў А. Вечара, М. Томіна, Г. Гарэцкага, беларускіх вучоных-гісторыкаў, археолагаў і этнографаў М. Грынблата, С. Сахарава,

[162] Фонды и коллекции документов личного происхождения в государственных архивах Республики Беларусь / сост. Т. И. Седляревич. – Минск: БелНИИДАД, 2009. – 172 с.

[163] Документы Национального архивного фонда Республики Беларусь в Национальной библиотеке и музеях системы Министерства культуры и печати Республики Беларусь: справочник / Гос. ком. по архива и делопроизводству Рэсп. Беларусь; БелНИИДАД; сост. О. А. Добычина, В. И. Пташникова; под ред. А. Н. Михальченко.– Минск: БелНИИДАД, 1995. – С. 3.

[164] Лис М. М. Рукописный фонд отдела редких книг и рукописей ЦНБ НАН Беларуси: к вопросу формирования и развития // Информационное обеспечение науки Беларуси: от рукописей к электронным информационным ресурсам. Сб. науч. ст. – Минск, 2006. – С. 127; Жук Т. И., Лис М. М. Вопросы организации работы с фондами личного происхождения в отделе редких книг и рукописей ЦНБ НАН Беларуси [Электронный ресурс] // Б-ка нац. акад. наук: пробл. функционирования, тенденции развития. – Киев, 2005. – Вып. 3. – Рэжым доступу: http://www.nbuv.gov.ua/articles/2005/05jticnb.html. – Дата доступу: 19.06.2007.

[165] Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы і культуры. 1506–1983. // АРРК ЦНБ НАНБ. – Фонд 23. – Воп. 1. – Адз. зах. 1–1190.

М. Улашчыка, грамадскіх дзеячаў Я. Дылы, У. Пігулеўскага, А. Станкевіча, пісьменнікаў і грамадска-культурных дзеячаў У. Дубоўкі, Л. Геніюш, У. Караткевіча, А. Пальчэўскага, Ю. Гаўрука, П. Глебкі, мастака Я. Драздовіча ды інш. Кожны з фондаў уяўляе сабой цэласны і грунтоўны комплекс дакументаў, які ўсебакова адлюстроўвае дзейнасць асобы.

Адным з фондаў да якога найбольш часта звяртаюцца даследчыкі, з'яўляецца фонд Міколы Ўлашчыка, што актыўна выкарыстоўваўся для публікацыі яго навуковай спадчыны, а таксама для даследаванняў з нагоды правядзення юбілейных канферэнцый.

Дакументы асабістых фондаў АРКР ЦНБ з'яўляюцца таксама каштоўнай крыніцай па гісторыі беларускага нацыянальна-культурнага жыцця ў Заходняй Беларусі, Літве і Латвіі, па гісторыі беларускай гістарычнай навукі і іншых галін ведаў. Найвялікшую цікавасць ён уяўляе для гісторыкаў і літаратуразнаўцаў, адлюстроўваючы жыццё краіны праз прызму яе ўспрымання беларускай навуковай і пісьменніцкай элітай.

Захоўванне асабістых архіваў у Навукова-даследчыцкім аддзеле кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбываецца ў форме фондаў і калекцый. Яны часта не маюць унутранай сістэматызацыі, дакладнага навуковага апісання з інфармацыяй па гісторыі стварэння фонду, а таксама апрацоўкі характэрнай для асабістых архіўных фондаў. Асноўнай адзінкай уліку тут з'яўляецца дакумент. У аддзеле захоўваецца два даступныя для карыстальнікаў асабістыя фонды бібліятэказнаўцы Яўгена Хлябцэвіча і пісьменніка Каруся Каганца.

Таксама тут знаходзіцца «Збор матэрыялаў дзеячаў навукі і культуры», куды ўвайшлі дакументы 14 асоб, у тым ліку неапрацаваныя архівы першага дырэктара бібліятэкі І. Сіманоўскага, бібліёграфа Н. Ватацы, бібліятэкара і мастацтвазнаўцы В. Дышыневіч, гісторыка М. Нікольскага ды інш.

У 1991 г. у сістэме Міністэрства культуры БССР дзейнічаў 141 музей, дакументальная частка (ці частка, што адносіцца да дакументаў НАФ) у зборах 107 з гэтых музеяў налічвала больш за 300 тысяч адз. зах.[166] З іх значную колькасць складалі дакументы асабістага паходжання.

Адной з формаў захоўвання асабістых архіваў як цэласнага комплексу крыніц аб дзейнасці адной асобы і як феномена нацыянальнай культуры, з'яўляюцца літаратурна-мемарыяльныя музеі,

[166] Гужалоўскі А. А. Музейны фонд Рэспублікі Беларусь: спроба крыніцазнаўчага падыходу // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання. Матэрыялы да Міжнар. навукова-практычнай канф., прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У. І. Пічэты. – Мінск, 1998. – С. 59–60.

якіх у Беларусі налічваецца 12. Напрыклад, колькасць адзінак захоўвання асноўнага фонду музеяў Янкі Купалы і Якуба Коласа складае каля 30 тысяч (з іх рукапісы складаюць адпаведна 612 і 6,5 тыс. адз. зах.).

Што тычыцца асабістых архіваў народных паэтаў, то яны загінулі летам 1941 г. Усведамляючы каштоўнасць іх спадчыны, зборам і захоўваннем пачалі займацца жонка Янкі Купалы Ўладзіслава Францаўна Луцэвіч і сын Якуба Коласа Даніла Канстанцінавіч Міцкевіч.

Мерапрыемствы па ўшанаванні памяці праводзіліся на дзяржаўным узроўні, і ў выніку ў 1944 і 1957 гг. былі створаны літаратурна-мемарыяльныя музеі.

Усе матэрыялы, што адлюстроўвалі жыццё і дзейнасць паэтаў, перадаваліся на дзяржаўнае захоўванне. Гэта рукапісы твораў, ліставанне, біяграфічныя дакументы, кнігі, дакументы розных асоб, выяўленчыя дакументы, фотаздымкі, аўдыё- і відэадакументы, рэчы. Будынкі музеяў спланаваныя такім чынам, каб узнавіць асяроддзе, у якім жылі і працавалі пісьменнікі.

Стан захоўвання асабістых архіваў (дакументаў асабістага паходжання) у музеях можна ахарактарызаваць, зыходзячы з аналізу працы вядучых рэспубліканскіх і абласных музеяў. Так, напрыклад, БДМГВАВ з'яўляецца найвялікшым сховішчам дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў апошняй вайны. Гэтыя дакументы аб'яднаны ў г. зв. асабістыя справы – комплексы дакументаў, што звычайна складаюцца з біяграфічных матэрыялаў (пасведчанні, граматы ды інш.), ліставання і фотаздымкаў. Іх колькасць перавышае 6 тысяч адз. зах. Усяго ж дакументальны і фотафонд утрымліваюць больш за 100 тыс. адз. зах. У даведнік 1980 г. увайшло 111 комплексаў дакументаў[167]. Штогод фонды музея папаўняюцца на 500 адз. зах.[168] Асабістыя справы ўдзельнікаў вайны аб'яднаны ў картатэцы па тэматыцы: героі Савецкага Саюза, героі Сацыялістычнай працы і працаўнікі гаспадаркі, героі Савецкага Саюза (партызаны і падпольшчыкі), удзельнікі вайны (франтавікі), удзельнікі партызанскага руху і падполля, удзельнікі вайны – ураджэнцы Беларусі, дзеці-партызаны ды інш.

[167] Личные архивные фонды в государственных хранилищах СССР: указатель: в 3-х тт. / ред. кол. Ю. И. Герасимова и др.; сост. Э. В. Колосова и др.– М., 1980. – Т. 3.

[168] Воронкова И. Ю. Белорусский государственный музей истории Великой Отечественной войны как фундаментальное хранилище документов и материалов о народной борьбе против гитлеровских захватчиков // Мужество и трагедия народа. По матер. «круглого стола» посвященного 55-летию Победы в Великой Отечественной войне. – Минск, 2000. – С. 12–19.

Дакументы, што захоўваюцца ў музеях маюць тэматычны і калекцыйны характар (біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, рэчы), прэзентуючы асобу толькі як удзельніка вайны. Пры гэтым па-за ўвагай застаюцца іншыя перыяды і накірункі дзейнасці.

Тым не менш матэрыялы музеяў могуць стаць сур'езным дадаткам для ўзнаўлення комплексаў дакументаў вядомых дзеячаў, удзельнікаў апошняй вайны І. Шамякіна, П. Машэрава, В. Харужай, І. Крупені, Ц. Бумажкова, К. Заслонава, Э. Лаўрыновіча, В. Лівенцава, У. Лабанка, М. Восіпавай, А. Рабцэвіча, М. Шмырова, В. Каржа. Таксама трэба адзначыць дакументы шараговых удзельнікаў вайны, якія захаваліся ў розных музейных сховішчах, менавіта П. Галавачова, Е. Барыкіна, В. Казлова, А. Лізюкова, Б. Пішчыкевіча, К. Тамашэўскага, Я. Фогеля, М. Шылы.

У НМГКБ сабраны дакументы дзеячаў беларускай навукі, культуры, гаспадаркі, грамадска-палітычных дзеячаў, спартоўцаў, пачынаючы з XIX ст. Да асабліва каштоўных можна аднесці асобныя дакументы і рэчы Адама Багдановіча і яго сям'і, перададзеныя з Яраслаўля; рэчы, што належалі сем'ям Францішка Багушэвіча і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча; дзённік архіепіскапа Міхаіла Галубовіча, фотаздымкі Ігната Буйніцкага, Івана і Антона Луцкевічаў, Вацлава Ластоўскага, Лявона Дубейкоўскага, Адама Гурыновіча, Яўгена і Уладзіміра Хлябцэвічаў, Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

Да найбольш значных і цэласных комплексаў адносяцца дакументы мастака П. Гаўрыленкі, гісторыкаў М. Нікольскага і У. Перцава, паэта М. Танка, паэта П. Броўкі, кампазітараў Р. Пукста, Я. Цікоцкага, М. Чуркіна, П. Падкавырава, а таксама матэрыялы перададзеныя дачкой Уладзіміра Пічэты Ксеніяй у пач. 1980-х гг. (біяграфія ў трох сшытках, сямейны альбом, асабістыя рэчы і фотаздымкі гісторыка).

Картатэка дакументальнага фонду ДМГТМК, створанага ў 1990 г., налічвае больш за 420 асоб, сярод якіх варта адзначыць грунтоўныя комплексы дакументаў (біяграфічных, службовай, творчай дзейнасці, фотаздымкі): мастакоў К. Быліча, А. Грыгар'янца, канцэртмайстра Ў. Шэліхіна, кампазітараў Ю. Семянякі, акцёраў і рэжысёраў Г. Арловай і М. Яроменкі, М. і М. Кавязіных, Ю. Ужанцава, С. Штэйна, дырыжораў Я. Вашчака, В. Роўды, хормайстра А. Кагадзеева, мастацтвазнаўца А. Лабовіча, паэта С. Новіка-Пяюна.

У ДМГБЛ захоўваецца больш за 10 цэласных комплексаў дакументаў, перададзеных на дзяржаўнае захоўванне самімі архіваўтваральнікамі, асабістыя архівы пісьменнікаў і паэтаў Васіля Віткі, Зоські Верас, Сяргея Грахоўскага, Ніла Гілевіча, Алеся Звонака,

Вольгі Іпатавай, Кандрата Крапівы, Алеся Мілюця, Пімена Панчанкі, Тараса Хадкевіча, Сакрата Яновіча.

Літаратура, музыка, тэатр – сферы дзейнасці, што стасуюцца з профілем камплектавання БДАМЛМ, таму часткі цэлага шэрагу асабістых архіваў можна знайсці ў адным з музеяў і архіве.

Рашэнне аб стварэнні Мінскага абласнога краязнаўчага музея ў Маладзечне было прынята ў 1958 г. (адчынены ў 1964). Сюды з г. Калініна была перададзена грамата, выдадзеная Зарыяну Даленга-Хадакоўскаму ў 1818 г., якая дазваляла даследчыку правядзенне археалагічных раскопак і працу ў архівах і бібліятэках. Дачка беларускага пісьменніка А. Паўловіча прыслала з Львова асабістыя рэчы бацькі, падарункі Б. Эпімах-Шыпілы, а дачка гісторыка Міколы Ермаловіча перадала сямейныя фотаздымкі[169]. У музеі захоўваецца арыгінальны ліст Браніслава Тарашкевіча, што быў напісаны да родных з турмы ў 1931 г. і шэраг копій дакументаў біяграфічнага характару.

Комплекс дакументаў Паўліны Мядзёлкі, які ўключае біяграфічныя дакументы, матэрыялы дзейнасці, ліставанне, мемуары, дакументы бацькі, а таксама рэчы і кнігі з дароўнымі надпісамі, быў перададзены ў музей у 1974 г. з Будслава Ч. Грышкевічам. Захаваліся комплексы творчых дакументаў перакладчыка П. Бітэля, драматурга А. Махнача. Каштоўнасць прадстаўляе комплекс дакументаў ураджэнца Валожынскага раёна В. Харука, у якім, акрамя біяграфічных дакументаў захоўваюцца гаспадарчыя дакументы (дамовы аб арэндзе 1929–1936, абавязацельствы аб здачы сельскагаспадарчай прадукцыі за 1942 г. ды інш.). Картатэка персаналій налічвае больш за 90 асоб.

Найбольш каштоўным і цэласным комплексам дакументаў асобы, што захаваўся ў ВАКМ з'яўляюцца матэрыялы гісторыка, археографа, краязнаўцы Аляксея Сапунова, а таксама каштоўныя зборы дакументаў аб дзейнасці мастакоў Юрыя Пэна і Марка Шагала, калекцыянера Вацлава Федаровіча[170]. У Гродзенскім абласным краязнаўчым музеі – этнографа П. Кнышава, філосафа А. Макавельскага, настаўніка і фатографа Р. Салаўя. У Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі – гісторыка і краязнаўцы І. Філіповіча, арганізатара партызанскага руху на Магілёўшчыне падчас вайны І. Станкевіча, пісьменніка і перакладчыка П. Кабзарэўскага. У Го-

[169] Гужалоўскі А. А. Музеі Беларусі. 1941–1991. – Мінск: НАРБ. – С. 74–75.

[170] Абрамава И. А. Судьба коллекции В. П. Федоровича // 90 гадоў Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Матэрыялы навук. канф. 24 лістап. 1999 г., Віцебск / склад. В. У. Скалабан [ды інш.] – Мінск, 1999. – С. 56–57.

мельскім абласным краязнаўчым музеі захавалася невялікая частка асабістага архіва расійскага дзяржаўнага дзеяча і гісторыка Ю. В. Талстога (1824–1878) перададзеная ў 1920 г. у музей настаўнікам С. Бабарыкіным.

Брэсцкі краязнаўчы музей пачаў камплектаванне ў 1945 г., таму дакументы асабістага паходжання ахопліваюць час ад пачатку вайны і па сённяшні дзень. За апошнія 20 гадоў на захоўванне прыняты дакументы больш 90 асоб. Гэта дакументы вядомых дзеячаў Брэсцкай вобласці, якія адлюстроўваюць гісторыю рэгіёна па некалькіх накірунках. Аднак тут амаль цалкам адсутнічаюць дакументы творчай дзейнасці асобы.

Да цэласных комплексаў дакументаў, што тычацца дзейнасці адной асобы, можна аднесці дакументы першага дырэктара Брэсцкага дзяржаўнага настаўніцкага інстытута А. Гарбачова, удзельнікаў апошняй вайны Ў. Сальнікава і сям'і Фядотавых, паэта і журналіста І. Шчуроўскага, першага дырэктара Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея І. Бірулі.

На 1 студзеня 2007 г. у музеі налічвалася 4 656 адз. зах. з ліку дакументаў асабістага паходжання, а таксама 18 646 фотадакументаў, якія ў большасці выпадкаў паходзяць з асабістых архіваў. Кожны год музей папаўняецца дакументамі 5–7 асоб (прыблізна 100 адз. зах.).

Такім чынам, можна вызначыць больш 50 цэласных комплексаў дакументаў асабістага паходжання, што захоўваюцца ў вядучых музеях Беларусі і маюць самастойную навуковую каштоўнасць. Колькасць улічаных у музейных картатэках персаналій значна большая, але яны ўяўляюць каштоўнасць толькі для дапаўнення звестак аб ужо вядомых асабістых архівах. Колькасць фондаў асабістага паходжання, якія захоўваюцца ў аддзелах рукапісаў бібліятэк перавышае 68, у складзе двух калекцый аб'яднаны малаколькасныя архівы 34 асоб. Да гэтых лічбаў можна дадаць дакументы 12 літаратурных і мемарыяльных музеяў, што захоўваюць дакументы адной асобы, вялікую колькасць фрагментаў асабістых архіваў, а таксама асобныя дакументы асабістага паходжання.

## *Асабістыя архівы на захоўванні грамадскіх установаў Беларусі*

Акрамя дзяржаўных сховішчаў асабістыя архівы захоўваюцца ў прыватнай уласнасці асобаў і грамадскіх установаў. Найбуйнейшай грамадскай ініцыятывай па захоўванні дакументаў асабістага паходжання ў сучаснай гісторыі стаў Архіў найноўшае гісторыі (АНГ). Ён быў створаны пад эгідай беларускага гуманітарнага фонду «Наша ніва» у 1996 г. і ставіў на мэце *«асэнсаванне гісторыі Беларусі ХХ ст., пошук дэмакратычных каранёў незалежнага беларускага грамадства, актуалізацыю гэтай спадчыны»*. У тыя гады на хвалі грамадскага ўздыму адчувалася вострая патрэба ў фіксацыі падзеяў сучаснай гісторыі.

Першым праектам АНГ[171] стала выданне кнігі «Менская вясна – 1996: Хроніка, дакументы, успаміны». Быў створаны фонд беларускага самвыдату, адбываўся запіс вусных успамінаў, збіралася літаратура і дакументы, у т. л. з асабістых архіваў. На працягу 1996–1999 гг. Архіў выдаў больш дзясятка кніг. Гэта былі ўспаміны, даведнікі, зборнікі дакументаў.

Яго дзейнасць вялася ў шчыльным супрацоўніцтве з Цэнтрам KARTA (Польшча), «Мемориалам» (Расія), «Libri Prohibiti» (Чэхія), таварыствам «Alianta Civica» (Румынія), фондам Boll (Германія).

Зборы Архіву складаліся з 13 асноўных фондаў, кожны з якіх утрымліваў пэўную колькасць падфондаў. Падфонды, у сваю чаргу, падзяляліся на раздзелы. Сістэматызацыя матэрыялаў (у храналагічным, тэматычным ці прадметным парадку) адбывалася ў адпаведнасці з тэматычным, відавым і жанравым складам матэрыялаў. Фонд № 9 складаўся з архіваў прыватных асобаў.

У верасні 1999 г. на базе АНГ было створана грамадскае аб'яднанне «Дыярыуш», якое і сёння займаецца зборам і захоўваннем дакументаў па гісторыі беларускага грамадства ХХ ст., а таксама іх вывучэннем і публікацыяй. Дамінуючай праблематыкай стала гісторыю паўсядзённасці, а таксама палітычная гісторыя, у першую чаргу набыццё незалежнасці Рэспублікай Беларусь ды інш.

Зборы АНГ папаўняюцца і сёння, вядзецца пошук і набыццё архіваў грамадскіх арганізацый, якія ўтрымліваюць праграмныя і арганізацыйныя дакументы. Таксама ў цэнтры ўвагі прыватныя

[171] Дзярновіч А. Будзьма разам! // Наша ніва. – 1997. – № 36 (97) 29 снежня. [Электрон. рэсурс] – Рэжым доступу: http://www.nn.by/1997/36/06.htm – Дата доступу: 16.08.2010.

зборы і архівы пазацэнзурных і незалежных выданняў, улёткі, фотадакументы, атрыбутыка.

Тут захоўваюцца дакументы палітычных партый, што спынілі дзейнасць да 2000 г. (Партыя аматараў піва ды інш.), грамадскіх аб'яднанняў «Талака», «Паходня» ды інш., калекцыя ўлётак, аўдыё і відэазапісы (з розных мерапрыемстваў, выступленняў, успамінаў), музейна-мастацкая калекцыя (паштоўкі, вымпелы, значкі ды інш.), калекцыя ўспамінаў рэдактараў самвыдата, матэрыялы дзяржаўных устаноў, матэрыялы аб развіцці беларускай музыкі, дакументы ваеннага перыяду, дакументы рэпрэсаваных.

Таксама захоўваюцца дакументы з асабістых архіваў фатографа і журналіста Уладзіміра Кармілкіна, святара Уладзіслава Чарняўскага, урача Івана Міglobal Міронччыка, гісторыкаў Віталя Скалабана, Юрася Лаўрыка, палітычнага дзеяча Алега Багуцкага, фатографа і паэта Георгія Ліхтаровіча ды інш. Асноўную частку перададзеных асобамі матэрыялаў складаюць выразкі з газет, друкаваныя выданні, фотаздымкі і дакументы, што адлюстроўваюць грамадска-палітычнае жыццё і дзейнасць прадстаўнікоў нацыянальнага руху.

Акрамя АНГ сярод грамадскіх аб'яднанняў, якія захоўваюць дакументы асабістых архіваў, трэба назваць Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына». Як ужо хгадвалася, менавіта сюды ў 2005 г. быў перададзены на захоўванне архіў грамадскага дзеяча эміграцыі і выдаўца Дзмітрыя Касмовіча (1909–1991), што пражываў у Штутгарце (Германія).

Акрамя архіваў дзеячаў дысідэнцкага руху і палітыкаў у прыватнай уласнасці знаходзіцца большая частка архіваў святароў і рэпрэсаваных. Звесткі збіраюцца Камісіяй па кананізацыі пры Беларускім экзархаце (утворана ў 2006 г.). Таксама дакументы трапляюць у Архіў Мінскага епархіяльнага ўпраўлення. Праца вядзецца і ў межах розных грамадскіх праектаў, аднак сталае збіранне і захоўванне дакументаў асабістых архіваў не з'яўляецца іх асноўнай задачай[172].

[172] Іванова В. Вялікай душы чалавек: протаіерэй Іаан Струкоўскі. (Па дакументах асабістага архіва) // Праваслаўе. – 2010. – № 16. – С. 136–141; Іванова В. Доўгі жыццёвы шлях С. П. Яноўскага. // Пакаяньне. Праект Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. [Электрон. рэсурс] – Рэжым доступу: http://represii-by.info/index.php?newsid=1393 – Дата доступу: 19.12.2010.

## *Асабістыя архівы беларускага паходжання ў сховішчах іншых дзяржаў*

Асабістыя архівы беларусаў за мяжой – гэта архівы дзеячаў беларускай культуры, якія ў выніку гістарычных і адміністрацыйна-тэрытарыяльных трансфармацый і перамяшчэнняў апынуліся па-за межамі сучаснай Беларусі, а таксама дзеячаў, што выехалі ў эміграцыю.

Большасць асабістых архіваў, якія фарміраваліся ў канцы XVIII – першай палове XX ст., страчаны ці не захаваліся ў сваёй цэласнасці. Многія апынулася па-за межамі Беларусі, і іх часткі раскіданы па сховішчах Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі, Украіны ды інш. дзяржаў.

У Аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта сёння захоўваюцца асабістыя фонды Міхала Баброўскага, Іяхіма Лялевеля, Мікалая Маліноўскага, Еўдакіма Раманава, Яна Снядэцкага, Івана Спрогіса. У Аддзеле рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі Акадэміі навук Літвы – фонды гісторыкаў Тэадора Нарбута, Станіслава Пташыцкага, Яўстаха Тышкевіча, пісьменніка Уладзіслава Сыракомлі, Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы – фонды Элізы Ажэшкі, Тамаша Зана, Адама Кіркора, Ігната Лабойкі, Аляксандра Пшчолкі.

У Аддзеле рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве можна ўбачыць дакументы калекцыянераў Аляксандра Ельскага, Зыгмунта Глогера, Вандаліна Шукевіча, навукоўцаў Ігната Аннацэвіча, Міхала Баброўскага, Іяхіма Лялевеля, дзеячаў літаратуры Вінцэся Каратынскага, Юзафа Крашэўскага, Чэслава Янкоўскага ды інш. У Архіве Польскай Акадэміі навук – дакументы архівіста Мікалая Маліноўскага, калекцыянера Міхала Федароўскага, у Аддзеле рукапісаў бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта – Аляксандра Ельскага, Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага, Яна Булгака, Міхала Федароўскага.

У Інстытуце рускай літаратуры (Пушкінскім доме) у Санкт-Пецярбургу – дакументы Ігната Лабойкі, у Навукова-даследчыцкім аддзеле рукапісаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі – Івана Грыгаровіча, Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага, у Аддзеле пісьмовых крыніц Дзяржаўнага гістарычнага музея – дакументы Грыгаровічаў, І. Каладзеева, у Аддзеле рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі – Паўла Баброўскага, П. Гільтэбрандта, Ігната Лабойкі, у Архіве Расійскай Акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу – Іосіфа Сямашкі ды інш.

Асабістыя архівы навукоўцаў, якія працавалі ў першай палове XX ст. і зрабілі істотны ўнёсак у развіццё беларускай навукі – Ула-

дзіміра Пічэты[173], Яўхіма Карскага, Мікалая Нікольскага, Аляксея Шахматава, Яўгена Ляцкага, Паўла Шэйна захоўваюцца зараз у сховішчах Масквы і Пецярбурга, Мітрафана Доўнар-Запольскага – у Кіеве і Львове, архівістаў Івана Спрогіса і Баляслава Брэжгі – у Рызе[174], літаратуразнаўцы і этнографа Яўгена Ляцкага – у Літаратурным архіве Музея нацыянальнай літаратуры Чэхіі (Прага).

З часоў падзелаў Рэчы Паспалітай з тэрыторыі Беларусі эмігравала значная колькасць літаратурных і палітычных дзеячаў, творцаў, навукоўцаў і шэраговых асобаў. На працягу больш як двух стагоддзяў назіраліся некалькі хваляў эміграцыі. Можна вылучыць раннюю эміграцыю XVIII – першай паловы XIX ст., эканамічную эміграцыю канца XIX – пачатку XX ст., міжваенную эміграцыю, а таксама эміграцыю падчас і пасля Другой сусветнай вайны.

Адну з першых хваляў эміграцыі склалі ўдзельнікі паўстання 1830–1831 гг. Агульная іх колькасць у краінах Заходняй Еўропы і ўсяго свету вагалася ад 8 да 10 тыс. чал., з якіх ад 1500 – да 1700 чал. з'яўляліся ўраджэнцамі сучасных Беларусі і Літвы[175].

Менавіта прадстаўнікі гэтай хвалі Аляксандр Галынскі і Леан Вадзінскі выступілі з ідэяй стварэння эмігранцкай Польскай бібліятэкі ў Парыжы. Бібліятэка была адкрыта ў 1838 г., і акрамя кнігазбору ў ёй захоўваліся рукапісы. У 1841 г. сюды былі перададзены дакументы Юльяна Нямцэвіча, у 1852 г. – 36 лістоў Іяхіма Ляревеля, у 1860-я гг. Яўстафі Янушкевіч перадаў лісты і ўспаміны свайго брата Адольфа. У 1844 г. пры бібліятэцы быў створаны тайны Нацыянальны архіў, куды перадаваліся дакументы паўстання 1830–1831 гг., а ў 1903 г. Уладзіслаў Міцкевіч стварыў пры бібліятэцы музей свайго бацькі Адама Міцкевіча.

Матэрыялы Польскай бібліятэкі і музея Адама Міцкевіча ў Парыжы, якія тычацца гісторыі Беларусі, апісаны і анатаваны

---

[173] Иванова О. С. Личные архивы как исторический источник (на примере архивов учёных-историков В. И. Пичеты и Н. Н. Улащика) // Академический архив в прошлом и настоящем: Сборник научных статей к 280-летию Архива Российской академии наук / ПФА РАН; Отв. ред. И. В. Тункина – СПб.: Нестор-История, 2008. – С. 414–420.

[174] Іванова В. Асабістыя архівы ў Латвійскіх сховішчах як крыніца па гісторыі Беларусі // Сучасныя праблемы дакументазнаўства, архівазнаўства і археаграфіі: матэрыялы навук.-практ. канф., прысвеч. 85-годдзю Дзярж. архіўн. службы і 80-годдзю Нац. архіва Рэсп. Беларусь. (Мінск, 12 красавіка 2007) / склад. В. С. Пазднякоў, П. П. Журкевіч. – Мінск, 2007. – С. 162–168.

[175] Матвейчык Дз. Эміграцыя з беларуска-літоўскіх зямель у Заходняй Еўропе (1831–1863 гг.) // Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. – 2007. – № 3. – С. 52–61.

Вольгай Гарбачовай[176]. Сярод іх вызначаюцца комплексы дакументаў Напалеона Орды, Іяхіма Лялевеля, Ігната Дамейкі, Юльяна Нямцэвіча, Тамаша Зана, якія з'яўляюцца часткамі іх асабістых архіваў[177].

З Францыяй у пазнейшыя часы звязана гісторыя архіву БНР, што знаходзіўся ў Міколы Абрамчыка[178]. У прыватнай уласнасці тут захоўваецца архіў мастака Уладзіміра Шыманца.

У ЗША пражывае каля 600–650 тыс. выхадцаў з Беларусі, што пераехалі сюды пераважна ў XX ст. Асабістыя архівы грамадскіх дзеячаў, навукоўцаў, літаратурных дзеячаў Мікалая Лапіцкага, Янкі Касяка, Янкі Запрудніка, Наталлі Арсенньевай знаходзяцца сёння ў бібліятэцы Рутгэрскага ўніверсітэта. Дакументы вядомага польскага этнографа, уладальніка калекцыі фотаздымкаў Палесся 1934–1936 гг. Юзафа Абрэмбскага (Joseph Obrebski, J. Obrębski) – у архіве Масачусацкага ўніверсітэта (Амхерст).

Матэрыялы Вітаўта Кіпеля, Васіля Пунтуса, Вінцэнта і Раісы Жук-Грышкевічаў, Багдана Андрусішына – у складзе беларуска-амерыканскай калекцыі Даследчыцкага цэнтра гісторыі эміграцыі ўніверсітэта Мінесоты. Асабістыя архівы Антона Адамовіча, Юркі Віцьбіча, Яўгена Кавалеўскага, Янкі Юхнаўца – у Нью-Ёркскай Публічнай бібліятэцы, празаіка Васіля Каваля (1907–1937) – у складзе Смаленскага рукапіснага збору ў Нацыянальным архіве ЗША. Дакументы палітычнага і грамадскага дзеяча Аляксандра Прушынскага, польскага гісторыка беларускага паходжання Мікалая Іванова, а таксама Юрыя Сабалеўскага, Івана Любачкі – у Архіве Гувераўскага Інстытута (Стэнфардскі ўніверсітэт, Каліфорнія). Комплексы дакументаў асабістых архіваў, што захоўваюцца ў пералічаных установах часта маюць толькі павярхоўнае, першаснае апісанне.

Значную каштоўнасць маюць дакументы сховішча створанага пры царкве св. Ефрасінні Полацкай у Саўт-Рыверы. Гэты горад доўгі час з'яўляўся асяродкам прыхільнікаў Беларускай Цэнтральнай Рады – аднаго з крылаў беларускай палітычнай эміграцыі. Тут захоўваюцца архівы Радаслава Астроўскага, Нікандра Мядзейкі,

---

[176] Гарбачова В. Беларусіка ў зборах Польскай бібліятэкі й Музэю Адама Міцкевіча ў Парыжы // Запісы. Беларускі Інстытут навукі й мастацтва / рэдкал. Н. Гардзіенка [ды інш.]. – Т. 31. – Нью-Йорк–Мінск, 2008. – С. 45–64.

[177] У публікацыі згадваюцца дакументы цэлага шэрагу дзеячаў, звязаных з Беларуссю, якія аднак носяць шматковы характар і не разглядаюцца як комплекс дакументаў, што ўсебакова адлюстроўвае дзейнасць асобы.

[178] Запруднік Я. Да загадкі дзяржаўнага архіву БНР у Міколы Абрамчыка // Беларускі Інстытут навукі й мастацтва / рэдкал. Н. Гардзіенка [ды інш.]. – Т. 32. – Нью-Йорк–Мінск, 2009. – С. 450–477.

Аляксандра Русака ды інш., што ўтрымліваюць у асноўным дакументы аб дзейнасці БЦР.

Існуе таксама шэраг сховішчаў грамадскіх і навуковых аб'яднанняў беларусаў у ЗША. Трэба назваць Беларускі Інстытут навукі і мастацтва (БІНІМ), арганізаваны ў 1951 г., які гуртуе вакол сябе актыўныя беларускія інтэлектуальныя кадры (дырэктар – доктар Вітаўт Кіпель). Таксама неабходна прыгадаць Фундацыю імя Пётры Крэчэўскага, заснаваную ў 1959 г. пад патранатам Рады БНР, мэтай якой было захаванне ў ЗША беларускай культуры і традыцый, стварэнне Беларускага замежнага архіва (архівіст – Ганна Сурмач). У пачатку 1950-х гг. была зроблена спроба стварэння Ўсебеларускага архіву, якая аднак не была даведзена да канца[179].

Адзначаныя сховішчы захоўваюць пэўную колькасць матэрыялаў па беларускай гісторыі і культуры. Аднак утрыманне вялікіх комплексаў асабістых архіваў, якое вымагае значных матэрыяльных і арганізацыйных сродкаў, застаецца справай будучыні.

Можна казаць аб складванні традыцыі захоўвання асабістых архіваў беларусаў у ЗША. Звычайна яны перадаюцца на захоўванне ў сховішчы ўніверсітэтаў. Збіранне такіх архіваў з'яўляецца ў першую чаргу грамадскай ініцыятывай. Так, улетку 2004 г. Уладзімір Кушаль пераслаў на адрас Янкі Запрудніка 15 скрынак з кнігамі і архіўнымі матэрыяламі сваёй маці Наталлі Арсенневай, якія былі перададзены ў бібліятэку Рутгерскага ўніверсітэта[180].

Стварэнне даведачнага апарату – таксама справа грамадская. Напрыклад, дакументы перададзеныя ў бібліятэку Рутгерскага ўніверсітэта, апрацоўвала Лёля Касоўская-Лапіцкая[181], а дакументы Даследчыцкага цэнтра гісторыі эміграцыі – айцец Ігар Лабацэвіч.

Асноўным цэнтрам захоўвання асабістых архіваў беларусаў у Вялікабрытаніі на сённяшні дзень з'яўляецца Беларуская бібліятэка і музей імя Францішка Скарыны ў Лондане – найбуйнейшы асяродак канцэнтрацыі беларускай дакументальнай спадчыны за мяжой.

---

[179] Усебеларускі архіў // Бацькаўшчына. – 1953. – № 28 (159), 12 ліпеня. – С. 4.

[180] Запруднік Я. Архіў Наталлі Арсеньевай // Запісы. Беларускі Інстытут навукі й мастацтва / пад рэд. Н. Гардзіенка [ды інш.] – Т. 29. – Нью-Йорк-Мінск, 2005. – С. 181–189.

[181] Беларускі цуд у Нью-Ёркаўскай Публічнай бібліятэцы // Беларус. – 2009. – № 559 – С. 4–5; Гардзіенка А. Беларускі кангрэсавы камітэт Амерыкі (БККА). – Смаленск, 2009. – С. 6–9; Гардзіенка, А. Архівы царквы Сьв. Эўфрасіньні Полацкай у Саут-Рыверы // Запісы. Беларускі Інстытут навукі й мастацтва / рэдкал. Н. Гардзіенка [ды інш.]. – Т. 31. – Нью-Йорк-Мінск, 2008. – С. 65–72.

Збіранне рукапісных дакументаў пачалося яшчэ з канца 1940-х гг. з ініцыятывы айца Чэслава Сіповіча: *«У Marian House у Лондане пры Беларускай каталіцкай Місіі ёсць запачаткаваны Агульны Беларускі Архіў, Беларускі Музей і Беларуская Бібліятэка. Да ўсіх суродзічаў шчырая просьба прысылаць у Marian House (Holden Avenue, London, № 12), усё тое, што ёсць вартым захавання»*[182].

Гэтая абвестка стала пачаткам збірання ў Лондане асабістых архіваў беларускіх дзеячаў. Афіцыйнае адкрыццё Бібліятэкі і Музея адбылося 15 мая 1971 г. Першым асабістым зборам тут стаў архіў расійскага эмігранта князя Георгія Паўлавіча Бенігсена, які займаўся прапагандай усходняга хрысціянства і быў знаёмы з а. Сіповічам.

На сённяшні дзень тут захоўваюцца архівы святароў Льва Гарошкі, Язэпа Германовіча, Тамаша Падзявы, Пятра Татарыновіча, Чэслава Сіповіча, паэтаў, пісьменнікаў і публіцыстаў Кастуся Акулы, Уладзіміра Сядуры, Аўгена Протаса, Юркі Віцьбіча, Сакрата Яновіча, кампазітара Мікалая Шчаглова-Куліковіча, музыказнаўцы Гая Пікарды.

Утрымліваюцца таксама асобныя рукапісы грамадскага і палітычнага дзеяча Васіля Захаркі, паэтаў і пісьменнікаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Ларысы Геніюш, Алеся Салаўя, Хведара Ільяшэвіча. У асобных скрынях захоўваюцца дакументы некаторых дзеячаў эміграцыі Аляксандра Калодкі і Міколы Скабея (Аўстралія), Аляксея Арэшкі і Леаніда Карася (Бельгія), Янкі Чарапука-Змагара і Аляксандры-Вольгі Хмыз (ЗША), Міхася Булыгі і Лявона Рыдлеўскага (Францыя). Большасць архіваў застаюцца неапрацаванымі, а іх агульнае апісанне створана гісторыкам Наталляй Гардзіенка[183].

Беларусы пачалі прыязджаць у Канаду ў пачатку XX ст., а наступная хваля эміграцыі ўжо з Заходняй Беларусі прыйшлася на міжваенны перыяд. Пераважна гэта была эканамічная эміграцыя.

У Яўрэйскім гістарычным таварыстве і архіве Эдмантана і Паўночнай Альберты захаваліся дакументы яўрэйскіх сем'яў бе-

[182] З абвесткі ў часопісе «Бацькаўшчына» 1955, № 9. Цыт па: Гардзіенка, Н. Архівы Беларускай бібліятэкі й музею імя Францішка Скарыны ў Лондане // Запісы. Беларускі Інстытут навукі й мастацтва / рэдкал. Н. Гардзіенка [ды інш.]. – Т. 31. – Нью-Йорк-Мінск, 2008. – С. 73.

[183] Гардзіенка Н. Архівы Беларускай бібліятэкі й музею імя Францішка Скарыны ў Лондане // Запісы. Беларускі Інстытут навукі й мастацтва / рэдкал. Н. Гардзіенка [ды інш.]. – Т. 31. – Нью-Йорк-Мінск, 2008. – С. 73–99; Гардзіенка Н. Беларусы ў Вялікабрытаніі / пад рэд. А. Гардзіенкі. – Мінск: Медысонт, 2010. – С. 425–443.

ларускага паходжання Ісаака Мілера з Капыля, Джаэля Ліўшыца з Веткі, Саламона і Марыяшы Эстрынаў з Краснаполля.

Пасля Другой сусветнай вайны ў 1948 г. пачалася палітычная беларуская эміграцыя. Прыязджалі пераважна маладыя людзі, выхаванцы беларускіх маладзёжных арганізацый у Беларусі або беларускіх лагераў у Германіі. Сяліліся яны ў вялікіх гарадах – Таронта і Манрэалі на ўсходзе Канады і Вініпэгу на захадзе. Менавіта яны пачалі ствараць першыя беларускія арганізацыі. У 1949 г. было створана Згуртаванне беларусаў у Канадзе. Паводле афіцыйных дадзеных, у Канадзе пражывае каля 5 тыс. чалавек, якія вызначаюць сябе беларусамі.

Некаторыя дзеячы беларускай эміграцыі перадалі свае асабістыя архівы на захоўванне ў Нацыянальны архіў Канады. У 1972 г. у складзе рукапіснага аддзелу быў створаны г. зв. Нацыянальны этнічны архіў[184]. Менавіта тут захоўваецца фонд грамадскага і культурнага дзеяча эміграцыі ў Канадзе, паэта і пісьменніка Міколы Сільвановіча (псеўд. Мікола Вярба) (1917–1975), дзеяча культуры і даследчыка гісторыі эміграцыі прафесара літаратуры Янкі Садоўскага (1926–1982), паэта і пісьменніка Кастуся Акулы (1925–2008), грамадскай дзеячкі Раісы Жук-Грышкевіч (1925–2009). Першыя два фонды цалкам апрацаваны, складзены вопісы, якія даступныя ў інтэрнэце.

Такім чынам, можна дакладна вылучыць цэнтры захоўвання асабістых архіваў беларускіх дзеячаў у Вялікабрытаніі, ЗША, Канадзе, Францыі, якія склаліся пераважна ў другой палове XX ст. Гэта зборы грамадскіх арганізацый і дзяржаўных архіваў азначаных краін, якія яшчэ патрабуюць вывучэння, а часта таксама сістэматызацыі і навуковай апрацоўкі.

Неабходна дадатковае даследаванне архіваў беларусаў у Германіі, Чэхіі, Францыі, Польшчы, Літве, Латвіі ды іншых краінах[185], у тым ліку архіваў, што знаходзяцца ў прыватнай уласнасці і патрабуюць пэўных захадаў для забеспячэння належнай захаванасці. Пошук архіўнай беларусікі трэба працягваць таксама ў сховішчах Расіі і Украіны.

---

[184] Матяш І. Архівна україніка в Канаді: історіографія, типологія, зміст. – Київ, 2008. – С. 53–54.

[185] Запартыка Г.В. Архівы беларускай эміграцыі // Замежная архіўная беларусіка. Матэрыялы міжнароднай навук. канф. / Дзяржкамітэт па архівах і справаводству РБ; БелНДІДАС; Бел. асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА [ды інш.]– Мінск: БелНДІДАС, 1998. – С. 12–22.

# Шляхі выкарыстання асабістых архіваў для навуковых даследаванняў

## *Асаблівасці фарміравання, камплектавання, навукова-тэхнічнай апрацоўкі, захоўвання і выкарыстання асабістых архіваў*

Працэс фарміравання асабістых архіваў і іх захоўванне ў розных сховішчах маюць шэраг асаблівасцяў. Стварэнне асабістага архіва рэгулюецца толькі логікай канкрэтнага жыцця, а сувязь паміж яго складовымі часткамі выяўляецца праз аналіз накірункаў дзейнасці асобы. Ступень захаванасці і склад дакументаў архіва ў вялікай ступені залежыць ад архіваўтваральніка, які зыходзіць з асабістага ўяўлення аб каштоўнасці дакументаў і неабходнасці іх захоўвання, а значыць непасрэдна ўплывае на тое меркаванне, якое будзе фарміравацца ў грамадстве. Вызначальным можа стаць стаўленне нашчадкаў да архіўнай спадчыны асобы, а таксама гістарычныя падзеі і прыродныя катаклізмы, якія часта вядуць да знішчэння крыніцаў гістарычнай памяці. У выніку ўздзеяння гэтых фактараў адбываецца своеасаблівы «натуральны адбор», які не заўсёды забяспечвае аб’ектыўнасць сведчанняў і паўнату складу.

Рэканструкцыя мінулага, заснаваная на крыніцах асабістых архіваў, павінна адбывацца з улікам ступені ўздзеяння на цэласнасць комплексу, асаблівасцей уліку, навукова-тэхнічнай апрацоўкі, захоўвання і выкарыстання дакументаў розных устаноў.

У залежнасці ад маштабу дзейнасці архіваўтваральніка на захоўванне ў рэспубліканскія архівы, музеі, аддзелы рукапісаў бібліятэк, грамадскія ўстановы прымаюцца асабістыя архівы выдатных прадстаўнікоў культуры, вядомых палітычных дзеячаў, праз прызму светаўспрымання якіх можна разглядзець жыццё цэлай краіны.

Асабістыя архівы «простых» людзей (працаўнікоў гаспадаркі, сведкаў ці ўдзельнікаў гістарычных падзей) дапамагаюць узнаўленню гісторыі паўсядзённасці, дэманструюць тыповае ці ўнікальнае асабістае ўспрыманне гістарычнай падзеі. Яны прымаюцца на захоўванне ў абласныя і занальныя архівы і ўтрымліваюць, як правіла, толькі пэўныя групы дакументаў (біяграфічныя, мемуарныя, дакументы дзейнасці) з дакладна вызначанай тэматыкай (рэвалюцыя і грамадзянская вайна ў Расіі, Другая сусветная вайна, вайна ў Афганістане, палітыка савецкага кіраўніцтва, краязнаўства).

В. П. Ласковіч, вядомы брэсцкі краязнаўца і збіральнік дакументаў асабістага паходжання, у сваіх нататках трапна вызначыў ідэю неабходнасці збірання дакументаў такога кшталту і мэты іх выкарыстання ў савецкім грамадстве: *«Кожны дакумент – адлюстраванне пэўнага перыяду часу, дзейнасці, жыцця чалавека. Дакументы – гэта палітычны, маральны, ідэйны пачатак грамадзяніна... Калі б я мог аб кожным дакуменце свайго архіва напісаць хаця б каротка, атрымалася б вялікая гісторыя, за якой стаяць добрыя і ліхія людзі, падзеі і з'явы майго пакалення»*[186]. Менавіта дакументы з вядомай ідэалагічнай скіраванасцю мелі прыярытэтнае права трапіць на дзяржаўнае захоўванне, а асэнсаванне неабходнасці захоўвання мела дастаткова высокі ўзровень.

З іншага боку, такія тэмы як рэпрэсіі, рэабілітацыя рэпрэсаваных, штодзённае жыццё ў Заходняй Беларусі, супрацiўленне савецкай уладзе, гісторыя царквы, дысідэнцтва, дзейнасць беларускіх грамадскіх арганізацый канца 1980-х гг. у дакументах фондаў абласных і занальных архіваў, краязнаўчых музеяў амаль не адлюстраваны. Няшмат захавалася ліставання, фотаздымкаў, успамінаў, якія асвятляюць асабістае і сямейнае жыццё. Пры адсутнасці дакументаў такога кшталту ахарактарызаваць асобу амаль немагчыма, і архіў набывае форму «асабіста-афіцыйнага». Ён адлюстроўвае толькі службовую дзейнасць архіваўтваральніка. Колькасць такіх архіваў, прынятых на дзяржаўнае захоўванне даволі значная.

Пры камплектаванні сховішчаў дакументамі асабістага паходжання архівісты (асабліва абласных і занальных архіваў) паўсюдна сутыкаюцца з праблемай адсутнасці беражлівага стаўлення да асабістых архіваў, што звязана са стратай традыцыі фарміравання і захоўвання асабістых архіваў прадстаўнікамі беларускай інтэлігенцыі[187].

Музеі, якія маюць прыярытэт у зборы і захоўванні дакументальных сведчанняў у абласных і раённых цэнтрах, у адпаведнасці са

---

[186] ДА Брэсцкай вобласці. Ф. 500 (Калекцыя дакументаў членаў КПЗБ, удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Вялікай Айчыннай вайны, сабраная В. П. Ласковічам). – Воп. 1. – Адз. зах. 348. – Л. 3.

[187] Шумейко М. Ф. Ещё раз о личных архивных фондах // Архіўныя чытанні I–III: матэрыялы навуковых канферэнцый, Мінск, 2003–2005 гг./ укл.: Г. В. Запартыка [ды інш.]; навук.рэд. А. В. Мальдзіс – Мінск, 2006. – С. 69–72; Кобец Ю., Окружилова Е. Комплектование и использование личных фондов в Зональном государственном архиве в г. Речица // «Пятыя Міжнародныя Доўнараўскія чытанні», міжнародная навук. канф. (2005, Рэчыца): прысвеч. дзейнасці і навуковай спадчыне вучонагаславіста М. В. Доўнар-Запольскага і гісторыі Рэчыцкага края / рэдкал.: М. В. Лебедзева (адк. рэд.) [ды інш.] – Гомель, 2005. – С. 379–383.

сваімі функцыямі не ставяць задачай цэласнае захаванне, улік і выкарыстанне комплексаў дакументаў асабістага паходжання. Звычайна, яны бяруць на захоўванне толькі асобныя дакументы, якія маюць пэўную атрактыўнасць, г. зн. здольнасць прыцягнуць увагу гледача.

У савецкі перыяд музей выконваў таксама ідэалагічную функцыю адлюстравання і прапаганды афіцыйнага погляду на гісторыю і сучаснасць. Зыходзячы з гэтага, збіраліся асобныя дакументы ўдзельнікаў рэвалюцый, войнаў, працаўнікоў гаспадаркі, спартсменаў ды інш. У асноўным гэта пасведчанні, ганаровыя граматы, узнагароды. Комплексы дакументаў асабістага паходжання ў музеях, як правіла, вызначаліся разнароднасцю фіксацыі інфармацыі, фрагментарнасцю, ідэалагічнай зададзенасцю, скіраванасцю на прыцягненне ўвагі гледача і невысокай інфармацыйнай каштоўнасцю.

Працэс камплектавання музеяў дакументамі асабістых архіваў не з’яўляецца пастаянным. З аднаго боку, гэта садзейнічае захаванню шэрагу каштоўных комплексаў крыніц, а з другога – стварае цяжкасці ў іх выкарыстанні. Так, напрыклад, у Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі захоўваюцца каштоўныя архівы беларускага настаўніка і фатографа Р. Салаўя, якія ўтрымліваюць унікальную калекцыю фотаздымкаў перыяду першай сусветнай вайны, а таксама іншыя крыніцы па гісторыі Беларусі за 1915–1942 гг. Тамсама захоўваецца асабісты архіў этнографа і гісторыка, ураджэнца Гродна П. Кушнера (Кнышава) (1889–1968), у асабістай перапісцы якога знайшлі адлюстраванне падзеяў другой паловы 1930-х гг. Аднак адсутнасць як інфармавання патэнцыяльных карыстальнікаў пра гэтыя архівы, так і належнай навукова-тэхнічнай апрацоўкі, замаруджвае ўвядзенне гэтых каштоўных комплексаў дакументаў у навуковы ўжытак.

На сённяшні дзень, кожнае дзяржаўнае сховішча Беларусі мае вызначаны накірунак камплектавання, у адпаведнасці з якім на захоўванне бяруцца і асабістыя архівы. Дакументы грамадскіх і палітычных дзеячаў, навукоўцаў прымаюцца НАРБ; літаратараў і мастакоў – БДАМЛМ, ДМГБЛ, ДМГТМК і мемарыяльнымі музеямі; навукоўцаў і літаратараў – АРКР ЦНБ НАН БЕЛАРУСІ, навукі і тэхнікі – БДАНТД; дзеячаў рэгіянальнага маштабу, удзельнікаў і сведкаў гістарычных падзей – абласнымі і занальнымі архівамі, краязнаўчымі музеямі, БДМГВАВ.

Найбольшая колькасць захаваных архіваў – гэта архівы літаратараў (25,6%), сведкаў і ўдзельнікаў гістарычных падзей (14,6%), навукоўцаў (13,2%), дзеячаў тэатра (11,3%) грамадскіх і палітыч-

ных дзеячаў (9,3%), работнікаў сферы музыкі, мастацтва, культуры (у сярэднім па 5,5%).

Відавочнае перакрыжаванне накірункаў камплектавання дзяржаўных устаноў асабістымі архівамі прыводзіць да іх распылення. Пры гэтым адсутнічае належная сістэма інфармавання аб месцах захоўвання. Раскіданасць архіваў асабістага паходжання выклікае неабходнасць правядзення мерапрыемстваў па іх размеркаванні на захоўванне, цэнтралізаваным уліку, стварэнні ўмоў для эфектыўнага выкарыстання на падставе шчыльнага навукова-метадычнага супрацоўніцтва архіваў, музеяў і бібліятэк.

Для забеспячэння захаванасці асабістых архіваў важнай праблемай з'яўляецца методыка іх навукова-тэхнічнай апрацоўкі. Адсутнасць навукова-даведачнага апарата, інфармацыі па гісторыі фонду, пра прынцыпы, крытэрыі і механізмы селекцыі прыводзіць да страты неабходнай для крыніцазнаўчага аналізу інфармацыі, а часам робіць немагчымай рэканструкцыю складу асабістага архіва. Апрацоўка і ўлік дакументаў асабістага паходжання ў музеях Беларусі разыходзіцца з метадычнымі рэкамендацыямі савецкага перыяду, а сучасныя беларускія нарматыўныя дакументы амаль не закранаюць дадзены аспект[188].

Большасць цэласных комплексаў дакументаў (фамільныя, сядзібныя архівы), якія браліся на захоўванне ў пачатку 1920-х гг. і колькасць якіх была нязначнай у выніку панесеных страт, у пасляваенны час былі перададзены на захоўванне ў дзяржаўныя архівы. У сувязі з гэтым методыка апісання архіўных фондаў у музеях, прапанаваная ў савецкі час, не была ўведзена ў практыку.

Нешматлікія цэласныя асабістыя архівы, перададзеныя ў музей архіваўтваральнікам ці яго роднымі, патрабуюць дадатковай навуковай архіўнай апрацоўкі, стварэння даведачнага апарата і сістэмы інфармавання аб іх колькасці і складзе. Метадычныя рэкамендацыі па працы з дакументамі асабістага паходжання, створаныя савецкімі і беларускімі архівістамі[189], прапанавалі апісанне акрамя дакументаў, таксама прадметаў і кніг, што паступаюць ра-

---

[188] Правила работы музеев по учёту и организации хранения письменных документов государственного архивного фонда СССР / Мин. культуры, ГАУ при СМ СССР; ред. А. В. Елпатьевский и др. – М., 1990. – 47 с.; Інструкцыя аб парадку камплектавання, уліку, навуковай апрацоўкі, захавання і выкарыстання прадметаў музейнага фонду Рэспублікі Беларусь / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 1997. – 95 с.

[189] Методические рекомендации по работе с документами личного происхождения (литература и искусство) / Э. Р. Коган [и др.]; Гл. арх. управ. при СМ СССР. – М., 1990. – 256 с.; Метадычныя рэкамендацыі да працы архіваў з дакументамі асабістага паходжання / аўт.-склад. Г. В. Запартыка; навук. рэд. С. У. Жумар. – Мінск, 2005. – 200 с.

зам з уласна асабістым архівам. Дзеля гэтага ствараецца асобны раздзел у вопісе і бібліятэчных картках.

Такім чынам, прадмет ці кніга, якія захоўваюцца ў архіве праходзяць два віды апісання – архіўнае і музейнае ці архіўнае і бібліятэчнае. Адпаведна ў бібліятэцы асабісты фонд апісваецца па бібліятэчных і архіўных правілах. Для сучаснага стану захоўвання асабістых архіваў у дзяржаўных музеях Рэспублікі Беларусь, актуальным з'яўляецца ўвядзенне навуковага апісання і ўліку дакументаў НАФ па адзіных патрабаваннях дзеля больш эфектыўнага выкарыстання комплексаў дакументаў, прынятых на захоўванне.

Выкарыстанне фондаў і калекцый асабістага паходжання ў дзяржаўных сховішчах Беларусі адбываецца дзеля падрыхтоўкі супрацоўнікамі архіваў і карыстальнікамі чытальных залаў выстаў, тэле- і радыёперадач, археаграфічных і навуковых публікацый.

З пачатку 1990-х гг. архівістамі, супрацоўнікамі музеяў і бібліятэк зроблена вялікая праца па папулярызацыі дакументаў асабістага паходжання. Найбольш папулярныя сярод вучоных, асабліва літаратуразнаўцаў – фонды асабістага паходжання БДАМЛМ. Дакументы асабістых архіваў выкарыстоўваюцца пры правядзенні біяграфічных даследаванняў (напрыклад, прысвечаных Аляксею Сапунову, Мікалаю Ўлашчыку ды інш.) і публікацыі іх твораў (напрыклад, Паўлюка Труса, Змітрака Астапенка, Міколы Улашчыка ды інш.).

Вызначаныя асаблівасці і праблемы захоўвання асабістых архіваў павінны вырашацца з улікам існуючага заканадаўства і нарматыўна-метадычнай базы. Патрабуецца пэўнае спалучэнне архіўных, бібліятэчных і музейных методык апісання і інфармавання, а таксама супрацоўніцтва работнікаў асноўных мемарыяльных устаноў у дадзеным накірунку. Неабходным з'яўляецца таксама ўлік асабістых архіваў дзеячаў беларускай навукі і культуры, што захоўваюцца як у айчынных, так і ў замежных сховішчах.

Паўсюдная змена носьбіта інфармацыі з папяровага на электронны робіць актуальнай праблему захоўвання электронных асабістых архіваў.

Такім чынам, асноўнымі праблемамі камплектавання, захоўвання, навукова-тэхнічнай апрацоўкі і выкарыстання асабістых архіваў можна лічыць раскіданасць дакументаў адной асобы па розных сховішчах, адсутнасць даступнай інфармацыі аб захоўванні асабістых архіваў, нездавальняючы стан навукова-тэхнічнай апрацоўкі і захоўвання асабістых архіваў у некаторых сховішчах, нізкую інфарматыўную каштоўнасць і тэндэнцыйнасць дакументаў шэрагу асабістых архіваў, што былі прыняты на дзяржаўнае захоў-

ванне, адсутнасць поўнай інфармацыі аб асабістых архівах беларускіх дзеячаў у замежных сховішчах.

Актуальным накірункам з'яўляецца павышэнне ступені ўсведамлення грамадствам каштоўнасці асабістых архіваў, выпрацоўка форм і метадаў захоўвання электронных асабістых архіваў.

## *Асабісты архіў як гістарычная крыніца*

Асабісты архіў як комплекс крыніц мае цэлы шэраг асаблівасцяў, якія вынікаюць са спецыфікі яго стварэння, захоўвання і выкарыстання. Стварэнне асабістага архіва носіць характар натуральнага гістарычнага працэсу, які рэгулюецца толькі логікай асабістага жыцця архіваўтваральніка. Паўната і склад крыніц асабістага архіва цалкам залежаць ад ягонага погляду на тое, як і што неабходна захоўваць.

У выніку ўздзеяння гэтых фактараў адбываецца своеасаблівы «натуральны адбор», які далёка не заўсёды забяспечвае аб'ектыўнасць сведчанняў, і паўнату складу. Рэканструкцыя мінулага, заснаваная на захаваных асабістых архівах, павінна адбывацца разам з рэканструкцыяй дзейнасці асобы архіваўтваральніка. Пры гэтым трэба ўлічваць спецыфіку светаўспрымання той эпохі, у якую яны былі створаны, а таксама асабісты ўплыў уладальніка архіва і архівіста, які займаўся экспертызай каштоўнасці архіва і навуковай апрацоўкай фонду.

Пануючая ў БССР марксісцкая ідэалогія вызначала накірункі камплектавання дзяржаўных архіваў дакументамі асабістага паходжання. У залежнасці ад маштабу дзейнасці ў якасці архіваўтваральнікаў выступалі то «выдатны» прадстаўнік свайго часу, то вядомы палітык, праз прызму светаўспрымання якога можна было спрабаваць разглядаць жыццё цэлай краіны. Ім мог быць і «просты»[190] чалавек (сведка або ўдзельнік гістарычнай падзеі), дакументы асабістага архіва якога ўзнаўлялі паўсядзённую гісторыю, тыповае ці ўнікальнае ўспрыманне гістарычнай падзеі.

Але ў поўным сэнсе «асабістым» можна назваць толькі той архіў, у якім праяўляецца асоба яго ўтваральніка праз крыніцы асабістага паходжання, менавіта асабістае ліставанне, дзённікі, мемуары. Пры адсутнасці дакументаў такога кшталту ахарактарызаваць асобу амаль немагчыма. Як ужо адзначалася, у гэтым выпад-

---

[190] У літаратуры для акрэслення дадзенага паняцця ўжываецца цэлы шэраг азначэнняў: «просты», «тыповы», «шэраговы», «звычайны», «невыдатны»ды інш. У дадзенай працы асноўным паняццем будзе з'яўляцца паняцце «маленькі» чалавек.

ку архіў набывае форму «асабіста-афіцыйнага» і адлюстроўвае толькі службовую дзейнасць архіваўтваральніка. Колькасць такіх архіваў, прынятых на дзяржаўнае захоўванне, даволі значная.

Да іх шэрагу можна аднесці архівы некаторых гісторыкаў Канстанціна Шабуні (1912–1984)[191], Уладзіміра Верхася (н. 1928)[192] ды інш., архівістаў – Абрама Азарава (1907–1990)[193], Віктара Жыгалава (1918–1983) і Тамары Лявонцьевай (н. 1924)[194], а таксама пераважную большасць архіваў «простых» людзей (сведкаў і ўдзельнікаў гістарычных падзей, працаўнікоў гаспадаркі).

Такім чынам, архіваўтваральнік, а таксама дзяржаўная архіўная палітыка, прынятыя метады апрацоўкі і захавання і вызначаюць тыя катэгорыі дакументаў, якія будуць захоўвацца ў архіве, а значыць уплываць на меркаванне аб асобе, падзеі ці факце ў грамадстве.

Аналіз крыніц у межах асабістага архіва ў залежнасці ад мэты даследавання можа ажыццяўляцца ў рамках мікра- і макрагістарычнага падыходаў. Мікрагістарычны падыход накіраваны на вывучэнне ўнікальных сацыяльных з’яваў, такіх як лёс, псіхалогія, ментальнасць індывідаў і сацыяльных груп[195]. Крыніцы, што ўваходзяць у склад асабістага архіва, могуць выкарыстоўвацца падчас даследавання па гісторыі сям’і і паўсядзённасці, сацыяльнай гісторыі, гісторыі культуры, псіхагісторыі ды інш.

З пункту гледжання суадносін калектыўнай і індывідуальнай памяці, асабістыя архівы прадстаўляюць інфармацыю аб тыповым у развіцці грамадства (у выпадку, калі разглядаецца асабісты архіў «маленькага» чалавека, тыповага прадстаўніка свайго часу, «героя свайго часу», «сына стагоддзя» і г. д.) або могуць карэктаваць агульнапрынятыя погляды на тую ці іншую падзею[196].

Макрагістарычны падыход прадугледжвае вывучэнне ўсіх бакоў асобных падзей або з’яваў палітычнай, эканамічнай гісторыі ці гісторыі культуры.

---

[191] Асабісты фонд К. І. Шабуні // АРРК ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 43. – Воп. 1. – Адз. зах. 1–472.

[192] Асабісты фонд В. П. Верхася // ДАГАГрВ. – Ф. 44. – Воп. 1. – Адз. зах. 1–77.

[193] Дакументы асабістага архіва А. І. Азарава ў складзе калекцыі // НАРБ. Ф. 355. – Воп. 1. – Адз. зах. 1–2.

[194] Сямейны фонд В. М. Жыгалава, Т. Е. Лявонцьевай // НАРБ. Ф. 1106. – Воп. 1. – Адз. зах. 1–53.

[195] Репина Л. П. Социальная история в историографии XX столетия (курс лекций). – М., 2001. – С. 128.

[196] Безрогов В. Г. Автобиография и социальный опыт // Социальная история. Ежегодник. 2001/2002. – М., 2004. – С. 532.

У выпадку, калі асабісты архіў выкарыстоўвацца як крыніца па асобнай тэме ці пэўным гістарычным перыядзе, ён выконвае дапаможную функцыю, уносячы пэўны суб'ектыўны момант у аналіз працэсаў палітычнага ці сацыяльна-эканамічнага развіцця[197]. Аналіз гістарычнай крыніцы адбываецца з улікам кантэксту і асяродку крыніц, у якім яна захавалася.

Засноўваючыся на набытым досведзе аналізу крыніц у рамках асабістых архіўных фондаў[198], улічваючы падыходы да іх класіфікацыі ў гістарычным і літаратурным крыніцазнаўстве[199] і архівазнаўстве[200] дзеля вызначэння складу крыніц асабістага архіва можа быць прапанавана пэўная класіфікацыя.

Па спосабу фіксацыі інфармацыі вызначаюцца такія тыпы крыніц як пісьмовыя, друкаваныя, выяўленчыя, рэчавыя, аўдыё і відэа (на магнітнай плёнцы), электронныя і прасторавыя. У архівазнаўчым разуменні асноўным тыпам дакументаў у межах асабістага архіва з'яўляюцца пісьмовыя крыніцы, якія можна аб'яднаць у тэматычныя групы, улічваючы характар адлюстравання таго ці іншага боку дзейнасці асобы, менавіта крыніцы да біяграфіі, творчай дзейнасці, мемуарныя, эпісталярныя, маёмасна-гаспадарчыя і калекцыі.

Крыніцы да біяграфіі і службовай дзейнасці асобы з'яўляюцца асновай для вывучэння падзей жыццядзейнасці асобы. Гэта асабістыя дакументы (пасведчанні, дыпломы, анкеты, даведкі і г. д.), дакументы службовай дзейнасці (копіі статутаў, загадаў, службовае ліставанне і г. д.), дакументы юбілейных дат, звязаных з дзейнасцю фондаўтваральніка (рэцэнзіі, артыкулы і г. д.), якія прадстаўляюць чалавека ў якасці члена тых ці іншых грамадскіх установаў, вызначаюць яго сацыяльны статус.

---

197 Иванова О. С. История Первой мировой войны в документах личных фондов и коллекций Белорусского государственного архива-музея литературы и искусства // Архіўныя чытанні I–III: матэрыялы навуковых канферэнцый, Мінск, 2003–2005 гг. – Мінск., 2006. – С. 190–194.

198 Дмитриев С. С. Личные архивные фонды. Виды и значение их как исторических источников // Вопросы архивоведения. – 1965. № 4. – С. 35–48.

199 Пушкарев Л. Н. Классификация русских письменных источников по отечественной истории. – М., 1975. –271 с.; Пронштейн А.П. Методика исторического источниковедения. – Ростов, 1976. – 480 с.; Источниковедение истории СССР: учебник / под. ред. И. Д. Ковальченко. – М., 1981. – 498 с.; Грицкевич В.П., Каун С.Б., Ходин С. Н. Теория и история источниковедения: пособие. – Мінск, 2000. – 221с.; Бельчиков Н. Ф. Литературное источниковедение. – М., 1983. – 271 с.; Кісялеў Г. Ад Чачота да Багушэвіча: праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. – Мінск, 2003. – 426 с.

200 Метадычныя рэкамендацыі па рабоце архіваў з дакументамі асабістага паходжання / аўт.-склад. Г. В. Запартыка; навук. рэд. С. У. Жумар. – Мінск, 2005. – 200 с.

Асабістыя дакументы менш за ўсё падпадаюць пад асобасны ўплыў, аб'ектыўна адлюстроўваючы дзейнасць асобы ў тых ці іншых гістарычных умовах. Дадзеная група дакументаў добра захавалася ў складзе асабістых архіваў, як асноўная частка дакументаў большасці фондаў «маленькіх» людзей. Гэта можа растлумачыць доўгатэрміновасцю іх практычнага выкарыстання.

Група біяграфічных крыніц дае падставу для рэканструкцыі гісторыі жыцця асобы, якая, па словах В. Дзільтэя, *«з'яўляецца мадэллю як для гісторыі чужога жыцця, так і для ўніверсальнай гісторыі свету»*[201].

<u>Крыніцы творчай дзейнасці</u> ў залежнасці ад накірунку даследаванняў могуць уключаць літаратурныя творы (раманы, аповесці, паэмы, вершы і г. д.), вынікі навуковых даследаванняў у выглядзе артыкулаў, манаграфій, дакладаў, мастацкія (эскізы, малюнкі) і музычныя творы (нотныя запісы) і г. д. Дадзеная група з'яўляецца вызначальнай для асабістага архіва творцы, бо адлюстроўвае яго ўнёсак у развіццё навукі ці культуры, вызначае яго месца ў гісторыі. Апошні фактар якраз і з'яўляецца падставай для прыняцця асабістага архіва на дзяржаўнае захоўванне. Каштоўнай крыніцай для спецыялістаў адпаведнай галіны (літаратуразнаўцаў, гістарыёграфаў, хімікаў, біёлагаў, музыказнаўцаў, мовазнаўцаў і г. д.) з'яўляюцца падрыхтоўчыя матэрыялы да працы (выпіскі, чарнавыя запісы, спісы, копіі дакументаў).

<u>Крыніцы мемуарнага характару</u> (дзённікі, успаміны) адносяцца да шэрагу ўласна асабістых крыніц і «*найбольш паслядоўна ўвасабляюць працэс самапазнання асобы і ўзаемаадносіны паміж асобамі»*[202], а таксама могуць ствараць псіхалагічны партрэт эпохі.

Высокая ступень адлюстравання асабістых перажыванняў, а часта яшчэ і глыбокая інтымнасць рэфлексій ставяць этычныя пытанні пры выкарыстанні крыніц такога кшталту (напрыклад, дзённік мінскага архіепіскапа Міхаіла Галубовіча 1858–1860 гг.[203], «інтымны» дзённік Максіма Багдановіча).

Дзённікі служылі ў якасці памяткі аб тых ці іншых падзеях асабістага і грамадскага жыцця, адлюстроўваючы паўсядзён-

---

[201] Цыт па: Безрогов В. Г. Автобиография и социальный опыт // Социальная история. Ежегодник, 2001/2002. – М., 2004. – С. 540.

[202] Источниковедение: Теория. История. Метод. Источники российской истории: учеб. пособ./ Н. И. Данилевский, В. В. Кабанов, О. М. Медушевская, М. Ф. Румянцева. – М., 1998. – С. 466.

[203] Янушкевіч Я. Я. Дыярыуш з XIX ст. Дзённікі М. Галубовіча як гістарычная крыніца. – Мінск, 2003. – 350 с.

насць[204] і пэўны погляд на гістарычныя падзеі[205]. Для мемуараў савецкага часу характэрная ідэалагічная зададзенасць, стандартны выбар тэм і набор сюжэтаў (подзвіг, апісанне баёў, гераічнае змаганне падчас вайны ці рэвалюцый і г. д.), прысутнасць вобраза ворага, удзел у той ці іншай падзеі, стандартнасць апісанняў. Асобна ў гэтым шэрагу можна вылучыць прафесійныя медыцынскія дзённікі беларускага ўрача-анколага Мікалая Аляксандрава[206] за 1962–1971 гг., успаміны партыйнага і дзяржаўнага дзеяча Мікалася Аўхімовіча аб вядомых дзеячах Беларусі з кароткай і жорсткай іх характарыстыкай, якая не адпавядала агульнапрынятаму погляду[207].

Група эпісталярных крыніц уключае асабістае ліставанне, лісты да знакамітых дзеячаў, у рэдакцыі газет і часопісаў, скаргі, а таксама дароўныя надпісы. Ліставанне з'яўляецца адным з найбольш папулярных спосабаў камунікацыі ў XIX–XX стст. Пры гэтым іх скіраванасць у адрозненне ад дзённікаў на іншую асобу ці асобы стварае шырокія інфармацыйныя магчымасці[208]. Так, напрыклад, лісты Івана Грыгаровіча да брата Мікалая ў Пецярбург за 1815–1835 гг., адлюстроўваючы складаны і цікавы перыяд станаўлення і дзейнасці выдатнага навукоўца з яго паўсядзённымі цяжкасцямі і турботамі, вымалёўваюць псіхалагічны партрэт дзеяча, яго светаўспрыманне, матывацыю, стаўленне да беларускай гісторыі і культуры. Тым самым яны з'яўляюцца крыніцай па гісторыі беларускай археаграфіі, гістарычнай навукі, гістарычнай псіхалогіі, гісторыі паўсядзённасці[209].

Дароўныя надпісы, адносячыся да шэрагу эпісталярных крыніц, характарызуюць узаемаадносіны паміж людзьмі, даюць падставу для рэканструкцыі кола асабістых і прафесійных стасункаў,

---

[204] Дзённікі І. Я. Спрогіса (1864–1914) // Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі (ДГАЛ). Ф. 2320. – Воп. 1. – Адз. зах. 1–11.

[205] Дзённік М. Мялешкі. 22 верасня – 4 кастрычніка 1915 г. // НГАБ. Ф. 3111. – Воп. 1. – Адз. зах. 15; Вяртанне: Дзённік Міхаіла Мялешкі / пуб. В. Бабкова // Шляхам гадоў: гіст.-літ. зб. – Мінск, 1994. – С. 131– 140.

[206] Дзённікі М. М. Аляксандрава // НАРБ. – Ф. 579. – Воп. 1. – Адз. зах. 30–38.

[207] Успаміны М. Я. Аўхімовіча аб партыйных і дзяржаўных дзеячах Беларусі. // НАРБ. – Ф. 554. – Воп. 1. –Адз. зах. 65.

[208] Шумейко М. Ф. Личная переписка как исторический источник и особенности её сохранения и публикации // Архівы і справаводства. – 2007. – № 3. – С. 84–89.

[209] Лісты І. Грыгаровіча да брата Мікалая з Пецярбургу, Магілёва, Гомеля (1815–1835) // Навукова-даследчыцкі аддзел рукапісаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі (НДАР РДБ). – Ф. 178. – Карт. 1346. – Адз. зах. 18. – Л. 1–58; Іванова В. Лісты з асабістага архіва Івана Грыгаровіча // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. / рэд. кал. У. І. Адамушка [ды інш.] – Мінск, 2007. – С. 222–231.

дазваляюць, прасачыць гісторыю стварэння твора (паметы ў кнігах). Яны ж дапамагаюць праілюстраваць эпоху, ахарактарызаваць асобу, атрыбуціраваць здымак ці кнігу і г. д.[210] Асаблівасць дароўных надпісаў як гістарычнай крыніцы ў тым, што яны непарыўна звязаны з іншай крыніцай інфармацыі (фотаздымкам, малюнкам, кнігай, часопісам і г. д.), на які былі нанесены, а таксама адрозніваюцца лаканічнасцю формы.

Крыніцы маёмасна-гаспадарчага і бытавога характару (дакументы аб куплі-продажу маёмасці, рахункі, гаспадарчыя запісы) з'яўляліся асноўнай складовай часткай фамільных (родавых) архіваў. У асабістых архівах, асабліва XX ст. гэтыя крыніцы сустракаюцца зрэдку. Маёмасна-гаспадарчыя дакументы ў складзе асабістага архіва ілюструюць сацыяльна-эканамічнае развіццё на мікраўзроўні, фіксуюць матэрыяльны стан асобы. Напрыклад, да іх шэрагу можна аднесці рахункавую кнігу Івана Грыгаровіча за 1840–1842 гг.[211], якая ўтрымлівае падрабязныя запісы аб выдатках на тавары і паслугі, і адлюстроўвае матэрыяльнае становішча сям'і протаіерэя.

Калекцыі – група крыніц, якая ўключае ў сябе матэрыялы, сабраныя асобай па-за межамі непасрэдна творчай дзейнасці, а таксама дакументы членаў сям'і архіваўтваральніка. Дакументы дадзенай групы яднаюцца па тэматычнай, храналагічнай ці іншай прыкмеце, нясуць на сабе адбітак штучнасці ўтварэння і фіксуюць кола навуковых, творчых ды інш. інтарэсаў асобы. Дзейнасць асобы адбіваецца тут апасродкавана.

Калекцыя адрозніваецца непрадказальнасцю складу і зместу крыніц. Да яе могуць належыць сабраныя і сістэматызаваныя архіваўтваральнікам творы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і народнага мастацтва, рукапісы, друкаваныя выданні, гістарычныя дакументы, паштовыя маркі, паштоўкі ды інш. Пры ўключэнні калекцыі ў фонд асабістага паходжання, як правіла, захоўваецца іх аўтарская сістэматызацыя.

Выяўленчыя крыніцы можна падзяліць на мастацкія, графічныя і натуральныя[212], якія ўключаюць фотаздымкі і партрэты архіваўтваральніка, родных, блізкіх і знаёмых, малюнкі і фотаздымкі

[210] Жук Т. И. Книги с дарственными надписями, автографами и рукописными пометами в составе фондов личного присхождения // Информационное обеспечение науки Беларуси: от рукописей у электронным информационным ресурсам. Сб. науч. ст. – Мінск, 2006. – С. 131–137.

[211] Калекцыя Грыгаровічаў І. І., М. І. 1695–1896 // БДАМЛМ. – Ф. 6. – Воп. 1. – Адз. зах. 33. – Л. 1–29.

[212] Шмидт С. О. О классификации исторических источников // Путь историка: избранные труды по источниковедению и историографии. – М., 1997 . – С. 87.

прыроды, відаў гарадоў і г. д. Выяўленчыя крыніцы характэрны для творчай спадчыны мастакоў. Так, у архіве Язэпа Драздовіча захаваліся малюнкі, эскізы, накіды, фотаздымкі карцін, а таксама сямейныя фотаальбомы, фотаздымкі розных асоб, відаў архітэктурных помнікаў[213].

У складзе асабістых фондаў мастацтвазнаўцаў Пятра Герасімовіча і Міхаіла Кацара знаходзіцца вялікая колькасць фотаздымкаў архітэктурных помнікаў Беларусі, абразоў, фрэсак, твораў беларускіх мастакоў, скульптараў, твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, зробленых у другой палове 1940-х – 1950-я гг.[214]

Паняцце асабістага архіва ў яго крыніцазнаўчым разуменні вымагае аналізу рэчавых крыніц, якія рэканструіруюць эпоху і асяроддзе дзейнасці асобы і генетычна дапасоўваюцца да пісьмовых і выяўленчых крыніц. Яны прымаюцца на захоўванне дзяржаўнымі архівамі (БДАМЛМ і НАРБ), літаратурнымі і мемарыяльнымі музеямі.

Друкаваныя крыніцы, да якіх належаць кнігі, часопісы, газеты, улёткі ды інш., захоўваюцца разам з пісьмовымі дакументамі асабістага архіва, ствараючы асяроддзе ў якім працуе творца, адлюстроўваючы кола яго інтарэсаў. Сёння бібліёграфы на падставе кніжных вопісаў, у т. л. з асабістых архіваў, актыўна рэканструююць страчаныя кніжныя зборы, якія існавалі ў Беларусі.

Бібліяграфічная рэканструкцыя паўстае як аднаўленне важнай крыніцы для вывучэння нацыянальнай гісторыі і культуры[215]. Зроблены спробы рэканструкцыі асабістых бібліятэк Браніслава Эпімаха-Шыпілы (у якой было не менш за 4000 кніг, у фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі трапіла толькі 5), Мітрафана Доўнар-Запольскага, Уладзіміра Пічэты[216]. У ЦНБ НАН Беларусі

---

[213] Асабісты фонд Я. Драздовіча. 1798–1963. // АРРК ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 2. – Воп. 1. – Адз. зах. 1–79.

[214] Асабісты фонд П. М. Герасімовіча. 1907–1989. // БДАМЛМ. – Ф. 301. – Воп. 1. – Адз. зах. 173– 231; Асабісты фонд М. С. Кацара. 1910–1971 // БДАМЛМ. – Ф. 301. – Воп. 3. – Адз. зах. 192–492.

[215] Рошчына Т. Бібліяграфічны ўлік кніжных помнікаў і рэканстукцыя гістарычных беларускіх кнігазбораў як адзін са шляхоў іх вяртання // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей, праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): Матэрыялы Міжнар. навук. канфер., якая адбылася ў Мінску пад эгідай UNESCO 19–20 чэрвеня 1997. Вяртанне-4. – Мінск, 1997. – С. 98–103.

[216] Сільнова Л. Кнігі з уласнай бібліятэкі Б. Эпімаха-Шыпілы ў фондах нацыянальнай бібліятэкі Беларусі // На шляхах да ўзаемаразумення: навук. збор. / рэдкал.: А. Мальдзіс [ды інш.]. – Мінск, 2000. – С. 303–304; Лебедзева В. М., Сільнова Л. Д. Спроба рэканструкцыі бібліятэкі М. В. Доўнар-Запольскага // Здабыткі: дакум. помнікі на Беларусі. – Мінск, 2002. – Вып. 5. – С. 90–108 ды інш.

ў якасці самастойных комплексаў захоўваюцца прыватныя кніжныя зборы вядомых пісьменнікаў, навукоўцаў, культурніцкіх, грамадскіх і палітычных дзеячаў Адама Багдановіча, Паўла Беркава, Пятра Глебкі, Анатоля Вялюгіна, Янкі Брыля ды інш. На кнігах даволі часта сустракаюцца дароўныя надпісы вядомых пісьменнікаў, паэтаў, грамадскіх і культурніцкіх дзеячаў[217].

Сярод аўдыё- і відэакрыніц асабістых архіваў, што захаваліся ў беларускіх дзяржаўных архівах і музеях можна адзначыць, напрыклад, плыту з запісам «Марша белорусских партизан»[218], які паступіў у БДАМЛМ разам з фондам кампазітара Марка Шнэйдэрмана, успаміны С. Кэмрада і А. Васільевай аб Веры Харужай, запісаныя на магнітную плёнку ў 1959 г., якія захоўваюцца ў НАРБ[219], запісы голасу Янкі Купалы, кінасюжэт 1942 г. аб пахаванні Янкі Купалы ў Маскве – у БДАКФФД, успаміны і кінахронікі – у Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы ды інш.

Прасторавыя крыніцы ці памятныя мясціны найчасцей выкарыстоўваюцца ў літаратуразнаўстве *«як адметная, надзвычай каштоўная першакрыніца, якая дапамагае наблізіцца да творцы, пранікнуць у яго ўнікальны мастацкі свет»[220].* Вывучэнне родных мясцін Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Яна Чачота, Паўлюка Багрыма ды інш., пошук пахаванняў Аляксандра Ельскага, Альгерда Абуховіча, Янкі Лучыны адбываліся паралельна з даследаваннем іх жыцця і творчасці і сталіся адным з накірункаў ушанавання памяці дзеячаў. Літаратурна-мемарыяльныя музеі, што ўзнаўляюць інтэр’ер эпохі створаны на радзіме Янкі Купалы ў Вязынцы, Якуба Коласа ў Мікалаеўшчыне, Адама Міцкевіча ў Завоссі, Францішка Багушэвіча ў Кушлянах, Кузьмы Чорнага ў Цімкавічах, Максіма Гарэцкага ў Малой Багацькаўцы.

Асабісты архіў сучаснага творцы – гэта архіў электронны, які ўтрымлівае творчыя, мемуарныя, эпісталярныя, выяўленчыя крыніцы, калекцыі, г. зн. асноўныя групы крыніц, характэрныя для пісьмовага тыпу.

На традыцыйных папяровых носьбітах захоўваюцца толькі біяграфічныя і маёмасна-гаспадарчыя крыніцы, якія з цягам часу таксама могуць быць пераведзены ў электронны фармат. Да шэра-

---

[217] Жук Т. И. Книги с дарственными надписями, автографами и рукописными пометами в составе фондов личного присхождения // Информационное обеспечение науки Беларуси: от рукописей у электронным информационным ресурсам. сб. науч. ст. – Мінск, 2006. – С. 131–137.

[218] БГАМЛИ – Муз. предмет. № 203.

[219] НАРБ. – Фонд 1369. – Воп. 1. – Адз. зах. 33–35.

[220] Кісялеў Г. Ад Чачота да Багушэвіча: праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. – Мінск, 2003. – С. 160.

гу новых крыніц, якія могуць служыць творцы ў якасці дапаможных матэрыялаў, а таксама з'яўляцца вынікам працы, адносяцца мультымедыйныя і структураваныя рэсурсы (базы дадзеных), а таксама асабістыя Інтэрнэт-сайты, якія прадстаўляюць асобу і яе дзейнасць. Са зменай носьбіта інфармацыі з'яўляецца праблема знікнення адных крыніц і з'яўлення новых, узнікае перспектыва захавання электронных асабістых архіваў.

Такім чынам, сярод асаблівасцяў асабістага архіва як комплексу крыніц вылучаюцца натуральна-гістарычны характар узнікнення і моцны асобасны і ідэалагічны ўплыў у працэсе захоўвання. Асноўным тыпам крыніц асабістага архіва па форме фіксацыі інфармацыі з'яўляюцца пісьмовыя, якія з улікам архівазнаўчых і крыніцазнаўчых класіфікацый, аб'ядноўваюцца ў тэматычныя групы з улікам характару адлюстравання імі таго ці іншага боку дзейнасці асобы (крыніцы да біяграфіі, творчай дзейнасці, мемуарныя, эпісталярныя, маёмасна-гаспадарчыя дакументы, калекцыі). Пры гэтым друкаваныя, рэчавыя, аўдыё- і відэа-дакументы, прасторавыя крыніцы дапасоўваюцца да ўласна асабістага архіва як сховішча пісьмовых крыніц.

Кожная група крыніц у межах асабістага архіва мае асобную функцыю, уяўляе сабой пласт інфармацыі ў генетычна цэласным комплексе крыніц асабістага архіва. Крыніцы да біяграфіі фіксуюць сацыяльны статус асобы, а крыніцы дзейнасці вызначаюць месца асобы ў культуры і гісторыі краіны. Крыніцы асабістага паходжання (мемуарныя, эпісталярныя) ілюструюць асобу, яе пазіцыянаванне сябе ў гістарычнай рэчаіснасці і ўзаемадзеянне з асяроддзем. Крыніцы маёмасна-гаспадарчага характару фіксуюць эканамічны стан асобы, а калекцыі – кола яе інтарэсаў. Выяўленчыя, рэчавыя і друкаваныя крыніцы рэканструіруюць асяроддзе дзейнасці асобы і эпоху. Стан захавання, спецыфіка адлюстраванай інфармацыі вар'іруецца ў кожнай з згаданых груп, вызначаючы паўнату, дакладнасць і спецыфічнасць асабістага архіва як комплекснай і складанай гістарычнай крыніцы.

Асабістым у поўным сэнсе гэтага слова можна назваць той архіў, дзе бачна асоба яго ўтваральніка, што выяўляецца найбольш у крыніцах асабістага паходжання, напрыклад, асабістым ліставанні, дзённіках, успамінах, асабістых фотаздымках, фотаздымках сям'і. Пры адсутнасці дакументаў такога кшталту ахарактарызаваць дзеяча як асобу амаль немагчыма. І тады асабісты архіў пераўтвараецца ў г. зв. «асабіста-афіцыйны» архіў.

Адсутнасць уласна асабістых дакументаў у архіве можа сведчыць аб жаданні схаваць асабістыя недахопы, нядобрадзейныя ўчынкі, адсутнасць уласнага пункту гледжання, імкненняў і г. д.,

і тым самым паўплываць на погляд аб асобе, які будзе існаваць у грамадстве.

Выкарыстанне крыніц асабістага архіва гісторыкам у якасці крыніцы залежыць ад мэты гістарычнага даследавання. Могуць вырашацца традыцыйныя пытанні, звязаныя з вывучэннем заканамернасцяў і падзей палітычнага, сацыяльна-эканамічнага ці культурнага жыцця (макрагістарычны падыход). Але найбольш эфектыўныя адказы будуць атрыманыя на пытанні аб матывацыі, перажытым гістарычным вопыце асобы, пункце гледжання на яго (мікрагістарычны падыход).

## *Рэканструкцыя асабістых архіваў як сродак пошуку і захавання*

Тэарэтычна асабісты архіў як комплекс сведчанняў пра дзейнасць асобы вымагае разгляду ў сукупнасці ўсіх дакументаў, пра якія ведае даследчык і якія з'яўляюцца інтэгральнай часткай архіва, з якім аднак была страчана сувязь. Захаванне асабістых архіваў на практыцы не можа дасягнуць абсалютнай паўнаты і з'яўляецца частковым. Пры адсутнасці самастойнай навуковай вартасці комплекса дакументаў ідзе гаворка аб захаваных фрагментах асабістага архіва.

Шматлікія асабістыя архівы – каштоўная крыніца па гісторыі Беларусі – страчаныя ці раскіданыя па розных сховішчах, не існуюць для непасрэднага вывучэння, таму вымагаюць правядзення навуковай рэканструкцыі. Традыцыйна метад рэканструкцыі ў архівазнаўстве выкарыстоўваецца ў двух накірунках: рэканструкцыя працы ўстановы, якая стварае дакументальную сістэму і рэканнструкцыя самой дакументальнай сістэмы[221]. Рэканструкцыя асабістых архіваў, тэарэтычнае ўзнаўленне як мага найбольш цэласнага комплексу дакументаў адной асобы, прадугледжвае правядзенне аналізу і характарыстыкі захаваўшыхся частак і біяграфічнай інфармацыі аб дзеячы, а таксама вопісаў і іншых дадзеных.

Рэканструкцыя можа адбывацца шляхамі фізічнага перамяшчэння рэшткаў архіва ў адно сховішча, тэарэтычнага даследавання гісторыі архіва, публікацыі вопісу, характарыстыкі складу кожнай структурнай часткі (напрыклад, архіва Станіслава Аўгуста Панятоўскага, музея імя Івана Луцкевіча, архіва Вінцэнта Дуніна-Мар-

[221] Kolankowski Z. Granice spuścizny archiwalnej // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawom archiwalnym / Nachelna Dyrekcja Archiwów Państwowych. – T. 57. – 1972. – S. 53–73; Robótka H. Wprowadzenie do archiwistyki. – Toruń: Wyd. Uniw. M. Kopernika, 2003. – S. 52–53.

цінкевіча, бібліятэк Уладзіміра Пічэты, Яўхіма Карскага, Мітрафана Доўнар-Запольскага[222], арганізацыі выстаў выяўленых у розных сховішчах дакументаў)[223], стварэння электроннага інфармацыйнага рэсурсу, дзе прадстаўленыя ў пэўным парадку дакументы, якія суправаджаюцца каментарамі і адлюстроўваюць этапы жыцця і дзейнасці асобы. Так, на сайце «Архівы Беларусі» у раздзеле прыватныя асобы прадстаўлена рэканструкцыя асабістых архіваў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Напалеона Орды, Ігната Дамейкі, Уладзіміра Караткевіча, Браніслава Эпімах-Шыпілы, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Барыса Кіта, створаная супрацоўнікамі дзяржаўных архіваў і БелНДЦЭД[224].

Першасная рэканструкцыя асабістых архіваў, можа таксама адбывацца шляхам стварэння даведніка ці электроннай базы дадзеных, дзе ўтрымліваецца кароткая інфармацыя аб утваральніку і месцах захоўвання асабістага архіва. Пэўным узорам можа быць даведнік «Асабістыя архівы ў дзяржаўных сховішчах СССР» у 3-х тт., рэестр і база дадзеных «Эліта Ўкраіны», электронная база дадзеных па асабістых архівах у Германіі «Nachlassdatenbank», база дадзеных «SEZAM» з інфармацыяй аб усіх фондах, што захоўваюцца ў дзяржаўных і акадэмічных архівах Польшчы.

Першыя спробы рэканструкцыі дакументальных збораў знакамітых дзеячаў пачалі ажыццяўляцца яшчэ ў канцы XIX ст. Так, у 1898 г. у Вільні быў створаны г. зв. Мураўёўскі музей, дзеля арганізацыі якога ў розных сховішчах была праведзена праца па пошуку і вынятку дакументаў аб дзейнасці графа Міхаіла Мураўёва ў перыяд кіравання г. зв. «Паўночна-Заходнім краем» у 1863–1865 гг.

---

[222] Bańkowski P. Archiwum Stanisława Augusta / Naczelna Dyrekcja Archiwów Państwowych. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1958. – 315 s.; Запартыка Г. Перспектывы навуковай рэканструкцыі музея імя І. Луцкевіча ў Вільні // Рэстытуцыя культурных каштоўнасцей, праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты): Матэрыялы Міжнар. навук. канфер., якая адбылася ў Мінску пад эгідай UNESCO 19–20 чэрвеня 1997. Вяртанне-4 / рэд. кал. А. Мальдзіс (гал. рэд.) [ды інш.] – Мінск: ННАЦ, 1997.– С. 178–183; Янушкевіч Я. Я. Рэканструкцыя асабістага архіва В. Дуніна-Марцінкевіча // Архіўныя чытанні I–III: матэрыялы навуковых канферэнцый, Мінск, 2003–2005 гг./ укл.: Г. В. Запартыка [ды інш.]; навук.рэд. А. В. Мальдзіс – Мінск, 2006. – С. 73–77; Сільнова Л. Д. Калекцыя «Бібліятэка Я. Ф. Карскага». Стан і перспектывы даследавання // Здабыткі: дакумент. Помнікі на Беларусі / Нац. бібл. Беларусі; склад. Л. Г. Кірухіна, Т. І. Рошчына.– Мінск, 2007. – Вып. 9. – С. 251–263 ды інш.

[223] Міхась Мялешка. Доўгае вяртанне ў Беларусь. Каталог выставы / склад. Г. В. Запартыка [ды інш.] – Мінск: БелНДІДАС, 1999. – 12 с.; «Усім вядомы Вам Мікола Каспяровіч». Каталог выставы / склад. Г. В. Запартыка [ды інш.] – Мінск, 2002. – 28 с.

[224] Архівы Беларусі [Электронны рэсурс] / БелНДЦЭД – Мінск, 2006. – Рэжым доступа: http://archives.gov.by/index.php?id=11 – Дата доступа: 10.01.2011.

З 1923 г. да канца 1980-х гг. ва ўсіх архівах СССР вялося выяўленне і перамяшчэнне ў сховішча Цэнтральнага партыйнага архіва Інстытута марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС дакументаў звязаных з дзейнасцю Ўладзіміра Леніна і Іосіфа Сталіна. Мерапрыемствы па фізічным перамяшчэнні прыводзілі да парушэння цэласнасці архіўных фондаў устаноў і архіўнага прынцыпу правеніенцыі, а рэканструкцыя станавілася сродкам ідэалагізацыі дзейнасці асобы ў палітычных мэтах.

Рэканструкцыя асабістых архіваў з'яўляецца рэканструкцыяй ідэальнага аб'екта дакументальнай сістэмы, якая фарміравалася як адбітак жыцця і дзейнасці асобы, але, як правіла, не захавалася ў цэласнасці. Правядзенне рэканструкцыі асабістых архіваў, скіраванае на вырашэнне архівазнаўчай, крыніцазнаўчай і гісторыка-культурнай задач, залежыць ад ступені ўсведамлення каштоўнасці і неабходнасці захоўвання і ўзнаўлення крыніц памяці архіваўтваральнікам, яго спадчыннікамі, дзяржавай і грамадствам. Методыка рэканструкцыі заснаваная на вывучэнні біяграфіі, асноўных накірункаў дзейнасці асобы, гісторыі асабістага архіва і захаваных фрагментаў, вызначэнні і характарыстыкі іх складу, паўнаты і каштоўнасці. На падставе праведзенай працы складаецца вопіс асабістага архіва.

Тэматыка асабістага архіва, асаблівасці складу, інфармАцыйных узаемасувязяў паміж структурнымі часткамі вар'іруюцца ў залежнасці ад накірунку дзейнасці архіваўтваральніка ў грамадска-палітычнай сферы, сферы навукі, літаратуры, мастацтва, тэатра, музыкі, культуры, спорту, калекцыяніравання, тэхнікі і гаспадаркі. Каштоўнымі з'яўляюцца таксама архівы ўдзельнікаў ці сведкаў гістарычных падзей.

Найбольш значнымі групамі дакументаў у складзе асабістых архіваў навукоўцаў, грамадскіх і палітычных дзеячаў, працаўнікоў гаспадаркі дзяржаўнага маштабу з'яўляюцца біяграфічныя дакументы, якія адлюстроўваюць жыццёвы шлях архіваўтваральніка, дазваляюць даць пэўную ацэнку яго дзейнасці, вызначыць ступень уплыву на жыццё краіны, на развіццё навукі і тэхнікі. Вынікі навуковай, грамадскай ці службовай дзейнасці фіксуюцца ў мАнаграфіях, артыкулах, тэкстах дысертацый і выступленняў, а таксама ў афіцыйных дакументах і перапісцы.

Неад'емнай часткай архіва з'яўляюцца выяўленчыя матэрыялы (фотаздымкі). Дакументы асабістага паходжання (мемуары, дзённікі, ліставанне) адлюстроўваюць унутраны свет дзеяча, яго асабістыя думкі і матывацыю. Для архіваў дзеячаў літаратуры і мастацтва асноўнай з'яўляецца група дакументаў творчай дзей-

насці асобы, якая з’яўляецца асновай для ацэнкі каштоўнасці асабістага архіва.

Усведамленне значнасці асабістага архіва як асобнага комплексу дакументаў адбылося ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. у першую чаргу ў дачыненні да дакументаў гісторыкаў Адама Нарушэвіча, Івана Грыгаровіча, Міхала Баброўскага, Ігната Анацэвіча, Івана Лабойкі, Ігната Даніловіча ды інш., чые архівы захавалі вялікія калекцыі гістарычных дакументаў і ўтрымлівалі адбітак некалькіх эпох. Гэта перадвызначыла іх каштоўнасць і сталую цікавасць да іх з боку калекцыянераў і даследчыкаў.

Напрыклад, калекцыя Ігната Анацэвіча пасля смерці збіральніка больш чым на стагоддзе выпала з навуковага ўжытку. У 1935 г. была здзейснена спроба рэканструкцыі складу калекцыі на падставе захаваных вопісаў. Яна складалася з трынаццаці раздзелаў: ліставанне, папскія булы, дыпломы, граматы, ліставанне і аўтографы каранаваных асобаў, карты, дакументы сям’і Любамірскіх (у асноўным перапіска), дакументы гісторыі дома Ягелонаў, дакументы аб дыпламатычных зносінах Расіі і Польшчы ў XVI–XVIII стст., па гісторыі Курляндыі і Ліфляндыі.

Надзвычай каштоўнымі з’яўляліся рукапісныя сшыткі Ігната Анацэвіча з выпіскамі. Частка калекцыі, якая дае падставу меркАваць аб поўным яе складзе, захоўваецца ў Інстытуце рускай літаратуры (Пушкінскім доме) і ўяўляе сабой значную каштоўнасць, бо шэраг дакументаў калекцыі яшчэ не ўключаны ў навуковы ўжытак[225].

Вызначаная тэндэнцыя захавалася і ў XX ст. Архівы гісторыкаў часта адлюстроўваюць некалькі стагоддзяў гістарычнага развіцця ў адрозненне ад іншых асабістых архіваў, храналагічныя рамкі якіх максімальна набліжаны да жыцця архіваўтваральніка. Лёс і склад такіх архіваў выклікае пільную ўвагу даследчыкаў. Так, напрыклад, у асабістым архіве гісторыка Міколы Ўлашчыка захоўваюцца копіі нявыкарыстаных у апублікаваных працах дакументаў, рукапісы неапублікаваных даследаванняў, першакрыніцы (архіўныя копіі, фотакопіі), структураваныя дадзеныя з першакрыніц у форме табліц, графікі, схемаў і картатэкі, а таксама выпіскі. Апошнія даюць магчымасць аналізаваць працэс працы і ход думак аўтара, утрымліваюць інфармацыю аб крыніцах, на аснове якіх праводзілася даследаванне.

---

[225] Николаев С. И. О колекции Игнатия Онацевича. // Духовная культура славянских народов. Литература. Фольклор. История. Сб. статей к IX международному съезду славистов / АН СССР, Ин-т русской литературы (Пушкинский дом). – Ленинград, 1983. – С. 197–208.

Такім чынам, асабістыя архівы гісторыкаў дазваляюць усвядоміць погляды вучонага, суаднесці іх з тым ці іншым гістарыяграфічным накірункам, скласці навуковую біяграфію, выявіць неапублікаваныя матэрыялы, каштоўныя для шырокага кола чытачоў, даследаваць гісторыю ўстаноў, у якіх працаваў навуковец[226].

Цікавы лёс дакументальнай спадчыны гісторыка, мовазнаўцы, пачынальніка беларускай археаграфіі Івана Грыгаровіча (1792–1852), якая аказалася раскіданай па сховішчах Беларусі і Расіі. Яго архіў з'яўляецца адзіным з захаваных у Беларусі асабістых архіваў навукоўцаў першай паловы XIX ст. Дрэнная захаванасць асабістых архіваў дадзенага перыяду і недахоп дакладнай інфармацыі аб складзе частак асабістага архіва Івана Грыгаровіча, што захоўваюцца ў розных сховішчах, а таксама наяўнасць у ім каштоўных калекцыйных матэрыялаў робяць актуальнай яго навуковую рэканструкцыю на падставе вывучэння гісторыі і апісання вядомых частак.

Пасля смерці протаіерэя большая частка яго архіва захоўвалася сынам Мікалаем Грыгаровічам, які на падставе дакументаў архіва напісаў біяграфію бацькі і апублікаваў ліставанне з графам Міхаілам Румянцавым.

Гэтыя сведчанні з цягам часу сталі асноўнай крыніцай аб жыцці і дзейнасці першага беларускага археографа, а самі дакументы ў 1872 г. былі перададзены ў Румянцаўскі музей (зараз НДАР РДБ). Часткі асабістых архіваў Івана і Мікалая Грыгаровічаў (сыноў) трапілі ў канцы XIX – пачатку XX ст. да вядомага калекцыянера П. Шчукіна, а зараз захоўваюцца ў АПК ДГМ у Маскве.

Частка дакументаў, у тым ліку рукапіс працы «Беларуская іерархія», якая доўгі час лічылася страчанай, а таксама падрыхтоўчыя матэрыялы да слоўніка беларускай мовы і некаторыя дакументы сям'і Грыгаровічаў у 1929 г. паступілі ў аддзел рукапісаў РНБ у Санкт-Пецярбургу.

Але найбольш грунтоўны комплекс дакументаў Івана Грыгаровіча разам з дакументамі сыноў Івана і Мікалая напачатку XX ст. захоўваўся ў калекцыі бібліяфіла Г. Юдзіна. Ён быў выяўлены ў Красноярскім архіве прафесарам А. Праабражэнскім у канцы 1950-х гг. Неўзабаве быў перададзены ў Беларусь і зараз захоўваецца ў БДАМЛМ. Найбольш верагодна, што гэтая частка архіва захоўвалася ў старэйшага сына Івана Грыгаровіча да яго смерці ў 1895 г.

[226] Колосова Э. В. Личные архивы историков и историография. // Советские архивы. – 1971. – № 4. – С. 20–27.

Дакументальная спадчына Івана Грыгаровіча, якая адлюстроўвае навуковую дзейнасць гісторыка і археографа, уяўляе сабой значную крыніцазнаўчую каштоўнасць. Найбольш колькаснай і вартаснай групай захаваных дакументаў з'яўляюцца другая частка «Беларускага архіва старажытных грамат», рукапіс «Слоўніка Заходнерускай гаворкі», прадмова да 4 тому «Актаў Заходняй Расіі», рукапіс «Беларускай іерархіі», а таксама шэраг апісанняў, нататак, паведамленняў і выпісак. Захаваліся таксама дакументы, якія адлюстроўваюць працэс працы над «Зборам твораў Георгія Каніскага», «Перапіска пап з расійскімі гасударамі». Аднак амаль няма сведчанняў аб працы І. Грыгаровіча над «Навагародскімі пасаднікамі», «Гістарычнымі звесткамі аб жыцці Мітрафана, першага Варонежскага архіепіскапа», «Актамі Заходняй Расіі».

Вялікай і каштоўнай групай з'яўляюцца копіі дакументаў, зробленыя М. Гартынскім, Ф. Галадкоўскім, А. Дарашкевічам, І. Сыценка, І. Шулякевічам і самім І. Грыгаровічам у беларускіх архівах у першай чвэрці XIX ст. Аналіз складу і зместу копій дакументаў, што захаваліся ў БДАМЛМ, дае падставу сцвярджаць, што гэта падрыхтоўчыя матэрыялы да трэцяй часткі «Беларускага архіва старажытных грамат», над якой толькі пачаў працаваць навуковец. Акрамя саміх копій, там утрымліваюцца вопісы дакументаў беларускіх архіваў пачатку XIX ст., а таксама шэраг каталогаў рукапісных кніг.

Нешматлікімі з'яўляюцца дакументы да біяграфіі, а таксама дакументы маёмасна-гаспадарчага характару. Найбольш каштоўнымі з пункту гледжання раскрыцця накірункаў дзейнасці і асобы Івана Грыгаровіча з'яўляецца службовае і асабістае ліставанне. Калі перапіска з Міхаілам Румянцавым насіла афіцыйны характар, то ліставанне з роднымі і блізкімі не толькі пралівае святло на многія эпізоды навуковай дзейнасці, але і вымалёўвае псіхалагічны партрэт дзеяча, яго светаўспрыманне, матывацыю, стаўленне да беларускай гісторыі і культуры. Так, лісты Івана Грыгаровіча да брата Мікалая ў Пецярбург за 1815–1835 гг. адлюстроўваюць складаны перыяд станаўлення і дзейнасці выдатнага вучонага. Адначасна яны з'яўляюцца важнай крыніцай для вывучэння паўсядзённай гісторыі Беларусі першай паловы XIX ст.

Дакументы археографа захаваліся ў комплексе з дакументамі яго сыноў, менавіта выкладчыка гісторыі Івана Грыгаровіча (1833–1895) і дырэктара архіва і бібліятэкі Св. Сінода Мікалая Грыгаровіча (1835–1889), якія адначасова з'яўляліся захавальнікамі архіўнай спадчыны сям'і. Якраз таму гэты архіў можна аднесці да ліку сямейных.

Асабісты архіў Івана Грыгаровіча паўстае як каштоўны дакументальны комплекс, які не толькі адлюстроўвае асноўныя накі-

рункі жыцця і навуковай дзейнасці протаіерэя і яго сям'і, але стварае карціну развіцця беларускага архівазнаўства, археаграфіі, гістарычнай навукі, мовазнаўства і з'яўляецца каштоўнай крыніцай па гісторыі Беларусі з XIII ст.[227]

Такім чынам, метад рэканструкцыі асабістых архіваў, стварае магчымасці для пошуку дакументаў, аналізу і ацэнкі ўнутраных інфармацыйных сувязей паміж дакументамі, ацэнкі яго значэння як гістарычнай крыніцы, спрыяе ўвядзенню ў навуковы ўжытак шэрагу крыніц, а таксама падрыхтоўцы біяграфічных даследаванняў.

Відавочная роля рэканструкцыі таксама ў вывучэнні асноўных тэндэнцый у захоўванні асабістых архіваў. Актуальнасць гэтага метаду абумоўлена не толькі слабой захаванасцю асабістых архіваў канца XVIII – пачатку XX ст., але таксама неабходнасцю захоўвання ці ўзнаўлення інфармацыі аб страчаных асабістых архівах беларускай эліты, стварэння адзінай інфармацыйнай прасторы. Гэта ў сваю чаргу адкрывае доступ да архіўных дакументаў і інфармацыі аб іх незалежна ад месца іх фізічнага знаходжання.

[227] Падрабязней гл.: Іванова В. Дакументальная спадчына протаіерэя Іаана Грыгаровіча // Праваслаўе. – 2004. – № 12–13. – С. 78–85; Іванова В. Лісты з асабістага архіва Івана Грыгаровіча // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. / рэд. кал. У. І. Адамушка [ды інш.] – Мінск, 2007. – С. 222–231 ды інш.

# Заключэнне

Гісторыя асабістых архіваў беларускіх дзеячаў, на жаль, не столькі гісторыя захоўвання, колькі гісторыя стратаў. Большасць асабістых архіваў XIX – першай паловы XX ст. часткова ці поўнасцю страчаны, некаторыя апынуліся па-за межамі Беларусі. Тым не менш, дзейнасць многіх прадстаўнікоў беларускай літаратуры, мастацтва і навукі зрабіла магчымым захаванне дакументальнай памяці пра выдатныя асобы гісторыі Беларусі.

Сістэма захоўвання дакументаў асабістага паходжання ў Беларусі склалася ў савецкі час пад уздзеяннем пэўнай ідэалагічнай схемы, што ставіла на першы план чалавека, жыццёвы шлях якога адлюстроўваў такія гістарычныя вехі як падзеі рэвалюцыі 1917 г., грамадзянскай вайны, Другой сусветнай вайны, гаспадарчае развіццё перыяду СССР. Адпаведна, значная колькасць асоб, памяць аб якіх захавалася ў беларускіх архівах, гэта сведкі і ўдзельнікі азначаных падзей, аднак амаль няма асобаў, якія не падтрымлівалі тагачасны дзяржаўны лад, былі рэпрэсаваныя ці мелі альтэрнатыўныя погляды на грамадска-палітычнае развіццё краіны. Такая абмежаванасць, з аднаго боку, заканамерная, бо камплектаванне архіваў праводзілася і праводзіцца дзяржавай, адной з функцый якой з'яўляецца самаўзнаўленне. З другога боку, такая сітуацыя значна звужае комплекс крыніц для гістарычных даследаванняў, асабліва ў новых накірунках.

Прадстаўленая архівазнаўчая праца спрабуе пазбегнуць ідэалагічных размежаванняў, бо культурную і дакументальную спадчыну асобы немагчыма ўціснуць у межы адной ідэі. Падчас даследавання вывучаліся як дакументы вядомых пісьменнікаў, так звычайных працаўнікоў гаспадаркі, як савецкіх грамадска-палітычных дзеячаў, так і дзеячаў нацыянальнага руху, якія зведалі рэпрэсіі з боку савецкага ўраду ці трапілі ў эміграцыю. У працы была зроблена спроба ацэнкі той дакументальнай асобаснай спадчыны, якую маем, і вызначэння накірункаў для пошуку і набыцця дакументаў, а таксама стварэння «герояў», памяць аб якіх варта перадаць нашчадкам.

Хочацца спадзявацца, што надалей асноўную ролю ў гэтым накірунку працы будзе адыгрываць не дзяржаўная ідэалагічная зададзенасць, а актыўная дзейнасць грамадскіх установаў, ініцыятыў, а таксама асоб, зацікаўленых у захоўванні дакументаў. Жыццё чалавека і жыццё дакумента трымаецца на тоненькім валаску, які можа імгненна абарвацца або застацца на стагоддзі як памяць пакаленняў. Захаванне памяці – задача не толькі архівістаў і гісторыкаў, але ўсіх людзей, якія адчуваюць яе важнасць.

Яшчэ адной праблемай, якая набывае асаблівую актуальнасць сёння, з'яўляецца праблема формы прадстаўлення дакументаў асабістага паходжання. Традыцыйныя пісьмовыя ці друкаваныя дакументы паступова адыходзяць на другі план. Актуальнымі становяцца электронныя асабістыя архівы ці архівы вуснай гісторыі. Іх праектаванне, спосабы камплектавання і захоўвання маюць прынцыповыя адрозненні і патрабуюць грунтоўнай тэарэтычнай і метадычнай распрацоўкі, а таксама сур'ёзнай тэхнічнай падтрымкі.

# ДАВЕДНІК

## Прадмова

Першая спроба інфармацыйнага абагульнення дадзеных аб дакументах асабістага паходжання ў выглядзе даведніка адносіцца яшчэ да сярэдзіны 1960-х гг., калі пабачыў свет паказальнік «Личные архивные фонды в государственных хранилищах СССР»*. У яго склад былі ўключаны звесткі аб персанальных зборах, сямейных, фамільных і сядзібных архівах, калекцыях дакументаў адной асобы ў дзяржаўных архівах, а таксама комплексах дакументаў асоб (не менш 5 адз. зах.) у фондах музеяў і бібліятэк.

У першыя два тамы (1962, 1965) увайшла інфармацыя прадстаўленая Дзяржаўным архівам Мінскай вобл., Цэнтральным дзяржаўным архівам літаратуры і мастацтва, Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архівам у г. Гродна і Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архівам у г. Магілёве.

У трэцім томе (1980 г.) былі ўлічаны яшчэ больш 400 комплексаў дакументаў асабістага паходжання (большасць з іх малакольскасныя, ад 5 адз. зах.), што знаходзіліся на захоўванні ў БДМВАВ, архіве Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў г. Горках, Бібліятэцы Інстытута літаратуры АН БССР, Бабруйскім, Брэсцкім, Віцебскім, Слонімскім і Слуцкім краязнаўчых музеях, Фундаментальнай бібліятэцы імя Якуба Коласа АН БССР, Дзяржаўнага музея БССР, Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, ЦДАМЛМ і ЦДГА БССР.

Прынцып пабудовы паказальніка, што зыходзіў з неабходнасці шырокага ўліку ўсіх захаваных у розных дзяржаўных сховішчах звестак аб дзейнасці адной асобы (прынцып прыналежнасці да дзейнасці адной асобы) адкрыў новыя магчымасці для пошуку і працы з дакументамі асабістага паходжання ў беларускіх сховішчах і ацэнкі іх інфармацыйнай каштоўнасці.

У канцы 2009 г. у Беларусі выйшаў з друку Даведнік па асабістых фондах і калекцыях, што захоўваюцца ў дзяржаўных архівах рэспублікі. Яго мэтаю было *«азнаямленне шырокага кола даследчыкаў з месцазнаходжаннем і складам дакументаў»* такога кшталту**. Даведнік быў створаны па ініцыятыве Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

---

* Личные архивные фонды в государственных хранилищах СССР: указатель: в 3-х тт./ ред. кол. Ю.И. Герасимова [и др.]; сост. Э. В. Колосова [и др.]– М.: Тип. Библиотеки им. В. И. Ленина, 1962–1980. – Т. 1–3.

** Фонды и коллекции документов личного происхождения в государственных архивах Республики Беларусь / сост. Т. И. Седляревич. – Минск: БелНИИДАД, 2009. – 172 с.

на падставе інфармацыі прадастаўленай рэспубліканскімі, абласнымі і занальнымі дзяржаўнымі архівамі, якія захоўвалі дакументы асабістага паходжання.

Звесткі аб фондах і калекцыях у Даведніку былі згрупіраваны па архівах, унутры – па ўліковых адзінках у межах архіваў (фондах і калекцыях). Фонды былі сістэматызаваны па алфавіту прозвішчаў фондаўтваральнікаў. Апісальныя артыкулы мелі разгорнутую структуру. Яны ўключалі прозвішча і ініцыялы фондаўтваральніка, пошукавыя дадзеныя фонду ці калекцыі ў архіве, назву фонду ці калекцыі, характарыстыку зместу дакументаў (рукапісы, дакументы дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі і г. д.).

У даведніку былі апісаныя 522 фонды і калекцыі асабістага паходжання з дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь. Асаблівасці захоўвання дакументаў асабістага паходжання ў дзяржаўных архівах вызначылі асаблівасці структуры даведніка, большая частка якога (амаль 300 запісаў) адносіцца да БДАМЛМ і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (55). Усяго былі прадстаўленыя звесткі па 5 рэспубліканскіх, 9 абласных і 15 занальных архівах.

Даведнікі па дакументах асабістага паходжання акрамя даведачна-інфармацыйнай выконваюць шэраг іншых функцый, менавіта крыніцазнаўчую, ствараючы і пашыраючы базу даследаванняў у розных навуковых накірунках; архівазнаўчую, забяспечваючы пошук дакументаў асабістага паходжання і ўдасканаленне методыкі іх апісання; архівасофскую, ацэнваючы значнасць комплексаў дакументаў асабістага паходжання ў той ці іншы гістарычны перыяд, а таксама ўзровень свядомасці грамадства ў справе захоўвання архіваў і культуралагічную, характарызуючы захаваныя асабістыя архівы як культурны здабытак грамадства ды інш.

Асабістыя архівы дзеячаў беларускай навукі, культуры, грамадскай і палітычнай сферы захоўваюцца ў якасці фондаў асабістага паходжання, а таксама ў складзе калекцый і фондах устаноў не толькі дзяржаўных архіваў, але і ў рукапісных аддзелах бібліятэк, музеяў, ведамасных архіваў, знаходзяцца ў прыватнай уласнасці. Асаблівай увагі патрабуюць часткі асабістых архіваў дзеячаў, што трапілі на захоўванне ў замежныя сховішчы, без якіх немагчыма скласці ўяўленне аб паўнаце і каштоўнасцці асабістых архіваў, асабліва дзеячаў XIX – пачатку XX ст. Да ліку фондаў асабістага паходжання адносяцца не толькі асабістыя, але сямейныя і фамільныя. Дакументы асабістых архіваў уваходзяць у склад калекцый асабістага паходжання (гэта могуць быць як калекцыі сабраныя асобай так і калекцыі, якія ўтрымліваюць дакументы некалькіх асоб), персанальных збораў.

Асабістыя архівы, як правіла, уключаюць у сябе дакументы некалькіх тыпаў: пісьмовыя (папяровыя), электронныя, выяўленчыя, аудыё і відэа (на магнітнай плёнцы), рэчавыя, некалькіх відаў і груп (дакументы да біяграфіі, творчыя дакументы, ліставанне, мемуары, калекцыі), што вызначае іх тэматычную разнастайнасць і рознасць у падыходах да апісання. Улік дадзеных асаблівасцяў асабістых архіваў, а таксама ўжо адзначаная неабходнасць іх пошуку і рэканструкцыі робяць магчымым стварэнне якасна новага даведніка, які можа стаць асновай вырашэння пералічаных задач.

Першапачатковы збор і сістэматызацыя шматлікіх і разнастайных звестак аб асабістых архівах у межах архівазнаўчага даследавання пачаліся ў 2006 г. і праводзіліся з дапамогай базы дадзеных (БД) «Асабістыя архівы». Сюды ўносіліся звесткі аб архівах асоб, якія нарадзіліся ў тэрытарыяльных межах сучаснай Рэспублікі Беларусь, асоб, што ўсведамлялі сябе беларусамі ці зрабілі ўнёсак у развіццё беларускай навукі і культуры, шляхам стварэння твораў на беларускай мове ці аб Беларусі, удзелам у грамадскім жыцці і г. д.

У БД уключалася інфармацыя аб асабістых архівах дзеячаў, чые дакументы захоўваюцца ў дзяржаўных архівах Беларусі ў складзе асабістых фондаў, калекцый, а таксама, у залежнасці ад значнасці дзейнасці асобы і ступені захаванасці асабістага архіва, дакументы з фондаў устаноў і звесткі аб калекцыях, сабраных імі. Таксама збіралася інфармацыя пра асобы, чые дакументы знаходзяцца ў аддзелах рукапісаў рэспубліканскіх бібліятэк у складзе асабістых фондаў і калекцый; пра дзеячаў, комплексы дакументаў якіх былі перададзены на захоўванне ў дзяржаўныя музеі. Пазначаліся дзеячы, чые архівы лічацца загінуўшымі або знаходзяцца ў прыватнай уласнасці, а таксама асобы, дакументы якіх захоўваюцца ў сховішчах Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Польшчы ды інш. дзяржаў і ўтрымліваюць ці могуць утрымліваць звесткі па гісторыі Беларусі.

Колькасць асоб звесткі аб архівах якіх былі ўнесены ў БД у канцы 2010 г. перавысіла 1400.

У межах БД было вылучана чатыры асноўныя блокі інфармацыі: біяграфічныя звесткі, гісторыя фарміравання і захоўвання асабістага архіва, сучасныя месцы захоўвання і склад дакументаў. Інфармацыя аб дзеячы ўтрымлівае прозвішча, імя, імя па бацьку, даты жыцця, месца нараджэння, сферу дзейнасці. Для апошняга поля было вызначана 12 агульных накірункаў, у залежнасці ад накірунку і маштабу дзейнасці асобы (грамадска-палітычная дзейнасць, літаратура, мастацтва, навука, тэатр, музыка, культура, калекцыяніраванне, працаўнік гаспадаркі, сведка/удзельнік гіста-

рычных падзей, спорт). Два дадатковыя палі ўдакладняюць інфармацыю ў выпадку, калі архіваўтваральнік меў некалькі накірункаў дзейнасці.

Гісторыя стварэння і захоўвання асабістага архіва апісвалася ў асобным тэкставым полі ў вольнай форме, дзе ўвага акцэнтавана на індывідуальных асаблівасцях існавання таго ці іншага асабістага архіва. Характарыстыка дакументаў, што захаваліся ў дзяржаўным сховішчы, уключае асноўныя пошукавыя дадзеныя (фонд, вопіс, адзінка захоўвання ці іншае), крайнія даты, дату, калі дакументы сталі даступнымі для выкарыстання (дата апрацоўкі для архіваў ці дата паступлення для музеяў), а таксама характарыстыку комплексу дакументаў, у т. л. форму захоўвання (асабісты, сямейны фонд, калекцыя, збор, асобныя дакументы ў складзе фонду ды інш.).

БД утрымлівае звесткі аб дакументах з больш чым 100 сховішчаў Беларусі, Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі, Украіны, Чэхіі, ЗША, Вялікабрытаніі, Канады згодна з інфармацыяй друкаваных даведнікаў, архіўных вопісаў, архіўных аглядаў, каталогаў, электронных пошуковых сістэм ды інш.

У створаным на падставе гэтай базы дадзеных Даведніку інфармацыя па абласных і занальных архівах, а таксама музеях прадстаўлена на 1 студзеня 2008 г., па рэспубліканскіх архівах і аддзелах рукапісаў бібліятэк, як буйнейшых дзяржаўных сховішчах Беларусі, якія захоўваюць дакументы асабістага паходжання, а таксама па замежных сховішчах – на 1 студзеня 2010 г.

У даведніку прадугледжана два віды апісальных артыкулаў: поўны і кароткі. Від апісання залежыць ад маштабу дзейнасці асобы, паўнаты захаваўшыхся звестак, колькасці захаваўшыхся дакументаў, часу стварэння дакументаў. Пералічаныя крытэрыі ўжываліся ў сукупнасці.

Поўны апісальны артыкул уключае прозвішча, імя, імя па бацьку (поўнасцю), даты жыцця па новым стылі (дзень, месяц, год), месца нараджэння (сучасны адміністрацыйны падзел), вызначэнне накірунку дзейнасці асобы. Даты жыцця, асабліва для дзеячаў рэгіянальнага маштаба, устанавіць часам не падаецца магчымым. У гэтым выпадку даты нараджэння і смерці не падаваліся. Не пазначаліся таксама званні, ступені, пасады за выключэннем выпадкаў, калі немагчыма іншае дакладнае вызначэнне сферы дзейнасці асобы (напрыклад для грамадскіх і палітычных дзеячаў)

Наступны блок інфармацыі – гэта кароткая гісторыя асабістага архіва, што ўключае інфармацыю аб умовах і часе паступлення дакументаў на захоўванне, ацэнку паўнаты захаваўшыхся дакументаў, накірункаў пошуку страчанага і г. д. Адным з элементаў

апісальнага артыкула з’яўляецца спасылка на публікацыі па гісторыі дакументаў архіва (у т. л. на прадмовы да археаграфічных выданняў) і агляды фондаў, якія раскрываюць змест дакументаў. Выкарыстанныя даведнікі па шэрагу фондаў і калекцый асабістага паходжання пералічаны ў агульным спісе літаратуры.

Апошні блок уключае ў сябе пашуковыя дадзеныя захаваных дакументаў адной асобы ў розных сховішчах (назва сховішча, фонд, характар фонду (у выпадку, калі фонд не з’яўляецца асабістым), колькасць вопісаў ці нумар вопісу, колькасць ці нумары адзінак захавання, іншыя пашуковыя дадзеныя, крайнія даты дакументаў). На заканчэнні даецца анатацыя да дакументаў па асноўных групах.

Кароткі апісальны артыкул ужываўся для апісання малакольксных архіваў дзеячаў рэгіянальнага маштабу, што, як правіла, захоўваюцца ў занальных, абласных архівах, краязнаўчых музеях, а таксама для фрагментаў архіваў дзеячаў у складзе іншых фондаў і калекцый. Тут не падаецца гісторыя архіва і спасылкі на публікацыі, зыходзячы з таго што такая інфармацыя амаль заўсёды страчана. У шэрагу выпадкаў не ўстаноўлены поўныя імя і імя па бацьку, даты нараджэння ці смерці, месца нараджэння дзеяча. Асобныя артыкулы на архівы дзеячаў, колькасць выяўленых дакументаў якіх не перавышае 5 адз. зах. і не маюць самастойнай навуковай вартасці і перспектыў для далейшай рэканструкцыі, не складаліся, але адзначаліся ў заўвагах да апісальных артыкулаў, з далейшым унясеннем у імянны паказальнік.

Даведнік не прэтэндуе на вычарпальнасць, з’яўляючыся адной з першых спробаў абагульніць інфармацыю аб асабістых архівах беларускіх дзеячаў, зыходзячы з каштоўнасці іх дакументальнай спадчыны для развіцця беларускай навукі і культуры. Даведнік разглядаецца як аснова для далейшай працы па збору і сістэматызацыі звестак аб асабістых архівах.

# А

АБЕЛІЁВІЧ Леў Майсеевіч (06.01.1912, г. Вільня, Літва – 08.12.1985), кампазітар.

*Дакументы перададзены ў БДАМЛМ дачкой, фонд апрацаваны ў 1992* г.*

БДАМЛМ. Ф. 345. 113 адз.зах за 1938–1988. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі індывідуальныя і групавыя, прадметы, кнігі.

АБІХТ Рудольф (09.08.1850, г. Намыслаў, Сілезія – 12.02.1921), славіст Універсітэту ў Брэслаў (сучасны Вроцлаў), выкладчык Свіслацкай гімназіі.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 78 (фонд Л. Абрамовіча**). Воп. 1. Адз. зах. 338.

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя музея імя І. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах. 261.

АБРАЖЭВІЧ Леанід Георгіевіч (14.11.1923, в. Стары Койцін, Чэрвенскі р-н Мінскай вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, партыйны дзеяч.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 42. 13 адз. зах. за 1941–1996. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, граматы, пасведчанні), успаміны, артыкулы, фотаздымкі.

АБРАМОВІЧ Людвік Караль (05.07.1879, г. Масква – 09.03.1939), польскі гісторык, грамадскі дзеяч, журналіст, выдавец, рэдактар.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 79. 732 адз. зах. Сярод матэрыялаў дакументы беларускіх дзеячаў А. Луцкевіча, В. Гадлеўскага, Ф. Аляхновіча, Б. Пачопкі, У. Талочкі, Ф. Рушчыца, К. Скірмунта, Я. Станкевіча, А. Станкевіч, А. Шлюбскага, П. Татарыновіча, Я. Карскага, М. Доўнар-Запольскага, А. Кіркора, Т. Грыба, А. Ельскага, Дз. Даўгялы, Я. Лучыны, Т. Нарбута, І. Даніловіча, М. Любаўскага, П. Янкоўска, Ядзвігіна Ш., А. Уласава, Н. Орды ды інш.

АБРАМОВІЧ Данііл Мартынавіч (н. 1900), краязнаўца Быхаўскага раёна.

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1244 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 3. Адз. зах. 1–26 за 1917–1972.

АБРЭБСКІ Юзэф (Obrebski, Obrębski) (18.02.1923, в. Тэплік, Вінніцкая вобл., Украіна – 1974), этнограф, антраполаг, сацыёлаг.

Універсітэт Масачусетс. Амхерст. Аддзел спецыяльных рукапісаў і калекцый. Калекцыя Абрэбскага. 48 каробак, 24 пагонных

---

* Падаецца дата апрацоўкі першага паступлення дакументаў.

** Назва фонда падаецца ў выпадках, калі дакументы дзеяча захоўваюцца не ў яго асабістым фондзе, а ў складзе іншых фондаў ці калекцый.

метра. Палявыя нататкі з запісамі інтэрв'ю, афіцыйныя дакументы па правядзенні экспедыцый у т. л. у Македоніі (1931–1932), Палессі (1934–1936), Ямайцы (1947–1948), фотаздымкі, карэспандэнцыя, чарнавікі артыкулаў, вопісы сабраных матэрыялаў, аудыёзапісы народных песень; дакументы жонкі.

АБУХОВІЧ Альгерд Рышардавіч (06.08.1840, в. Калацічы, Глускі р-н, Магілёўскай вобл.–22.08.1898), пісьменнік, удзельнік паўстання 1863–1864.

*Сваю бібліятэку і рукапісы А. Абуховіч аддаў К. Аколаву, якія разам з архівам Аколава трапілі ў Варшаву. Страчаны.*

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 431.

АБУХОВІЧ Ганна Браніслаўна (22.11.1908, г. Масква – 14.07.1986), актрыса.

*Дакументы паступілі на захоўванне ў БДАМЛМ ад архіва-ўтваральніка і сына, апрацаваны ў 1991 г. У ДМГТМК паступілі ў 1994 г. ад сына.*

БДАМЛМ. Ф. 342. 188 адз. зах. за 1927–1985. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах, кнігі.

ДМГТМК. КП 574 (1–8).

АВЕЧКІН Аляксандр Аляксеевіч (22.06.1913, в. Чуднава, Наўгародская вобл., Расія – 07.11.1980), пісьменнік, журналіст.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад утваральніка, апрацаваны ў 1967 г.*

БДАМЛМ. Ф. 121. 310 адз. зах. за 1951–1965. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, калекцыя розных дакументаў.

АВЯР'ЯНАЎ Юрый Іванавіч (16.06.1952, г. Мікашэвічы, Лунінецкі р-н, Брэсцкая вобл.–10.01.1998), акцёр.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад сястры, апрацаваны ў 2003 г.*

БДАМЛМ. Ф. 427. 31 адз. зах. за 1954–1996. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

АГАНАЎ Міхаіл Аляксандравіч (н. 1921, в. Уштоль, Ізмайлінскі р-н, Азербайджан), удзельнік Другой сусветнай вайны і вызвалення г. Пінска ў 1944 г.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 9. Адз. зах. 1–4 за 1944–1967. Успаміны, характарыстыка часоў апошняй вайны, падзякі, фотаздымкі.

АГІНСКІ Міхал Клеафас (07.10.1765, м. Гузаў, Мазавецкае ваяв., Польшча – 15.10.1833), кампазітар.

*Асабісты архіў быў перададзены сынам Ірэніўшам у 1833 г. у Пецярбург у Дзяржаўны архіў Расійская імперыі (1834–1917),*

*утрымліваў рукапісы музычных твораў, вершаў, нататкі, малюнкі, вялікае ліставанне, мемуары, сямейныя дакументы.*

Архіў каралеўскага замка (Варшава). Ліставанне.

РДАСА. Ф. 12 (Справы аб Літве і Польшчы). Творы, ліставанне, нататкі за 1683–1854.

ДМГТМК. Копіі дакументаў Агінскага з РДАСА.

Гарадзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. 114 лл. за 1767–1821.

АГНЯЦВЕТ Эдзі (Каган Эдзі Сямёнаўна) (28.09.1913, г. Мінск – 17.07.2000), паэтка.

*Дакументы ў ДМГБЛ пастулілі ў 1996 г. ад утваральніка.*

БДАМЛМ. Ф. 378 (неап.).

НДАК НББ. Ф. 2 (Збор матэрыялаў дзеячаў навукі і культуры Беларусі). Воп. 1. Адз. зах. 9. Верш.

ДМГБЛ. КП 13328(1–85). Рукапісы, фотаздымкі, лісты, паштоўкі, тэлеграмы.

АДАМОВІЧ Алесь (Аляксандр Міхайлавіч) (08.08.1927, в. Канюхі, Капыльскі р-н, Мінская вобл. – 26.01.1994), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка, першае паступленне апрацавана ў 1988 г. У ДМГБЛ дакументы паступілі ад Н. А. Адамовіч у 1994.*

БДАМЛМ. Ф. 116. Воп. 1–3. 771 адз. зах. за 1916–1986. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, успаміны, ліставанне, фотаздымкі.

ДМГБЛ. КП 11206–11216, 12027 (1–131). Кнігі з дароўнымі надпісамі і дакументы да біяграфіі.

АДАМОВІЧ Антон Еўстафьевіч (13.06.1909, г. Мінск – 12.06.1998) празаік, літаратуразнаўца.

*Дакументы ў БДАМЛМ былі перададзены з НАРБ у 2004 г., у якім знаходзіліся на сакрэтным захоўванні з 1944 г. Некаторыя дакументы захоўваюцца таксама ў Нью-Йоркскай публічнай бібліятэцы.*

БДАМЛМ. Ф. 459 (неап). 7 адз. зах. за 1935–1943.

АДАМОВІЧ Іосіф Аляксандравіч (1896, г. Барысаў, Мінская вобл. – 22.04.1937), грамадска-палітычны дзеяч, старшыня СНК БССР у 1924–1927 гг.

НМГКБ*. КП 28019. 11 адз. зах. за 1908–1937. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

---

* У тэматычных калекцыях НМГКБ, акрамя пазначаных тут і далей матэрыялаў, захоўваюцца невялікія комплексы асабістых дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны К. М. Басалыгі (1887–1963), Ф. А. Баталава (н. 1900), В. Я. Уласава (1896–1957), Дз. П. Ладуцькі (н. 1872), Ф. Дз. Леўчанкі (н. 1898), І. Ф. Ленчыкава (1872–1961), А. Ф. Пятроўскага (1895–1958), А. Н. Полазава (н. 1900), А. В. Радзюка (1896–1959), П. Р. Саенка (н. 1913), Ф. В. Сімончыка (1885–1966), А. І. Спіцкага (н. 1896), У. П. Страбулаева (1891–1971),

АДАМОВІЧ Яўгенія Аляксандраўна (1923–1995), удзельнік Другой сусветнай вайны, дэпутат гарадскога Савета.

ЗДА ў г. Рэчыца. Ф. 835. 24 адз. зах. за 1941–1991. Біяграфічныя дакументы.

АДАМОВІЧ Славамір Генрыхавіч (н. 08.03.1962, ст. Унежна, Анежскі р-н, Архангельская вобл.), паэт, празаік, публіцыст.

*Дакументы перададзены архіваўтваральнікам у БДАМЛМ у 2000 г., апрацаваны ў 2007 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. 9 адз. зах. за 1950–2000. Дзённік паэта «Справа 182», артыкулы, вершы, інтэрв'ю.

АДЫНЕЦ Антон Эдвард (25.01.1804, в. Гейстуны, Ашмянскі р-н, Гарадзенская вобл. – 15.01.1885), паэт, перакладчык.

*Да Першай сусветнай вайны яго дакументы захоўваліся ў Яна Адынца ў Кумеланах Ашмянскага пав.*

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава), № 2847 за 1826–1884.

АЖЭШКА Элаіза (06.06.1841, в. Мількаўшчына, Гарадзенскі р-н – 18.05.1910), пісьменніца.

Літ.: Ткачова В.А. Архіў Элізы Ажэшка // Краязнаўчыя запіскі. Гарадзенскі дзяржаўны гісторыка-археалаг. музей / уклад. В.М. Царук. – Вып. 6. – Гродна, 2003. – С. 16–22.

Аддзел старажытных кніг і рукапісаў Публічнай бібліятэкі (Варшава). Творы, ліставанне.

Аддзел рукапісаў бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта. № 1457–1458.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі імя Асалінскіх (Вроцлаў). № 12028.

Бібліятэка Інстытута літаратуразнаўства Польскай Акадэміі навук. 1 000 адз. зах.

ДГАЛ. Ф. 1137 (Таварыства прыяцеляў навук у Вільні). Воп. 15. 37 адз. зах. за 1777–1931. Дакументы дзейнасці.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. 85 адз. зах. ды інш.

АЗАРАЎ Абрам Ігнатавіч (11.11.1907, в. Цімошына, Глінкаўскі р-н, Смаленская вобл. – 24.10.1990), гісторык, архівіст.

НАРБ. Ф. 355 (Калекцыя дакументаў старэйшых архівістаў Беларусі). Воп. 1. Адз. зах. 1–2. за 1954–1974. Аўтабіяграфія, кандыдацкая дысертацыя «Архивное дело в Белорусской ССР».

---

І. М. Хабарава (1916–1945), грамадскіх дзеячаў: П. Р. Сяўрука (н. 1902), В. Ф. Стасевіча (н. 1924), М. С. Ціхмянева (1885–1963), Х. І. Якубовіча, працаўнікоў сельскай гаспадаркі М. Я. Ігнатавай, С. Дз. Фешчанкі (н. 1909), працаўнікоў прамысловасці М. І. Мацэнкі (н. 1907), С. П. Рачок (1909–1970), І. В. Шчатніковіча (1895–1972) настаўнікаў М. Б. Голуба (1875–1966), М. М. Пруднікавай (н. 1870), Т. Ф. Сапёлкінай (1890–1967), Ф. В. Паперцінскага.

АЗГУР Заір Ісаакавіч (02.01.1908, в. Маўчаны, Сенненскі р-н, Віцебская вобл. – 18.01.1995), скульптар.

*У 1996 г. у былой майстэрні скульптара быў утвораны музей. У архіў музея дакументы паступілі ад сям'і – Г.Г. Азгур (жонкі), З.З. Азгура (сына) у 1996 г.*

Мемарыяльны музей З.І. Азгура. Філіял НММ Рэспублікі Беларусь. 1346 дак. за 1924–1999 гг. Дакументы творчай дзейнасці (фотаздымкі і рэпрадукцыі твораў, артыкулы, выступленні, лекцыі), біяграфічныя дакументы, успаміны, ліставанне, дакументы сабраныя па цікавячых тэмах (фотаматэрыял), дакументы сям'і.

АКІМАВА Вольга Дзмітрыеўна (11.07.1883, Полацкі р-н, Віцебская вобл. – 04.07.1969), біёлаг, адзін з першых даследчыкаў альгафлоры ў Беларусі, арганізатар аднаўлення біялагічнага факультэта БДУ.

НМГКБ. КП 19516 (1–25) за 1928–1966. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

АКІНЧЫЦ Фабіян Іванавіч (20.01.1886, г. Стоўбцы, Мінская вобл. – 07.03.1943), грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст, заснавальнік Беларускай нацыянал-сацыялістычнай партыі.

НАРБ. Ф. 242 (фонд КПЗБ). Воп. 1. Адз. зах. 232 за 1928–1929. Мемуары «Працэс Беларускай сялянска-працоўнай грамады», рукапіс з уклеенымі газетнымі выразкамі.

АКОРКАЎ Уладзімір Андрэевіч (17.11.1915, г. Гомель – 1985), інжынер Беларускай чыгункі.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 18. Адз. зах. 1–7 за 1944–1981 гг. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыкі, граматы, пасведчанні), тэксты дакладаў, фотаздымкі.

АКРУЖНАЯ Святлана Арцёмаўна (н. 26.01.1947, г. Чарнаўцы, Украіна), актрыса.

БДАМЛМ. Ф. 337 (неап.).

АКСАКАЎ Сяргей Сяргеевіч (07.01.1891, г. Самара, Расія – 04.09.1968), кампазітар.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка, апрацаваны ў 1965 г.*

БДАМЛМ. Ф. 95. 54 адз. зах. за 1870–1957. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі родных, знаёмых, сабраныя дакументы.

АКСЁНАЎ Аляксандр Нікіфаравіч (09.10.1924, в. Кунтараўка, Веткаўскі р-н, Гомельская вобл. – 08.09.2009), грамадска-палітычны дзеяч, старшыня СМ БССР (1978–1983).

*Асабісты архіў паступіў на захоўванне ў НАРБ у 2002 г. ад архіваўтваральніка.*

НАРБ. Ф. 1177. 356 адз. зах. за 1940–2002. Біяграфічныя дакументы (асабістыя, узнагародныя, тэлеграмы віншаванні, дакументы аб ім), дакументы грамадска-палітычнай дзейнасці (службовае ліставанне, даклады, выступленні, артыкулы, інтэрв'ю), фотаздымкі індывідуальныя і сямейныя.

АКСЁНАЎ Уладзімір Міхайлавіч (21.04.1924, г. Уладзімір, Расія), удзельнік Другой сусветнай вайны, прафсаюзны дзеяч.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262. Воп 43. Адз. зах. 1–6 за 1945–1999. Біяграфічныя дакументы, (пасведчанні, граматы, віншаванні), фотаздымкі.

АКУЛА Кастусь (сапр. Качан Аляксандр) (16.11.1925, в. Верацеі, Докшыцкі р-н, Віцебская вобл. – 30.01.2008), грамадска-палітычны дзеяч, пісьменнік.

*Дакументы ў Нацыянальны архіў Канады перададзены з Таронта ўтваральнікам у 1974 і 1975.*

Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане. Дакументы дзейнасці (рукапісы твораў), ліставанне з рознымі ўстановамі, асобамі.

Нацыянальны архіў Канады. Дакументы за 1956–1976. Дакументы аб дзейнасці беларусаў у Канадзе, ліставанне, артыкулы.

АЛАДАВА Алена Васільеўна (22.05.1907, г. Пружаны, Брэсцкая вобл. – 29.05.1986), мастацтвазнаўца, дырэктар Дзяржаўнага мастацкага музея

*Дакументы былі перададзены ў архіў музея сям'ёй у 2003 г., частка засталася ў сям'і. Частка была перададзена супрацоўнікамі музея.*

*Літ.:* Елена Аладова. Музей её судьба: воспоминания, документы исследования / сост. Б. Крепак, В. Прокопцев, Н. Усова. – Минск: «Мастацкая літаратура.», 2006. – 319 с.

Архіў НММ. Ф. 2 (Калекцыя дакументальных матэрыялаў навуковых супрацоўнікаў НММ Рэспублікі Беларусь). Воп. 6. Адз. зах. 1–134 за 1942–1986 гг. Дакументы дзейнасці (інфармацыйныя матэрыялы, даведкі, успаміны аб стратах, панесеных музеямі, артыкулы, выступленні, даклады, рэцэнзіі, матэрыялы выдавецкай дзейнасці), дакументы да біяграфіі, ліставанне, сабраныя дакументы, выяўленчыя матэрыялы.

АЛАДАЎ Мікалай Ільіч (09.12.1890, г. Санкт-Пецярбург – 04.12.1972), кампазітар.

БДАМЛМ. Ф. 21 (неап.).

АЛЕЙНІК Аляксандр Людвігавіч, дырэктар Гомельскага абласнога краязнаўчага музея

ДА Гомельскай вобласці. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 3. Адз. зах. 1–17 за 1997–2005 гг. Дакументы да біяграфіі, артыкулы.

АЛЕЙНІКАЎ Андрэй Захаравіч (н. 1916), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Слуцку. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.), 10 адз.зах за 1948–1987. Дакументы да біяграфіі, успаміны, ліставанне, фотаздымкі.

АЛЕКСАНДРОВІЧ Андрэй Іванавіч (09.01.1906, г. Мінск – 06.01.1963), паэт.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі, апрацаваны ў 1965 г. АРРК ЦНБ набыў дакументы ў сына архіваўтваральніка Радаслава ў 1975 г. У ДМГБЛ дакументы паступілі ў 1996 г.*

АРКР ЦНБ НАН БЕЛАРУСІ. Ф. 9. 39 адз. зах. за 1936–1974. Творчыя дакументы, біяграфічныя дакументы (пасведчанні, нататнікі, дакументы аб архіваўтваральніку), ліставанне, фотаздымкі індывідуальныя, сабраныя дакументы ў т. л. дакументы М. Танка.

БДАМЛМ. Ф. 97. 140 адз. зах. за 1910–1963. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

ДМГБЛ. КП 13505–13515. Рукапісы твораў.

РДАЛМ. Ф. 631 (фонд Саюза пісьменнікаў СССР). Воп. 15. Адз. зах. 66. Даклад «О белорусской поэзии» на пасяджэнні Саюза пісьменнікаў СССР (1936 г.), аўтабіяграфія, фотаздымкі ды інш.

АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ Ларыса Пампееўна (15.02.1904, г. Мінск – 23.05.1980), спявачка, рэжысёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад унука, апрацаваны ў 1989 г. У ДМГТМК – у 1994 г.*

БДАМЛМ. Ф. 316. 887 адз. зах. за 1907–1989. Біяграфічныя дакументы (дыпломы, пасведчанні, запрашэнні), дакументы творчай, службовай, грамадскай дзейнасці, нататнікі, успаміны, ліставанне, дароўныя надпісы, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах, сцэн са спектакляў, партрэты, сабраныя дакументы.

ДМГТМК. КП 566 (1–9). Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі сцэн са спектакляў.

НМГКБ. КП 33957 (1–51). Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, афішы, праграмы, рэчы.

АЛЕКСІЕВІЧ Фёдар Паўлавіч (н. 18.02.1934, в. Белае, Жыткавіцкі р-н, Гомельская вобл.), шліфоўшчык падшыпнікавага завода.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 8. Адз. зах. 1–8 за 1959–1983. Тэксты выступленняў на сходах, артыкулы, біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыка, граматы, запрашэнні), ліставанне з рэдакцыямі газет, фотаздымкі.

НМГКБ. 5 адз. зах. за 1960–1962. Біяграфічныя дакументы.

АЛЕКСЮТОВІЧ Канстанцін Андрэевіч (20.05.1884, в. Бахаравічы, Пухавіцкі р-н, Мінская вобл. – 26.02.1943), балетмайстар.

БДАМЛМ. Ф. 375 (неап.) (Калекцыя дакументаў кампазітараў, музыказнаўцаў).

АЛЕКСЮТОВІЧ Ларыса Канстанцінаўна (20.01.1913, г. Мінск – 18.02.2003), балерына, балетмайстар.

БДАМЛМ. Ф. 375 (неап.) (Калекцыя дакументаў кампазітараў, музыказнаўцаў).

АЛЕР Фаіна Яфімаўна (17.03.1904, г. Бабруйск, Магілёўская вобл. – 29.03.1985), тэатральны дзеяч, дзеяч культуры.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад К.Б. Кузняцовай (дачкі) у 1992 г., апрацаваны ў 2005 г.*

БДАМЛМ. Ф. 379 (сямейны). 21 адз. зах. за 1924–1990. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

АЛЕХНІК Алесь Апанасавіч (н. 31.07.1929, в. Перунова, Лунінецкі р-н, Брэсцкая вобл.), грамадскі дзеяч, дзеяч культуры.

*Дакументы паступілі дзякуючы намаганням камісіі «Вяртанне» пры Беларускім фондзе культуры, у прыватнасці А. Мальдзіса. Апрацаваны ў 2006 г.*

БДАМЛМ. Ф. 452. 453 адз. зах. за 1930–1999. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы, дакументы родных.

АЛЕШКА Антон Антонавіч (01.02.1913, в. Балочычы, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 13.09.1971), празаік.

*Дакументы паступілі ад жонкі, апрацаваны ў 1976 г.*

БДАМЛМ. Ф. 208. 104 адз. зах. за 1938–1973 гг. Дакументы творчай дзейнасці (раманы, аповесці), дзённікі, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

АЛІМАЎ Рэс Мікітавіч (26.09.1926, г. Жытомір, Украіна – 26.12.1984), архітэктар.

*Дакументы паступілі ад жонкі, апрацаваны ў 1987 г.*

БДАНТД. Ф. 86. 69 адз. зах. за 1945–1985. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфіі, граматы, характарыстыкі ды інш.), дакументы дзейнасці (артыкулы, аўтарэферат), фотаздымкі.

АЛЬБЕРТРАНДЗІ Ян (1731, г. Варшава, Польшча – 1808), гісторык, архівіст, настаўнік Нясвіжскай езуіцкай семінарыі.

*Частка дакументаў, што захоўвалася ў Бібліятэцы Варшаўскага ўніверсітэта загінула. Копіі дакументаў з Кракава і Вроцлава захоўваюцца ў Архіве ПАН (Варшава).*

Аддзел рукапісаў Ягелонскай бібліятэкі (Кракаў).

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі імя Асалінскіх (Вроцлаў).

Навуковая бібліятэка Польскай акадэміі навук (Кракаў). Карэспандэнцыя і афіцыйныя паперы.

Аддзел рукапісаў бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта. № 135.

Курніцкая бібліятэка Польскай акадэміі навук (Познань). Дакументы дзейнасці: копіі з архіваў польскіх і італьянскіх з бібліятэкі Ватыкана, фрагмент каталогу бібліятэкі Станіслава Аўгуста.

АЛЬСМІК Пётр Іванавіч (27.02.1907, в. Выдрэя, Лёзненскі р-н, Віцебская вобл. – 02.04.1992), селекцыянер, акадэмік АН БССР.

*Дакументы паступілі ад родных, апрацаваны ў 2002 г.*

БДАНТД. Ф. 187. 105 адз. зах. за 1877–1992. Дакументы дзейнасці (артыкулы), біяграфічныя дакументы аб удзеле ў партызанскім руху, фотаздымкі з роднымі і знаёмымі.

АЛЯКСАНДРАЎ Мікалай Мікалаевіч (11.06.1917, г. Бранск, Расія – 07.10.1981), анколаг, доктар медыцынскіх навук.

*Асабісты архіў паступіў на захоўванне ў НАРБ ад удавы навукоўца ў 1983 г., апрацаваны ў 1988 г.*

НАРБ. Ф. 579. 250 адз. зах. за 1908–1987. Біяграфічныя (юбілейныя дакументы, характарыстыкі, аб удзеле ў баявых дзеяннях), дакументы службовай, грамадскай і навуковай дзейнасці, дзённікі за 1962–1971 гг., успаміны, ліставанне з роднымі, сямейныя фотаздымкі, фотаздымкі пад час аперацый.

НМГКБ. КП 42282–42286, 35248 (1–98). Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, рэчы.

АЛЯКСЕЕВА Ларыса Філалогаўна (16.10.1907, г. Луцк, Валынская вобл., Украіна –15.02.1998), оперная спявачка.

*Дакументы перададзены ўтваральнікам, апрацаваны ў 1992 г.*

БДАМЛМ. Ф. 310. 40 адз. зах. за 1924–1984. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі ў ролях, індывідуальныя і ў групах, з дароўнымі надпісамі, нататкі і ўспаміны, кнігі.

АЛЯКСЕЕЎ Уладзімір Паўлавіч, партыйны дзеяч.

ДА Гомельскай вобласці. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. Адз. зах. 112–121. Біяграфічныя дакументы, успаміны, фотаздымкі.

АЛЯКСЕЕЎ Мікалай Іванавіч (17.12.1898, г. Санкт–Пецярбург – 12.08.1985), празаік, драматург.

*Дакументы перададзены ўтваральнікам, апрацаваны ў 1977 г.*

БДАМЛМ. Ф. 207. Воп. 1–2. 334 адз. зах. за 1940–1984. Дакументы да біяграфіі, творчай дзейнасці (раманы, п’есы, сцэнарыі, артыкулы, выступленні), ліставанне, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

АЛЯКСЮК Павел Паўлавіч (н. 28.11.1892, г. Гродна), грамадска-палітычны дзеяч, член Вялікай беларускай рады і Цэнтральнай беларускай вайсковай рады.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 872. Афіцыйныя лісты і адозвы.

АЛЯХНОВІЧ Мікалай Мікалаевіч (21.04.1903, г. Барысаў, Мінская вобл. – 09.04.1959), літаратурны крытык.

*Дакументы ў ДМГБЛ паступілі ў 1989 г.*

ДМГБЛ. КП 3246–3251, 5196–5204. Даведкі, пасведчанні, паштоўкі, ліставанне.

АЛЯХНОВІЧ Францішак Каролевіч (09.03.1883, г. Вільня, Літва – 03.03.1944) драматург, публіцыст, тэатральны дзеяч.

*Дакументы былі перададзены М. Ільінскім у 1920-я гг. у архіў Інбелкульта, страчаны. У 2000 г. справа з копіямі яго біяграфічных дакументаў перададзена з НАРБ у БДАМЛМ.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 10 за 1926–1943. Копіі біяграфічных дакументаў.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 3–6 за 1914–1915. Лісты з турмы А. Луцкевічу, рэдактару «Вечерней газеты», рукапіс п’есы «На Антокалі», эскізы дэкарацый да пастаноўкі спектакля.

АНАЦЭВІЧ Ігнат Сымонавіч (1780, в. М. Бераставіца, Бераставіцкі р-н, Гарадзенская вобл.– 18.02.1845), гісторык, археограф.

*Праца «Гісторыя Літвы» засталася ненадрукаванай, некалькі тамоў паводле завяшчання перададзены Ю. Крашэўскаму. Рукапісы ў колькасці 319 адз. зах. трапілі ў калекцыю К. Свіндзіцкага, потым захоўваліся ў бібліятэцы Красінскіх і загінулі падчас Другой сусветнай вайны. Частка калекцыі была падаравана розным асобам Анацэвічам яшчэ пры жыцці, частка перададзена гарадзенскаму калекцыянеру памешчыку Слізню, частка трапіла ў зборы Э. Рачынскага і Р. Падбярэзскага. Калекцыя гістарычных матэрыялаў уключала дакументы з архіваў Пецярбурга, Кенігсберга, Дзярэчына, Пулаў. Некаторыя дакументы з гэтай калекцыі набыты С. Пташыцкім. Ёсць сведчанні, што частка калекцыі была прададзена ў Францыю.*

Літ.: Габрусевіч С. А., Марозава С. В. Прафесар Ігнат Анацэвіч. Жыццё. Спадчына: гіст. нарыс – Гродна: ГрДУ, 2005. – С. 108–118; Николаев С. И. О коллекции Игнатия Онацевича // Духовная культура славянских народов. Литература. Фольклор. История. Сб. статей к IX Международному съезду славистов / АН СССР, Ин-т русской литературы (Пушкинский дом). – Ленинград: «Наука», 1983. – С. 197–208; Pohorecki F. Teki i zbiory Ignecego Onacewicza (proba rekonstrukcii) // Pamiętnik VI powszechnego zjazdu historików połskich w Wilnie. 17–20 wrzesnia 1933 r. Referaty. – Lwow. 1933. – S. 414–424.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава). № 6975. Выпісы з дакументаў.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі імя Асалінскіх (Вроцлаў).

АР БВУ. Ф. 12 (фонд І. Лялевеля). Воп. 1. Адз. зах. 145.

АР ЦБАН Літвы. Асобныя дакументы ў складзе Фф. 18, 43, 151, 273.

Бібліятэка Рачыньскіх (Познань).

ДГАЛ, Ф. 721 (Віленскі ўніверсітэт). Воп.1. Адз. зах. 68, 121, 130, 254, 624, 741, 1195. Дакументы аб працы прафесарам Віленскага ўніверсітэта.

Інстытут рускай літаратуры РАН (Пушкінскі дом). Калекцыя. 374 адз. зах.

АНДРУСІШЫН (Данчык) Багдан (н. 02.02.1958, г. Нью-Йорк, ЗША), спявак.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад маці. Апрацаваны ў 1994 г.*

БДАМЛМ. Ф. 388. 38 адз. зах. за 1958–1990. Дакументы аб дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

Даследчыцкі цэнтр гісторыі эміграцыі ўніверсітэта Мінесоты (ЗША). Ф. 206. 1 скрынка.

АНДРУШКЕВІЧ Барыс Кірылавіч (н. 01.01.1926, г. Жлобін, Гомельская вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, вайсковец.

ЗДА ў г. Жлобіне. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры). Воп. 11. 5 адз. зах. за 1944–1993. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

АНДРЭЕВА Яўгенія Васільеўна (н. 25.12.1885, в. Лугавая Вірня, Жлобінскі р-н, Гомельская вобл.), настаўніца, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР.

ЗДА ў г. Жлобіне. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры). Воп. 1. 14 адз. зах. за 1915–1971. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, пасведчанні, граматы).

АНДРЭЕЎ Анатоль Яўгенавіч (14.09.1916, г. Рагачоў, Гомельская вобл. – 26.03.2005), грамадска-палітычны дзеяч, удзельнік Другой сусветнай вайны, міністр аўтамабільнага транспарту БССР (1963–1984).

*Дакументы паступілі на захоўванне ад самога ўтваральніка ў 2001 г., апрацаваны ў 2003 г.*

НАРБ. Ф. 1418. 138 адз. зах. за 1935–2001. Біяграфічныя (пасведчанні, характарыстыкі, узнагароды, дакументы пра архіва-ўтваральніка), дакументы службовай і грамадскай дзейнасці (даклады, артыкулы, інтэрв'ю, архіўныя выпісы), ліставанне, фотаздымкі індывідуальныя, у групах, падчас мерапрыемстваў, фотаздымкі родных, кнігі з дароўнымі надпісамі, дакументы жонкі.

АНДРЭЕЎ Іван Юдаевіч (н. 1897, в. Панцыркі, Пскоўская вобл., Расія), удзельнік рэвалюцыйных падзей 1917 г.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў заходняй Беларусі, Вялікай Айчынай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 1. Адз. зах 1–10 за 1897–1977. Аўтабіяграфія, успаміны, дакументы службовай і грамадскай дзейнасці (выступленні, загады, пасведчанні), фотаздымкі.

АНІСКАВЕЦ Георгій Васілевіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. Адз. зах. 38 за 1986 г. Успаміны аб Вялікай Айчыннай вайне.

АНТОНАЎ Дзмітрый Антонавіч (11.02.1910–21.07.1987), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Бабруйску. Ф. 366 (Калекцыя малааб'ёмных фондаў асабістага паходжання). 1 адз. зах. за 1929–1987. Успаміны, альбом з фотаздымкамі.

АНТОНІК Міхаіл Цярэнцьевіч (н. 1921), электразваршчык Мінскага трактарнага завода, грамадскі дзеяч.

НМГКБ. КП 16776 (1–75) за 1943–1958. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, рэчы.

АРАБЕЙ Лідзія Львоўна (27.06.1925, в. Нізок, Уздзенскі р-н, Мінская вобл.), пісьменніца, літаратуразнаўца.

*Дакументы паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1975 г.*

БДАМЛМ. Ф. 202. Воп. 1. Адз. зах. 1–30 за 1955–1973. Дакументы творчай дзейнасці (лібрэта, апавяданні, артыкулы, пераклады).

АРЛОВА Галіна Аляксандраўна (н. 30.11.1928, г. Віцебск), актрыса.

*Дакументы паступілі ад утваральніка ў 2003 г.*

ДМГТМК. КП 5574–5586. Біяграфічныя дакументы (граматы, дыпломы і г. д.).

АРЛОЎ Дзмітрый Аляксеевіч (26.09.1903, г. Масква – 18.06.1969), акцёр, рэжысёр.

*Дакументы паступілі ад дачкі. Апрацаваны ў 1989 г.*

БДАМЛМ. Ф. 315. 138 адз. зах. за 1930–1983. Дакументы акцёрскай і рэжысёрскай дзейнасці (тэксты роляў, артыкулы, нататкі), ліставанне, дакументы да біяграфіі, фотаздымкі.

АРЛОЎСКІ Віктар Фёдаравіч (н. 1933 г.), грамадска-палітычны дзеяч, старшыня ваенкамата г. Слуцка.

ЗДА ў г. Слуцку. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). 4 адз.зах за 1939–1975. Дакументы да біяграфіі (граматы, пасведчанні, аўтабіяграфія), фотаздымкі.

АРОНЧЫК Юдзіф Самойлаўна (19.12.1908, г. Мінск – 03.06.1933), актрыса.

*Дакументы паступілі ад утваральніка. Апрацаваны ў 1973 г.*

БДАМЛМ. Ф. 184. 27 адз. зах. за 1922–1970. Фотаздымкі сцэн са спектакляў, у ролях, біяграфічныя дакументы (пасведчанні, граматы, віншаванні).

АРСЕНКА Валянціна Канстанцінаўна (н. 01.07.1907, г. Адэса, Украіна), спявачка.

*Дакументы паступілі ад архіваўтваральніка, апрацаваны ў 1974 г.*

БДАМЛМ. Ф. 193 (сямейны). Воп. 2. Адз. зах. 24–121 за 1925–1977. Дакументы творчай дзейнасці (арыі, рамансы, рэпертуар), фотаздымкі.

АРСЕНКА Арсен Дзянісавіч (02.03.1903, в. Новая Вадалага, Валькоўскі р-н, Харкаўская вобл., Украіна – 30.07.1945), спявак.

*Дакументы паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1974 г.*

БДАМЛМ. Ф. 193 (сямейны). Воп. 1–2. 140 адз. зах. за 1925–1977. Дакументы артыстычнай дзейнасці, матэрыялы да біяграфіі (аўтабіяграфія ды інш.), фотаздымкі.

АРСЕННЕВА Наталля (20.09.1903, г. Вільня, Літва – 25.07.1997), паэтка.

*Мела багаты асабісты архіў і бібліятэку (рукапісы, фотаздымкі, ліставанне). Некаторыя дакументы перададзены ў БДАМЛМ В. Кіпелем. У 2004 г. асноўная частка дакументаў асабістага архіва перададзена ў архіў БІНІМ сынам паэткі Ўладзімірам Кушалем. Захоўваліся там часова да перадачы ў бібліятэку Рутгерскага ўніверсітэту.*

Літ.: Запруднік Я. Архіў Наталлі Арсеньевай // Запісы. Беларускі Інстытут навукі й мастацтва – Т. 29. – Нью-Йорк–Мінск, 2005. // http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/binim/29/07.htm

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 9–12 за 1925–1935 гг. Лісты С. Станкевічу, А. Луцкевічу. Рукапісы твораў (у прыватнасці паэмы «Лясное возера»).

БДАМЛМ. Маюцца дакументы ў складзе неапрацаванага фонду.

Бібліятэка Рутгерскага ўніверсітэту. 15 скрынак. Дакументы творчай дзейнасці, альбомы з сямейнымі фотаздымкамі, газеты, магнітафонавыя запісы праграмаў радыё «Свабода»; народны строй, кнігі.

АРЦЕМ’ЕВА Вольга Міхайлаўна (1923, в. Востраў, Ляхавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.) удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі ). Воп. 9. 1 адз. зах. 1943–1984. Успаміны, фотаздымак.

АРЦЮХОВА Сабіна Ўладзіміраўна (н. 01.03.1923, в. Ніўкі, Мінскі р-н), удзельнік Другой сусветнай вайны, настаўніца геаграфіі.

ЗДА ў г. Мазыры. Ф. 286 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг., партызанскага руху на Палессі, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі)*. Воп. 1. Адз.

* У складзе калекцыі дакументаў асабістага паходжання ЗДА ў г. Мазыры (Ф. 286. Воп. 1. Адз. зах. 1–70), акрамя пазначаных тут і далей дакументаў, сабраны такса-

зах. 145–151 за 1949–2010. Біяграфічныя дакументы (пасведчанні), артыкулы аб утваральніку, фотаздымкі.

АРЭХВА Мікалай Сямёнавіч (11.11.1902, в. Баруны, Ашмянскі р-н, Гродзенская вобл. – 16.07.1990) грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі.

*Асабісты архіў паступіў на захоўванне ў НАРБ у сакавіку 1996 ад дачкі Баданінай Ларысы Мікалаеўны. Апрацаваны ў 2001 г.*

НАРБ. Ф. 976. 226 адз. зах. 1902–1996. Біяграфічныя дакументы, дакументы навуковай дзейнасці (спісы публікацый, артыкулы, кнігі, матэрыялы сабраныя для працы, выпісы з архіваў, кніг), фотаздымкі індывідуальныя, з рознымі асобамі, родных і знаёмых, падчас мерапрыемстваў, дароўныя надпісы на тытульных лістах кніг, сабраныя дакументы.

АСЕЦКІ Аляксандр Віктаравіч, удзельнік вайны 1918–1921, генерал-майор царскай арміі і атаман вайсковага злучэння, што дзейнічала ў 1919 г. ва Ўкраіне.

*Дакументы перададзены з фонду Рускага замежнага архіва (ДАРФ) у 1951 г.*

НАРБ. Ф. 574. 1 адз. зах. за 1909–1919. Віншаванні саслужбоўцаў з нагоды атрымання ім воінскага звання.

АСІПЕНКА Алесь (Аляксандр Харытонавіч) (07.09.1919, в. Пушкары, Віцебскі р-н – 06.08.1994), пісьменнік, дзеяч культуры.

*Дакументы паступілі ад жонкі пісьменніка ў 1994, а потым ад сына ў 2002 г., апрацаваны ў 2007 г.*

БДАМЛМ. Ф. 432. 295 адз. зах. за 1922–1994. Дакументы творчай дзейнасці (раманы, аповесці, апавяданні, пераклады), ліставанне, дакументы да біяграфіі, фотаздымкі, дакументы сабраныя па цікавячых тэмах.

АСТАПЕНКА Змітрок (Дзмітрый Емяльянавіч) (10.11.1910, в. Калеснікі, Смаленская вобл., Расія – 07.09.1944), пісьменнік, перакладчык.

---

ма тэматычныя ўспаміны, якія не складаюць цэласных комплексаў дакументаў асобы. Гэта ўспаміны ўдзельнікаў падзей 1917–1921 гг. М. Л. Андрэева, А. В. Гранькова, Ц. А. Балюнава, Ф. А. Барысава, І. І. Віславужыла, А. Н. Гарагляда, І. І. Галяца, М. І. Жураўскага, Н. Д. Зарыцкага, П. А. Крыўчыка, А. М. Кухнаўца, Ф. Л. Лузана, В. І. Мазуркевіча, А. К. Мельянца, Т. П. Русага, І. Д. Трусевіча; удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны С. Н. Абрамавай, П. П. Алісейка, М. П. Алісейка, Ю. І. Аўраменка, М. Дз. Афанасьева, К. І. Бакуна, Я. Н. Блізнякова, Дз. І. Богуша, К. М. Вараб'я, К. Ф. Вікенцьева, І. Е. Вольфмана, М. Ц. Гнядко, К. С. Гарулі, І. А. Глушакова, А. Т. Дубіна, Т. Я. Есьман, Н. В. Замыка, А. Я. Жулега, П. К. Журовіча, А. Л. Жыльскага, П. В. Кажадуба, В. В. Кочатава, А. М. Кржэменскага, І. М. Крупа, К. В. Катлінскага, В. С. Лапіцкага, А. І. Лаўшук, У. А. Лойкі, А. М. Ляціна, П. Ц. Морава, А. С. Мураўева, М. З. Патапава, П. І. Прыдыбайлы, С. П. Ракіцкага, У. П. Раманава, В. І. Сасноўскай, В. І. Смірнова, С. П. Церахава, В. Ф. Хархалёва, З. Я. Чарнаглаза. С. І. Шафаростава, М. С. Шорапа, Г. Н. Яськовай; удзельнікаў ваенных дзеянняў у Афганістане А. В. Адзінцова, С. М. Бобера, В. С. Кашубы.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад сястры і ўдавы, апрацаваны ў 1983. У ДМГБЛ – у 1989 ад сястры.*

БДАМЛМ. Ф. 128. 32 адз. зах. за 1902–1986. Дакументы творчай дзейнасці, нататнік, ліставанне, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

ДМГБЛ. КП 4166–4174. Фотаздымкі.

АСТАПЕНКА Аляксандр Кірылавіч (14.03.1920, в. Сырская Буда, Добрушскі р-н, Гомельская вобл. – 20.07.1970), пісьменнік.

*Дакументы паступілі ад жонкі, апрацаваны ў 1975 г.*

БДАМЛМ. Ф. 200. 99 адз. зах. за 1941–1970. Дакументы творчай дзейнасці (паэмы, нарысы, рэцэнзіі ды інш.), біяграфічныя дакументы, ліставанне, нататнікі з дзённікавымі запісамі, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах, дароўныя надпісы на кнігах.

АСТАПОВІЧ Аркадзь Антонавіч (18.09.1896, г. Мінск – 21.09.1941), мастак-графік.

*Падчас вайны знішчана ліставанне. Дакументы перададзены ў БДАМЛМ у 1994 жонкай сына ўтваральніка М. Р. Астаповіч. Апрацаваны ў 1995 г. Лісты за 1915–1941 гг. захаваліся ў прыватных архівах родных і знаёмых. Дакументы у Архіў НММ паступілі ад супрацоўнікаў музея.*

Архіў НММ. Ф. 3 (Калекцыя дакументальных матэрыялаў навуковых супрацоўнікаў НММ Рэспублікі Беларусь). Воп. 8. Адз.зах 1–16 за 1915–1997. Фотарэпрадукцыі, каталогі выстаў ды інш.

БДАМЛМ. Ф. 395. 156 адз. зах. за 1902–1994. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, кнігі.

АСТАФ'ЕЎ Мікалай Кірылавіч (н. 03.05.1952, в. Баўлы, Баўлінскі р-н, Татарстан) удзельнік вайны ў Афганістане, удзельнік ліквідацыі аварыі на ЧАЭС.

ЗДА ў г. Кобрыне. Ф. 611 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, войнаў-інтэрнацыяналістаў, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 8. Адз. зах. 1–4 за 1982–2004. Аўтабіяграфія, успаміны аб службе ў Афганістане, ордэнская кніжка, пасведчанні да медаляў.

АСТАХАВА Кацярына Мацвееўна, настаўніца.

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164. (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). 7 адз. зах. за 1948–1976. Лісты вучняў, артыкулы, фотаздымкі.

АСТОРЫНА Аляксандра Паўлаўна (26.11.1990, г. Чэлябінск, Расія – 15.07.1982), актрыса

*Дакументы паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1966 г.*

БДАМЛМ. Ф. 124. Воп. 1–2. 284 адз. зах. за 1900–1980. Дакументы творчай дзейнасці (артыкулы, рэцэнзіі, нататкі), біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, прадметы, калекцыі афіш і праграм са спектакляў, кнігі.

АСТРАЎЛЯНЧЫК Раіса Ўладзіміраўна (н. 17.07.1945, г. Сураж, Бранская вобл., Расія), паэтка, выкладчык тэорыі бухгалтарскага ўліку.

ЗДА ў г. Барысаве. Ф. 707 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, працаўнікоў тылу і сацыялістычнага будаўніцтва, дзеячаў культуры). Воп. 17. 5 адз. зах. за 1994–2002. Зборнікі вершаў, песняў, манаграфіі, аўтабіяграфія.

АСТРОЎСКІ Радаслаў (25.10.1887, в. Заполле, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 17.10.1976), грамадска-палітычны дзеяч, прэзідэнт Беларускай цэнтральнай рады (1943–1976).

*Дакументы захоўваюцца ў архіве пры царкве св. Ефрасінні Полацкай у Саўт-Рыверы, перададзены яго паплечнікамі, а таксама дачкой Галінай Мінкевіч.*

Архіў царквы св. Ефрасінні Полацкай у Саўт-Рыверы. Дакументы дзейнасці (афіцыйныя дакументы дзейнасці ў БСРГ, як прэзідэнта БЦР (пратаколы, запрашэнні, мемарандумы, ліставанне) як дырэктара Віленскай беларускай гімназіі).

АСТРЭЙКА Сяргей Адамавіч (09.07.1912, в. Каласаўшчына, Капыльскі р-н, Мінская вобл. – 14.09.1937), паэт.

*Дакументы перададзены А. І. Шарахоўскай. Апрацаваны ў 2007 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 11–14 за 1931–1987. Успаміны С. Гайко, фотаздымак ды інш.

АСТРЭЙКА Анатоль (Акім) Пятровіч (11.07.1911, в. Пясочнае, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 23.08.1978), паэт.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка, апрацаваны ў 1975 г. У ДМГБЛ дакументы паступілі ў 1990 ад І. Дзегцева.*

БДАМЛМ. Ф. 197. Воп. 1–2. 192 адз. зах. за 1920–1980. Дакументы творчай дзейнасці (вершаваныя аповесці, паэмы, пераклады), біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, калекцыя рукапісаў твораў розных асоб.

ДМГБЛ. КП 5679–5692, 5817–5826. Рукапісы, ліставанне, фотаздымкі.

АЎДЗЕЕНКА Фёдар Самойлавіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. Ад.зах. 102–103 за 2002. Аўтабіяграфія, успаміны.

АЎДЗЕЕЎ Алег Ціханавіч (н. 15.06.1926, г. Санкт-Пецярбург), кінаапаратар.

БДАМЛМ. Ф. 366 (неап.), (сямейны фонд).

АЎДЗЕЕЎ Фёдар Ігнатавіч (н. 1919), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Кобрыне. Ф. 611 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, войнаў-інтэрнацыяналістаў, грамадска-палітычных дзеячаў). 5 адз. зах. за 1933–2006 гг. Біяграфічныя дакументы.

АЎРАМЧЫК Мікалай Якаўлевіч (н. 14.01.1920, в. Плёсы, Бабруйскі р-н, Магілёўская вобл.), паэт, празаік, перакладчык.
БДАМЛМ. Ф. 160 (неап.).
Бабруйскі краязнаўчы музей. 5 адз. зах. за 1952–1956.

АЎСІЕВІЧ Сяргей Ілліч (н. 02.05.1927, в. Ягадка, Бярэзінскі р-н, Мінская вобл.) працаўнік прамысловасці, наладчык такарных аўтаматаў Мінскага падшыпнікавага завода.
ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 9. Адз. зах. 1–12 за 1950–1987. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыкі, граматы, дыпломы), тэксты выступленняў, фотаздымкі.

АЎХІМОВІЧ Мікалай Яфрэмавіч (01.01.1907, г. Барысаў, Мінская вобл. – 12.09.1996), грамадска-палітычны дзеяч, старшыня СМ БССР (1956–1959).
*Асабісты архіў быў перададзены на захоўванне ў НАРБ у 1997 г. дачкой архіваўтваральніка З.М. Атраховіч. Апрацаваны ў 1999 г. 33 кнігі перададзены ў бібліятэку НАРБ.*
НАРБ. Ф. 554. 176 адз. зах. за 1912–1996. Біяграфічныя дакументы (працоўная кніжка, пасведчанні граматы, запісныя кніжкі ды інш.), дакументы дзяржаўнай і партыйнай дзейнасці (даклады, прамовы, артыкулы, інтэрв'ю ды інш.), фотаздымкі індывідуальныя і ў групах, кнігі з дароўнымі надпісамі, брашуры ды інш.

АХРЭМЧЫК Іван Восіпавіч (16.12.1903, г. Мінск – 09.03.1971), мастак.
*Дакументы паступілі ад дачкі. Апрацаваны ў 1987 г.*
БДАМЛМ. Ф. 187. 27 адз. зах. за 1939–1975. Дакументы творчай дзейнасці (малюнкі, эскізы, накіды, фотаздымкі работ, каталогі выстаў, лекцыі), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі індывідуальныя, у групах ды інш. асоб.
НМГКБ. КП 30735(1–25). Пасведчанні, фотаздымкі, узнагароды.

# Б

БАБАРЫКА (Кузняцова) Маіна Максімаўна (н. 21.03.1930, г. Віцебск), дзіцячая пісьменніца, член Саюза журналістаў.

*Дакументы ў ДА Віцебскай вобл. былі перададзены ўтваральнікам у лістападзе 1995 г.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 803. Воп. 1–2. 156 адз. зах. за 1924–1996. Дакументы творчай дзейнасці (апавяданні, вершы, кнігі, рэцэнзіі на яе апавяданні ды інш.), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

БАБАРЭКА Адам Антонавіч (02.10.1899, в. Слабада-Кучынка, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 10.10.1938) пісьменнік, крытык.

*Перададзены ў БДАМЛМ у канцы 1990-х дачкой Алесяй Адамаўнай Бабарэкай Апрацаваны ў 2001 г.*

Літ.: А. Бабарэка. У душы гарэў святы агонь. Каталог выставы / БДАМЛМ; склад.: Г. Запартыка, Т. Лапкоўская. – Мінск, БелНДІДАС, 1999. – 16 с.; Евенка І. Архіўны фонд Адама Бабарэкі і яго сям'і – крыніца па гісторыі беларускай літаратуры // Пра час «Узвышша»: Матэрыялы Ўзвышаўскіх чытанняў (Мінск, 2003–2004). – Вып. 2. – Мінск: РІВШ, 2005. – С. 91–97.

БДАМЛМ. Ф. 407. 356 адз. зах. за 1915–2001. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, дакументы родных, рэчы.

БАБРОЎСКІ Міхал (08.11.1784, в. Вулька, Бельска-Падляскае ваяв., Польшча – 21.09.1848), гісторык.

*Частка рукапіснай спадчыны знікла адразу пасля яго смерці, частка трапіла да бібліяфіла Ў. Трэнбіцкага, а потым разышлася па розных сховішчах, большасць загінула ў Другую сусветную вайну. Ацалелі асобныя лісты, нататкі і матэрыялы, прызначаны розным асобам і зберагаюцца ў архівах Вільні, Кракава, Варшавы, Масквы, Санкт-Пецярбурга.*

АР БВУ. Ф. 58. 11 адз. зах. Нататкі, выпісы, ліставанне.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава). № 0827, 0872, 0924, 1659, 1735 за 1805–1845. Нарысы, нататкі, даклады, службовыя дакументы, ліставанне.

Аддзел рукапіснай і старажытнай кнігі Бібліятэкі Акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу. Ф. 46. (збор)

АР РНБ. Ф. 80 (асабісты фонд П.В. Баброўскага).

Ватыканскі архіў.

БАБРОЎСКІ Павел Восіпавіч (21.03.1832, б. маёнтак Вака, каля Вільні, Літва – 03.02.1905), гісторык, этнограф.

*У фондзе РНБ сабраны не толькі дакументы самага фондаўтваральніка, але і яго дзядзькі Міхаіла Кірылавіча. У РНБ дакументы паступілі ад жонкі А. А. Баброўскай, апрацаваны ў 1927 г.*

Літ.: Отчет публичной библиотеки за 1907. – СПб., 1908. – С. 48–49.

АР РНБ. Ф. 80. 7 адз. зах. за 1864–1875. Службовае ліставанне.

БАГАРОДСКІ Мікалай Мікалаевіч (02.06.1877, в. Маталоша, Бежацкі р-н, Тврская вобл., Расія – 03.01.1938), гісторык, краязнаўца.

ДА Віцебскай вобл. Ф. 289 (фонд ДА Віцебскай вобл.). Воп. 1. Ад. зах. 43, 144, 157, 159, 132, 191, 192, 183, 208. Сведчанні аб працы ў якасці супрацоўніка Віцебскага губернскага архіва.

БАГАТЫРОЎ Анатоль Васільевіч (13.07.1913, г. Віцебск – 19.09.2003), кампазітар.

*У БДАМЛМ дакументы паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1986 г.*

НМГКБ. КП 28318–28319. Нотныя рукапісы і пасведчанне.

БДАМЛМ. Ф. 190. 37 адз. зах. за 1935–1977. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, кнігі.

БАГДАНАВА Аляксандра Міхайлаўна (н. 08.03.1939), настаўнік, краязнаўца.

*Дакументы ў архіў паступілі ў 1999 г. Доступ быў абмежаваны да канца 2010 г.*

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 12. 11 адз. зах. за 1939–1999.

БАГДАНОВІЧ Максім Адамавіч (27.11.1891, г. Мінск – 12.05.1917), паэт.

*Да Другой сусветнай вайны архіў захоўваўся спачатку ў Інбелкульце, а потым у Акадэміі навук. Пад час вайны знік і дагэтуль не знойдзены. Архіў складаўся з 14 тэчак, большая частка з якіх была перададзена бацькам паэта. Гэта тыя дакументы, што былі выратаваны падчас пажару ў доме, дзе жылі Багдановічы ў Яраслаўлі. Падчас перадачы матэрыялаў быў складзены вопіс, які складаўся з двух раздзелаў: вопісу рукапісаў, вопісу дакументаў да яго біяграфіі, сшытку вершаў «Зеленя», кніг з бібліятэкі. У 1930-х гг. у Беларускі музей у Вільні паступіў архіў «Беларускай кнігарні» і рэдакцыі газеты «Наша ніва». У 1944 г. у час разбору гэтых матэрыялаў былі знойдзены аўтографы пісьмаў і твораў М. Багдановіча. У БДАМЛМ дакументы паступілі ад А. М. Бачылы ў 1968, 1969, Н. Б. Ватацы ў 1973 і ад У. Н. Кузняцова ў 1977 з Яраслаўля. Аўтографы былі атрыманы Дзяржаўнай бібліятэкай БССР у верасні 1964 г. ад пляменніцы М. Багдановіча – Наталлі Глебаўны Кунцэвіч, і ў 1971 г. ад пляменніка гімназічнага таварыша – М. І. Лілеева Дзейнічаюць музеі М. Багдановіча ў Яраслаўлі (засн. у 1992 г.), Гродна (засн. у 1986 г.) і Мінску (засн. у 1981 г.). Асобныя дакументы М. Багдановіча і сям'і Багдановічаў захоўваюцца таксама ў РДАЛМ, РДБ, Навуковай бібліятэцы АН Украіны ды інш.*

Літ.: Багдановіч М. Творы. – Т.2. – Мінск, 1928 (апублікаваны вопіс архіва); Бываеўскі Н. Скарбы творчасці пісьменніка (атрыманыя рукапісы М. Багдановіча) // Савецкая Беларусь. – № 134(831).– 1923. – 16 чэрв. – С. 3–5; Запартыка Г. В. Гісторыя фарміравання збору матэрыялаў сям'і Максіма Багдановіча ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва // Архівы Беларусі [Электронны рэсурс] / БелНДЦЭД – Мінск, 2006. – Рэжым доступу: http://archives.gov.by/index.php?id=633771 – Дата доступа: 10.01.2011; Запартыка Г. Да гісторыі ўзнікнення архіўнага фонду сям'і Багдановічаў у Беларусі // «І прад высокаю красою...» Зб. дакладаў Міжнар. навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 130-годдзю з дня нараджэння М. А. Багдановіча. – Мінск, 2001. – С. 5–9; Архіўныя матэрыялы да жыцця і творчасці Максіма

Багдановіча / Літаратурны музей Максіма Багдановіча; Склад.: В. Бяляўская, П. Качаткова, С. Кіслова, В. Мікута, Т. Рэвяка, М. Трус, Т. Шубіна; Рэд. А. Бяляцкі. – Сш. 1–2. – Менск: Б. в., 1996–1997.

БДАМЛМ. Ф. 153 (сямейны). Воп. 1–3. 212 адз. зах. за 1878–1993. Фотаздымкі, збор артыкулаў і нататак пра М. Багдановіча, рэчы, а таксама дакументы бацькі А. Багдановіча (фармулярны спіс, пасведчанні, ліставанне і г. д.) ды інш. членаў сям'і.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 38–39 за 1909–1915. 9 лістоў за 1912–1914 у рэдакцыю газеты «Наша ніва» і 2 у рэдакцыю альманаха «Наша Беларусь», 6 арыгіналаў вершаў (1913–1917), пераклады вершаў Поля Верлена (1909–1915), частка крытычнага артыкула.

Збор Інстытута мастацтвазнаўства этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Ф. 1. Адз. зах. 13. Дзённік М. Багдановіча прысвечаны ўзаемаадносінам паэта з крымскай сяброўкай. 1915. (перададзены Я. Дылам).

Збор Інстытута літаратуры. Уласнаручны спіс вершаў, апавяданняў і артыкулаў, апублікаваных у 1912–1914 гг., уласнаручны запіс афарызмаў і асобных моўных выразаў.

НДАК НББ. № 09/1,5. Аўтографы.

Літаратурны музей імя Я. Купалы. КП 3319. Верш «Я, нядужны, бяскрылы паэт...» (атрыманы ў 1951 г. ад У. Ф. Баханко), пераклад верша Я. Купалы «Жніво».

Літаратурны музей Максіма Багдановіча ў г. Мінску. Каля 17 тыс. адз. зах. Рукапісы, дакументы сям'і, фотаздымкі, рэчы, кнігі ды інш.

БАГДАНОВІЧ Адам Ягоравіч (20.03.1862, в. Халопенічы, Крупскі р-н, Мінская вобл. –16.04.1940), этнограф, мовазнаўца.

*Дакументы знаходзяцца ў сховішчах разам з дакументамі сына М. Багдановіча (гл. вышэй). Акрамя таго ў НМГКБ – матэрыялы перададзеныя ў 1965 г. з Яраслаўля.*

НМГКБ. КП 15928–15974 за 1874–1950. Біяграфічныя дакументы і рэчы А. Багдановіча ды інш. членаў сям'і.

БАГДАНОВІЧ Анатоль Васільевіч (16.08.1888, в. Слабада-Дзісна, Верхнядзвінскі р-н, Віцебская вобл. – 02.08.1969), мовазнаўца, літаратуразнаўца.

*Асабісты архіў перададзены ў АРКР ЦНБ НАН Беларусі братам І.В. Багдановічам у 1970 г. і ў 1975 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 12. 87 адз. зах. за 1917–1969. Біяграфічныя дакументы (пасведчанні, даведкі), творчыя дакументы (артыкулы, рэцэнзіі), дакументы педагагічнай дзейнасці (канспекты лекцыі, праграмы), успаміны, ліставанне, фотаздымкі індывідуальныя, збор адбіткаў артыкулаў, брашуры.

БАГУШЭВІЧ Францішак (21.03.1840, б. фальварак Свіраны, Вільнюскі р-н, Літва – 28.04.1900), пісьменнік, грамадскі дзеяч.

*Пытаннем захавання спадчыны Ф. Багушэвіча апекаваўся А. Луцкевіч, які адзначае непаважлівыя адносіны родных паэта да яе і да ўсёй яго дзейнасці. Частка рукапісаў перададзена*

*ў Беларускі музей у Вільні. Па адных сведчаннях, скрынка з рукапісамі згарэла ў 1944 г., па іншых – захавалася да 1946 г. разам з асабістымі рэчамі і партрэтамі работы Андрыёлі. У 1920-я гг. рукапіс «Беларускай скрыпачкі» захоўваўся ў архіве Б. Эпімах-Шыпілы ў Ленінградзе. У 1959 г. у Ашмянскі краязнаўчы музей з Нежынскага філіяла Чарнігаўскага абласнога архіва паступілі сямейны альбом Ф. Багушэвіча і справа аб службе ў Канатопе.*

Літ.: Кісялёў Г. Ці шмат застаецца з напісанага. Да праблемы паўнаты гісторыка-літаратурных крыніц. // Ад Чачота да Багушэвіча: праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – С. 61–69; Янушкевіч Я. Чалавек, які нарадзіўся не ў сваю эпоху. Новае з перапіскі Ф. Багушэвіча з Я. Карловічам // За архіўным парогам: Бел. літ. XIX–XX стст. у святле архіўных пошукаў. – Мінск: Маст. літ., 2002. – С. 78–104.

Ашмянскі краязнаўчы музей імя Ф. К. Багушэвіча. 94 дак. за 1865–1967. Выпісы з метрычных кніг, дакументы аб навучанні і працы, кнігі.

Навуковая бібліятэка НАН Украіны (Львоў). Фонд Я. Галавацкага. Адз. зах. 12. Лісты за 1885–1886 гг.

НМГКБ. КП 17266. Сямейны фотаальбом Ф. Багушэвіча, рэчы, што належалі сям’і Багушэвічаў.

БАДЗІН Раман Рыгоравіч (1930–1999), мастацтвазнаўца, супрацоўнік НММ.

Архіў НММ. Ф. 2 (Калекцыя дакументальных матэрыялаў навуковых супрацоўнікаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь). Воп. 4. Адз. зах. 1–72 за 1953–2001. Дакументы навуковай дзейнасці (лекцыі, артыкулы, выпісы), матэрыялы да біяграфіі, фотаздымкі, сабраныя дакументы, кнігі.

БАДУНОВА Паліна Аляксандраўна (07.09.1885, Навабеліца, г. Гомель – 29.11.1938), грамадска-палітычны дзеяч.

*Асабісты архіў, што ўключаў у сябе дакументы па гісторыі беларускіх палітычных партый і арганізацый, у 1926 г. быў прададзены Музею рэвалюцыі пры Гістпарце за 150 рублёў.*

Літ.: Гесь А. М., Калеснік Н. Я. Як трапілі ў архіў дакументы Палуты Бадуновай // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 5 / рэдкал. Ю. М. Бохан [ды інш.] – Мінск: НГАБ, 2007. – С. 14–20.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 37 за 1923–1944. Апавяданні «Смяюцца над сабой», «Думкі парабка», «Смерць мачыхі».

БДАМЛМ. Ф. 372 (фонд Ю. Б. Туронка ). Воп. 1. Адз. зах. 14. Фотаздымак. [1910–1920-я гг.]; Ф. 3 (Калекцыя музея імя І. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах 256. Ліст да В. Ластоўскага і К. Душэўскага .

НАРБ. Ф. 458 (фонд К. Б. Езавітава ). Воп. 2. Адз. зах. 20 за 1920 г. Фотаздымак П. Бадунова і Я. Мамонька.

БАДУЭН дэ КУРТЭНЕ Іван Аляксандравіч (13.03.1845, г. Радзымін, Польшча – 04.11.1929), рускі і польскі мовазнавец.

АРАН СПб. Ф. 102. Воп. 1–2. 385 Адз. зах. за 1870–1909. Дакументы дзейнасці, біяграфічныя дакументы.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава).

Навуковая бібліятэка НАН Украіны (Львоў). Фонд Я. Галавацкага. № 3152–3343.
Архіў Польскай акадэміі навук (Варшава).

БАЖКО Аляксандр Цімафеевіч (н. 22.10.1918, в. Даўгінава, Навагрудскі р-н, Мінская вобл.), празаік, публіцыст, грамадска-культурны дзеяч.
*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад архіваўтваральніка, апрацаваны 1973 г.*
БДАМЛМ. Ф. 61. 24 Адз. зах. за 1937–1966. Ліставанне з М.І. Забэйда-Суміцкім, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.
НАРБ. Ф. 311. Воп. 5. Адз. зах. 1–95 за 1931–1996. Біяграфічныя (пасведчанні, граматы, дакументы аб працы), ліставанне (у рэдакцыі, ад родных, з розных устаноў, ад пісьменнікаў), літаратурныя творы (артыкулы, аповесці, вершы, публіцыстычныя творы, рэцэнзіі), фотаздымкі (індывідуальныя, з роднымі, іншых асобаў).

БАЖЭЛКА Аляксандр Афанасьевіч (н. 05.02.1944, в. Святкі, Мядзельскі р-н, Мінская вобл.), акцёр тэатра «Дыяген».
ЗДА ў г. Пінску. Ф. 775 (Калекцыя дакументаў выдатных людзей Палесся). Воп. 4. Адз. зах. 10–14 за 1946–2002. Аўтабіяграфія, пасведчанні, дыпломы, граматы, фотаздымкі, праграмы спектакляў з аўтографамі сяброў.

БАЗАН Іван Іванавіч (16.09.1953, в. Скарацічы, Іванаўскі р-н, Брэсцкая вобл.), акцёр тэатра «Дыяген»
ЗДА ў г. Пінску. Ф. 775 (Калекцыя дакументаў выдатных людзей Палесся). Воп. 4. Ад.зах. 7–9 за 1946–2002. Аўтабіяграфія, пасведчанні, дыпломы, граматы, фотаздымкі.

БАКАНАВА Надзея Давыдаўна (н. 07.08.1940, в. Тышкевічы, Іванаўскі р-н, Брэсцкая вобл.), спявачка.
БДАМЛМ. 375 (неап.) (Калекцыя дакументаў кампазітараў, музыказнаўцаў, выканаўцаў).

БАКЛАНАЎ Міхаіл Іванавіч (12.11.1914, в. Іванаўка, Валнахвацкі р-н, Данецкая вобл., Украіна – 23.01.1990), архітэктар.
*Дакументы перададзены жонкай. Апрацаваны ў 1993 г.*
БДАНТД. Ф. 128. 32 адз. зах. за 1949–1989. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах, фотаздымкі будынкаў, спраектавананых утваральнікам.

БАЛАБАЙ Зоя Дзмітрыеўна (н. 1922), удзельнік Другой сусветнай вайны.
ЗДА ў г. Лідзе. Ф. 4лс (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, працы, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі г. Ліды і Лідскага р-на). 2 адз. зах. за 1910–2005. Біяграфічныя дакументы, успаміны.

БАЛІНСКІ Міхаіл (14.08.1794, б. маёнтак Цярэспаль, Полацкі р-н, Віцебская вобл. – 22.12.1864), гісторык, публіцыст.
АР ЦБАН Літвы. Ф. 81. 45 адз. зах. за 1380–1920.
АР БВУ. Ф. 22. 807 адз. зах. за 1509–1939.

Аддзел рукапісаў Ягелонскай бібліятэкі (Кракаў). Навуковыя працы, ліставанне, матэрыялы па гісторыі Літвы, успаміны аб А. Снядэцкім.

БАЛОЦІН Ісідар Міхайлавіч (08.09.1907, г. Бабруйск, Магілёўская вобл. – 07.12.1961), акцёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі, апрацаваны ў 1978 г. У ДМГТМК дакументы перададзены ў 1993 г.*

ДМГТМК. КП 287 (1–45), 5321–5328. Біяграфічныя дакументы (даведкі, тэлеграмы, запісныя кніжкі, афішы, партрэты).

БДАМЛМ. Ф. 102 (сямейны). 82 адз. зах. за 1921–1975. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, рэчы (ордэны, медалі, значкі).

БАЛЮК Сцяпан Ерамеевіч (н. 1904, в. Трылiскі, Іванаўскі р-н, Брэсцкая вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, член КПЗБ.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і удзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 6. Адз. зах. 1–4 за 1932–1968. Фотакопіі характарыстык і даведак, фотаздымкі індывідуальныя, артыкулы, ліставанне з архівам у Пінску аб пошуку дакументаў.

БАНАДЫК Дзмітрый Фёдаравіч (1911–1989), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Рэчыцы. Ф. 831. 10 адз.зах за 1941–1979. Біяграфічныя дакументы, дакументы службовай дзейнасці, дзённікавыя запісы, ліставанне, фотаздымкі ваенных гадоў.

БАНАДЫСЕВА Вольга Спірыдонаўна (12.07.1930–01.03.2001), настаўніца.

ЗДА ў г. Крычаве. Ф. 1250 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). 17 адз. зах. за 1952–2005. Біяграфічныя дакументы, ліставанне.

БАНАЧЫЧ Антон Пятровіч (19.12.1880, г. Марыупаль, Украіна – 22.03.1933) , спявак.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад Л.В. Бельскай. Апрацаваны ў 1973 г.*

БДАМЛМ. Ф. 174. 6 адз. зах. за 1906–1913. Фотаздымкі ў ролях, ліставанне.

БАНДАРЫК Мікалай Мікалаевіч (пам. у 2000 г.), фотакарэспандэнт.

*Калекцыя фотаздымкаў у 2000 г. перададзена ў БДАКФФД.*

Літ.: Пармон Е., Великая Н. Минск 1970–1990-х гг. глазами Николая Бондарика // Архівы і справаводства. – 2006. – № 2. – С. 124–129.

БДАКФФД. 1210 адз. зах. за 1970–1990 гг. Калекцыя фотаздымкаў грамадска-палітычных, культурных дзеячаў, мерапрыемстваў, краявідаў г. Мінска.

БАНДАРЧЫК Таццяна Андрэеўна (30.11.1902, в. Дукора, Пухавіцкі р-н, Мінскай вобл. – 24.07.1974), актрыса.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1996 г.*

БДАМЛМ. Ф. 23. Воп. 1–2. 146 адз. зах. за 1921–1974. Дакументы творчай дзейнасці (фота ў ролях, рукапісы і нататкі), біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах з Я. Купалам.

БАНДАРЫНА Зінаіда Аляксандраўна (11.10.1909, г. Гродна – 16.04.1959), пісьменніца.

*Дакументы паступілі ў 1964 г. ад маці Т.А. Бандарынай. Апрацаваны ў 1965 г.*

БДАМЛМ. Ф. 75. 174 адз. зах. за 1926–1961. Дакументы творчай дзейнасці (аповесці, апавяданні, фельетоны, казкі, нарысы, артыкулы, рэцэнзіі), біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, дакументы сабраныя для працы.

БАРАНАВЫХ Сымон (Баранаў Сымон Якаўлевіч) (01.09.1900, в. Рудакова, Чэрвенскі р-н, Мінская вобл. – 10.11.1942), пісьменнік.

*Дакументы паступілі ад сястры жонкі. Апрацаваны ў 1964 г.*

БДАМЛМ. Ф. 46. 28 адз. зах. 1927–1956. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, дакументы жонкі.

БАРАНАЎ Георгій Паўлавіч (1926–2006), працаўнік гаспадаркі, намеснік старшыні Лідскага райвыканкама.

ЗДА ў г. Лідзе. Ф. 4лс (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, працы, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі г. Ліды і Лідскага р-на). 4 адз. зах. за 1910–2005. Біяграфічныя дакументы, успаміны.

БАРАНОВІЧ Іван Мацвеевіч (н. 15.01.1926, в. Антушы, Рагачоўскі р-н, Гомельская вобл.), настаўнік, кіраўнік адукацыйных устаноў.

ЗДА ў г. Жлобіне. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры). Воп. 13. 5 адз. зах. за 1956–2001. Аўтабіяграфія, пасведчанні, успаміны, артыкулы, фотаздымкі.

БАРАНОЎСКАЯ Галіна Мікалаеўна (н. 22.05.1936, г. Іркуцк), мастачка.

БДАМЛМ. Ф. 423 (неап.).

БАРАНОЎСКАЯ Ніна Міхайлаўна (24.12.1914–04.07.1989), мастацтвазнаўца, супрацоўнік НММ.

Архіў НММ. Ф. 2 (Калекцыя дакументальных матэрыялаў навуковых супрацоўнікаў НММ Рэспублікі Беларусь). Воп. 1. Адз. зах. 1–109 за 1930–1989. Дакументы службовай дзейнасці, дакументы да біяграфіі, сабраныя матэрыялы.

БАРАНОЎСКІ Яўген Іванавіч (н. 03.09.1938, г. Бабруйск, Магілёўская вобл.), гісторык, архівіст, дырэктар Цэнтральнага партыйнага архіва КПБ у 1990–1992 гг.

*Дакументы у НАРБ паступілі ад архіваўтваральніка ў 2006 г . Апрацаваны ў 2008 г.*

НАРБ. Ф. 1468. 268 адз. зах. за 1918–2008. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, пасведчанні), дакументы навуковай дзейнасці (спісы навуковых прац, кнігі, артыкулы, выступленні, зборнікі дакументаў), дакументы сабраныя (па гісторыі Другой сусветнай вайны, успаміны ды інш.), фотаздымкі (індывідуальныя, з аднакурснікамі, падчас службы ў войску).

БАРАШКА Іларыён Мацвеевіч (25.07.1905, г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенскай вобл. – 03.06.1968), пісьменнік, архівіст, кінадраматург, перакладчык.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1973 г.*

БДАМЛМ. Ф. 28. 446 адз. зах. за 1917–1968. Дакументы творчай дзейнасці (сцэнарыі, п'есы, аповесці, апавяданні, вершы, рэцэнзіі, выступленні), біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі індывідуальныя, у групах.

НАРБ. Ф. 205 (фонд Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта). Воп. 3. Адз. зах. 398 (асабовая справа); Ф. 249 (фонд Галоўнага архіўнага ўпраўлення). Воп. 2. Адз. зах. 128 (асабовая справа).

БАРАШКІН Дзмітрый Іванавіч (н. 1922, в. Шчавялі, Лёзненскі р-н, Віцебская вобл.), працаўнік прамысловасці (Мінскага аўтамабільнага завода), грамадскі дзеяч.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 21. Адз. зах. 1–3 за 1951–1979. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыкі, граматы, пасведчанні), фотаздымак.

НМГКБ. 30 адз. зах. за 1944–1961. Біяграфічныя дакументы.

БАРОЎСКІ Ісаак Юльевіч (18.11.1921, г. Віцебск – 05.03.1991), мастак.

*Дакументы ў архіў перададзены роднымі.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 773. 93 адз. зах. за 1920-я – 1995 гг. Дакументы творчай дзейнасці (накіды, эскізы, фотаздымкі прац, рэцэнзіі на працы мастака), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

БАРСУКОЎ Міхаіл Захаравіч (19.07.1919, в. Лучна, Полацкі р-н, Віцебская вобл.–10.03.1979), архітэктар.

*Дакументы паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1988 г.*

БДАНТД. Ф. 88. 23 адз. зах. за 1935–1987. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі будынкаў па праектах архітэктара, ліставанне.

БАРШЧЭЎСКІ Ян (1794, в. Мурагі, Расонскі р-н, Віцебская вобл. – 12.03.1851), пісьменнік, паэт, выдавец.

*Архіў знаходзіўся ў сямейным архіве графаў Ржэвускіх, асобныя рукапісы – у віцебскай калекцыі Вацлава Федаровіч., а потым*

*у Віцебскім краязнаўчым музеі. У 1920-я гг. паведамлялася аб захоўванні ліставання да Ю. Шапялевіч-Корсак.*

Літ: Кісялёў Г. Ці шмат застаецца з напісанага. Да праблемы паўнаты гісторыка-літаратурных крыніц. // Ад Чачота да Багушэвіча: праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі беларускай літаратуры XIX ст. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – С. 44–45; Каханоўскі Г. Вандраванні. // Маладосць. – 1984. – № 10. – С. 155–157.

ВАКМ. Ліставанне з сястрой Ю. Шапялевіч за 1837–1842 гг.

БАРЫКІН Емяльян Ігнатавіч (02.08.1902, в. Трасная, Камарыцкі р-н, Бранская вобл., Расія –25.03.1951), удзельнік падпольнага руху ў Другой сусветнай вайне.

БДМГВАВ*. 4 адз. зах. за 1944. Біяграфічныя дакументы.

Гомельскі абласны краязнаўчы музей**. Ф. 7. 17 адз.зах за 1940–1950-я гг. Біяграфічныя дакументы.

---

* У тэматычных калекцыях БДМГВАВ, акрамя пазначаных тут і далей матэрыялаў, захоўваюцца невялікія комплексы асабістых дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны А. С. Азончыка (н. 1908), С. П. Анішчанка (1923–1944), А. А. Антонава (н. 1914), С. А. Бабрука (н. 1901), М. У. Барысава (н. 1923), І. І. Бувіна (1921–1944), А. К. Бурака (н. 1918), А. С. Бычок (1921–1944), А. А. Вашкевіча (1901–1945), К. М. Галіцкага (1897–1973), Б. Л. Галушкіна (1919–1944), М. І. Гапеенка (н. 1919), М. Ф. Гастэла (1907–1941), С. Дз. Герасімава (1915–1944), А. М. Германа (1908–1959), В. М. Гінтаўта (н. 1922), В. В. Глаголева (1898–1947), І. А. Дзяменцьева (1901–1964), М. І. Дзенісенкі (1899–1949), Б. М. Дзмітрыева (1924–1944), Е. У. Дабравольскага (н. 1908), Ф. Ф. Дуброўскага (1901–1970), В. І. Ероньکі (н. 1920), Ф. Е. Жгірава (н. 1911), С. Г. Жуніна (н. 1906), М. І. Зіньковіча (1900–1943), І. С. Іванова (н. 1920), Дз. В. Казакевіча (1902–1972), С. А. Казакова (1914–1964), М. С. Камельчыка (н. 1921), С. Дз. Карыцкага (1913–1944), У. М. Кірмановіча (н. 1919), П. М. Кіслова (1906–1968), А. Е. Кляшчова (1905–1968), Ф. І. Кавалёва (1916–1944), Б. І. Каўзана (н. 1922), І. А. Каўшарава (н. 1911), І. П. Кажара (1902–1967), І. І. Казлоўскага (н. 1917), В. М. Калеснікава (н. 1922), А. Ф. Калясовай (1920–1942), М. І. Колычава (н. 1918), У. Л. Каргузалава (1896–1944), П. М. Каралёва (н. 1915), М. Ф. Каралёва (н. 1906), І. Я. Красніка (1897–1944), І. Т. Краснова (1911–1952), А. П. Кулясава (1919–1944), В. А. Лабанава (н. 1917), М. А. Ласкунова (1911–1945), І. П. Луева (1898–1945), А. С. Лукашэвіча (1924–1943), І. І. Люднікава (н. 1902), Ф. А. Малышава, С. С. Манковіча (н. 1905), С. С. Маркіна (н. 1918), Ф. Р. Маркава (1912–1958), К. І. Марусічэнка (н. 1917), А. М. Матросава (1924–1943), В. Е. Мацюшкіна (1921–1943), Р. Н. Мачульскага (н. 1903), А. А. Мініна (н. 1924), Я. А. Мойзаха (1903–1944), А. Р. Ніканава (1901–1944), Б. С. Акрэсціна (1923–1944), М. В. Акцябрскай (1905–1944), В. К. Алейніка (1922–1944), Ф. І. Паўлоўскага (н. 1908), С. А. Пашкевіча (н. 1921), А. В. Паддавашкіна (1919–1976), М. Г. Падсадніка (н. 1922), Г. Ф. Пакроўскага (н. 1915), М. П. Пакроўскага (н. 1909), А. І. Радкевіча (1913–1957), С. А. Свідзерскага (н. 1905), А. П. Сярогіна (н. 1906), А. І. Сліца (1894–1945), М. І. Смарчкова (н. 1916), І. П. Собалева (н. 1907), І. М. Цімчука (н. 1901), І. Ф. Ціткова (н. 1912), У. А. Ціхамірава (н. 1921), М. Ф. Талкачова (н. 1922), М. В. Хоцімскага (н. 1903), Б. А. Царыкава (1926–1943), У. З. Царука (1899–1957), В. Е. Чарнышова (1908–1969), І. Д. Чарняхоўскага (1906–1945), В. М. Шышыгіна (н. 1917), С. Ф. Шутава (1902–1963), А. М. Юрына (1905–1944) ды інш.

** У тэматычных калекцыях Гомельскага абласнога краязнаўчага музея, акрамя пазначаных тут і далей матэрыялаў, захоўваюцца невялікія комплексы асабістых дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны М. Р. Батракова (1922–1945),

БАРЫСАГЛЕБСКІ Леанід Аляксандравіч (06.04.1912, г. Санкт-Пецярбург – 28.01.2007), фізік, доктар фізіка-матэматычных навук.

*Дакументы перададзены архіваўтваральнікам. Апрацаваны ў 2000 г.*

БДАНТД. Ф. 180. 53 адз. зах. за 1929–1997. Дакументы навуковай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

БАРЫСЁНАК Андрэй Міхайлавіч, удзельнік партызанскага руху ў Другой сусветнай вайне.

*Дакументы перададзены ў ДА Мінскай вобл. роднымі і ўвайшлі ў склад калекцыі малакалькасных дакументаў (Ф. 1262, Воп. 32) удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны разам з дакументамі Я. І. Валовіка (2 адз. зах. за 1944–1971), хірурга Т.С. Лерман (3 адз. зах. за 1987); удзельніка партызанскага руху І.А. Пармона (4 адз. зах. за 1985–1989), радавога Ў.К. Пецюрэнкі (5 адз. зах. за 1942), радавога М.С. Парцянкіна (1 адз. зах. за 1942), удзельніка партызанскага руху П.Ф. Рудава (7 адз. зах. за 1975), удзельніка падпольнага і партызанскага руху А.К. Рыбакова (8 адз. зах. за 1942–1944).*

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 32. Адз. зах. 1 за 1944–1971. Біяграфічныя дакументы, успаміны.

БАРЫЧЭЎСКІ Яўген Іванавіч (17.12.1883, г. Мінск – 12.09.1934), літаратуразнаўца.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад дачкі. Апрацаваны ў 1991 г.*

БДАМЛМ. Ф. 329. 29 адз. зах. за 1890–1985. Дакументы дзейнасці (лекцыі, даклады, артыкулы), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах, кнігі.

БАРЫШАЎ Гурый Іларыёнавіч (30.04.1928, г. Ташкент, Узбекістан – 14.06.2000), мастацтвазнаўца.

*Дакументы паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1969 г.*

БДАМЛМ. Ф. 131. Воп. 1–2. 90 адз.зах за 1924–1978. Дакументы творчай дзейнасці (даследаванні, артыкулы, рэцэнзіі, нататкі), біяграфічныя дакументы, ліставанне.

БАСАЎ Веніямін Мацвеевіч (12.10.1913, г. Мсціслаўль, Магілёўская вобл. – 2000), мастак.

*Дакументы перададзены сынам Ю.В. Басавым у 2005 г.*

---

П. С. Сінчукова (н. 1920), фотажурналіста П. Я. Белавуса, грамадскага дзеяча Г. А. Варатынцавай, працаўніка гаспадаркі Я. П. Кернажыцкага , урача І. М. Касіма, мастака Ц. І. Казлова, урачоў У. І. Парменава, А. І. Перлава ды інш.

Архіў НММ. Фонд неапрацаваны. 40 адз. зах. за 1930–2005.

БАСАЎ Ізраіль Мордухавіч (07.10.1918, г. Мсціслаўль, Магілёўская вобл. – 04.08.1994), мастак.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад архіваўтваральніка ў 1976 г. Апрацаваны ў 2003 г.*

БДАМЛМ. Ф. 374 (Збор архіваў дзеячаў мастацтва). Воп. 1. 5 адз. зах. за 1950–1972. Дакументы творчай дзейнасці (пейзажы, партрэты), артыкул пра ўтваральніка з нагоды юбілею, фотаздымкі індывідуальныя.

БАЧАРОВА Зінаіда Антонаўна, мастак.

БДАМЛМ. Ф. 448 (неап.).

БАЧЫЛА Аляксандр Мікалаевіч (02.02.1918, в. Лешніца, Чэрвенскі р-н, Мінская вобл. – 04.01.1983), паэт, драматург.

*Дакументы паступілі ў 1988 г. ад Я.Я. Бачылы. Апрацаваны ў 1996 г.*

БДАМЛМ. Ф. 323. 307 адз. зах. за 1890–1985. Дакументы творчай дзейнасці (кнігі, зборнікі вершаў, лібрэта ды інш.), біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, зборы песняў, афіш, праграм спектакляў, фотаздымкаў у ролях.

БЕГУНОЎ Рыгор Дзмітрыевіч (18.11.1914, б. хут. Вялікі Бейсуг, Брухавецкі р-н, Краснадарскі край, Расія – 20.01.2000), удзельнік Другой сусветнай вайны, вайсковец.

ЗДА ў г. Жлобіне. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры). Воп. 7. 6 адз. зах. за 1944–1987. Аўтабіяграфія, граматы, ліставанне, фотаздымкі.

БЕЗБАРОДАЎ Міхаіл Аляксеевіч (14.11.1898, г. Санкт-Пецярбург – 15.06.1983), вучоны ў галіне фізічнай хіміі і тэхналогіі шкла.

*Дакументы ў АРКР ЦНБ перададзеныя сынам у лістападзе 1985 г. Апрацаваны ў 1992 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 45. 1085 адз. зах. за 1902–1983. Дакументы творчай дзейнасці (кнігі, манаграфіі, артыкулы, нататкі, даклады, водгукі), дакументы службовай і грамадскай дзейнасці, ліставанне з рознымі асобамі і ўстановамі, дакументы біяграфічнага характару (аб адукацыі, характарыстыкі, граматы, карэспандэнцыя, даведкі; дакументы аб утваральніку), фотаздымкі індывідуальныя, калекцыя ўключае ў сябе адбіткі артыкулаў, аўтарэфераты, працы розных асобаў ды інш.

БЕЛАКАЗОВІЧ Базыль (02.01.1932, в. Відова, Беластоцкае ваяв., Польшча – 24.02.2010), славіст, літаратуразнаўца.

БДАМЛМ. 463 (неап.).

БЕЛАВУС Аляксандр Міхайлавіч (н. 10.06.1945, в. Аснежыцы, Пінскі р-н, Брэсцкая вобл.), акцёр тэатра «Дыяген».

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Другой сусветнай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 4. Адз. зах. 21а–24 за 1948–2002. Дакументы біяграфіі (аўтабіяграфія, копіі працоўнай кніжкі, пасведчанні, граматы, дыпломы), афішы, фотаздымкі спектакляў, артыкулы з газет аб утваральніку.

БЕЛТАЎ Віктар Міхайлавіч (н. 01.01.1910, г. Самара, Расія), паэт.

ЗДА ў г. Барысаве. Ф. 707 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, працаўнікоў тылу і сацыялістычнага будаўніцтва, дзеячаў культуры). Воп. 12. 7 адз. зах. за 1966–1997. Біяграфія, фотаздымкі, граматы, фельетоны, артыкулы аб дзеячы.

БЕЛЫ Аляксей Ілліч (н. 02.01.1953, в. Міхновічы, Івацэвіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), журналіст, літаратар, дзеяч культуры.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 25. 11адз. зах. за 1970–2007. Дакументы творчай дзейнасці (зборнікі вершаў, артыкулы), дакументы службовай дзейнасці, ліставанне, аўтабіяграфія, фотаздымкі (індывідуальныя ў групах, з дзеячамі мастацтва).

БЕЛЫ Анатоль Яўхімавіч (10.12.1939, г. Старыя Дарогі, Магілёўская вобл. – 14.11.2011), грамадскі дзеяч, дзеяч культуры.

БДАМЛМ. Ф. 390 (неап.).

БЕРАЗОЎСКІ Віктар Восіпавіч (н. 15.10.1919, в. Лаўрукі, Верхнядзвінскі р-н, Віцебская вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Глыбокае. Ф. 200 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжанння). 4 адз. зах. за 2000–2005. Біяграфічныя дакументы.

БЕРГЕР Міхаіл Аркадзьевіч (15.08.1909, г. Мінск – 06.02.1981), піяніст.

*Дакументы паступілі ў 1981–1982 гг. ад Г. І. Рыхтэман (жонкі). Апрацаваны ў 1993 г.*

БДАМЛМ. Ф. 256. 91 адз. зах. за 1923–1982. Нотныя рукапісы, ліставанне, матэрыялы да біяграфіі (асабістыя дакументы, дакументы аб ім), дакументы сабраныя для сваіх работ, фотаздымкі.

БЕРЛІН Ілля Навумавіч (01.01.1917, в. Ціхінічы, Гомельскі р-н, Мінская вобл. –28.01.1968), фатограф.

*Дакументы паступілі ў 1980 г. ад П. С. Берлінай (удавы). Апрацаваны ў 1982 г.*

БДАМЛМ. Ф. 246. 181 адз. зах. за 1945–1970. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы.

БІБІЛА Юлія Іосіфаўна (10.01.1897, г. п. Поразава, Свіслацкі р-н, Гродзенская вобл. – 04.12.1974), бібліёграф.

НДАК НББ. Ф. 2 (Збор матэрыялаў дзеячаў навукі і культуры Беларусі). Воп. 1. Адз. зах. 46–52 за 1920–1974 гг. Артыкулы.

БІРУЛЯ Іван Вікенцьевіч, дырэктар Брэсцкага краязнаўчага музея ў 1955–1961, удзельнік Другой сусветнай вайны.

Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. КП 18815 (1–39) за 1953–1993. Афіцыйнае ліставанне ды інш. афіцыйныя дакументы, дзённікі, рукапісы артыкулаў, біяграфічныя дакументы.

БІРЫЛА Сцяпан Сцяпанавіч (14.08.1903, г. Мінск – 15.08.1978), акцёр.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад Сянько А.І. (жонкі) у 1979 і ад І.В. Кісялёвай (нявесткі) у 1986 г.*

БДАМЛМ. Ф. 238 (сямейны). Воп. 1–2. 265 адз. зах. за 1911–1978. Дакументы творчай дзейнасці (тэксты роляў, фотаздымкі), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

БІТЭЛЬ Пётр Іванавіч (1912, в. Радунь, Воранаўскі р-н, Гродзенская вобл. – 1991) паэт, перакладчык, краязнаўца.

*Дакументы ў ДМГБЛ паступілі ў 1988 г. ад архіваўтваральніка.*

Літ.: Запартыка Г. В. Пятро Бітэль: вяртанне дакументальнай спадчыны // Архівы і справаводства. – 2009. – № 2. – С. 109–113.

БДАМЛМ. (неап.)

ДМГБЛ. КП 2115–2170. Рукапісы вершаў.

ЗДА ў г. Маладзечна. 8 адз. зах. за 1953–1987. Творчыя дакументы (пераклады).

Мінскі абласны краязнаўчы музей у г. Маладзечна. КП 9936–9940, 14035–14038. Рукапісы перакладаў, фотаздымкі.

БІЧЭЛЬ Данута Янаўна (н. 03.12.1937, в. Біскупцы, Лідскі р-н, Гродзенская вобл.) паэтка.

БДАМЛМ. Ф. 369 (неап.).

БЛАЖКО Сяргей Мікалаевіч (17.11.1870, г.п. Хоцімск, Магілёўская вобл. – 11.02.1956), астраном, член-карэспандэнт АН СССР.

Бібліятэка Дзяржаўнага астранамічнага інстытута імя П. К. Штэрнберга пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце. 80 адз. зах. за 1892–1956.

Магілёўскі абласны краязнаўчы музей*. КП 14261–14331 (1–71) за 1907–1951. Дыплом аб заканчэнні ўніверсітэта, атэстат прафесара за 1950 г., пасведчанні, чарнавікі прац, фотаздымкі.

БЛІШЧ Міхаіл Андрэевіч (07.11.1917, в. Заспа, Рэчыцкі р-н, Магілёўская вобл. – 09.05.1966), мастак.

---

* У тэматычных калекцыях Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея, акрамя пазначаных тут і далей матэрыялаў, захоўваюцца невялікія комплексы асабістых дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны І. М. Кардовіча (1899–1967), П. І. Бажэнава, Е. Н. Мікалаенкі, Г. А. Храмовіча, М. Г. Чарняева, А. Д. Шэмянкова, удзельнікаў рэвалюцыйнага руху М. Т. Панасевіча , С. М. Юсклер.

*Дакументы паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1971 г.*

БДАМЛМ. Ф. 162. 62 адз. зах. за 1947–1965. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

БОБР Аляксандр Рыгоравіч (н. 12.09.1947, г. Мазыр, Гомельская вобл.), гісторык, краязнавец, настаўнік.

ЗДА ў г. Мазыры. Ф. 289 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг., партызанскага руху на Палессі, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі). Воп. 2. 8 адз. зах. за 1964–2000. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, асабістыя дакументы), дакументы дзейнасці (рукапіс кнігі, малюнкі, сцэнарый), ліставанне, артыкулы аб утваральніку, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

БОВА Фёдар Мікітавіч (20.12.1915, в. Вішнякі, Харолскі р-н, Палтаўская вобл.–26.04.1982), удзельнік партызанскага руху падчас Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 13. Адз. зах. 1–5 за 1944–1988. Копіі даведак, характарыстыкі, пасведчанні, фотаздымкі, ліставанне з аднавайскоўцамі.

БОГУШ-СЕСТРАНЦЭВІЧ Станіслаў (03.09.1731, в. Занкі, Свіслацкі р-н, Гродзенская вобл. – 13.12.1826), гісторык, літаратар, Магілёўскі архіепіскап.

*Дакументы аб дзейнасці знаходзяцца ў фондах розных устаноў.*

РДАСА. Ф. 12. Воп. 1. Адз. зах. 192. Лісты да кн. Г.А. Пацёмкіна-Таўрычаскага.

РДГА. Фонд архіва. Воп. 2. Адз. зах. 3475.

ЦДГАУ ў Кіеве. Ф. 257 (фамільны фонд кн. Радзівілаў). Воп. 1. Адз. зах. 128. Дзённік за 1731–1754 гг.

Бібліятэка Чартарыйскіх (Кракаў). № 689, 700, 707. Лісты да Станіслава Аўгуста Панятоўскага .

Ватыканскі архіў.

БОЛТРЫН Мікалай Іванавіч (н. 1912), удзельнік рэвалюцыйнага і партызанскага руху, грамадска-палітычны дзеяч.

ДА Гродзенскай вобл. Ф. 239 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). 17 адз. зах. за 1944–1978. Дакументы да біяграфіі, ліставанне.

БОНДАРАВА Ефрасіння Леанідаўна (н. 25.11.1922, в. Гапонава, Лёзненскі р-н, Віцебская вобл.), кіназнаўца.

БДАМЛМ. Ф. 366 (сямейны) (неап.).

БРАДОЎСКІ Антон Рафаілавіч (20.10.1859–1928), калекцыянер, нумізмат, член Віцебскай губернскай камісіі па ахове помнікаў.

*У 1924 г. яго калекцыя была ўключана ў склад створанага Віцебскага аддзялення Беларускага Дзяржаўнага музея. Калекцыя рукапісаў, планаў, малюнкаў, аўтографаў уключала ў сябе аўтографы Мікалая І, вялікага кн. Канстанціна Паўлавіча ды інш.*

ВАКМ. Н/а 3/1. Рукапіс аб стане працы ў Віцебскай губ. камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва. 1921.

БРАЙЦАЎ Якуб (Якаў Раманавіч) (19.02.1861, в. Забелішына, Магілёўская вобл. – 23.03.1931), пісьменнік.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад сына пісьменніка – прафесара Васілія Брайцава у 1981 г.*

БДАМЛМ. Ф. 7. 28 адз. зах. за 1884–1960. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

БРАХОЦКІ Уладзіслаў, Навагрудскі павятовы кіраўнік дваранства, землеўладальнік Навагрудскага павета.

НГАБ. Ф. 1588 (сямейны). 11 адз. зах. за 1865–1918. Генеалагічныя дакументы, ліставанне.

БРЖЭСКІ Вітольд Чэслававіч (25.11.1913, в. Рубанка, Бахмачскі р-н, Чарнігаўская вобл., Украіна – 16.10.1984), доктар медыцынскіх навук, гісторык медыцыны.

*Дакументы перададзены ў ДА Гродзенскай вобл. жонкай архіваўтваральніка. В. Ч. Бржэскі збіраючы звесткі аб медыцынскіх працаўніках збіраў дадзеныя ў 54 сховішчах СССР і Польскай рэспубліцы. Вопіс складзены архіваўтваральнікам.*

Літ.: Караськ Н. Личный фонд профессора Бржеского // Архівы і справаводства. – 2003. – № 3. – С. 86–87.

ДА Гродзенскай вобл. Ф. 260. 350 ад.зах. за 1925–1983. Калекцыя дакументаў аб увекавечванні памяці медыцынскіх работнікаў (ліставанне, біяграфічныя даведкі з розных устаноў, матэрыялы аб працы асобных урачоў), біяграфічныя і творчыя (дысертацыя) дакументы.

БРОЎКА Пятрусь (Пётр Усцінавіч) (25.06.1905, в. Пуцілкавічы, Ушацкі р-н, Віцебская вобл. – 24.03.1980), пісьменнік.

Дзяржаўны літаратурны музей П. Броўкі. Больш за 20 тыс адз. зах. за 1926–1980 гг. біяграфічныя дакументы, дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, успаміны, фотаздымкі, аудыё і відэадакументы, што адносяцца да дзейнасці П. Броўкі.

НМГКБ. КП 10651 (1–21) за 1955–1963. Рукапісы, фотаздымкі, кнігі.

БРУЕВІЧ Максім Пятровіч, удзельнік вайны 1918–1921 гг.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. Адз. зах. 104. Успаміны.

БРЫЛЬ Янка (Іван Антонавіч) (22.07.1917, г. Адэса, Украіна – 25.07.2006), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1996 г. Фонд быў закрыты для карыстальнікаў да 2011 года. У АРКР ЦНБ НАН Беларусі дакументы пачалі паступаць у 1975 г. потым у 1980, 1983, 1988, 1991, 1996–2000 гг. Ад Я. Брыля былі атрыманыя таксама дакументы асабістых архіваў Ю. І. Сергіевіча і журналіста Я. Г. Місько , якія апрацаваны асобна.*

БДАМЛМ. Ф. 59. Воп. 1–3. 1021 адз. зах. за 1932–2004 гг. Дакументы творчай і грамадска-палітычнай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, нататнікі, успаміны, фотаздымкі, ліставанне, 26 прадметаў, кнігі з дароўнымі надпісамі.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 10. Воп. 1–2. 2304 адз. зах. за 1893–2001. Творчыя матэрыялы (рукапісныя і машынапісныя творы), ліставанне з рознымі асобамі і арганізацыямі, фотаздымкі, ілюстрацыйныя матэрыялы, матэрыялы аб архіваўтваральніку (водгукі, рэцэнзіі на творы), сабраныя дакументы розных асоб, матэрыялы членаў сям'і.

НДАК НББ. Ф. 2. Воп. 1. Адз. зах. 10 за 1950. Аўтограф артыкула.

БРЭГМАН Авель Пінхусавіч (12.04.1906, в. Людзеневічы, Жыткавіцкі р-н, Гомельская вобл. – 30.05.1958), архітэктар, педагог.

*Дакументы ў БДАНТД паступілі ад сына. Апрацаваны ў 1990 г.*

БДАНТД. Ф. 110. 22 адз. зах. за 1937–1958. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі будынкаў па праектах архітэктара.

БРЭЖГА Баляслаў (31.01.1887, в. Айзупіша, Рэжыцкі пав., Віцебская губ., цяпер Латвія – 30.07.1957), гісторык.

*Асабісты архіў загінуў падчас бамбардзіроўкі Клайпеды ў 1944 г.*

АР ЦБАН. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 41–43, 49 за 1910–1917.

Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Латвійскай Нацыянальнай бібліятэкі (Рыга). Ф. 3. 177 адз. зах. за канец XVIII ст. – 1950-я гг.

Дзяржаўны гістарычны архіў Латвіі (Рыга). Ф. 6984. 86 адз. зах. за 1473–1841.

ДА Віцебскай вобласці. Ф. 289 (фонд Віцебскага архіва). Воп. 1. Адз. зах. 1, 23, 49. Дакументы дзейнасці.

Інстытут рускай літаратуры РАН (Пушкінскі дом). Ф. 532. Воп. 9. Адз. зах. 257.

Латгальскі культурна-гістарычны музей у Рэзекене (Латвія). 401 адз. зах. Біяграфічныя дакументы, дакументы дзейнасці.

БРЭНШТЭЙН Міхаіл (02.10.1874, г. Цяльшай, Літва – 29.03.1938), гісторык, бібліёграф.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава). Біяграфічныя дакументы, дзённікі, творы, ліставанне, сямейныя дакументы.

ЦБАН Літвы, Ф. 84. 34 адз. зах. за 1897–1935.

ДГАЛ. Ф. 1135 (Таварыства прыяцеляў навук у Вільні). Воп. 1. 221 адз. зах. за 1507–1939.

БУЙЛО Канстанцыя (сапр. Калечыц Канстанцыя Антонаўна) (17.01.1893, г. Вільня, Літва – 04.06.1986), паэтка.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1990 г. У ДМГБЛ – ад сына Я. В. Калечыца ў 1992 г.*

БДАМЛМ. Ф. 263. 174 адз. зах. за 1898–1990. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, рэчавыя.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 51. Рукапісы вершаў.

ДМГБЛ. КП 10390–10476, 10173–10309. Дакументы біяграфічныя, фотаздымкі, ліставанне.

БУЙНЕВІЧ Павел Мікалаевіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. Адз. зах. 24–27 за 1944–1969. Успаміны аб баях за вызваленне Веткаўскага раёна, лісты ўдзельнікаў ваенных дзеянняў.

БУЛАХАЎ Дзяніс Рыгоравіч (1905–1984), маляр, грамадскі дзеяч, ганаровы грамадзянін г. Мінска.

НМГКБ. КП 20820–20834, 16264 (1–15) за 1951–1964. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

БУЛАЦКІ Рыгор Васільевіч (05.05.1921, в. Мачулкі, Бабруйскі р-н, Магілёўская вобл. – 08.02.1999), гісторык, удзельнік Другой сусветнай вайны.

*Дакументы ў НАРБ паступілі ад жонкі Г. Н. Булацкай, апрацаваны ў 2005 г.*

НАРБ. Ф. 1433. Воп. 1. 121 адз. зах. за 1901–1996. Біяграфічныя дакументы (біяграфічная даведка, характарыстыкі, працоўная кніжка, дыпломы, дакументы аб архіваўтваральніку ды інш.), ліставанне (лісты франтавых сяброў, рэдакцый часопісаў і газет), дакументы навуковай дзейнасці (дысертацыя, кнігі, манагарфіі, брашуры, лекцыі, даклады), фотаздымкі (індывідуальныя з роднымі, на адпачынку, з аднапалчанамі, са студэнтамі і выкладчыкамі), сабраныя дакументы (дакументы аб жыцці і дзейнасці П.Н. Лепяшынскага, дакументы родных, газеты, улёткі і г. д.)

БУЛГАК Ян (06.10.1876, в. Асташына, Навагрудскі р-н, Гродзенская вобл. – 04.02.1950), фатограф, этнограф, фалькларыст.

*Фататэка і калекцыя здымкаў загінула ў 1944.*

Аддзел рукапісаў бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта. Каталог набыткаў (1911), «Успаміны дзяцінства, праведзенага на Навагрудчыне (І880–1887)» (1940).

БУЛЬБА-ПАПКОЎ Васіль Сяргеевіч (н. 1893), удзельнік рэвалюцый 1917 г.

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1244 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 4. 1 адз. зах. за 1963. Успаміны.

БУМАЖКОЎ Ціхан Піменавіч (30.06.1910, пас. Свіягіна, Спаскі р-н, Прыморскі край, Расія – 01.12.1941), адзін з арганізатараў партызанскага руху ў Беларусі.

БДМГВАВ. КП 13644–13648; 16482–16488. Біяграфічныя дакументы, лісты, фотаздымкі.

БУРАКОЎ Якаў Георгіевіч (27.12.1911, ст. Луша, Эстонія – 10.02.1987), акцёр, дзеяч культуры.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад утваральніка і А.Ф. Мельдзюковай (жонкі). Апрацаваны ў 1982 г, у ДА Віцебскай вобл. – у 1998 г. ад суседкі актрысы.*

БДАМЛМ. Ф. 261 (сямейны). 55 адз. зах. 1929–1982. Дакументы творчай, службовай, грамадскай дзейнасці (фотаздымкі са спектакляў), біяграфічныя дакументы (асабістыя дакументы, дакументы аб утваральніку), фотаздымкі індывідуальныя і ў групах, сабраныя дакументы.

ДА Віцебскай вобл. Ф. 2266 (сямейны). Воп. 1. Адз.зах 1–42 за 1912–1995. Дакументы дзейнасці (фотаздымкі ў ролях), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

БУРБІС Алесь (Аляксандр Лаўрэнавіч) (08.10.1885, г. Вільня, Літва – 20.03.1922), грамадска-палітычная дзейнасць.

*У 1925 годзе архіў захоўваўся ў бібліятэцы Інбелкульта. Страчаны.*

БЫКАЎ Васіль Уладзіміравіч (19.06.1921, в. Бычкі, Ушацкі р-н, Віцебская вобл. – 22.06.2003), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка, апрацаваны ў 1971 г., у ДМГБЛ у 1996 г. дакументы перададзены ў дар утваральнікам, захавалася аўтарская сістэматызацыя.*

Літ.: Ціханавецкая В.А. Васіль Быкаў – асоба і час (матэрыялы асабістага архіва, перададзеныя ў Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры) // Архіўныя чытанні I–III: Матэрыялы навук. канф., Мінск, 2003–2005 гг. – Вып. 1. – Мінск: РІВШ, 2006. – С. 120–123.

БДАМЛМ. Ф. 165. Воп. 1–2. 140 адз. зах. за 1930–1986. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, ліставанне.

ДМГБЛ. КП 12461–12535, 17235–17247. Асабістыя дакументы, рукапісы твораў, ліставанне, фотаздымкі.

БЫЛІНА Янка (сапр. Ян Семашкевіч) (30.10.1883, в. Лакцяны, Свянцянскі р-н, Віцебская вобл. – 18.02.1956), паэт, каталіцкі святар.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 46–47 за 1918–1934. Вершы, лісты.

БЫЛІЧ Канстанцін Фёдаравіч (20.10.1906, г. Івангорад, Кінгісепцкі р-н, Ленінградская вобл., Расія – 24.10.1944), акцёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад сястры. Апрацаваны ў 1997 г. У ДМГТМК перададзены ў 1992 г.*

БДАМЛМ. Ф. 331. 14 адз. зах. за 1915–1944. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы.

ДМГТМК. КП 207 (1–35) ды інш. Эскізы, малюнкі, партрэты (больш 150), фотаздымкі.

БЫЧКОЎСКАЯ Зінаіда Міхайлаўна (н. 15.01.1941, в. Калачы, Лагойскі р-н, Мінская вобл.), працаўнік Камвольнага камбіната.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 7. Адз. зах. 1–8 за 1972–1983. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыка, грамата, віншаванні), артыкулы, фотаздымкі.

БЭНДЭ Лука Апанасавіч (01.11.1903, в. Шчакоцк, Іванаўскі р-н, Брэсцкая вобл. – 23.12.1961), літаратуразнаўца, публіцыст.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1975 г.*

БДАМЛМ. Ф. 66. 1501 адз. зах. за 1833–1961. Дакументы творчай дзейнасці (манаграфіі, артыкулы, рэцэнзіі ды інш.), біяграфічныя дакументы, нататнікі, ліставанне, фотаздымкі сабраныя дакументы (розных асоб: Э. Агняцвет, З. Астапенкі, П. Броўкі, М. Гарэцкага ды інш.)

БЯГАНСКАЯ Ядвіга Іосіфаўна (29.02.1908, г. Улан-Удэ, Бурацiя – 03.04.1992), празаік, перакладчык.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ў 1999 г. ад Я. М. Бяганскага (сына). Апрацаваны ў 2008 г.*

БДАМЛМ. Ф. 436. 43 адз. зах. за 1906–1991. Дакументы творчай дзейнасці (аповесці, апавяданні, п’есы ды інш.), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі індывідуальныя, з роднымі.

БЯДУЛЯ Змітрок (сапр. Плаўнік Самуіл Яфімавіч) (23.04.1886, в. Пасадзец, Лагойскі р-н, Мінская вобл. – 03.11.1941), пісьменнік.

*Перадаў некалькі сваіх рукапісаў у Белдзяржбібліятэку ў 1940–1941 гг. У БДАМЛМ дакументы перададзены пісьменнікам у 1977 г. У ДМГБЛ дакументы паступілі ад Р. У. Маслоўскай у 1991 г.*

Літ.: Кекелева Т. Агляд дакументаў Змітрака Бядулі з фондаў БДАМЛМ // Пра час «Узвышша»: Матэрыялы Ўзвышаўскіх чытанняў (Мінск, 2005–2006). – Вып. 3. – Мінск: РІВШ, 2007. – С. 212–221.

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз.зах 15–19 за 1990–1991. Вершы, апавяданні, артыкулы, лісты, успаміны, нататкі і ўспаміны пра З. Бядулю, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

НДАК НББ. Ф. 2. (Збор матэрыялаў дзеячаў навукі і культуры Беларусі). Воп. 1. Адз. зах. 11–12. Рукапіс паэмы.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 41–43 за 1910–1917. Рукапісы твораў, лісты ў рэдакцыю «Нашай Нівы».

ДМГБЛ. КП 7640–7647. Паштоўкі і лісты.

БЯЛЕВІЧ Антон Пятровіч (14.05.1914, в. Дуброўка, Уздзенскі р-н, Мінская вобл. –11.04.1978), паэт.

*Дакументы паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1993 г.*

БДАМЛМ. Ф. 330. 138 адз. зах. за 1940–1988 гг. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

БЯЛІНСКАЯ Марыя Сяргееўна (22.07.1906, г. Магілёў – 03.05.1990), актрыса.

*У ДА Віцебскай вобл. дакументы паступілі ад дачкі актрысы ў 1996 г. У 1997 да гэтых дакументаў далучаны дакументы яе мужа І. Л. Дорскага, сфарміраваны сямейны фонд.*

БДАМЛМ. Ф. 286 (неап.).

ДА Віцебскай вобл. Ф. 8 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 1–68 за 1924–1990. Дакументы творчай дзейнасці (тэксты роляў, фотаздымкі ў ролях, рэцэнзіі на спектаклі ды інш.), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, партрэт.

БЯЛІНСКІ Юзэф (1848–1926), гісторык, бібліёграф.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 82. 148 адз. зах. за 1879–1911.

БЯЛОЎ Іван Цімафеевіч (22.06.1917, г. Ніжні Ноўгарад), удзельнік Другой сусветнай вайны, будаўнік.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. І ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 25. Адз. зах. 1–7 за 1944–1977. Біяграфія, баявая характарыстыка, выдадзеная камандзірам партызанскага злучэння З. В. Каржом 23 жніўня 1944 г., пасведчанні, граматы, фотаздымкі індывідуальныя ў групах, з сям’ёй.

БЯЛЫНІЦКІ-БІРУЛЯ Вітольд Каэтанавіч (29.02.1872, в. Крынка, Бялыніцкі р-н, Магілёўская вобл. – 18.06.1957), мастак.

*Частка архіва, што ўтрымлівае ўнікальныя неапублікаваныя ўспаміны з пачатку XX ст. «Удомля і мастакі», «Нататкі мастака», захоўваецца ў Архіве НММ, і філіяле НММ Мемарыяльным музеі Бялыніцкага-Бірулі. Дакументы былі перададзены з асабістага архіва А. В. Аладавай. Бялыніцкі раённы мастацкі музей імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі створаны ў 1970 г.*

Архіў НММ. Ф. 3 (Калекцыя дакументальных матэрыялаў навуковых супрацоўнікаў НММ Рэспублікі Беларусь). Воп. 12. 305 адз. зах. за 1885–1997. Успаміны, ліставанне (рукапісы і копіі), матэрыялы да біяграфіі, выяўленчыя (фотарэпрадукцыі твораў, індывідуальныя, сямейныя 1898–1953), дакументы аб святкаванні юбілеяў, адкрыцці мемарыяльнага музея ў Магілёве.

Бялыніцкі раённы мастацкі музей імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі. Мастацкія творы, ліставанне, фотаздымкі.

РДАЛМ. Ф. 1938. Воп. 1. Адз.зах 10. Дакументы да біяграфіі, часткі ліставання; Ф. 2518 (фонд А. П. Глобы). Воп. 1. Адз. зах. 87. Ліставанне, віншаванні.

БЯЛЬЗАЦКІ Юрый Давыдавіч (31.12.1909, г. Варшава, Польшча – 02.09.1963), кампазітар.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1964 г.*

БДАМЛМ. Ф. 67. 96 адз. зах. за 1939–1963. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

БЯЛЬКЕВІЧ Іван Кандратавіч (06.03.1883, в. Варонічы, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл. – 18.10.1960), мовазнавец.

*Дакументы перададзеныя ў АРКР ЦНБ у лютым 1981 г. Інстытутам мовазнаўства АН БССР. Апрацаваны ў 1984 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 38. 44 адз. зах. за 1926–1983. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы (артыкулы розных асоб, біяграфія, успаміны жонкі аб ім) сабраныя дакументы (дакументы жонкі, пералік карэспандэнтаў ды інш.)

БЯЛЯЕЎ Аляксей Мікалаевіч (н. 16.08.1928, в. Абдуліна, Арэнбурская вобл., Расія), акцёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка.*

БДАМЛМ. Ф. 376 (Збор дакументаў дзеячаў тэатра і кіно). Воп. 1. 47 адз. зах. за 1936–1971. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

БЯЛЯЎСКІ Павел Пятровіч (н. 27.10.1921, в. Перапечына, Полацкі р-н, Віцебская вобл.), грамадскі дзеяч, Старшыня савета па кінематаграфіі пры СМ БССР, журналіст.

*Дакументы у ДА Віцебскай вобл. перададзены ўтваральнікам, апрацаваны ў 1998 г.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 2287. 85 адз. зах. за 1943–1996. Дакументы творчай і службовай дзейнасці (нарысы ды інш.), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя спісы падпольных арганізацый, партыйных працаўнікоў, партызан Віцебскай вобл.

БЯРОЗА (сапр. Рабкін) Аляксандр Якаўлевіч (29.08.1917, в. Алексіна, Кальчугінскі р-н, Уладзімірская вобл., Расія – 02.08.1994), паэт, удзельнік Другой сусветнай вайны.

*Дакументы ў ДА Віцебскай вобл., перададзены жонкай З. І. Рабкінай у 1997.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 1073. 167 адз. зах. за 1935–1994. Дакументы творчай дзейнасці (зборнікі вершаў, артыкулы, нататкі ды інш.), ліставанне, біяграфічныя дакументы, партрэты, фотаздымкі, сабраныя дакументы аб дзеячах Віцебшчыны.

БЯРОЗКІН Рыгор Саламонавіч (03.07.1918, г. Магілёў – 01.12.1981), крытык.

*Дакументы паступілі ад Ю. М. Канэ (жонкі). Апрацаваны ў 1994 г.*

БДАМЛМ. Ф. 24 (сямейны). 56 адз. зах. 1928–1991. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, кнігі.

# В

ВАГНЕР Генрых Матусавіч (02.07.1922, г. Жырардаў, Польшча – 15.07.2000), кампазітар.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ў 1981 г ад самога ўтваральніка.*

БДАМЛМ. Ф. 255. 160 адз. зах. за 1926–1981. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДМГТМК. КП 259, 266 (1–11), 730 (1–5) ды інш. Нотныя рукапісы, аўтографы, біяграфічныя дакументы.

ВАДАНОСАЎ Мікалай Міхайлавіч (04.01.1923, г. Мінск – 10.04.2006), пісьменнік.

*Дакументы перададзены ў БДАМЛМ архіваўтваральнікам у 1977 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 20–25. за 1924–1970. Ліст. І.П. Шамякіна, фотаздымкі.

ВАЙЦОЎ Мацвей Васільевіч, удзельнік стварэння Гомельскага ўмацаванага раёна.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3531 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). 1 адз. зах. Успаміны аб стварэнні і дзейнасці Гомельскага ўмацаванага раёна.

ВАЛАДЗЬКО Іван Іосіфавіч (14.03.1895, в. Плебанцы, Мінскі р-н – 24.03.1984), архітэктар.

*Дакументы ў БДАНТД паступілі ад дачкі. Апрацаваны ў 1989 г.*

БДАНДТ. Ф. 105. 70 адз. зах. за 1913–1983. Дакументы творчай і службовай дзейнасці (праекты, артыкулы, справаздачы), фотаздымкі.

ВАЛАСЕВІЧ Эдуард Станіслававіч (03.03.1918, г. Магілёў – 02.09.1997), паэт, байкапісец.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1973 г.*

БДАМЛМ. Ф. 178. 33 адз. зах. за 1951–1972. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне

ВАЛЕНЦІК Дзмітрый Данілавіч (1907–1969), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Рэчыцы. Ф. 35. 41 адз. зах. за 1929–1984. Біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

ВАЛІЦКІ Аляксандр (08.02.1826, г. Вільня, Літва – 01.06.1893), літаратар, музыкальны крытык, архівіст*.

---

* У складзе фонда Радзівілаў у ДАСА (Варшава) захоўваецца афіцыйнае ліставанне і іншыя службовыя дакументы нясвіжскіх архівістаў Аляксандра Гафаукса за 1734–1763, Ануфрыя Ёдкі за 1806–1810, Антонія Калакуцкага за 1760–1781, Каэтана

*Дакументы набытыя Аддзелам рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве ў 1949 г. у М. Карповіч.*

Літ.: Латушкін А. М. Архівісты Нясвіжскага архіва Радзівілаў. Літары «В», «Г». // Архіварыус, 2009. – Вып. 7. – С. 302–310; Латушкін А. М. Аляксандр Валіцкі як архівіст Нясвіжскага архіва Радзівілаў // Актуальныя праблемы паланістыкі 2009 / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; рэд. С. Важнік, А. Кожынава. – Мінск: Права і эканоміка, 2009. – С. 199–212.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава). № 2974–2981. Карэспандэнцыя за 1844–1893, ад В. Каратынскага, С. Манюшкі, А. Адынца, А. Прахазкі, сям'і Радзівілаў.

НГАБ. Ф. 139 (фонд Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу). Воп. 1. Адз. зах. 32а; Воп. 2. Адз. зах. 408, 422. Дакументы аб доказе шляхецкага паходжання роду Валіцкіх; Ф. 694 (фонд Радзівілы, князі). Воп. 1. Адз. зах. 411. Матэрыялы аб дзейнасці ў якасці архівіста Нясвіжскага архіва.

ВАЛКАДАЕЎ Пётр Іванавіч (09.11.1911, в. Кажэмякі, Бугурусланскі р-н, Самарская вобл., Расія – 04.11.1973), пісьменнік, журналіст.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1977 г.*

БДАМЛМ. Ф. 74. 397 адз. зах. за 1930–1973. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, нататнікі, ліставанне, фотаздымкі, калекцыя, рэчы (медаль, ордэн, гальштук), кнігі з дароўнымі надпісамі.

ВАЛЧАНЕЦКАЯ Валянціна Фёдараўна (27.11.1898, г. Ніжні Ноўгарад, Расія – 05.05.1980), актрыса.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1971 г.*

БДАМЛМ. Ф. 110. 29 адз. зах. за 1945–1964. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ВАРАБ'ЕВА Тамара Анатольеўна (17.11.1932, ст. Аджы-Кабул, Зубаўскі р-н, Азербайджан – 26.01.1999), архівіст, супрацоўнік ГАУ БССР.

*Дакументы перададзены ў НАРБ мужам у складзе сямейнага фонду ў 2004 г.*

НАРБ. Ф. 1457 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 73–91 за 1932–2002. Біяграфічныя дакументы (пасведчанні, асабістая справа), дакументы дзейнасці (выступленні, артыкулы).

ВАРАБЕЙ Пётр Васільевіч (н. 01.03.1923, в. Калодзежы, Чэрвенскі р-н, Мінская вобл.), працаўнік прамысловасці (леспрамгас), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 30. 9 адз. зах. за 1946–1958. Біяграфічныя даку-

---

Квяткоўскага (1769–1852) за 1806–1810, Францішка Асіповіча за 1794–1810, А. Попеля за 1795–1798, Юзэфа Вэсэла за 1739–1782, Тадэвуша Дубіцкага за 1810–1824, Адама і Францішка Бернатовічаў за 1785–1792, Б. Туган-Таўрагінскага (1904–1974).

менты (аўтабіяграфія, характарыстыкі, граматы, пасведчанні), тэксты выступленняў, фотаздымкі.

ВАРАБ'ЕЎ Аляксандр Васільевіч (21.02.1930, в. Дубно, Тульская вобл., Расія – 07.06.2006), архівіст, дырэктар ЦДАНТД у 1968–1988 гг.

*Дакументы ў НАРБ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 2005 г.*

НАРБ. Ф. 1457 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 1–82, 92–95 за 1918–2006. Біяграфічныя (пасведчанні, гарматы ды інш.), ліставанне (лісты розных асоб) і дароўныя надпісы, дакументы дзейнасці (даклады, артыкулы), сабраныя дакументы (выпісы, дакументы родных), фотаздымкі.

ВАРАКСІН Мікалай Уладзіміравіч (н. 07.03.1933, г. Санкт-Пецярбург, Расія), гісторык архітэктуры.

*Дакументы ў БДАНТД перададзены ўтваральнікам. Апрацаваны ў 1997 г.*

БДАНТД. Ф. 170 (сямейны). 269 адз. зах. за 1928–1996. Дакументы навуковай дзейнасці (артыкулы, дысертацыя), ліставанне, фотаздымкі

ВАРАКСІН Уладзімір Мікалаевіч (05.07.1901, г. Омск, Расія – 02.01.1980), архітэктар.

*Дакументы ў БДАНТД перададзены сынам утваральніка. Апрацаваны ў 1997 г.*

БДАНТД. Ф. 170 (сямейны). 269 адз. зах. за 1928–1996. Дакументы творчай дзейнасці (фотаздымкі будынкаў, артыкулы), біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

ВАРАНЕЦКІ Андрэй Максімавіч (09.02.1920, в. Дуброўка, Гродзенская вобл. – 14.01.1972), дырэктар калгаса «Гвардыя» Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл., удзельнік Другой сусветнай вайны.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. КП 27673(1–26) за 1958–1971. Біяграфічныя дакументы.

ВАРАНІШЧА Фадзей Канстанцінавіч (н. 1907, в. Клідзянеты, Гродзенская вобл.), удзельнік грамадзянскай вайны ў Іспаніі, руху супраціву ў Францыі.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. КП 26310 (1–21) за 1935–1945. Біяграфічныя дакументы.

ВАРОНКА Язэп (04.04.1891, Саколкскі пав., Польшча – 04.06.1952), грамадска-палітычны дзеяч.

*Часткі асабістага архіва захоўваюцца ў фондах арганізацый. Я. Варонка захоўваў у сябе архіў Народнага сакратарыята і рады БНР, які разам з асабістым архівам быў перададзены В. Ластоўскаму. Потым адна частка трапіла ў Беларускі замежны архіў (страчана), частка ў фонд БНР у НАРБ.*

АР ЦБАН, Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 732–735 за 1919–1921.

ДГАЛ. Ф. 582. Воп. 1. Адз. зах. 2.

ВАСІЛЕВІЧ Алена Сямёнаўна (н. 22.12.1922, в. Ліпнікі, Слуцкі р-н, Мінская вобл.), пісьменніца.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1975 г.*

БДАМЛМ. Ф. 204. Воп. 1. 28 адз. зах. за 1962–1974. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне.

ВАСІЛЕВІЧ Іван Антонавіч (1894, в. Будслаў, Мядзельскі р-н, Мінская вобл. – 24.11.1937), партыйны і дзяржаўны дзеяч, сакратар ЦК КП(б)Б.

*У складзе партыйнага захавалася частка службовага архіва, што засталася на працоўным стале пасля яго смерці.*

НАРБ. Ф. 4 (фонд КП(б)Б). Воп. 21. Адз. зах. 169 за 1928–1930. Службовыя дакументы: пратаколы пасяджэнняў, артыкулы аб КПЗБ, лісты ад розных асоб (некаторыя з іх з асабістымі зваротамі, але па службовых пытаннях).

ВАСІЛЕВІЧ Мікалай Ілліч (н. 1939), працаўнік сельскай гаспадаркі, член-карэспандэнт Беларускай інжынерна-тэхналагічнай акадэміі.

ЗДА ў г. Слуцку. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчынай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 1. Адз. зах. 6–9 за 1964–2006. Дакументы да біяграфіі, артыкулы, ліставанне, фотаздымкі.

ВАСІЛЁК Міхась (сапр. Касцевіч Міхаіл Восіпавіч) (14.11.1905, в. Баброўня, Гродзенскі р-н – 03.09.1960), паэт.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад жонкі. У перадачы дакументаў і ў паседжанні экспертнай камісіі, што вырашала пытанне аб прыёме дакументаў удзельнічаў В. Быкаў.*

БДАМЛМ. Ф. 2. 54 адз. зах. за 1921–1960. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, кнігі з дароўнымі надпісамі.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 717, 718 за 1926–1936. Вершы, лісты.

ВАСІЛЁНАК Яўген Пятровіч (26.12.1917, г. Орша, Віцебская вобл. – 24.09.1973), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ і АРКР ЦНБ НАН Беларусі паступілі ад жонкі І. Ф. Пакуль, апрацаваны ў 1978–1979 гг.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 8. 115 адз. зах. за 1934–1973. Біяграфічныя дакументы, творчыя дакументы (вершы, п’есы, рэцэнзіі) і дакументы службовай дзейнасці, ліставанне з пісьменнікамі, дзеячамі навукі і культуры, фотаздымкі.

БДАМЛМ. Ф. 216. 43 адз. зах. 1936–1972. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, калекцыя, рэчы (медалі, значкі).

ВАСІЛЕЎСКАЯ Аляксандра Вітальеўна (20.02.1894–16.10.1963), мастацтвазнаўца, супрацоўнік НММ.

*Дакументы паступілі ў 1960 г.*

Архіў НММ. Ф. 2 (Калекцыя дакументальных матэрыялаў навуковых супрацоўнікаў НММ Рэспублікі Беларусь). Воп. 2. 43 адз. зах. за 1946–1960. Дакументы службовай дзейнасці, матэрыялы да біяграфіі, сабраныя дакументы.

ВАСІЛЕЎСКІ Іосіф Іосіфавіч (08.12.1911, г. Данецк, Украіна – 20.04.1994), паэт, перакладчык, акцёр.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад самога паэта ў 1988 г. Апрацаваны ў 2007 г.*

БДАМЛМ. Ф. 413. 50 адз. зах. за 1923–1987. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ВАСІЛЬЕЎ Іван Рыгоравіч (19.01.1916, в. Вялікі Толкіш, Чыстопальскі р-н, Татарстан – 2004), удзельнік Другой сусветнай вайны, супрацоўнік і дырэктар архіва ў г. Пінску ў 1965–1986 гг.

ЗДА ў г. Пінск. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 22. 7 адз. зах. за 1935–1997. Дакументы да біяграфіі, артыкулы ўтваральніка і аб утваральніку ў газетах, фотаздымкі індывідуальныя, з сям’ёй і сябрамі, віншаванні.

ВАСІЛЬЕЎ Рыгор Арцем’евіч (05.12.1885, г. Жлобін, Гомельская вобл. – 25.12.1978), партыйны дзеяч, чыгуначнік.

ЗДА ў г. Жлобіне. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры). Воп. 5. 5 адз. зах. за 1968–1974. Аўтабіяграфія, ліставанне з партыйнымі арганізацыямі.

ВАСІЛЮЧАК Міхаіл Вікенцьевіч (н. 23.09.1933, в. Малыя Князікаўцы, Іўеўскі р-н, Гродзенская вобл.), гісторык, выкладчык ГрДУ.

*Дакументы перададзены самім утваральнікам у 2005 г.*

ДА Гродзенскай вобл. Ф. 239 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 13. 49 адз. зах. за 1950–2004. Дакументы навуковай і выкладчыцкай дзейнасці, біяграфічныя дакументы.

ВАСЬКІН Павел Арцёмавіч (н. 22.01.1925, в. Чырвоная Ея, Кубанскі край, Расія), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 19. 1 адз. зах. за 1945–2001. Успаміны, фотаздымкі, копія дыплома.

ВАТАЦЫ Ніна Барысаўна (14.05.1908, г. Цэсіс, Латвія – 03.08.1997), бібліёграф, даследчык творчасці М. Багдановіча.

*У 2000 г. у НДАК НББ паступілі дакументы, што засталіся пасля смерці Н. Ватацы. Рукапісная частка фонду малакольканая.*

Літ.: Белы А. В. Агляд фонду асабістага паходжання Ватацы Н. Б. // Здабыткі: дакумент. Помнікі на Беларусі / Нац. бібл. Беларусі; склад. Л. Г. Кірухіна, Т. І. Рошчына.– Мінск, 2007. – Вып. 9. – С. 172–175.

НДАК НББ. Ф. 2. Воп. 1. Адз. зах. 55–56 за 1956–1977. Лісты ад М. Лынькова і М. Улашчыка; асабісты фонд неапрацаваны. Каля 1000 адз. зах. Артыкулы і прадмовы ў энцыклапедыі, газеты, часопісы, якія прысвечаны Максіму Багдановічу, ліставанне, дакументы да біяграфіі, фотаздымкі.

ВАШЧАК Яраслаў Антонавіч (19.02.1921, г. Броды, Украіна – 02.03.1989), дырыжор.

*Дакументы паступілі ў ДМГТМК у 1992 г.*

БДАМЛМ. Ф. 375 (неап.) (Калекцыя дакументаў кампазітараў, музыказнаўцаў, выканаўцаў).

ДМГТМК. КП 236 (1–52), 288 (7–31). Біяграфічныя дакументы, дакументы службовай дзейнасці, фотаздымкі.

ВЕЛІКАНАЎ Мікалай Якаўлевіч (н. 25.10.1927), мастак экслібрыса.

*Дакументы паступілі ў архіў у 1996 г.*

ДАГА Магілёўскай вобл. Ф. 64. 21 адз. зах. за 1963–1992. Біяграфічныя дакументы, дакументы дзейнасці.

ВЕРАС Зоська (сапр. Сівіцкая Людвіка Антонаўна) (30.09.1892, г. п. Мяджыбаж, Лятычаўскі р-н, Жытомірская вобл., Украіна – 08.10.1991), пісьменніца.

*Дакументы паступалі ў БДАМЛМ на працягу 1987–1989 гг. ад самой пісьменніцы. Апрацаваны ў 1992 г. У ДМГБЛ паступілі ў 1989 г. ад архіваўтваральніка і А. І. Мальдзіса.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23 (Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры, літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 629–635 за 1916–1984. Творчыя дакументы, фотаздымкі, сабраныя матэрыялы.

БДАМЛМ. Ф. 318. 203 адз. зах. за 1908–1989. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, калекцыя.

ДМГБЛ. КП 4244–4555, 12412 (1–104). Ліставанне.

ВЕРХАСЬ Уладзімір Паўлавіч (н. 02.07.1928, г. Жытомір, Украіна), грамадска-палітычны дзеяч, гісторык.

*Дакументы паступілі ў ДАГА ад самога ўтваральніка ў 2004 г*

ДАГА Гродзенскай вобл. Ф. 44. Воп. 1. 77 адз. зах. за 1941–2003. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфіі, характарыстыкі, мандаты), творчыя дакументы (артыкулы аб удзельніках вайны, лекцыі, рэцэнзіі), дакументы службовай дзейнасці (дамовы, ліставанне), ліставанне, сабраныя дакументы ўдзельнікаў Другой сусветнай вайны і аб іх, фотаздымкі.

ВЕСНІНА Лізавета (Ядзіткіна Лізавета Саламонаўна) (н. 28.10.1917, г. Сухумі, Грузія), актрыса.

БДАМЛМ. Ф. 352 (сямейны) (неап.).

ВЕТРАЎ Іван Дзмітрыевіч (26.09.1905, м. Самацевічы, Магілёўская вобл. – 10.02.1986), грамадска-палітычны дзеяч, міністр юстыцыі, пракурор БССР, удзельнік Другой сусветнай вайны.

*Асабісты архіў Ветрава быў перададзены ў ЦДАКР у 1987 г. з архіва Інстытута гісторыі партыі ў россыпе. Апрацаваны ў 1989 г.*

НАРБ. Ф. 581. 364 адз. зах. за 1938–1983. Біяграфічныя дакументы, ліставанне (з установамі, з саслужбоўцамі), дакументы творчай і службовай дзейнасці, дзённікі 1941–1944, успаміны былых партызан і падпольшчыкаў, фотаздымкі індывідуальныя, эпізодаў партызанскага жыцця.

ВЕЧАР Аляксандр Сцяпанавіч (25.03.1905, в. Машчыцы, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 04.04.1985), біяхімік, паэт.

*Асабісты архіў перададзены ў АРКР ЦНБ НАН Беларусі ўдавой А.А. Грыцкевіч у 1986 г. Апрацаваны ў 2004 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 48. 3535 адз. зах. за 1910–1985. Творчыя і дакументы службовай дзейнасці, ліставанне, сабраныя дакументы.

ВІГУРА Яўгенія Іванаўна (н. 1905), заслужаны настаўнік БССР.

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1244 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 9. 1 адз. зах. за 1865–1965. Успаміны.

ВІЖ Мар`ян (Зайцаў Мар`ян Міхайлавіч) (23.02.1949, г. Мінск – 30.04.1999), пісьменнік, гісторык.

*Дакументы перададзены ў БДАМЛМ у красавіку 2000 жонкай Г.В. Зайцавай. Апрацаваны ў 2008.*

БДАМЛМ. Ф. 440. 112 адз. зах. за 1971–1999. Дакументы творчай дзейнасці (раманы, аповесці, п’есы, апавяданні і г. д.), дакументы да біяграфіі, ліставанне, фотаздымкі.

ВІЛЬЧЫНСКІ Іван Сцяпанавіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 6. 22 адз. зах. за 1962–1995. Дзённік-успаміны аб ваенных гадах, ліставанне.

ВІНАГРАДАЎ Віктар Ніканавіч (н. 03.11.1933, в. Замасточча, Гарадоцкі р-н, Віцебская вобл.), рэктар Віцебскага ўніверсітэта (1978–1997 гг.), доктар педагагічных навук.

*Дакументы у архіў перададзены ўтваральнікам у 2000 г.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 982. 54 адз. зах. за 1948–1997. Дакументы дзейнасці (падручнікі па чарчэнні і геаметрыі, альбом з малюнкамі), дакументы службовай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, дакументы родных, кнігі.

ВІНАГРАДАЎ Гаўрыіл Лявонцьевіч (23.07.1889, в. Багушэвічы, Бярэзінскі р-н, Мінская вобл.), удзельнік Першай сусветнай вайны.

*Успаміны дасланыя ў архіў у канцы 1984 г. Апрацаваны ў 1986 г.*

НАРБ. Ф. 357 (Калекцыя дакументаў ветэранаў партыі і ўдзельнікаў грамадзянскай вайны). Воп. 1. Адз. зах. 1–3 за 1955–1985. Дакумен-

ты грамадскай дзейнасці (аб супрацоўніцтве з рэдакцыямі газет ды інш.), біяграфічныя дакументы, успаміны.

ВІНАР Мікалай Андрэевіч (1912, в. Заполле, Навагрудскі р-н, Гродзенская вобл. – 1977), краязнаўца, настаўнік, загадчык Любчанскага краязнаўчага музея.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23 (Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры, літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 644–702 за 1938–1979. Дакументы навуковай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

ВІТКА Васіль (сапр. Крысько Цімох Васільевіч) (03.05.1911, в. Еўлічы, Слуцкі р-н, Мінская вобл – 05.07.1996), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад дачкі, апрацаваны ў 2001 г. У ДМГБЛ – у 1998 г. самім утваральнікам.*

БДАМЛМ. Ф. 419. 423 адз. зах. за 1927–1996. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы, рэчы.

ДМГБЛ. КП 18285–18307, 14935–15374. Рукапісы, ліставанне, біяграфічныя дакументы, нататнікі, кнігі, прадметы.

ВІЦІНГ Яўген Эдуардавіч (02.08.1884, г. Санкт-Пецярбург – 19.08.1959), спявак.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад Т. І. Лук'янавай (жонкі), апрацаваны ў 1964 г. У ДМГТМК паступілі ў 1994 г.*

БДАМЛМ. Ф. 54. Воп. 1–2. 224 адз. зах. за 1901–1963. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы, дакументы жонкі.

ДМГТМК. КП 636 (1–9), 6291–6312, 6552–6556. Рукапісы, лісты, біяграфічныя дакументы.

ВІЦЬБІЧ Юрка (сапр. Шчарбакоў Серафім) (15.06.1905, г. Веліж, Расія – 06.01.1975), пісьменнік, публіцыст, краязнаўца, дзеяч эміграцыі.

Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане. Дакументы дзейнасці (бібліяграфія, артыкулы), артыкул Ч. Сіповіча аб Ю. Віцьбічу, ліставанне.

Нью-Йоркская публічная бібліятэка. Неапрацаваныя матэрыялы.

Архіў царквы св. Ефрасінні Полацкай у Саўт-Рыверы.

ВІШКАРОЎ Барыс Якаўлевіч (29.10.1905, г. Смаленск, Расія – 23.02.1974), рэжысёр.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 2004 г.*

БДАМЛМ. Ф. 376 (Збор дакументаў дзеячаў тэатра і кіно). Воп. 1. 39 адз. зах. за 1944–1952. Дакументы творчай дзейнасці.

ВІШНЕЎСКАЯ Марыя Фёдараўна (01.08.1915, в. Саланое, Жлобінскі р-н, Гомельская вобл. – 07.02.2000), працаўнік сельскай гаспадаркі.

ЗДА ў г. Жлобіне. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў,

дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры). Воп. 3. 9 адз. зах. за 1948–1995. Біяграфічныя дакументы (граматы, характарыстыка).

ВОІНАЎ Аляксандр Пятровіч (20.11.1902, г. Санкт-Пецярбург – 01.10.1987), архітэктар.

*Дакументы перададзены ў БДАНТД унучкай. Апрацаваны ў 2006 г.*

БДАНТД. Ф. 221. 131 адз. зах. за 1939–2002. Дакументы творчай і службовай дзейнасці (праекты, артыкулы), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ВОІНКАЎ Васіль Віктаравіч (12.04.1902, г. Тбілісі, Грузія – 04.03.1986), акцёр.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад утваральніка. Апрацаваны ў 1979 г.*

БДАМЛМ. Ф. 232. 134 адз. зах. за 1921–1977. Дакументы творчай дзейнасці.

ВОЙНІЧ Епіфаній Ігнацьевіч (1907, в. Новыя Зяленкі, Чэрвенскі р-н, Мінская вобл. – 11.07.1967), дзеяч культуры.

*Дакументы паступілі ў архіў ад жонкі ў 1968 г.*

БДАМЛМ. Ф. 152. 57 адз. зах. за 1907–1966. Дакументы творчай дзейнасці, фотаздымкі, сабраныя дакументы аб творчасці Бялыніцкага-Бірулі.

ВОЛКАЎ Валянцін Віктаравіч (07.04.1881, г. Ялец, Ліпецкая вобл., Расія – 08.11.1964), мастак.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад дачкі. Апрацаваны ў 1974 г.*

Архіў НММ. Ф. 3. Воп. 13. Адз. зах. 12–16. Артыкулы, каталогі выстаў, віншаванні.

БДАМЛМ. Ф. 192. 157 адз. зах. за 1907–1972. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, рэчы.

ВОЛЧАК Віктар Мацвеевіч (09.07.1910, в. Ціны, Краснаярская вобл., Расія – 26.04.1985), архітэктар.

*Дакументы ў БДАНТД паступілі ад сына. Апрацаваны ў 1987 г.*

БДАНТД. Ф. 81. Воп. 1–2. 167 адз. зах. за 1936–1985. Дакументы дзейнасці (па праектаванню, артыкулы ды інш.), біяграфічныя, ліставанне, фотаздымкі.

ВОЛЬСКІ Артур (Зэйдэль Артур Вітальевіч) (н. 23.09.1924, г. Дзяржынск, Мінская вобл.), пісьменнік.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка ў 1971 г.*

БДАМЛМ. Ф. 76. Воп. 1–2. 48 адз. зах. за 1950–1984. Дакументы творчай дзейнасці (вершы, п’есы, пераклады).

ВОЛЬСКІ Віталь (Зэйдэль Віталь Фрыдрыхавіч) (05.09.1901, г. Санкт-Пецярбург, Расія – 22.08.1988), пісьменнік.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад архіваўтваральніка і жонкі. Апрацаваны ў 1967 г.*

БДАМЛМ. Ф. 100. Воп. 1–3. 419 адз. зах. за 1923–1991. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, дзённікі, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ВОСІПАВА Марыя Барысаўна (27.12.1908, в. Серпуковічы, Талочынскі р-н, Віцебская вобл. – 05.02.1999), удзельнік падпольнага руху ў Другой сусветнай вайне.

*Дакументы у НАРБ паступілі ад утваральніка ў красавіку 1994 г.*

БДМГВАВ. 57231–57234; 67382–67388 за 1941–1964. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

НАРБ. Ф. 345 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны). Воп. 4. 21 адз. зах. за 1940–1993. Біяграфічныя (дыплом, пасведчанні, артыкулы аб ёй), успаміны аб падпольнай працы ў гады вайны, ліставанне (ад розных асоб, віншаванні).

ВОЎК-ЛЕВАНОВІЧ Іосіф Васілевіч (25.10.1891, б. хут. Лявонаўка, Бабруйскі р-н, Магілёўская вобл. – 19.08.1943), мовазнаўца.

*Асноўная частка асабістага архіва была атрымана АРКР ЦНБ НАН Беларусі ў 1982 г. з Ін-та мовазнаўства АН БССР. У 1984 г. дадатковыя матэрыялы былі дасланыя дачкой утваральніка.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 34. 171 адз. зах. за 1926–1987. Дакументы творчай і службовай дзейнасці (нарысы, артыкулы, водгукі, рэцэнзіі ды інш.), ліставанне, біяграфічныя дакументы, сабраныя дакументы.

ВУС Аляксандра Паўлаўна (1909, г. Віцебск – 13.06.1997), рэдактар часопіса «Работніца і сялянка».

*Дакументы паступілі ад утваральніка ў 1977 г.*

НАРБ. Ф. 175 (Калекцыя дакументаў партыйных, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў) Воп. 3. 18 адз. зах. за 1942–1977. Біяграфічныя дакументы (пералік узнагарод, віншаванні, пасведчанні), дакументы творчай дзейнасці (нарысы, апавяданні, артыкулы), фотаздымкі (індывідуальныя, у групах).

ВЫЛЧАЎ Георгій Дзімітраў (н. 08.01.1926, в. Нова-Сяло, Хаскаўская акруга, Балгарыя), літаратуразнаўца, даследчык беларускай літаратуры.

*Дакументы ў копіях паступілі у БДАМЛМ ад архіваўтваральніка ў 1973 і 1982 гг. Апрацаваны ў 1982 г.*

БДАМЛМ. Ф. 264. 46 адз. зах. за 1938–1982. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы.

ВЫСОЦКІ Канстанцін Гаўрылавіч (н. 07.11.1927, в. Астрожанка, Лельчыцкі р-н, Гомельская вобл.), загадчык аддзела культуры райвыканкама, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Мазыры. Ф. 286 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг., партызанскага руху на Палессі, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі). Воп. 3. 4 адз. зах. за 1953–2000. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, пасведчанні, граматы ды інш.), фотаздымкі.

ВЯЛІКІ Зіновій Сямёнавіч (01.03.1900, в. Старынкі, Мінскі р-н – 19.09.1983), акцёр, рэжысёр тэатра імя Я. Коласа.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступлілі з музея ветэранаў партыі, войн, працы Рэспубліканскага інтэрната персанальных пенсіянераў у 1991 г.*

БДАМЛМ. Ф. 376 (Збор дакументаў дзеячаў тэатра і кіно). Воп. 1. Адз. зах. 88–101 за 1928–1983. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы.

ВЯЛЮГІН Анатоль Сцяпанавіч (27.12.1923, в. Машканы, Сенненскі р-н, Віцебская вобл. – 24.10.1994), паэт, кінадраматург, перакладчык.

*Дакументы перададзены сваячкай паэта А. А. Мядзведзь у 2002 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 55. 254 адз. зах. за 1933–1994. Дакументы творчай дзейнасці (выбраныя творы, зборнікі вершаў з рукапіснымі праўкамі, сцэнарыі), ліставанне з рознымі ўстановамі і асобамі, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы, матэрыялы членаў сям'і.

ВЯРБА Вера (Сакалова Гертруда Пятроўна) (14.01.1942, в. Высокі Гарадзец, Талачынскі р-н, Віцебская вобл. – 15.07.2012), паэтка.

*Дакументы перададзены архіваўтваральнікам у БДАМЛМ у 1977 г. Апрацаваны ў 2007 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор дакументаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 315–317 за 1967–1976. Дакументы творчай дзейнасці (рукапісы паэм).

ВЯРЦІНСКІ Анатоль Ільіч (н. 18.11.1931, в. Дзямешкава, Лепельскі р-н, Віцебская вобл.), паэт, драматург, крытык, перакладчык.

*Дакументы перададзены у БДАМЛМ архіваўтваральнікам у 1976 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор дакументаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 26–36 за 1968–1975. Вершы, паэмы.

ВЯРШЫНІН (сапр. Верамей) Мікалай (1878–1934), грамадска-палітычны дзеяч, эмігрант.

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя дакументаў музея імя І. Луцкевіча ў Вільна). Воп. 1. Адз. зах. 227 за 1921 г. Лісты да К. Езавітава і Б. Тарашкевіча.

НАРБ. Ф. 459 (фонд В. Русака). Воп. 1. Адз. зах. 16,17. Нарыс «Продкі беларусаў», дакументы на праезд у транспарце.

ВЯРЫГА-ДАРЭЎСКІ Арцём (23.10.1816, в. Кублічы, Лепельскі р-н, Віцебская вобл. – 1884), пісьменнік.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 720, 722 за 1859. Вершаванае віншаванне Сакалоўскаму і Хадэцкаму, напісанае па-польску, альбом (копія), зробленая Б. Тарашкевічам .

ВЯТОШКІН Віктар Дзмітрыевіч (н. 10.05.1925), працаўнік прамысловасці.

ДАГА Гомельскай вобл. Ф. 366 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 1. Адз. зах. 1–5 за 1944–2005. Аўтабіяграфія, успаміны, фотаздымкі.

# Г

ГАВОРСКІ Ксенафонт Антонавіч (1821, г. Кіеў, Украіна – 29.06.1871), гісторык, археолаг.

БДАМЛМ. Ф. 43 (фонд А. Ельскага). Воп. 1. Адз. зах. 9. Ліст К. Гаворскага да А. Кіркора.

ГАДЛЕЎСКІ Вінцэнт (Вікенцій Іванавіч) (16.11.1898, в. Поразава, Ваўкавыскі р-н, Гродзенская вобл. – снежань 1942), грамадска-палітычны дзеяч, святар.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 4 (фонд А. Станкевіча). Воп. 1. Адз. зах. 92–94 за 1922–1927. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія), лісты.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 178 за 1944 г. Пераклад «Чатырох евангелляў».

ГАЗІН Віктар Раманавіч (н. 17.09.1928, в. Сакольнікі, Віцебскі р-н), краязнаўца, гісторык.

*Дакументы ў архіў перададзены ўтваральнікам у 1994 і 2008 г.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 330. Воп. 1–2. 115 адз. зах. за 1936–2010. Дакументы дзейнасці (артыкулы, нарысы, нататкі), біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ГАЙДУК Аркадзь Пятровіч (21.01.1925, в. Дзямешкаўка, Бярэзінскі р-н, Мінская вобл. –06.09.2001), удзельнік Другой сусветнай вайны, кіраўнік прамысловасці, кандыдат тэхнічных навук.

ЗДА ў г. Барысаве. Ф. 707 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, працаўнікоў тылу і сацыялістычнага будаўніцтва, дзеячаў культуры). Воп. 14. 14 адз. зах. за 1963–1988. Аўтабіяграфія, копіі асабістых дакументаў, пасведчанні, граматы, манаграфіі, фотаздымкі.

ГАЛАВАЦКІ Якаў (17.10.1814, в. Чэпелі, Львоўская вобл., Украіна – 13.05.1888), фалькларыст, мовазнавец, старшыня Віленскай археаграфічнай камісіі.

Навуковая бібліятэка НАН Украіны (Львоў). Дакументы выкладчыцкай дзейнасці, ліставанне.

ГАЛАВАЧ Платон Раманавіч (18.04.1908, в. Пабокавічы, Чэрвенскі р-н, Мінская вобл. –29.10.1937), пісьменнік, грамадска-палітычны дзеяч.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад Дз.З. Бародзіча.* Апрацаваны ў 1964 г.

БДАМЛМ. Ф. 58. 18 адз. зах. за 1922–1937. Фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

ГАЛАВІНСКІ Аляксандр Кузьміч (кастрычнік 1886, в. Муравілле, Касцюковіцкі р-н, Магілёўская вобл. – 1937), грамадска-палітычны дзеяч, рэдактар.

НАРБ. Ф. 325 (фонд БНР). Воп. 1. Адз. зах. 217 за 1924. Ліставанне з дзеячамі нацыянальнага руху, запіска аб беларуска-літоўскіх адносінах, мемарыял прэм'ер-міністру Вялікабрытаніі.

ДГАЛ. Ф. 582 (фонд БНР). Воп. 1. Адз. зах. 24. Нататкі аб палітычным становішчы Беларусі, узнікненні і дзейнасці БНР, лісты.

ГАЛАДЗЕД Мікалай Мацвеевіч (21.05.1894, в. Стары Крывец, Бранская вобл., Расія – 21.06.1937), грамадска-палітычны дзеяч.

НМГКБ. 4 адз. зах. за 1927–1970. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ГАЛАЎЧЫНЕР Віктар Якаўлевіч (15.06.1905, г. Мінск – 15.07.1961), рэжысёр, драматург.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1964 г.*

БДАМЛМ. Ф. 72. 23 адз. зах. за 1946–1962. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ГАЛІЁНКА Васіль Пятровіч (н. 15.02.1880), удзельнік падзеяў рэвалюцый першай чвэрці XX ст.

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1244 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 6. 7 адз. зах. за 1958–1980. Біяграфічныя дакументы, успаміны.

ГАЛІНА-АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ Вольга Ўладзіміраўна (11.03.1899, в. Жалудок, Лідскі р-н, Гродзенская вобл. – 04.12.1980), актрыса.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка і брата. Апрацаваны ў 1990 г.*

БДАМЛМ. Ф. 107. 67 адз. зах. за 1923–1980. Дакументы творчай дзейнасці (фотаздымкі ў ролях), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, кнігі.

ГАЛІЦКІ Міхаіл Мікалаевіч, удзельнік рэвалюцыі і вайны 1918–1921 гг.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3531 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. Адз. зах. 105 за 1969. Біяграфічныя дакументы.

ГАЛКОЎСКІ Канстанцін (16.06.1875, г. Вільня, Літва – 20.02.1963), літоўскі і беларускі кампазітар.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 236. Воп. 1. Адз. зах. 1196 за 1946–1975. Артыкулы, ліставанне з Р. Шырмай, С. Нісневіч, П. Панамарэнкам, Я. Коласам, М. Танкам.

ГАЛУБОВІЧ Міхал (1800–06.03.1881), уніяцкі (праваслаўны) архіепіскап.

НДАК НББ. № 091/203 № 7 за 1858–1860. Дзённік.

Нацыянальны музей гісторыі культуры (НМГК). № 5420 за 1865–1867.

ГАЛУБОК Уладзіслаў (сапр. Голуб Уладзіслаў Іосіфавіч) (01.05.1882, в. Лясная, Навагрудскі пав., Мінская губ. – 28.09.1937), рэжысёр, драматург, акцёр, мастак.

Дзяржаўны цэнтральны тэатральны музей імя А. А. Бахрушына (Масква).

РДАЛМ. Ф. 837 (фонд М. А. Папова ). Воп. 1. Адз. зах. 117. Ліставанне.

АР ЦБАН. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 146, 147 за 1926–1927.

ГАЛЯК Барыс Мацвеевіч, трэнер па футболу ў г. Мазыры.

ЗДА ў г. Мазыры. Ф. 286 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг., партызанскага руху на Палессі, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі). Воп. 9. 3 адз. зах. за 1980–1981. Біяграфічныя дакументы, артыкулы аб утваральніку, фотаздымкі.

ГАМОЛКА Мікалай Іванавіч (11.03.1922, в. Брынёў, Петрыкаўскі р-н, Гомельская вобл. – 03.05.1992), пісьменнік.

БДАМЛМ. Ф. 279 (неап.).

ГАНЕСТАВА Людміла Раманаўна (н. 18.07.1923, в. Калышкі, Лёзненскі р-н, Віцебская вобл.), спявачка.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1971 г.*

БДАМЛМ. Ф. 103. 22 адз. зах. за 1954–1964. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ГАНІНА Ларыса Аляксандраўна (н. 15.11.1929, в. Колмава, Ермакоўскі р-н, Яраслаўская вобл., Расія), архівіст, гісторык, дырэктар ЗДА ў г. Барысаве (1963–1983).

ЗДА ў г. Барысаве. Ф. 707 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, працаўнікоў тылу і сацыялістычнага будаўніцтва, дзеячаў культуры). Воп. 19. 6 адз. зах. за 1958–2006. Аўтабіяграфія, граматы, копіі асабістых дакументаў, успаміны аб працы архіва ў першыя гады яго стварэння, фотаздымкі.

ГАНЧАРЫК Міхаіл Мікалаевіч (24.11.1899, в. Клянік, Смалявіцкі р-н, Мінская вобл. – 11.04.1986), фізіёлаг раслін.

*Дакументы перададзены ў дар АРКР ЦНБ НАН Беларусі самім вучоным у 1981 г. Частка атрыманых матэрыялаў была ў тэчках з тлумачальнымі надпісамі, якія па магчымасці былі захаваны. У 2004 г. укладальнік кнігі ўспамінаў вучонага М. У. Токараў перададаў рукапіс успамінаў, фотаздымкі ды інш. Апрацаваны ў 2008 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 26. 890 адз. зах. за 1917–2002. Дакументы навуковай і службовай дзейнасці (манаграфіі, зборнікі, артыкулы, выступленні, рэцэнзіі, водгукі ды інш.), ліставанне з рознымі ўстановамі і асобамі, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, ілюстрацыйныя матэрыялы, калекцыя (выразкі з часопісаў і газет; дакументы членаў сям'і ды інш.).

ГАРАЧКА Зінаіда Дзмітрыеўна (н. 1931, в. Высачаны, Лёзненскі р-н, Віцебская вобл.), працаўнік лёгкай прамысловасці.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 26. 5 адз. зах. за 1947–1987. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыкі, граматы, пасведчанні, артыкулы аб утваральніку), фотаздымкі.

ГАРАЧЫ Эдуард Мікалаевіч (н. 19.10.1936, Мінск), акцёр.

БДАМЛМ. Ф. 424 (неап.).

ГАРБАЧОЎ Андрэй Раманавіч, першы дырэектар Брэсцкага дзяржаўнага настаўніцкага інстытута імя А.С. Пушкіна.

Брэсцкі дзяржаўны краязнаўчы музей. КП 18782 (1–62) за 1932–1992. Біяграфічныя дакументы.

ГАРБУК Вісарыён Сцяпанавіч (24.12.1913, в. Шкілякі, Полацкі р-н, Віцебская вобл. – 08.08.1986), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1996 г.*

БДАМЛМ. Ф. 234. 540 адз. зах. за 1930–1978. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, калекцыя, рэчы, кнігі з дароўнымі надпісамі.

ДМГБЛ. КП 12009–12012. Ліставанне, машынапісы твораў, кнігі.

ГАРБУКОЎ Іван Пракофьевіч, настаўнік.

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 2. 17 адз. зах. за 1942–1982. Рабочыя сшыткі, біяграфічныя дакументы.

ГАРОШКА Леў (26.02.1911, в. Трашчыны, Навагрудскі р-н, Гродзенская вобл. –28.07.1977), святар, грамадскі дзеяч, публіцыст.

Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане. Скрынкі 1–4. Дакументы дзейнасці (дакументы выдавецкай дзейнасці, грамадскіх установаў, ліставанне; казанні, катэхезы, рэкалекцыя, творы і матэрыялы да іх), біяграфічныя дакументы, нататнікі, ліставанне, сабраныя дакументы (біяграфічныя звесткі пра беларускіх дзеячаў, матэрыялы да гісторыі беларускай царквы).

ГАРТНЫ Цішка (сапр. Жылуновіч Зміцер Фёдаравіч) (04.11.1887, г. Капыль, Мінская вобл. – 11.04.1937), грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, пісьменнік, архівіст.

*Архіваўтваральнік перадаў некаторыя свае рукапісы ў 1931 г. Аддзелу беларускай літаратуры і бібліяграфіі Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі. Рукапіс рамана «Сокі цаліны» захоўваўся да 1962 г. у ЦДАКР, пасля перададзены ў ЦДАЛМ. Асноўная частка архіва страчана. Матэрыялы фонду ў БДАМЛМ сабраны дачкой Ц. Гартнага Г. Д. Жылуновіч для выдання збору твораў пісьменніка і з’яўляюцца ў большай сваёй частцы капійнымі.*

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 154–156, 765 за 1924–1944. Вершы, ліставанне.

БДАМЛМ. Ф. 15 (збор). 154 адз. зах. за 1908–1989. Копіі дакументаў творчай дзейнасці, біяграфічных дакументаў, ліставання, дакументаў сям'і. Рукапіс рамана «Сокі цаліны»

ДМГБЛ. КП 282–300. Аўтабіяграфія, сшыткі з вершамі, урыўкі з працамі, дзённік рабочага, успаміны.

НАРБ. Ф. 458 (фонд К. Езавітава ). Воп. 1. Адз. зах. 99; Ф. 257. Воп. 1. Адз.зах 53. Рукапісы артыкула «Этапы развіцця беларускай літаратуры», драмы «Сацыялістка».

НДАК НББ. Ф. 2 (Збор матэрыялаў дзеячаў навукі і культуры Беларусі). Воп. 1. Адз. зах. 13–21, № 091/4603 за 1930–1931. Часткі раманаў «Бацькава воля» і «Сокі цаліны», аповесці, апавяданні, нарысы.

РДАЛМ. Ф. 613 (фонд Дзяржаўнага выдавецтва «Мастацкая літаратура»). Воп. 1. Адз. зах. 4829 за 1936; Ф. 2182 (фонд М. М. Шкапскай). Воп. 1. Адз. зах. 314. Ліставанне.

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 21. Воп. 1. Адз. зах. 154, 155, 156 за 1910–1913. Лісты ў рэдакцыю «Нашай нівы», вершы, апавяданні.

ГАРТЫНСКІ Мікалай Рыгоравіч (07.01.1799, г. Магілёў – 03.02.1887), гісторык, археограф.

БДАМЛМ. Ф. 6 (фонд І. Грыгаровіча ). 1. Адз. зах. 3, 13, 14 за 1968. Копіі дакументаў архіваў зробленыя Гартынскім.

НГАБ. Ф. 1817 (Магілёўскі магістрат). Воп. 1. Адз. зах. 108, 189. Дакументы дзейнасці.

ГАРУЛЁЎ Мікалай Аляксандравіч (06.11.1919, в. Баева, Дубровенскі р-н, Віцебская вобл. – 05.05.1980), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі, апрацаваны ў 1993 г.*

БДАМЛМ. Ф. 178. 76 адз. зах. за 1926–1980. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

ГАРУН Алесь (сапр. Прушынскі Аляксандр Уладзіміравіч) (11.03.1887, Новы Двор, Мінскі пав. – 28.07.1920), паэт, празаік, драматург, грамадскі дзеяч.

*У 1920-я гг. рукапісы захоўваліся ў Літаратурнай секцыі Інбелкульта. У БДАМЛМ дакументы паступілі ад выдаўца А. Жынкіна ў 1997 пазней ад У. Казбярука (копіі дакументаў Іркуцкага архіва).*

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 145, 473, 760 за 1912–1919.

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 37–52 за 1908–1985. Копіі біяграфічных дакументаў з Іркуцкага абласнога архіва, артыкулы з газет, фотаздымкі.

ГАРЭЦКАЯ Галіна Максімаўна (13.03.1921, г. Вільня, Літва – 19.09.2006), дзеяч культуры, педагог.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ў 1999, 2002 і 2006, ад Г. М. Гарэцкай і пасля яе смерці ад (стрыечнага брата) В. Я. Тэадарчука. Апрацаваны ў 2003 г.*

БДАМЛМ. Ф. 426 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 44–249; Воп. 2. Адз. зах. 175–336 за 1900–2003. Ліставанне, дакументы аб выданні творчай спадчыны М. Гарэцкага, дакументы аб правядзенні юбілейных канферэнцый, фотаздымкі.

ГАРЭЦКІ Гаўрыла Іванавіч (10.04.1900, в. Малая Багацькаўка, Мсціслаўскі р-н, Магілёўская вобл. – 20.11.1988), геолаг, географ, эканаміст, адзін з заснавальнікаў Беларускай акадэміі навук.

*Перададзены сынам утваральніка Радзімам Гаўрылавічам Гарэцкім у 2002 г. Архіў часткова ўпарадкаваны.*

Літ.: Свякла В. В. Дакументы эпісталярнага характару з рукапіснага архіва Г. І. Гарэцкага ў фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтарльнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі // Библиотеки в информационном пространстве: синтез традиций и инноваций: материалы Международной научно-практической конференции молодых учёных и специалистов, Минск, 12 сентября 2007 / редкол. Н. Ю. Березкина [и др.] – Минск, 2007.– С. 244–250.

АРРК ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 54 (неап.), 25 тыс. аркушаў. Матэрыялы навуковай, службовай і грамадскай дзейнасці, ліставанне.

ГАРЭЦКІ Максім Іванавіч (06.02.1893 в. Малая Багацькаўка, Мсціслаўскі р-н, Магілёўская вобл. – 10.02.1938), пісьменнік, фалькларыст, мовазнавец, грамадскі дзеяч.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад дачкі Г.М. Гарэцкай, пры ўдзеле гісторыка М. М. Ількевіча. Дакументы М. Гарэцкага перададзены спадчыннікамі ў АРРК ЦНБ у 1972 г., доступ абмежаваны. Дадатковыя матэрыялы былі перададзены ў 1977 г. дачкой Галінай Максімаўнай. У ДМГБЛ паступілі ў 1998 г. ад Г. М. Гарэцкай.*

Літ.: Запартыка Г. В. Дакументальны і музейны фонд сям'і Гарэцкіх у БДАМЛМ // Максім і Гаўрыла Гарэцкія: Жыццё і творчасць: Матэрыялы XII Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 4 мая 2004 г. / Дзярж. музей гіст. бел. літ., Рэсп. фонд імя братоў Гарэцкіх, Ін-т літ. імя Янкі Купалы НАН Беларусі, Ін-т геалогіі і геафізікі НАН Беларусі; Рэд. кал.: Р. Гарэцкі ды інш. – Мінск, 2005. – С. 39–42.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 149–152, 405 за 1913–1925. Лісты А. Луцкевічу, артыкулы «Гісторыя беларускае літаратуры», «Беларускае пісьменства: Кароткі агляд беларускага пісьменства», раман «Віленскія камунары».

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 7. Воп. 1. 53 адз. зах.; Воп. 2. 66 адз. зах. за 1905–1977. Творчыя дакументы (рукапісы раманаў, апавяданняў, перакладаў, спісы твораў), лісты да сям'і, біяграфічныя дакументы (пасведчанні, паслужны спіс), фотаздымкі, сабраныя дакументы, дакументы родных.

БДАМЛМ. Ф. 426 (сямейны). Воп. 1. 43 адз.азх.; Воп. 2. 123 адз. зах. за 1900–2003. Дакументы творчай дзейнасці (рукапісныя копіі Г. М. Гарэцкай), біяграфічныя дакументы (асабістыя дакументы, дакументы пра пісьменніка), фотаздымкі, рэчы.

ДМГБЛ. КП 2833–2842, 7306–7808. Лісты Гарэцкага да Хайноўскай, фотаздымкі.

ГАЎРУК Юрка (06.05.1905, г. Слуцк, Мінская вобл. – 18.02.1979), перакладчык, літаратурны крытык.

*Дакументы ў АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Апрацаваны ў 1980 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 18. 667 адз. зах. за 1918–1979. Творчыя дакументы (вершы, пераклады, артыкулы, рэцэнзіі, выступленні), дакументы службовай і грамадскай дзейнасці, ліставанне з асобамі і ўстановамі, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі індывідуальныя, у групах, родных, пісьменнікаў, сабраныя дакументы.

ГАЎРЫЛАЎ Пётр Гаўрылавіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Оршы. Ф. 169 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы Дубровенскага, Аршанскага, Сенненскага, Талачынскага р-наў Віцебскай вобл.). 22 адз. зах. за 1941–2004. Асабістыя дакументы, успаміны.

ГАЎРЫЛАЎ Леанід Рыгоравіч (02.02.1918, в. Бердыж, Чачэрскі р-н, Гомельская вобл. –1941), паэт.

*Дакументы сабраны школьным літаратурным музеем СШ № 150 г. Мінска.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор дакументаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 378–392 за 1935–1986. Вершы, дзённікавыя запісы, асабістыя дакументы, індывідуальныя фотаздымкі і ў групах, дакументы аб утваральніку (успаміны сясцёр і інш).

ГАЎРЫЛЕНКА Павел Нікіфаравіч (15.02.1902, в. Касцюкоўцы, Гомельскі р-н – 04.02.1961), мастак.

*Дакументы у БДАМЛМ і НМГКБ паступілі ад Л. С. Балінскай (жонкі) у 1960-я гг.*

БДАМЛМ. Ф. 17. 50 адз. зах. за 1941–1960. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

НМГКБ. КП 10773 (1–61) за 1932–1962. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ГАШКЕВІЧ Іосіф Антонавіч (1814, Мінскі р-н – 05.10.1872), першы консул Расійскай імперыі ў Японіі, дыпламат, лінгвіст, усходазнаўца, энтамолаг.

Архіў Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Копіі дакументаў службовай дзейнасці перададзеныя Расійскім архівам Міністэрства замежных спраў у 2004 г.

Санкт-Пецярбургскі філіял Інстытута ўсходазнаўства Расійскай акадэміі навук. Ф.13. 19 адз. зах. за 1830–1852.

ГЕЙЦ Ніна Мікалаеўна (11.01.1912, г. Баку, Азербайджан – 07.12.1983), актрыса.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка.*

БДАМЛМ. Ф. 376 (Збор дакументаў дзеячаў тэатра і кіно). Воп. 1. 20 адз. зах. за 1937–1970. Дакументы творчай дзейнасці.

ГЕНДЛЕР Абрам Бен’ямінавіч (н. 12.02.1907, в. Замошша, Іванаўскі р-н, Брэсцкая вобл.), удзельнік грамадскага руху ў Заходняй Беларусі у міжваенны перыяд.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацы-

ялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 19. 9 адз. зах. за 1929–2004. Асабістая справа, успаміны, фотаздымкі палітзняволеных Пінскай турмы 1928, лісты В. З. Харужай (1941, 1942), лісты жонцы, фотаздымкі індывідуальныя, артыкулы.

ГЕНІЮШ Ларыса Антонаўна (09.08.1910, в. Жлобаўцы, Ваўкавыскі р-н, Гродзенская вобл. – 07.04.1983), паэтка.

*Дакументы набыты АРКР ЦНБ НАН Беларусі ў 1983 г. у сына Юрыя Іванавіча Геніюша. У 1993 г. М. М. Чарняўскі перадаў машынапісны экзэмпляр успамінаў, якія былі апублікаваны пад назвай «Споведзь».*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 31. 1095 адз. зах. за 1910–1983. Дакументы творчай дзейнасці (паэмы, вершы), успаміны, дзённікавыя запісы, нататнікі, ліставанне з пісьменнікамі, вучонымі, беларусамі замежжа, фотаздымкі (самейныя, сяброў, падчас мерапрыемстваў), паштоўкі з партрэтамі беларускіх пісьменнікаў, сабраныя дакументы (вершы А. Салаўя, У. Караткевіча, А. Ставера, М. Ермаловіча, Д. Бічэль; выступленні і рэцэнзіі розных асоб; дакументы сваякоў і блізкіх у т. л. творчыя дакументы Ю. Геніюша).

ГЕРАСІМОВІЧ Пётр Мікалаевіч (13.04.1912, в. Танежніцы, Слуцкі р-н, Мінская вобл. –20.04.1990), мастацтвазнаўца, графік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка і жонкі.*

Архіў НММ. Ф. 2 (Калекцыя дакументальных матэрыялаў навуковых супрацоўнікаў НММ Рэспублікі Беларусь). Воп. 3. 73 адз. зах. за 1942–1989. Мастацкія працы, рукапісы нарысаў, матэрыялы да даведнікаў, апавяданні, успаміны і аўтабіяграфічныя запісы, сабраныя дакументы, выяўленчыя дакументы (індывідуальныя, рэпрадукцыі ды інш.)

БДАМЛМ. Ф. 301. 231 адз. зах. за 1907–1989. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы, кнігі з дароўнымі надпісамі.

ГЕРМАНОВІЧ Язэп Станіслававіч (псеўд. Вінцук Адважны) (04.03.1890, г. п. Гальшаны, Ашмянскі р-н, Гродзенскай вобл. – 26.12.1978), грамадскі дзеяч, святар, пісьменнік, публіцыст.

Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане. Дакументы дзейнасці (кніга ўспамінаў і яе пераклады, байкі, «Біблія ў вершах», артыкулы, літаратурныя творы), біяграфічныя дакументы, дзённікавыя запісы, фотаздымкі.

ГЕРУС Сямён Пятровіч (21.11.1925, в. Кунічна, Навагрудскі р-н, Гродзенскай вобл. –1998), мастак.

БДАМЛМ. Ф. 380 (неап.).

ГЕРЦОВІЧ Якаў Бенцыянавіч (01.01.1910, в. Сяліба, Бярэзінскі р-н, Мінская вобл. – 21.04.1976), пісьменнік.

*Дакументы у БДАМЛМ перададзены дачкой у 1995 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 53–63 за 1926–1976. Артыкулы, нататкі, вершы, дакументы да біяграфіі, фотаздымкі.

ГІКАЛА Мікалай Фёдаравіч (20.03.1897, г. Адэса, Украіна – 25.4.1938), дзяржаўны і партыйны дзеяч.

НАРБ. Ф. 4 (Фонд КП(б)Б). Воп. 21. Адз. зах. 325, 353, 480, 503, 504, 507, 509. Службовыя дакументы, машынапісы дакладаў і выступленняў.

ГІЛЕВІЧ Жанна Вікенцьеўна (н. 13.04.1933, г. Магілёў), дырэктар Барысаўскага краязнаўчага музея.

ЗДА ў г. Барысаве. Ф. 707 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, працаўнікоў тылу і сацыялістычнага будаўніцтва, дзеячаў культуры). Воп. 13. 32 адз. зах. за 1966–1997 гг. Аўтабіяграфія, дакументы дзейнасці (выпісы з архіўных дакументаў, артыкулаў па гісторыі Барысаўшчыны, сцэнарыі вечарын, біяграфіі выдатных дзеячаў Барысаўшчыны).

ГІЛЕВІЧ Ніл Сымонавіч (н. 30.09.1931, в. Слабада, Лагойскі р-н, Мінская вобл.), паэт.

*Дакументы ў ДМГБЛ перададзены ўтваральнікам у 1996 г.*

ДМГБЛ. КП 13474 (1–181), 14211 (1–531), 16180–16241. Рукапісы, ліставанне, фотаздымкі.

ГІЛЬТЭБРАНДТ Пётр (08.05.1840, в. Пер’і, Разанская вобл., Расія – 12.12.1905), архівіст, этнограф, археограф.

АР БВУ. Ф. 6. (фонд І. Спрогіса ) Адз. зах. 35 за 1899–1902. Лісты да І. Спрогіса.

АР РНБ. Фальклорныя запісы.

ГІНЬКО Георгій Міхайлавіч (н. 1900, г.п. Асвея, Верхнядзвінскі р-н, Віцебская вобл.), удзельнік рэвалюцыйнага руху і ваенных дзеяў 1918–1920 гг., партыйны дзеяч.

НАРБ. Ф. 357 (Калекцыя дакументаў ветэранаў партыі і ўдзельнікаў грамадзянскай вайны). Воп. 1. Адз. зах. 4–5 за 1921–1984. Успаміны аб рэвалюцыйных і ваенных падзеях у Віцебскай губ., фотаздымкі.

ГІТГАРЦ Ілья Аляксандравіч (11.04.1893, г. Адэса, Украіна – 03.02.1966), дырыжор.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1972 г.*

БДАМЛМ. Ф. 168. 64 адз. зах. за 1917–1963. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

ГЛЕБАЎ Аляксей Канстанцінавіч (24.03.1908, в. Зверавічы, Краснінскі р-н, Смаленская вобл., Расія – 02.10.1968), скульптар.

*Дакументы перадаваліся на захоўванне роднымі пасля смерці ўтваральніка.*

БДАМЛМ. Ф. 296. 52 адз. зах. за 1926–1976. Дакументы творчай дзейнасці, эпісталярныя дакументы, сабраныя дакументы.

ДМГТМК. КП 6243–6255. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ГЛЕБАЎ (сапр. Сарокін) Глеб Паўлавіч (29.04.1899, г. Вазнясенск, Нікалаеўская вобл., Украіна – 03.03.1967), акцёр БДТ-1.

НМГКБ. КП 30427 (1–24) за 1940–1965. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ГЛЕБАЎ Яўген Аляксандравіч (10.09.1929, г. Раслаўль, Смаленская вобл., Расія – 12.01.2000), кампазітар.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка ў 1985 г.*

БДАМЛМ. Ф. 276. 111 адз. зах. за 1949–1985. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ГЛЕБКА Пятро (Пётр Фёдаравіч) (06.07.1905, в. Вялікая Ўса, Уздзенскі р-н, Мінскай вобл. – 18.12.1969), пісьменнік.

*У АРРК ЦНБ дакументы падараваны жонкай Нінай Іларыёнаўнай па распараджэнні пісьменніка ў 1979 і 1985 гг. У НМГКБ – у 1979 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 24. 2782 адз. зах. за 1899–1986. Творчыя дакументы (вершы, паэмы, пераклады, артыкулы, выступленні), дзённікавыя запісы ваенных гадоў, дакументы службовай і грамадскай дзейнасці, ліставанне з роднымі, блізкімі, калегамі, біяграфічныя дакументы (дакументы аб пісьменніку), фотаздымкі.

НДАК НББ. Ф. 2 (Збор матэрыялаў дзеячаў навукі і культуры Беларусі). Воп. 1. Адз. зах. 53. Аўтограф аўтабіяграфіі.

НМГКБ. КП 44038 (1–9). Граматы, віншаванні, пасведчанні да медалёў, рукапісы вершаў.

ГЛОГЕР Зыгмунт (03.11.1845, в. Каменка, Ломжыцкі пав., Аўгустоўскае ваяв., Польшча – 15.08.1910), археолаг, калекцыянер, гісторык.

*Сабраў у Яжэве вялікую музейную калекцыю археалагічных, этнаграфічных, нумізматычных матэрыялаў сярод якіх беларускія матэрыялы са збораў М. Федароўскага, А. Кіркора, Я. і К. Тышкевічаў, А. Ельскага ды інш.*

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава). Літаратурныя творы, ліставанне.

Аддзел старажытных кніг і рукапісаў Публічнай бібліятэкі (Варшава). Асабістыя дакументы, літаратурныя творы за 1809–1907.

Дзяржаўны архіў у Кракаве. Ф. 678. Калекцыя дакументаў за 1515–1907.

Нацыянальны музей (Кракаў). Зборы рукапісаў, маёнткавыя дакументы.

ГЛУШЧАНКА Георгій Сымонавіч (05.05.1922, г. Растоў-на-Доне, Расія – 22.09.1994), музыказнаўца.

БДАМЛМ. Ф. 375 (неап.) (Калекцыя дакументаў кампазітараў, музыказнаўцаў, выканаўцаў).

ГОЛУБ Юрый Уладзіміравіч (н. 20.10.1947, в. Горна, Зэльвенскі р-н, Гродзенская вобл.), паэт, перакладчык.

*Дакументы перададзены архіваўтваральнікам у 2000 г.*
БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 64–67 за 1929–1969. Лісты Л. Геніюш, асабістыя дакументы, фотаздымкі.

ГОЛУБЕЎ Іосіф Пятровіч (1873, г. Кулебакі, Ніжагародская вобл., Расія – 27.06.1962), удзельнік рэвалюцыйнага руху і ваенных дзеяў 1917–1920 гг., ветэран працы.
НМГКБ. 48 адз. зах. за 1900–1956. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ГОЛУБЕЎ Уладзімір Аляксандравіч (н. 26.09.1940, г. Кастрама, Расія), астраном, старшыня Віцебскага аддзялення Ўсесаюзнага астранома-геадэзічнага таварыства.
*Дакументы ў архіў перададзены ўтваральнікам у 1999 і 2004 г.*
ДА Віцебскай вобл. Ф. 2291. Воп. 1–2. 261 адз. зах. за 1958–2004. Дакументы навуковай дзейнасці (артыкулы), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ГОЛЬ Мірон Маісеевіч, партыйны дзеяч, удзельнік ваенных дзеянняў 1918–1921 гг.
НАРБ. Ф. 357 (Калекцыя дакументаў ветэранаў партыі і ўдзельнікаў грамадзянскай вайны). Воп. 1. Адз. зах. 6. за 1978. Успаміны аб падзеях у Слуцкім раёне ў 1921 г.

ГОМАН Аркадзь Сямёнавіч (Абрам Шэндэравіч) (н. 18.03.1938, г. Віцебск), кампазітар, выкладчык Віцебскага музычнага вучылішча.
*Дакументы ў архіў перададзены ўтваральнікам у 1996 г.*
ДА Віцебскай вобл. Ф. 943. 9 адз. зах. за 1965–1993. Дакументы творчай дзейнасці (нотныя рукапісы, афішы канцэртаў, бібліяграфічны спіс), фотаздымкі.

ГРАХОЎСКІ Сяргей Іванавіч (25.09.1913, в. Нобель, Пінскі р-н, Брэсцкая вобл. –11.12.2002), паэт.
*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка, апрацаваны ў 1975, у ДМГБЛ перададзены ў 1991 г. утваральнікам.*
БДАМЛМ. Ф. 201. Воп. 1–4. 1413 адз. зах. за 1918–1994. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, успаміны, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы.
ДМГБЛ. КП 9227–9269, 10737 (1–198). Рукапісы, ліставанне, фотаздымкі.
ДМГТМК. КП 276 (1–5). Біяграфічныя дакументы, ліставанне.

ГРУБЭ Аляксандр Васільевіч (31.08.1894, в. Грыгор'еўка, Белябееўскі р-н, Уфімская вобл., Башкірыя – 03.08.1980), скульптар, мастак.
*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад дачкі. Апрацаваны ў 1994 г.*
Архіў НММ. Ф. 3 . Воп. 13. Адз. зах. 20–28. Лісты да А.В. Аладавай, фотаздымкі.
БДАМЛМ. Ф. 321. 85 адз. зах. за 1914–1980. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, прадметы.

ГРЫБ Тамаш (07.03.1895, в. Паляны, Швянчонскі р-н, Літва – 25.01.1938), грамадска-палітычны дзеяч.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 165–167 за 1919–1923. Лісты ў рэдакцыю газеты «Родны край», даклад, прачытаны на сходзе замежнай групы БПСР. 1922.

БДАМЛМ. Ф. 403 (фонд П. Мядзёлкі). Воп. 1. Адз. зах. 69. Фотаздымкі Т. Грыба за 1919, 1925; Ф. 3 (Калекцыя музея імя І. Луцкевіча ў Вільна). Воп. 1. Адз. зах. 145. Артыкул пач. 1920-х гг.

ДГАЛ. Ф. 582 (фонд БНР). Воп. 2. Адз. зах. 12, 58 за 1921. Даклад, прачытаны на сходзе замежнае групы БПСР з прычыны трэцяе гадавіны абвяшчэння незалежнасці БНР.

НАРБ. Ф. 459 (фонд В. Русака). Воп. 1. Адз. зах. 18–21. Прамова на адкрыцці помніка П. Крэчэўскаму, ліставанне; Ф. 458 (фонд. К. Езавітава). Воп. 1. Адз. зах. 10–15, 22, 23, 50. Даклады, публіцыстычныя творы; Ф. 60 п. Воп. 3. Адз. зах. 800 за 1923–1924. Копія ліставання.

НМГКБ. Фотаздымак 1930-я гг.

ГРЫГАРОВІЧ Іван Іванавіч (26.08.1792, г. Слаўгарад., Магілёўская вобл.– 01.11.1852), археограф, гісторык, мовазнавец.

*Пасля смерці протаіерэя яго дакументы захоўваліся ў сына Мікалая Грыгаровіча, на іх падставе апошні напісаў біяграфію бацькі і апублікаваў яго ліставанне з графам М. П. Румянцавым. У 1872 г. дакументы былі перададзены ў Румянцаўскі музей. Некаторыя дакументы трапілі ў канцы XIX–пачатку XX ст. да вядомага калекцыянера П. І. Шчукіна. Частка дакументаў у 1929 г. паступілі ў АР РНБ Санкт-Пецярбурга. Але найбольш грунтоўны комплекс дакументаў Івана Грыгаровіча, разам з дакументамі сыноў Івана і Мікалая, на пачатку XX ст. захоўваўся ў калекцыі бібліяфіла Г. В. Юдзіна, быў адшуканы ў Краснаярскім архіве прафесарам А. А. Праабражэнскім у канцы 1950-х гг. Неўзабаве перададзены ў Беларусь і зараз захоўваецца ў БДАМЛМ.*

Літ.: Запартыка Г. В., Запартыка А. М. І. І. Грыгаровіч. // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 2.– Мінск, 2001. – С. 261–263; Іванова В. Дакументальная спадчына протаіерэя Іаана Грыгаровіча // Праваслаўе. – 2004. – № 12–13. – С. 78–85; Іванова В. Лісты з асабістага архіва Івана Грыгаровіча // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 8. / рэд. кал. У. І. Адамушка [ды інш.] – Мінск, 2007. – С. 222–231; Трухина Т. А. Рукопись второй части «Белорусского архива древних грамот» // Научно-информационный бюллетень АУ при Совете министров БССР. – 1961– № 10. – С. 34–37.

АПК ДГМ (Масква). Ф. 261 (фонд І. І. Грыгаровіча (сына). Воп. 1. Спр. 1–8 за 1774–1901; Ф. 262 (фонд М. І. Грыгаровіча (сына). Воп. 1. Спр. 1–5 за 1739–1890. Памяннік памерлых родных і блізкіх, копія фармулярнага спіса, выпісы, дакументы сыноў ды інш.

Архіў РАН. Ф. 216 (фонд І.І. Сразнеўскага ). Воп. 3. Адз. зах. 738–743 за 1840–1850 гг. Матэрыялы да слоўніка старажытнарускай мовы, выпісы са старажытных дакументаў, выпісы слоў з актаў Заходняй Расіі.

АР РНБ (Санкт-Пецярбург). Ф. 223. Рукапіс «Беларуская іерархія» за 1801–1825.

БДАМЛМ. Ф. 6. 118 адз. зах. за 1695–1896. Біяграфічныя дакументы, дакументы дзейнасці, маёмасна-гаспадарчыя дакументы.
НДАР РДБ (Масква). Ф. 255. (фонд М. П. Румянцава); Ф. 178 (Калекцыя рускіх аўтографаў). 1 тэчка. 2 адз. зах. за 1820-я гг. Ліставанне з роднымі.

ГРЫГАР'ЯНЦ Армэн Багратавіч (28.09.1918, г. Андыжан, Узбекістан – 24.03.1976), мастак тэатра.
ДМГТМК. КП 8557–8576, 8160–8289, 8945–8886, 2277 (1–45). Эскізы касцюмаў і дэкарацый (больш 250), фотаздымкі, біяграфічныя дакументы.

ГРЫГОНІС Генрых Юр`евіч (08.05.1889, в. Пабяржэ, Вільнюскі р-н, Літва – 04.11.1955), акцёр.
*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1973 г.*
БДАМЛМ. Ф. 185. 42 адз. зах. за 1905–1969. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.
НМГКБ. КП 16027–16057 за 1920–1927 і пазней. Фотаздымкі ў ролях, пасведчанні, граматы, афішы, праграмы, узнагароды, працоўная кніжка.

ГРЫНБЛАТ Майсей Якаўлевіч (16.03.1905, г. Мінск – 04.06.1983), этнограф, фалькларыст, гісторык.
*Асабісты архіў паступіў на захоўванне ў АРКР ЦНБ НАН Беларусі ў адпаведнасці з завяшчаннем архіваутваральніка і па хадатайніцтве Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора АН БССР з прычыны асаблівай каштоўнасці архіва. У БДАМЛМ дакументы паступілі ад самога архіваўтваральніка ў 1981 г.*
АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 42. 2136 адз. зах. за 1910–1983. Творчыя дакументы (манаграфіі, зборнікі, манаграфіі, артыкулы, даклады, лекцыі, пераклады, запісы фальклору), службовыя дакументы (ліставанне, матэрыялы этнагарафічных экспедыцый, канспекты лекцый, праграмы), ліставанне, біяграфічныя дакументы, дакументы аб фондаўтваральніку, фотаздымкі, сабраныя дакументы М. М. Нікольскага, М. С. Кацара, С. Д. Палееса, Л. С. Мухарынскай, ліст Е. Р. Раманава, каталог архіва беларускіх народных песен у Беларускім музеі імя І. Луцкевіча ў Вільні, 1944)
БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 69–84 за 1910–1981. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі

ГРЫНЕВІЧ Антон Антонавіч (03.05.1877, б. фальв. Іваноўшчына, Лепельскі р-н, Віцебская вобл. – 08.12.1937), збіральнік фальклору, выдавец.
*Асабісты архіў быў набыты АРКР ЦНБ НАН Беларусі ў 1979 у А.С. Разанава. Ім, у сваю чаргу, у Вільні. Архіў захаваўся не поўнасцю, да Другой сусветнай вайны знаходзіўся ў фондах Беларускага музея ў Вільні, дзе прайшоў навуковую апрацоўку.*
АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 15. 62 адз. зах. за 1920–1924. Творчыя дакументы (зборы беларускіх песняў і танцаў), ліставанне (лісты Р. Зямкевіча, Г. Леўчыка ды інш.)

ГРЫНКЕВІЧ Станіслаў Сымонавіч (02.02.1902, в. Новы Двор, Сакольскі пав. Польшча – 25.07.1945), грамадска-палітычны дзеяч, дзеяч культуры.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 711. Артыкулы.

ГРЫШКЕВІЧ Францішак (1905, в. Сухаволя, Падляшскае ваяв., Польшча – 1946), паэт, публіцыст.

ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 168–170, 967 за 1928–1936 гг. Лісты, вершы, апавяданні, артыкулы.

ГУБАРЭВІЧ Канстанцін Лявонавіч (05.01.1907, в. Радучы, Чавускі р-н, Магілёўская вобл. – 03.07.1987), драматург.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1993 г.*

БДАМЛМ. Ф. 365. 242 адз. зах. за 1925–1987. Дакументы творчай і службовай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ГУДЗІМАЎ Барыс Сяргеевіч (н. 12.12.1919, в.Калыон, Томская вобл., Расія), медык, навуковец, удзельнік Другой сусветнай вайны.

*Дакументы перададзеныя ў НАРБ архіваўтваральнікам у 2003–2004 гг.*

НАРБ. Ф. 1360. 150 адз. зах. за 1928–2004 гг. Біяграфічныя дакументы, дакументы навукова-даследчыцкай і выкладчыцкай дзейнасці (бібліяграфіі, дысертацыі, кнігі, артыкулы, даклады), фотаздымкі (індывідуальныя, у групах).

ГУЗАЎ Васіль Дзмітрыевіч, удзельнік Другой сусветнай вайны, дырэктар Магілёўскага краязнаўчага музея

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1244 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 19. 81 адз. зах. за 1989–1996.

ГУРЛО Алесь (Аляксандр Кандратавіч) (31.01.1892, г. Капыль, Мінская вобл. – 04.02.1938), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ перададзены В. Скалабанам (копіі дакументаў з Цэнтральнага архіва ваенна-марскога флота ў Санкт-Пецярбургу).*

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Адз. зах. 176, 177. Камедыя «Любоў усё змагае», вершы, пераклад.

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор дакументаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 75–77 за 1913–1956. Фотакопіі біяграфічных дакументаў, фотаздымкаў.

ГУРСКІ Ільля Данілавіч (26.04.1899, в.Замосце, Уздзенскі р-н, Мінская вобл. – 11.08.1972), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1988 г.*

БДАМЛМ. Ф. 312. 170 адз. зах. за 1915–1984. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, кнігі.

ГУРЫНОВІЧ Адам (сапр. Гілярый Калікставіч) (13.01.1869, фальварак Ковелькі, Мядзельскі р-н, Мінская вобл. – 14.01.1894), паэт.

*У 1902-х гг. рукапісы паэта захоўваліся ў пляменніцы Я. Гурыновіч. Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ў 1971 з Польшчы праз аддзел культуры ЦК КПБ, згодна пажаданню пляменніцы.*
БДАМЛМ. Ф. 171. 17 адз. зах. за 1887–1921. Вершы, этнаграфічны матэрыял.
ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). 175 адз. зах.

ГУРЫЧ Соф`я Якаўлеўна (29.12.1919, г. Мінск – 28.04.1999), актрыса.
БДАМЛМ. Ф. 358 (неап.).

ГУСЕЎ Валянцін Іванавіч (06.05.1911, в. Александрыя, Стаўрапольскі край, Расія – 17.07.1983), архітэктар.
*Дакументы перададзены у БДАНТД жонкай. Апрацаваны ў 1988 г.*
БДАНТД. Ф. 98. 96 адз. зах. за 1939–1980. Дакументы дзейнасці (праекты, рэцэнзіі, артыкулы), біяграфічныя дакументы, фота-здымкі (будынкаў, індывідуальныя, у групах).

ГУСЕЎ Мікалай Іванавіч (21.12.1899, г. Вязнікі, Расія – 14.02.1965), мастак.
*Дакументы ў БДАМЛМ перададзены жонкай. Апрацаваны ў 1972 г.*
БДАМЛМ. Ф. 170. 50 адз. зах. за 1919–1965. Дакументы творчай дзейнасці (малюнкі, эцюды, фотакопіі прац), біяграфічныя дакументы, ліставанне, дакументы жонкі.

ГУТКОВІЧ Аляксандр Залманавіч (20.12.1920, в. Аскеры, Бешанковіцкі р-н, Віцебская вобл. – 09.09.1989), рэжысёр, драматург.
*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад сястры. Апрацаваны ў 1995 г.*
БДАМЛМ. Ф. 325. 119 адз. зах. за 1942–1989. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

ГУЦІЕЎ Мікалай Цімафеевіч (н. 31.12.1912, г. Растоў-на-Доне, Расія), мастак-графік.
Архіў НММ. 66 адз. зах. Лісты былым падпольшчыкам-вязням лагера ваеннапалонных «Баравуха» у Полацкім р-не Віцебскай вобл. Гісторыя лагернага падполля.

# Д

ДАБРАНСКІ Флавіян Мікалаевіч (16.02.1848, в. Чарніцы, Валынская вобл., Украіна – 1919), гісторык, археограф, філолаг.
БДАМЛМ. Ф. 43 (Калекцыя А. Ельскага). Воп. 1. Адз. зах. 10. Ліст да Ю. Такажэвіча
ДГАЛ. Ф. 996 (фонд Е.Р. Раманава). Воп. 1. Адз. зах. 23 за 1910–1911. Лісты да Е. Раманава.

ДАВІДОВІЧ Янка, выкладчык.
*Дакументы паступілі ад сына Дзмітрыя ў 1997 г.*
Мінскі абласны краязнаўчы музей у Маладзечна. КП 11324–11134 за 1919–1956. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі выпускнікоў Ві-

ленскай беларускай гімназіі 1930-я гг., дакументы да біяграфіі сваячкі С. Мароз 1919–1923.

ДАВЫДАЎ Сяргей Ціграназіч (н. 1908, г. Варонеж, Расія), акцёр.

*Дакументы паступілі ў красавіку 1961 г.*

БДАМЛМ. Ф. 34. 11 адз. зах. за 1950–1961. Дакументы творчай дзейнасці (фотаздымкі роляў, артыкулы), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі (індывідуальныя).

ДАЛЕНГА-ХАДАКОЎСКІ Зарыян Якаўлевіч (сапр. Чарноцкі Адам) (24.12.1784, в. Гайна, Лагойскі р-н, Мінская вобл. – 17.11.1825), археолаг, этнограф, гісторык.

*Пасля смерці навукоўца рукапісы захоўваліся ў жонкі. Перамовы наконт куплі асабістага архіва вёў М. А. Палявы. Упершыню рукапісную спадчыну пачаў даследаваць М. П. Пагодзін. На сённяшні дзень рукапісы Хадакоўскага вядомы больш як у 10 сховішчах Расіі і Польшчы. Асноўная навуковая частка знаходзіцца ў зборах Пагодзіна ў РНБ.*

Аддзел рукапісаў бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта. № 459.

Аддзел рукапісаў Ягелонскай бібліятэкі (Кракаў). Копіі лістоў.

АР РНБ. Ф. 588 (фонд М. П. Пагодзіна). Воп. 4. Выпісы, справаздачы, ліставанне.

Дзяржаўны архіў старажытных актаў (Варшава). Ліставанне.

Мінскі абласны краязнаўчы музей у г. Маладзечна. № 1675. Грамата на дазвол праводзіць археалагічныя раскопкі, працаваць у музеях і бібліятэках (1818).

НДАР РДБ. Фф. 588, 32, 255. Дакументы за 1784–1820 гг.

РДГА. Ф. 733 (фонд Міністэрства народнай асветы). Воп. 2. Адз. зах. 45732 ды інш.

ДАЛЖОНАК Арэст Васільевіч (н. 1935), паэт-песеньнік, выканаўца, дзеяч культуры.

ЗДА ў г. Слуцк. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.) 3 адз. зах. за 1948–1997. Біяграфічныя дакументы, тэксты песень, фотаздымкі.

ДАЛМАТАЎ Сямён Харытонавіч (29.01.1923, в. Беламеснае, Нова-Аскольскі р-н, Белгародская вобл., Расія – 10.10.1999), мастацтвазнаўца.

*Дакументы ў архіў перададзены на захоўванне жонкай Д. Ф. Трафіменка ў 2001 г. Часткова захавана фарміраванне адзінак захоўвання, створанае ўтваральнікам.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 1931. 304 адз. зах. за 1941–2000. Дакументы дзейнасці (артыкулы, даклады, матэрыялы да лекцый, дысертацыя), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, кнігі.

ДАМАШЭВІЧ Уладзімір Максімавіч (17.02.1928, в. Вадзяціна, Навагрудскі р-н, Гродзенская вобл. – 13.04.2014), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка ў 1978 г.*

БДАМЛМ. Ф. 147. 59 адз. зах. за 1952–1978. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДАМБРОЎСКІ Іван Іванавіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1244 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 27. 5 адз. зах. за 1945–1990. Біяграфічныя дакументы, дзённік, успаміны, фотаздымкі.

ДАМЕЙКА Ігнат (31.07.1802, в. Мядзведка, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. – 23.01.1889), геолаг, мінеролаг.

Літ.: Горячева Р.Ф. Перечень архивных документов об Игнатии Домейко в Национальном историческом архиве в г. Гродно [Электронны рэсурс] // Архивы Беларуси – Рэжым доступу: http://archives.gov.by/index.php?id=856917. – Дата доступу: 20.02.2011.

Архіў Польскай акадэміі навук (Варшава).

Аддзел рукапісаў Ягелонскай бібліятэкі (Кракаў). № 10500 (са спадчыны філолага С. Пігоня).

Музей літаратуры імя А. Міцкевіча (Варшава). Ліставанне.

Навуковая бібліятэка Польскай акадэміі навук (Кракаў). Ліставанне, «Мемуары выгнанца», навуковыя працы.

НГАБ у г. Гродна. Фф. 1, 2, 5, 31 за 1824–1841.

Польская бібліятэка і музей А. Міцкевіча (Парыж).

Прыватны архіў сям'і ў Аргенціне.

ДАМЕНІКАН Мікалай Уладзіміравіч (н. 23.03.1931, в. Грускава, Нясвіжскі р-н, Мінская вобл.), працаўнік гаспадаркі, грамадскі і партыйны дзеяч.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 17. 1 адз. зах. за 1955–1995. Граматы, фотаздымак, успаміны.

ДАМІНІКОЎСКІ Фёдар Мікалаевіч (11.01.1905, г. Глыбокае, Віцебская вобл. – 08.04.1949), геолаг, кандыдат сельскагаспадарчых навук.

*Дакументы паступілі ў ЦДАМЛМ БССР ад сына архіваўтваральніка Ў.Ф. Дамінікоўскага ў 1986 г. У 1988 г. перададзеныя ў ЦДАКР як няпрофільныя.*

НАРБ. Ф. 311 (Калекцыя дакументаў вучоных). Воп. 2. 17 адз. зах. за 1930–1985. Дакументы навуковай дзейнасці (артыкулы), біяграфічныя дакументы (пасведчанні), дакументы аб фондаўтваральніку, фотаздымкі.

ДАНІЛАЧКІН Пётр Міхайлавіч (1913, в. Беціна, Касімаўскі р-н, Разанская вобл. – 1991), удзельнік савецка-фінскай вайны і Другой сусветнай вайны, настаўнік.

ЗДА ў г. Маладзечна. Ф. 256. 27 адз. зах. за 1947–1983. Творчыя дакументы (рукапіс кнігі, даклады, лекцыі, артыкулы).

ДАНІЛОВІЧ Ігнат Мікалаевіч (10.08.1787, в. Грыневічы, Бельска-Падляскага ваяв., Польшча – 12.07.1843), гісторык права, археограф.

*Меў багатую калекцыю дакументаў, якія набываў працуючы ў архівах. Неапублікаваныя рукапісы былі набыты Я. Тышкевічам*

*(Віленскі музей старажытнасцей) у 50-я гг. XIX ст. і апублікаваны.*

ДАРАФЕЕВА Зінаіда Кузмінічна (н. 15.05.1929), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДАГА Гомельскай вобл. Ф. 366 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 4. 5 адз. зах. за 1942–1995. Аўтабіяграфія, успаміны, фотаздымкі.

ДАЎГЯЛА Дзмітрый Іванавіч (20.10.1868, в. Каз'яны, Шумілінскі р-н, Віцебская вобл. – 1942), археограф, архівіст, гісторык

*Значная частка дакументаў да 1914 г. трапіла на захоўванне ў аддзел рукапісаў Віленскага ўніверсітэта, дакументы міжваеннага перыяду амаль не захаваліся.*

АР БВУ. Ф. 52. 467 адз. зах. за 1595–1914. Дакументы дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 79 (фонд Л. Абрамовіча). Воп. 1. Адз. зах. 139, 181.

ДГАЛ. Ф. 596 (Віленская археаграфічная камісія). Воп. 1. Адз. зах. 330, 368, 371, 376.

НАРБ. Ф. 249 (Галоўнае архіўнае ўпраўленне). Воп. 5. Адз. зах. 680.

НГАБ у Мінску. Ф. 2771 (фонд Віцебскай вучонай архіўнай камісіі). Воп. 1. Адз. зах. 2790.

ДВАРЧАНІН Ігнат Сымонавіч (27.05.1895, в. Погіры, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл. – 08.12.1937), грамадска-палітычны дзеяч, паэт, пісьменнік.

*Дакументы ў архіў перададзены роднымі.*

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 136 за 1927.–1944 гг. Лісты А. Луцкевічу, ліст ад Р. Зямкевіча.

ДЗЕЖЫЦ Валянцін Канстанцінавіч (09.03.1904, г. Хельсінкі, Фінляндыя –

ДА Віцебскай вобл. Ф. 408. 34 адз. зах. за 1911–1982. Дакументы творчай дзейнасці (малюнкі, рэпрадукцыі, спісы прац, каталогі выстаў), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДЗЕЙНІС Іван Пятровіч (10.02.1900–20.11.1985), гісторык, краязнаўца.

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 5. 26 адз. зах. за 1910–1984. Дакументы навуковай дзейнасці (матэрыялы па гісторыі г. Полацка, рукапісы прац), успаміны.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. КП-3 914 (1–19); 913 (1–75); КП-4 1010 (1–73); КП-5 2567. Дакументы навуковай дзейнасці, біяграфічныя дакументы.

НМГКБ. КП 31617 (1–11). Пасведчанні, фотаздымкі, успаміны 1921–1972.

ДЗЕМЧАНКА Лідзія Аўгусцінаўна (н. 1932, в. Юр'ева, Смалявіцкі р-н, Мінская вобл.), працаўніца Мінскага трактарнага завода.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 11. 7 адз. зах. за 1966–1982. Біяграфічныя да-

кументы (аўтабіяграфія, характарыстыкі, гарматы, пасведчанні; дакументы аб утваральніку), фотаздымкі.

ДЗЕМЯШКЕВІЧ Адам Станіслававіч (1902–1961), удзельнік Другой сусветнай вайны, ваеннакамандуючы.

БДМГВАВ. КП 14413 (1–48) за 1943–1961 гг. Біяграфічныя дакументы.

ДЗЕНІСЕНКА Рыгор Кірылавіч (н. 10.05.1921), удзельнік Другой сусветнай вайны, ваенны лётчык.

ДАГА Гомельскай вобл. Ф. 366. 7 адз. зах. за 1943–2001. Публікацыі, аўтабіяграфія, фотаздымкі.

ДЗЕНІСЕНКА Іван Філіпавіч (1913, в. Норкі, Чэрыкаўскі р-н, Магілёўская вобл. –05.07.1943), журналіст.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад сястры. Апрацаваны ў 1962 г.*

БДАМЛМ. Ф. 16. 12 адз. зах. за 1937–1963. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДЗЕНІСЮК Захар Захаравіч (н. 1922), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Кобрыне. Ф. 611 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, войнаў-інтэрнацыяналістаў, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 3. 26 адз. зах. за 1933–2006 гг.

ДЗЯДЗЮШКА Уладзімір Іосіфавіч (14.02.1905, г. Мінск – 30.03.1973), акцёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад Т.М. Шашалевіч (жонкі) у 1983 і 1988 гг.*

БДАМЛМ. Ф. 272 (сямейны фонд). Воп. 1. Адз. зах. 1–22; Воп. 2. Адз. зах. 1–57 за 1926–1985. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

ДЗЯЖУРКА Іосіф Раманавіч (26.08.1928, в. Тумень, Дубровіцкі р-н, Ровенская вобл., Украіна – 15.01.2002), удзельнік Другой сусветнай вайны, партызан, настаўнік матэматыкі.

ЗДА ў г. Пінск. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 26. 29 адз. зах. за 1944–2001. Біяграфічныя дакументы, артыкулы ў газетах утваральніка і аб утваральніку, ліставанне з ветэранамі, фотаздымкі баявых сяброў.

ДЗЯМЕШКА Сцяпан Цімафеевіч (1922, в. Бушмін, Аршанскі р-н, Віцебская вобл. – 2002), настаўнік, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Маладзечна. Ф. 231. 23 адз. зах. за 1961–1992. Творчыя дакументы (апавяданні, выступленні, рэцэнзіі, выразкі з газет), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДЗЯМ'ЯНЧЫК Іван Ігнацьевіч (1904, в. Хацілаўцы, Глыбоцкі р-н, Віцебскай вобл. – 1979), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Глыбокае. Ф. 200 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 1. Адз. зах. 1 за 1943–1946. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДЗЯНІСАЎ З. Н. (1914–1964), біёлаг, балотазнаўца.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23 (Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры, літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 713–724. Дакументы навуковай дзейнасці.

ДЗЯРЖЫНСКІ (сапр. Чаржынскі) Уладзіслаў Вікенцьевіч (май 1897, в. Старакаменная, Беластоцкае ваяв., Польшча – 02.04.1974), літаратуразнаўца.

*Дакументы ў БДАМЛМ перададзены Ю. Раманоўскай. У ДМГБЛ у 1991 г. ад Р. У. Маслоўскай.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах.78–80 за 1922–1960. Водгук, фотаздымкі.

ДМГБЛ. КП 7594–7647. Біяграфічныя і службовыя дакументы, рукапісы, ліставанне, фотаздымкі.

ДЗЯРКАЧ Анатоль (сапр. Зіміёнка Анатоль Рыгоравіч) (18.04.1887, в. Турэц, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. – 05.09.1937), паэт.

*Дакументы у БДАМЛМ перададзены дачкой у 1987 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 81–89 за 1903–1992. Вершы, паэмы, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ДЗЯТЛАЎ Яўген Канстанцінавіч (17.05.1923, в. Бабы, Чэрвенскі р-н., Мінская вобл. –11.03.2003), архітэктар, удзельнік Другой сусветнай вайны.

*Дакументы у БДАНТД паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1995 г.*

БДАНТД. Ф. 158. 99 адз. зах. за 1944–1989. Дакументы дзейнасці (эскізы праектаў, партызанскія малюнкі, артыкулы), біяграфічныя дакументы (характарыстыкі, граматы ды інш.).

ДЗМІТРУК Праскоўя Фёдараўна (н. 1899, в. Ліскі, Камянецкі р-н, Брэсцкая вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Брэсцкай вобл. Ф. 500* (Калекцыя дакументаў членаў КПЗБ, удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Вялікай Айчыннай вайны, сабраная В.П. Ласковічам). Воп. 5. Адз.зах 1. за 1976–1976. Успаміны.

---

* У вопісе 8 сабранай В. П. Ласковічам калекцыі захоўваецца 5 адз. зах. за 1944–1984 гг., уключаючы дакументы і ўспаміны І. М. Абрамчука, М. А. Абрамчука, А. А. Антонава, І. М. Андрыевіча, Я. Е. Беразнюка, А. І. Багданчука, В. Т. Варанянскага, І. П. Галадко, А. Я. Галоўчыка, А. І. Ганчарука, А. В. Горбата, І. Д. Гузеева, В. П. Гуля, М. М. Дворнікава, Н. Я. Дзягцярыка, Н. В. Дарашэнкі, І. А. Духовіча, Т. Д. Жука, Р. А. Зінчука, І. С. Зубко, А. Г. Зырко, Т. І. Зырко, Т. Ф. Кармановіча, В. М. Кірылкі, Дз. К. Клімава, І. Е. Калесніка, Н. Г. Капыціча, В. А. Капыціча, М. І. Карэцкага, І. Т. Кахновіча, Ф. К. Крата, А. Л. Кухарчука, П. А. Лебедзя, Т. Дз. Ліберoўскай, М. М. Лапуха, У. І. Мацвеева, Ю. В. Міранчука, В. Міхалеўскай, С. Панковай, Д. Г. Петрукевіча, А. Я. Піскуна, П. А. Паляшчук , А. І. Прыступы, Л. Я. Пучака , А. Р. Рубінчыка, І. Дз. Рудчыка, Т. С. Сайчука, П. Ф. Савуціна, П. І. Сярова, Г. К. Сіткавец, Дз. А. Сліжа, А. К. Шчаснай, С. Л. Татарына , В. Н. Трафімука, Ф. Г. Трацюка, А. Г. Хацкевіча, З. Г. Халадовіча, І. А. Хурса, Н. І. Чалей , Дз. Чарнака, М. Чарнака, Г. Ф. Шабуцькі, Г. М. Шпарко, Б. І. Ярашэвіча, І. І. Ясіновіча і дакументы аб гэтых асобах.

ДОГЕЛЬ Мацей (06.08.1715, б. в. Гембулы, Лідскі р-н, Гродзенская вобл. – 24.02.1760), гісторык-архівіст, педагог, прававед.

*Частка дакументаў да 1832 г. захоўвалася ў бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта.*

Курніцкая бібліятэка Польскай акадэміі навук (Познань), матэрыялы да зборніка «Межы Польскага каралеўства...»

АР РНБ. Рукапіс «Кодэкса Каралеўства Польскага і ВКЛ».

ДОРСКІ Іосіф Львовіч (17.12.1911, г. Мінск – 07.12.1964), драматург.

*Дакументы ў ДА Віцебскай вобл. паступілі ў 1996 г. у дар ад дачкі, сфарміраваны сямейны фонд.*

БДАМЛМ. Ф. 286 (неап.).

ДА Віцебскай вобл. Ф. 8 (сямейны). Воп. 2. Адз. зах. 1–73 за 1929–1970. Дакументы дзейнасці (п'есы, нарысы), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДОЎГІРД Анёл (02.12.1776, в. Юркаўшчына, Мсціслаўскі р-н, Магілёўская вобл. – 26.04.1835), філосаф, логік.

Навуковая бібліятэка НАН Украіны (Львоў). № 906.

ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКІ Мітрафан (14.06.1867, г. Рэчыца, Гомельская вобл. – 30.09.1934), гісторык.

*Дакументы гісторыка захоўваюцца больш як у 10 сховішчах Беларусі, Расіі, Украіны.*

Літ.: Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі: Біябібліяграфічны паказальнік / уклад. В. У. Скалабан ды інш. – Мінск: НББ, 2001. – 120 с.; Михальченко С. И. Личный фонд М. В. Довнар-Запольского в Центральном государственном историческом архиве Ўкраины в Киеве // Замежная архіўная беларусіка. Матэрыялы міжнароднай навук. канф. / Дзяржкамітэт па архівах і справаводству Рэсп. Беларусь; БелНДІДАС; Бел. асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА [ды інш.] – Мінск, 1998.– С. 262–269.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 86.

ВАКМ. № 9893.

НДАК НББ. Ф. 2 (Збор матэрыялаў дзеячаў навукі і культуры Беларусі). Воп. 1. Адз. зах. 1. Артыкул.

ЦДГАУ ў Кіеве. Ф. 262. 212 адз. зах. за 1518–1918.

ДРАЗДОВІЧ Язэп Нарцысавіч (01.09.1888, засценак Пунькі, Глыбоцкі р-н, Віцебская вобл. – 15.08.1954), грамадскі дзеяч, мастак, скульптар, этнограф, фалькларыст, археолаг, літаратар.

*Асабісты архіў быў набыты АРКР ЦНБ НАН Беларусі ў 1965 г. у сястры фондаўтваральніка, частка даваенных дакументаў захоўвалася ў музеі імя І. Луцкевіча ў Вільні.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 2. Воп. 1. 79 адз. зах. за 1798–1963. Творчыя дакументы (малюнкі, эскізы, накіды, фотаздымкі карцін; артыкулы; паэмы і вершы; аповесці і апавяданні; фальклорны матэрыял), біяграфічныя дакументы, дзённікі, ліставанне (лісты ад Б. І. Эпімах-Шыпілы, В. Ластоўскага, А. Луцкевіча, сямейнае ліставанне), фотаздымкі, дакументы сям'і Драздовічаў.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 87–127 за 1920–1933. Дакументы творчай дзейнасці (спіс прац, рукапісы аповесцяў, лексічныя матэрыялы), ліставанне ў тым ліку лісты ад К. Езавітава, В. Ластоўскага, С. Некрашэвіча, генеалагічнае дрэва Драздовічаў.

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя музея імя А. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах. 221 за 1930–1932. Запрашальныя білеты на імя Драздовіча.

ДРАЗДОЎ Мікалай Васільевіч (18.11.1913, г. Кастрама, Расія – 2006), архітэктар.

*Дакументы ў БДАНТД паступілі ад архіваўтваральніка, апрацаваны ў 1997 г.*

БДАНТД. Ф. 165. 130 адз. зах. за 1945–1988. Дакументы творчай дзейнасці (фотаздымкі будынкаў, праекты), малюнкі і фотаздымкі сяброў.

ДРАЗДОЎСКІ Станіслаў Іосіфавіч (н. 1920), перакладчык твораў сусветнай літаратуры на беларускую мову .

*Дакументы апрацаваны ў 1977 г.*

БДАМЛМ. Ф. 104. 7 адз. зах. за 1958–1978. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі

ДРАЙЧУК Якаў Іванавіч (н. 21.11.1901, в. Ржаўка, Слаўгарадскі р-н, Магілёўская вобл.), генерал-маёр авіяцыі, дзеяч культуры.

*Якаў Іванавіч і яго жонка настаўніца Зінаіда Васільеўна, сабралі вялікую бібліятэку каля 20 тыс. тамоў і перадалі яе на радзіму Якава Іванавіча. Шмат кніг з аўтографамі пісьменнікаў, навукоўцаў, акцёраў і г. д. У выніку адклалася вялікая колькасць лістоў ад асоб, якія дарылі кнігі. Гэтае ліставанне было перададзена ў ЦДАМЛМ БССР у 1968 г.*

БДАМЛМ. Ф. 151 (Калекцыя лістоў пісьменнікаў і ваенных мемуарыстаў). 196 адз. зах. за 1960–1971.

ДРОБАЎ Леанід Ніканоравіч (н. 06.08.1926, в. Растаў, Акцябрскі р-н, Гомельская вобл.), мастак, мастацтвазнаўца.

БДАМЛМ. Ф. 106 (неап.).

ДРУКЕР Соф`я Юр`еўна (07.01.1907, г. п. Копысь, Аршанскі р-н, Віцебская вобл. –21.04.1984), спявачка.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад пляменніка В. А. Фрэйдзіна ў 1985 г.*

БДАМЛМ. Ф. 98 (сямейны). 54 адз. зах. за 1933–1985. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

НМГКБ. КП 35166–35174. Праграмы канцэртаў, афішы, граматы.

ДРЭЙЗІН Юльян Мікалаевіч (22.09.1879, г. Днепрапятроўск, Украіна – 28.03.1942), музыказнаўца.

*Дакументы паступілі ад Дрэйзінай Веры Юльянаўны. Апрацаваны ў 1997.*

Літ.: Макарэвіч І. Дакументы Юльяна Дрэйзіна ў фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва // Архівы і справаводства. – 2009. – № 5. – С. 122–125.

БДАМЛМ. Ф. 401. 192 адз. зах. за 1942–1994. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, калекцыя сямейных фотаздымкаў, рэчы.

ДУБАЎ Георгій Савельевіч (09.12.1933, г. Чыта, Расія – 09.08.1995), акцёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1992 г. У ДА Віцебскай вобл. – ад жонкі акцёра Т. Г. Шашкінай у 1998 г.*

БДАМЛМ. Ф. 258. 38 адз. зах. за 1955– пач. 1980-х гг. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДА Віцебскай вобл. Ф. 2295. Воп. 1. Адз. зах. 1–190 за 1942–1997. Дакументы дзейнасці (тэксты роляў, фотаздымкі ў ролях), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДУБЕЙКОЎСКІ Лявон Іванавіч (07.07.1869, в. Дубейкава, Мсціслаўскі р-н, Магілёўская вобл. – 06.11.1940), грамадска-палітычны дзеяч, інжынер, архітэктар.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23 (Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры, літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 127–128, 725–745 за 1893–1940. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, сабраныя дакументы.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 127–128 за 1944 г. Прымаўкі, артыкул.

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя музея імя І. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах. 235–239 за 1903–1938 гг.

ДУБОЎКА Уладзімір Мікалаевіч (12.07.1900, в. Агароднікі, Пастаўскі р-н, Віцебскай вобл. – 20.03.1976), пісьменнік.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад архіваўтваральніка ў 1962 г. ад жонкі паэта ў 1977 г., ад А.А. Бабарэка – у 1999. АРКР ЦНБ набыў дакументы ва ўдавы пісьменніка ў 1976, матэрыялы перадаваліся і ў 1977 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 14. 962 адз. зах. за 1901–1971. Творчыя дакументы (вершы, паэмы, аповесці, казкі, пераклады, артыкулы), успаміны, нататнікі, ліставанне з рознымі асобамі і арганізацыямі, біяграфічныя дакументы (атэстат, біяграфічныя даведкі, пасведчанні), фотаздымкі індывідуальныя, сям'і, з беларускімі пісьменнікамі, дакументы бытавога характару (даведкі, заявы, дагаворы), дакументы аб архіваўтваральніку (артыкулы аб жыцці і творчасці), дакументы родных.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 129 за 1922–1944. Артыкул, ліст.

БДАМЛМ. Ф. 27. Воп. 1–3. 149 адз. зах. за 1900–1976. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы, дакументы жонкі, рэчы, кнігі з дароўнымі надпісамі.

РДАЛМ. Ф. 595. Воп. 1. Адз. зах. 314. Асабістая справа студэнта Вышэйшага літаратурна-мастацкага інстытута імя В. Я. Брусава Ў. М. Дубоўкі; Ф. 2175 (фонд С. П. Злобіна ). Воп. 5. Адз. зах. 106. Успаміны.

ДУБОЎСКІ Канстанцін Мікалаевіч (н. 1923, в. Іканы, Бягомльскі р-н, Мінская вобл.), генеральны дырэктар Мінскага вытворчага аб'яднання па птушкагадоўлі

*Дакументы на захоўванне перадаюцца часткамі самім утваральнікам.*

ДА Мінскай вобл. Ф.1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 2. 33 адз. зах. за 1968–2004. Біяграфічныя дакументы (граматы, пасведчанні ды інш.), дакументы службовай дзейнасці (даклады, выступленні), фотаздымкі падчас мерапрыемстваў.

БДАМЛМ. Ф. 311. 18 адз. зах. за 1819–1910. Дакументы творчай дзейнасці (нарысы, артыкулы), біяграфічныя дакументы, ліставанне з роднымі і з дзеячамі нацыянальнага руху, фотаздымкі, малюнкі, рэчы.

НДАК НББ. Ф. 1. 26 адз. зах. за 1894–1915.

РДАЛМ. Ф. 680 (фонд Вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства). Воп. 2. Адз. зах. 583. Асабістая справа К. К. Кастравіцкага, навучэнца Вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства (1885–1890).

КАГАНОВІЧ Моўша, бабруйскі купец.

*Дакументы ў НГАБ. Апрацаваны ў 1962 г.*

НГАБ. Ф. 1563. 6 адз. зах. за 1861–1862. Фінансава-гаспадарчыя дакументы (рахункавыя кнігі, кнігі запісаў продажу тавараў ды інш.)

КАЖАМЯКІН Аляксандр Дзмітрыевіч (1899, в. Дзям'янка, Добрушскі р-н, Гомельская вобл. – 1986), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Барысаве. Ф. 707 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны,

працаўнікоў тылу і сацыялістычнага будаўніцтва, дзеячаў культуры). Воп. 7. 12 адз. зах. за 1944–1985 гг. Аўтабіяграфія, граматы, віншаванні, фотаздымкі, выступленні, артыкулы аб дзеячы ў газетах.

КАЗАНЦАЎ Аляксей Васільевіч (н. 07.08.1922, в. Сугаяк, Бродакалмакоўскага р-на, Чэлябінская вобл.), працаўнік прамысловасці, дырэктар завода «Луч».

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 37. 17 адз. зах. за 1947–1992. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, граматы, пасведчанні), дакументы працоўнай дзейнасці, фотаздымкі.

КАЗБЯРУК Уладзімір Міхайлавіч (н. 29.08.1923, в. Бандары, Беластоцкае ваяв., Польшча), літаратуразнаўца.

БДАМЛМ. Ф. 343 (неап.).

КАЗЕКА Іван Дарафеевіч (18.08.1915, в. Кострычы, Бабруйскі р-н, Мінская вобл. –04.03.2000), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1974 г.*

БДАМЛМ. Ф. 189. 79 адз. зах. за 1946–1973. Дакументы творчай і службовай дзейнасці.

КАЗІМІРОЎСКІ Саламон Савельевіч (15.04.1915, г. Бабруйск, Магілёўская вобл.), рэжысёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 2002 г.*

БДАМЛМ. Ф. 324. 46 адз. зах. за 1940–1986. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КАЗІНЦОЎ-ПРАКОПЧЫК Яўген Сцяпанавіч (1889–1977), удзельнік рэвалюцыйных і ваенных дзеянняў 1917–1921 і Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Слуцку. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 7. 2 адз. зах. за 1958–1975. Біяграфічныя дакументы.

КАЗЛОЎ Васілій Іванавіч (18.02.1903, в. Заграддзе, Жлобінскі р-н, Гомельская вобл. – 02.12.1967), партыйны і дзяржаўны дзеяч, удзельнік Другой сусветнай вайны, арганізатар партызанскага руху.

БДМГВАВ. КП 54994–55013; 55794–55803; 47869–47877 за 1942–1967. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, рэчы.

КАЗЛОЎСКАЯ Елізавета Мікалаеўна, настаўніца, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1244 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 11. 1 адз. зах. за 1942–1954. Лісты родных, знаёмых, франтавікоў, вучняў.

КАЛАДЗЕЕЎ Іван Хрысанфавіч (1859, г. Барысаў, Мінская вобл. – 19.05.1914), землеўладальнік Мінскай губ., інжынер, калекцыянер

*Меў вялікую калекцыю эстампаў, гравюр, літаграфій аб падзеях 1812 г., а таксама бібліятэку з 15 тыс. тамоў. У 1915 г. удава калекцыянера перадала ў дар Дзяржаўнаму гістарычнаму музею больш 3 тыс адз. зах. выяўленчага матэрыялу, частку бібліятэкі і асабісты архіў.*

АПК ДГМ. Ф. 143. 3 адз. зах. Службовае ліставанне, карты Бярэзінскай воднай сістэмы.

КАЗЛОЎ Уладзімір Сямёнавіч (21.06.1921, Жлобінскі р-н, Гомельская вобл. – 01.01.2004), удзельнік Другой сусветнай вайны, чыгуначнік-сувязіст.

ЗДА ў г. Мазыры. Ф. 286 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг., партызанскага руху на Палессі, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі). Воп. 1. Адз. зах. 111–117 за 1943–2007. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, пасведчанні, характарыстыкі ды інш.), успаміны аб удзеле ў Вялікай Айчыннай вайне, артыкулы аб утваральніку, фотаздымкі.

КАЗЛОЎСКІ Міхаіл Міхайлавіч (н. 09.02.1960, в. Рабінавая, Маладзечанскі р-н, Мінская вобл.), грамадскі дзеяч, публіцыст.

ЗДА у г. Маладзечна. Ф. 285. 21 адз. зах. за 1998–2003. Творчыя дакументы (нарысы, артыкулы, рэцэнзіі, выступленні), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КАЛЕНІК Сцяпан Васільевіч (н. 01.01.1922, г. Петрыкаў, Гомельская вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, інжынер.

ЗДА ў г. Мазыры. Ф. 286 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг., партызанскага руху на Палессі, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі). Воп. 1. Адз. зах. 102–110 за 1945–2005. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, пасведчанні, граматы ды інш.), копіі, віншаванні, фотаздымак.

КАЛЕСНІК Уладзімір Андрэевіч (17.09.1922, в. Сіняўская Слабада, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. – 15.12.1994), літаратуразнаўца.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ў 1969 г. ад самога ўтваральніка.*

БДАМЛМ. Ф. 161. 11 адз. зах. за 1965–1968. Дакументы творчай дзейнасці (артыкулы, нарысы).

КАЛЕСНІКАЎ Іван Ягоравіч (н. 1910, в. Быцень, Івацэвіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), член КПЗБ, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 14. 1 адз. зах. за 1983. Успаміны.

КАЛЕШКА Алена Іванаўна (н. 1930), грамадска-палітычны дзеяч, другі сакратар райкома партыі Старадарожскага раёна.

ЗДА ў г. Слуцк. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 11. 5 адз. зах. за 1954–1982. Біяграфічныя дакументы, артыкулы аб утваральніку ў перыядычным друку, ліставанне, успаміны, фотаздымкі.

КАЛІНІН Міхаіл Сямёнавіч (27.09.1905, г. Лудза, Латвія – 14.02.1957), мастак.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад С. М. Афанасьевай (дачкі) у 1995 г.*

БДАМЛМ. Ф. 374 (Збор архіваў дзеячаў мастацтва). Воп. 1. 10 адз. зах. за 1923–1983. Дакументы творчай дзейнасці (малюнкі, акварэлі і г. д., біяграфічныя дакументы, дзённік, фотаздымкі.

КАЛОША Вольга Лукінічна (н. 1910, в. Лукі, Карэліцкі р-н, Гродзенскай вобл.), працаўнік сельскай гаспадаркі.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 17. 5 адз. зах. за 1956–1980. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыкі, граматы, пасведчанні, артыкулы аб утваральніку), фотаздымкі.

КАЛЮГА Лукаш (сапр. Вашына Канстанцін Пятровіч) (27.09.1909, в. Скварцы, Дзяржынскі р-н, Мінская вобл. – 05.10.1937), пісьменнік.

БДАМЛМ. Ф. 356 (неап.).

КАМЕНДАНТ Стэфан Аляксандравіч (1913–1992), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Кобрыне. Ф. 611 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, войнаў-інтэрнацыяналістаў, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 9. 12 адз. зах. за 1939–1988. Біяграфічныя дакументы.

КАМЕНШЧЫКАЎ Васілій Віктаравіч (1879–1959), удзельнік рэвалюцыйнага руху і ваенных дзеянняў у 1917–1920 гг., працаўнік чыгункі.

НМГКБ. 17 адз. зах. за 1914–1921. Біяграфічныя дакументы.

КАМІНСКІ Мікалай Іванавіч (05.12.1928, в. Масоры, Глыбоцкі р-н, Віцебская вобл. – 18.11.1992), гісторык, архівіст.

*Асабісты архіў паступіў у НАРБ у 1995 г. ад дачкі Таццяны Мікалаеўны Камінскай.*

НАРБ. Ф. 591. 817 адз. зах. за 1884–1992. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыка, дыпломная работа), дакументы навуковай дзейнасці (спісы навуковых прац, артыкулы, рэцэнзіі, водгукі), сабраныя дакументы (картатэкі, газеты, кнігі, дакументы Беларускага музея ў Вільні, калекцыі артыкулаў па розных пытаннях), фотаздымкі.

КАМЯНЕЦКІ Гірш Мордухавіч (15.12.1985, в. Чарняўка, Крупскі р-н, Мінская вобл. – 25.04.1957), паэт, публіцыст, драматург.

*Дакументы захаваліся ў выніку дзейнасці архівістаў па збору дакументаў.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор дакументаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 318–319 за 1958–2007. Падборкі да зборніка «Выбраныя вершы».

КАНАПЕЛЬКА Зінаіда Ігнатаўна (25.12.1918, в. Багушэўск, Сенненскі р-н, Віцебская вобл. – 27.05.1997), актрыса.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1987 г.*

БДАМЛМ. Ф. 262. 125 адз. зах. за 1936–1982. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

ДА Віцебскай вобл. Ф. 946. 91 адз. зах. за 1934–1997. Дакументы дзейнасці (тэксты роляў, фотаздымкі ў ролях, успаміны, артыкулы аб тэатры і выступленнях, рэцэнзіі), ліставанне, фотаздымкі.

КАНАТОПАЎ Іван Рыгоравіч (03.06.1920, в. Арзгір, Стаўрапольскі край, Расія), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131. Воп. 15. 1 адз. зах. за 1939–1990. Успаміны, аўтабіяграфія, фотаздымкі, артыкулы аб архіваўтваральніку.

КАНДРАТОВІЧ Васіль Іванавіч (28.12.1906, г. Клінск, Гомельскі р-н – 08.01.1993), будаўнік, дырэктар інстытута «Белдзяржпраект».

*Дакументы перададзены ўтваральнікам. Апрацаваны ў 1989 г.*

БДАНТД. Ф. 104. Воп. 1–2. 105 адз. зах. за 1934–1976. Біяграфічныя дакументы, артыкулы, спісы навуковых прац, фотаздымкі.

КАНДРАШОЎ Васіль Мікалаевіч (н. 1916, в. Рапное, Балашоўскі р-н, Саратаўская вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, кіраўнік архіўнага аддзела Мінаблвыканкама.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 12. 15 адз. зах. за 1952–1988. Біяграфічныя дакументы (анкета, граматы, пасведчанні), успаміны, ліставанне, фотаздымкі.

КАНДРАШОЎ Уладзімір Мікалаевіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Гомельскай вобласці. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. Адз. зах. 39 за 1990. Успаміны аб Другой сусветнай вайне.

КАНІСКІ Георгій (20.11.1717, г. Нежын, Украіна – 13.02.1795), беларускі архіепіскап.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23 (Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры, літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 1161.

ЦДГАУ г. Львове. Ф. 201 (Львоўская грэка-каталіцкая кансісторыя). Воп. 4в. Адз. зах. 273. Урыўкі з дзённіка.

КАНЦАВЫ Анатоль Кузьміч (н. 1929, в. Званец, Рагачоўскі р-н, Гомельскай вобл.), працаўнік гаспадаркі, працаўнік Мінскага мотавелазавода.
ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 24. 8 адз. зах. за 1952–1986. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыкі, граматы, пасведчанні, артыкулы аб утваральніку), тэксты выступленняў, фотаздымкі.

КАНЧАР Яўсей Стэфанавіч (20.09.1882, в. Сяўкі, Лоеўскі р-н, Гомельская вобл. – 16.05.1979), грамадска-палітычны дзеяч, даследчык эканамічнай геаграфіі, гісторык.
*Дакументы перададзены ў 1988 з ЦДАМЛМ БССР як непрофільныя.*
НАРБ. Ф. 311 (Калекцыя дакументаў вучоных). Воп. 4. 48 адз. зах. за 1899–1979. Біяграфічныя дакументы, дзённікі, успаміны, дакументы творчай і навуковай дзейнасці (вершы, артыкулы, нарысы ды інш.), ліставанне, фотаздымкі, збор гістарычных нарысаў у рукапісах.

КАНЬКОЎ Рыгор Ермалаевіч (1915–1984), удзельнік Другой сусветнай вайны, дырэктар ЗДА ў г. Слуцку.
ЗДА ў г. Слуцку. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). 3 адз. зах. 1941–1984. Артыкулы аб утваральніку, аўтабіяграфія, граматы, фотаздымкі.

КАНЭ Юлія Міхайлаўна (н. 21.08.1931, г. Масква, Расія), літаратурны крытык.
*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1994.*
БДАМЛМ. Ф. 24 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 57–162 за 1928–1991. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, дакументы сабраныя ўтваральнікам.

КАПІЧ Мікалай Фёдаравіч (н. 15.08.1918, в. Шаенка, Шумілінскі р-н, Віцебская вобл.), гісторык, удзельнік Другой сусветнай вайны, дырэктар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ (1969–1975).
*Дакументы НАРБ паступілі ад утваральніка.*
НАРБ. Ф. 1465. 69 адз. зах. за 1940–2005. Біяграфічныя дакументы, дакументы навуковай дзейнасці (дысертацыі, кнігі, брашуры), фотаздымкі, дароўныя надпісы.

КАПКО Аляксандр Мікалаевіч (н. 1925), удзельнік Другой сусветнай вайны.
ЗДА ў г. Слуцку. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі,

грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). 4 адз. зах. за 1944–1980. Успаміны, артыкулы, аўтабіяграфія, фотаздымкі.

КАПЛІЧ Міхаіл Дзмітрыевіч (1900, в. Сітніцкі Двор, Лунінецкі р-н, Брэсцкая вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, палітрук роты партызанскага атрада імя Чкалава.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 2. 4 адз. зах. за 1944–1964. Фотакопія характарыстыкі і загаду, выдадзеная камандзірам партызанскага атрада імя Чкалава, успаміны, ліст.

КАПУСТА Філіп Філіпавіч (1907–1973), адзін з арганізатараў партызанскага руху на Беласточчыне.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. КП 26275–26284 (1–15) за 1943–1957.

КАПУСЦІН Аляксандр Пятровіч (12.02.1924, в. Старая Рудня, Жлобінскі р-н, Гомельская вобл. – 16.10.1996), пісьменнік.

БДАМЛМ. Ф. 299 (неап.).

КАПЫСКІ Залман Юдавіч (19.01.1916, г. Віцебск – 14.12.1996), гісторык.

*Асабісты архіў перададзены ў НАРБ у 2002 сынам гісторыка.*

НАРБ. Ф. 1115. 130 адз. зах. за 1601–1990. Біяграфічныя дакументы, дакументы навуковай дзейнасці (дысертацыі, манаграфіі, артыкулы, планы працы, копіі і арыгіналы архіўных дакументаў перыяда ВКЛ), дароўныя надпісы розных асоб.

КАРАСЁЎ Пётр Іванавіч (н. 1895, в. Каменка, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл.), удзельнік рэвалюцыйнага руху.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 1. 16 адз. зах. за 1958–1974. Успаміны, артыкулы, нарысы, біяграфічныя дакументы (архіўныя даведкі).

НАРБ. Ф. 357 (Калекцыя дакументаў ветэранаў партыі і ўдзельнікаў грамадзянскай вайны). Воп. 1. Адз. зах. 7–18 за 1940–1971. Дакументы грамадскай дзейнасці, успаміны, фотаздымкі (індывідуальныя, падчас мерапрыемстваў).

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. КП 26562, 26811 (1–14) за 1912–1966. Біяграфічныя дакументы.

КАРАСЁЎ Анатоль Дзмітрыевіч (13.02.1947, г. Гродна – 21.03.2004), гісторык-архівіст.

Літ.: О создании фонда А.Д. Карасева в Государственном архиве Гомельской области // БАШ. – Вып. 6. – Мінск: БелНДІДАС, 2005. – С. 348–349.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 1393. 35 адз. зах. за 1977–2004. Дакументы навуковай дзейнасці (даследаванне па гісторыі Старакапытаўскага

мецяжу, генеалагічныя і біяграфічныя даследаванні), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, відэафільм.

КАРАТКЕВІЧ Уладзімір Сямёнавіч (26.11.1930, г. Орша, Віцебская вобл. – 25.07.1984), пісьменнік.

*Дакументы ў АРРК ЦНБ НАН Беларусі перададзены самім пісьменнікам у 1970 і 1981 гг. У 1990 гг. А. Верабей і З. Нядзеля перадалі лісты Караткевіча. Дакументы ў БДАМЛМ паступалі ад утваральніка і ад А.В. Мальдзіса у 1985 г., ад дачкі сябра, пісьменніка Ю. К. Гальперына, Т. Ю. Куляшовай. У ДМГКБ дакументы перададзены сястрой Н. С. Кучкоўскай у 1993 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 11. 283 адз. зах. за 1948–1984. Дакументы аб утваральніку, творчыя дакументы (зборнікі паэзіі, раманы, аповесці, зборнікі прозы, казкі, п'есы, сцэнарыі, лібрэта, пераклады, артыкулы, даклады), дакументы грамадскай дзейнасці, архіў Аляксандры Ігнатаўны Смоліч (1905–1974), ліставанне.

БДАМЛМ. Ф. 56. Воп. 1–2. 85 адз. зах. за 1953–2007. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы лісты Ў. Караткевіча да Ю. Гальперына, фотаздымкі.

ДМГБЛ. № 9282–9336, 10423–10436. Фотаздымкі, афішы, рэчы.

КАРАТЫНСКІ Вінцэнт (15.08.1831, в. Селішча, Навагрудскі р-н, Гродзенская вобл.– 07.02.1891), паэт.

*Бібліятэка Каратынскіх згарэла ў 1944 г. у Варшаве. Мемуары Бруна Каратынскага «Аб людзях і рэчах» захоўваюцца ў прыватным архіве Генрыха Каратынскага.*

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава). № 2679.

КАРАЦЕЕЎ Юры Ўладзіміравіч, грамадскі дзеяч, старшыня Магілёўскага аддзела «Беларускага камітэта ветэранаў надзвычайнай рызыкі», ваенны.

ДАГА Магілёўскай вобл. Ф. 415 (закрыты для выкарыстання). 4 адз. зах. за 1995–2004. Артыкулы, успаміны, біяграфічныя дакументы, дакументы службовай дзейнасці.

КАРАЧУН Юрый Аляксандравіч (27.12.1931, г. Мінск – 11.06.1997), мастацтвазнаўца, графік, дырэктар Дзяржаўнага мастацкага музея.

*Дакументы паступілі ад утваральніка і непасрэдна з музея ў 1994 г.*

Архіў НММ. Ф. 2 (Калекцыя дакументальных матэрыялаў навуковых супрацоўнікаў НММ Рэспублікі Беларусь). Воп. 7. 132 адз. зах. за 1977–2005. Дакументы дзейнасці (артыкулы, выступленні, рэцэнзіі), біяграфічныя дакументы, сабраныя дакументы аб працы дзяржаўных устаноў і грамадскіх аб'яднанняў, дзейнасць якіх звязана з музейным жыццём (камісія ЮНЭСКА, Міжнародны савет музеяў), фотаздымкі.

КАРЛОВІЧ Ян (28.05.1836, г. Субартоніс, Літва – 14.06.1903), польскі лінгвіст, этнограф.

ДГАЛ. Ф. 1135. (Таварыства прыяцеляў навук у Вільні). Воп. 10. 249 адз. зах. за 1500–1908.

Навуковая бібліятэка НАН Украіны (Львоў). Фонд Я. Галавацкага. Ліставанне.

КАРМІЛКІН Уладзімір Паўлавіч (15.02.1933, г. Смаленск, Расія – 16.07.2002), фатограф, журналіст, летапісец беларускага нацыянальнага руху 90-х гг. ХХ ст.

*Дакументы паступілі ў Архіў найноўшай гісторыі пасля смерці ўтваральніка.*

Літ.: Шанскі А. Архіў Кармілкіна // Наша ніва. – 2002. – № 29. [Электрон. рэсурс] – Рэжым доступу: http://www.nn.by/2002/29/10.htm – Дата доступу: 16.08.2010.

АНГ. Дакументы партыі «Беларускі народны фронт» (афіцыйныя, аўдыёзапісы сходаў, фотаздымкі) за 1988–1997.

КАРМУНІН Павел Васільевіч (28.01.1919, г. Вялікія Ключы, Татарстан – 01.03.2002), акцёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад утваральніка. Апрацаваны ў 1989 г. Дакументы ў ДМГКБ паступілі ў 2006 г.*

ДМГТМК. КП 9016–9018. Біяграфічныя дакументы.

БДАМЛМ. Ф. 320. 104 адз. зах. за 1908–1989. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КАРОЛЬ Уладзімір Адамавіч (27.12.1912, г. Чэрвень, Мінская вобл. – 28.05.1980), архітэктар.

*Дакументы ў БДАНТД паступілі ад сына, апрацаваны ў 1996 г.*

Літ.: Шостак Г. И. Творчество архитектора В. А. Короля [Электронны рэсурс] // Архивы Беларуси – Рэжым доступу: http://archives.gov.by/index.php?id=808124. – Дата доступу: 20.02.2011.

БДАНТД. Ф. 51. 326 адз. зах. за 1925–1980. Дакументы творчай і службовай дзейнасці (артыкулы, выступленні, нататкі), біяграфічныя дакументы, ліставанне. Артыкулы аб утваральніку, фотаздымкі аб'ектаў спраектаваных утваральнікам.

НМГКБ. КП 34247–34278. Білеты, пасведчанні, граматы, тэлеграмы.

КАРОТЧАНКА Дзмітрый Іванавіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1244 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 16. 6 адз. зах. за 1925–1944.

КАРПАЎ Уладзімір Барысавіч (26.02.1912, г. Хвалынск, Саратаўская вобл., Расія –06.09.1977), пісьменнік.

*Дакументы паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1988 г.*

БДАМЛМ. Ф. 305. 405 адз. зах. за 1932–1984. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, калекцыя.

КАРПАЧОВА Ася Ісаеўна (н. 13.04.1924, г. Нежын, Украіна), архівіст, старэйшы метадыст аддзела НСА ГАУ пры СМ БССР.

НАРБ. Ф. 355 (Калекцыя дакументаў старэйшых архівістаў Беларусі). Воп. 1. Адз. зах. 25–41 за 1924–1992. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, працоўная кніжка, пасведчанні, граматы, дыпломы), артыкулы (аб методыцы працы ведамасных архіваў), фота-

здымкі. Ф. 249 (фонд ГАУ пры СМ БССР). Воп. 5. Адз. зах. 479, 652, 653, 800, 861. Дакументы службовай дзейнасці.

КАРПАЧОЎ Афраім Маісеевіч (10.07.1914, г. Трубчэўск, Бранская вобл., Расія –18.06.1988), гісторык, удзельнік Другой сусветнай вайны.

*Дакументы паступілі ў ліпені 1992 г. ад удавы А. І. Карпачовай.*

НАРБ. Ф. 598. 245 адз. зах. за 1939–1992. Біяграфічныя дакументы (асабістыя дакументы), творчыя дакументы (дысертацыі, спісы навуковых прац, матэрыялы да іх), мемуарныя (нататнікі), эпісталярныя (ліставанне, дароўныя надпісы), выяўленчыя (фотаздымкі).

КАРПЕНКА Генадзь Дзмітрыевіч (17.09.1949, г. Мінск – 06.04.1999), грамадскі дзеяч, намеснік старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1995–1996), вучоны ў галіне тэхнічных навук.

*Дакументы паступілі ў НАРБ у 2001 г. ад жонкі.*

НАРБ. Ф. 1376. 82 адз. зах. за 1962–2002. Біяграфічныя дакументы (пасведчанні, аўтабіяграфія, дыпломы), дакументы навуковай дзейнасці (дысертацыя, аўтарскія пасведчанні, артыкулы, планы навуковай працы), дакументы грамадска-палітычнай дзейнасці (даведкі, заявы, скаргі ды інш.), дакументы аб архіваўтваральніку (артыкулы, спачуванні ды інш.), фотаздымкі.

КАРПЮК Аляксей Нічыпаравіч (14.04.1920, в. Страшава, Беластоцкае ваяв., Польшча –14.07.1997), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 2000 г.*

БДАМЛМ. Ф. 257. 477 адз. зах. за 1939–1999. Дакументы творчай і грамадска-палітычнай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, нататнікі, ліставанне, фотаздымкі, дакументы сабраны для работ па розных тэмах, рэчы.

ДА Гродзенскай вобл. Ф. 239 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 7. 38 адз. зах. за 1962–1986. Выступленні, лісты, віншаванні.

КАРСКІ Яўхім (01.01.1861, в. Лаша, Гродзенскі р-н – 29.04.1931), мовазнаўца, этнограф, фалькларыст, літаратуразнаўца, грамадскі дзеяч.

*Бібліятэка захоўваецца ў НББ. Асноўная частка архіва – у АРАН СПб, некаторыя дакументы – у прыватным архіве ўнука А. А. Карскага.*

Літ.: Спадчына акадэміка Яўхіма Карскага: да 150-годдзя з дня нараджэння /адказны за выпуск К. В. Суша [Электронны рэсурс] – Мінск: НББ, 2010. – 1 CD-ROM.

АРАН СПб. Ф. 292. 194 адз. зах. за 1883–1932. Біяграфічныя дакументы, дакументы дзейнасці, сабраныя дакументы, ліставанне.

АПК ДГМ. Ф. 37 (фонд П. К. Сімані). Адз. зах. 50 за 1894–1920.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 79 (фонд Л. Абрамовіча). Адз. зах. 89, 92, 165, 294, 295.

Дзяржаўны архіў горада Варшавы. S. 645. 208 л. за 1872–1916. Дакументы аб працы ў якасці рэктара Варшаўскага ўніверсітэта (фармулярны спіс, пасведчанні, заявы, копія пашпарту ды інш.)

КАРЫБСКІ Пётр Андрэевіч (н. 04.07.1923, г. Жлобін, Гомельская вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, вайсковец.

ЗДА ў г. Жлобіне. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры). Воп. 9. 8 адз. зах. за 1944–1993. Аўтабіяграфія, граматы, ліставанне, артыкулы, успаміны, фотаздымкі.

КАРЫЗНА Уладзімір Уладзіміравіч (н. 25.05.1938, в. Закружжа, Мінскі р-н), пісьменнік.

*Дакументы перададзены пісьменнікам у 2004 г.*

ДМГБЛ. КП 020061–020168. Рукапісы твораў.

КАРЫПІДЗІ Эдуард Георгіевіч (н. 1936), грамадска-палітычны дзеяч, дэпутат абласнога савета.

ДАГА Гродзенскай вобл. Ф. 57. 7 адз. зах. за 1968–1999. Біяграфічныя дакументы, дакументы службовай дзейнасці, фотаздымкі.

КАСАКОЎСКІ (Душачкін) Андрэй Валянцінавіч (20.06.1923, г. Жыздра, Украіна – 07.03.1985), акцёр.

*Дакументы паступілі ад жонкі А. І. Клімавай і сына А. А. Душачкіна.*

БДАМЛМ. Ф. 228 (сямейны). Воп. 2. Адз. зах. 204–244; Воп. 3. Адз.зах 154–164 за 1913–1987. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КАСАЛАПАЎ Якаў Ягоравіч (12.03.1933, г. Орша, Віцебская вобл. – 08.07.1982), кампазітар, выкладчык Віцебскага музыкальнага вучылішча.

*Дакументы ў архіў перададзены ўдавой Е. В. Касалапавай у 1991 і 1994 г.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 2450. Воп. 1–2. 54 адз. зах. за 1934–1994. Дакументы дзейнасці (нотныя рукапісы, зборнікі твораў), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы

КАСМОВІЧ Дзмітрый (21.09.1909, г. Нясвіж, Мінская вобл. – 23.04.1991), палітычны і грамадскі дзеяч, выдавец.

*Пасля смерці дзеяча архіў захоўваўся яго жонкай Надзеяй. Рукапіс яго біяграфічнай працы «За вольную і суверэнную Беларусь» у пачатку стагоддзя перададзены ў Беларусь і апублікаваны. Пасля са Штудгарта архіў быў перавезены ў Варшаву. У 2005 г. большая частка архіву перавезена ў Мінск і захоўваецца ў зборах Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына». Частка застаецца ў Варшаве.*

Літ.: Гардзіенка Н. Архіў Дзмітрыя Касмовіча // Запісы. Беларускі Інстытут навукі й мастацтва / рэдкал. Н. Гардзіенка [ды інш.]. – Т. 32. – Нью-Йорк–Мінск, 2009. – С. 482–498; Буель С. Архіў Дзьмітрыя Касмовіча (1909–1991) // Запісы. Беларускі Інстытут навукі й мастацтва / рэдкал. Н. Гардзіенка [ды інш.]. – Т. 36. – Нью-Йорк–Мінск, 2013.

Зборы Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына». 4 скрыні. 35 тэчак за 1945–1991 гг. Дакументы грамадскай і даследчыцкай дзейнасці (рукапісы ўспамінаў, даследчыцкіх прац; матэрыялы

Згуртавання беларускіх патрыётаў, Беларускага вызвольнага фронту; матэрыялы аб удзеле ў міжнародных канферэнцыях), ліставанне з рознымі асобамі і ўстановамі па гадах.

КАСПЯРОВІЧ Мікалай Іванавіч (09.05.1900, в. Ізабалёва, Пухавіцкі р-н, Мінская вобл.–26.12.1937), краязнаўца, гісторык, мовазнаўца.

*Асабісты архіў не захаваўся. Дакументы аб дзейнасці захоўваюцца ў фондах НАРБ, НГАБ, ЦНА НАН Беларусі, ДА Магілёўскай вобласці, ДА Віцебскай вобл., прыватных архівах (А. Ліса ды інш.) Гэта біяграфічныя дакументы, дакументы навуковай, краязнаўчай і грамадска-палітычнай дзейнасці, выяўленчыя матэрыялы.*

Літ.: «Усім вядомы Вам Мікола Каспяровіч». Каталог выставы / склад. Г.В. Запартыка [ды інш.] – Мінск: БелНДІДАС, 2002. – 28 с.

БДАМЛМ. Ф. 429 (неап.). Асабістыя дакументы (пасведчанне аб заканчэнні школы, пасведчанне аб працы школьным інструктарам беларускага аддзела Наркамасветы, Беларусі, пасведчанне аб заканчэнні інстытута народнай асветы ў Мінску), фотаздымкі сямейныя, індывідуальныя.

ДА Віцебскай вобл. Ф. 170. Воп. 1. Адз. зах. 4, 5, 8, 12, 13, 37, 110, 133, 313; Ф. 256. Воп. 1. Адз. зах. 4. Дакументы службовай дзейнасці.

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 325. Воп. 1. Адз. зах. 48. Дакументы службовай (настаўніцкай) дзейнасці.

НАРБ. Дакументы службовай дзейнасці (звароты, рахункі, ліставанне) у складзе розных фондаў.

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 67. Воп. 1. Адз. зах. 7. Асабістая справа, дакументы службовай дзейнасці.

КАСЦЕВІЧ Соф'я Васільеўна (н. 30.09.1906, г. Самара), грамадскі дзеяч, сакратар камсамольскай арганізацыі.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 39. 9 адз. зах. за 1914–1994. Біяграфічныя дакументы (дакументы аб утваральніку), успаміны, ліставанне, фотаздымкі.

КАСЦЕНІЧ Ярафей Васільевіч (16.10.1854, в. Мужычок, Хоцімскі р-н, Магілёўская вобл. – 24.12.1906), медык, клінічны прафесар Варшаўскага шпіталя, навуковец у галіне афтальмалогіі.

ДА Магілёўскай вобласці. Ф. 1244 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 10. 2 адз. зах. за 1854–1976. Фотакопіі дакументаў, што захоўваюцца РДГА ў Санкт-Пецярбургу: выпіскі аб нараджэнні і хрышчэнні, пасведчання студэнта, паслужны спіс ды інш.

КАСЦЮШКА Тадэвуш (12.02.1746, б. фальварак Мерачоўшчына, Івацэвіцкі р-н, Брэсцкая вобл. – 15.20.1817), грамадска-палітычны дзеяч.

*У 1818, згодна з тэстаментам, архіў Касцюшкі быў знішчаны ў прысутнасці натарыуса. З захаваўшыхся дакументаў няшмат аўтографаў, найбольшая частка дакументаў аб дзейнасці сабрана ў Польскім музеі ў Раперсвілі (Швейцарыя) у XIX ст., загінула*

*падчас Другой сусветнай вайны разам са зборамі Нацыянальнай бібліятэкі. Дакументы аб яго дзейнасці захоўваюцца больш як у 10 сховішчах.*

Аддзел рукапісаў Нацыянальнага музея (Варшава). Лісты.

Дзяржаўны архіў у Кракаве. Ф. 645/83, 1794–1798 ды інш.

Дзяржаўны архіў у Познані. Ф. 5113 (сямейны архіў Касцюшкаў з Кобрынскага пав.). 1639–1810 ды інш.

Курніцкая бібліятэка Польскай акадэміі навук (Познань). Матэрыялы дзейнасці, вопіс кампаніі, малюнкі, ліставанне.

Навуковая бібліятэка Польскай акадэміі навук (Кракаў). Ліставанне, асабістыя і ўрадавыя дакументы.

Нацыянальны музей (Кракаў). Асабістыя дакументы, ліставанне.

КАСЯК Янка (Іван Іванавіч), (01.11.1909, в. Гіры, Вілейскі р-н, Мінская вобл. – 13.03.1989), грамадска-палітычны дзеяч, публіцыст.

*Дакументы захоўваюцца ў бібліятэцы Рутгерскага ўніверсітэта ў Нью-Брансруіку (штат Нью-Джэрсі, ЗША). Апрацаваныя Лёляй Касоўскай-Лапіцкай.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23 (Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры, літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 749–751 за 1926–1965.

КАТАЕВІЧ Ліндзель Маркавіч, удзельнік рэвалюцыйных падзей 1917 г.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3531 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. 1 адз. зах. Успаміны аб падзеях 1917–1918 гг.

КАТКОЎ Сяргей Пятровіч (01.17.1911, в. Скрыпініна, Пензенская вобл., Расія – 17.02.1976), мастак.

*Дакументы перададзены дачкой у 1994 г.*

Архіў НММ. Фонд неапрацаваны. 14 адз. зах. Біяграфічныя дакументы, дакументы творчай дзейнасці.

КАЎКА Аляксей Канстанцінавіч (н. 20.09.1937, в. Равецкі Бор, Чэрвеньскі р-н, Мінская вобл.), гісторык, літаратуразнаўца.

*Дакументы паступалі на дзяржаўнае захоўванне ў БДАМЛМ ад архіваўтваральніка на працягу 1988–1998 гг. і пасля.*

БДАМЛМ. Ф. 340. 1025 адз. зах. за 1950–2005. Дакументы творчай дзейнасці (артыкулы, манаграфіі, дысертацыі), біяграфічныя дакументы, ліставанне, дзённікі за 1950–1990-я гг., фотаздымкі, сабраныя дакументы аб асобах беларускай гісторыі.

КАХАНОВІЧ Міхаіл Сілуянавіч (27.09.1882, в. Вялікія Лукі, Баранавіцкі р-н, Брэсцкая вобл. – 19.05.1934), грамадска-палітычны дзеяч, педагог.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 206, 207 за 1920. Лісты, нататкі па гісторыі.

КАХАНОЎСКІ Генадзь Аляксандравіч (08.01.1936, в. Домашы, Маладзечанскі р-н, Мінская вобл. – 15.01.1994), гісторык, краязнаўца.

*Частка асабістага архіва была прынята ЗДА ў г. Маладзечна ў 1988, другая – знаходзіцца ў прыватнай уласнасці родных.*
ЗДА ў г. Маладзечна. Ф. 252. 24 адз. зах. за 1965–1988. Дакументы навуковай дзейнасці (рукапісы артыкулаў, манаграфій).

КАЦАР Міхаіл Сяргеевіч (07.11.1906, в. Клімавічы, Сенненскі р-н, Віцебская вобл. – 30.03.1995), мастацтвазнаўца.
*Дакументы паступілі ад самога ўтваральніка ў 1973, 1986 гг.*
БДАМЛМ. Ф. 149. Воп. 1–4. 999 адз. зах. за 1910–/1991/. Дакументы навуковай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, калекцыя (фотаздымкі помнікаў архітэктуры, афіш, плакатаў), рэчы, кнігі.

КАЦНЕЛЬСОН Абрам Ісакавіч (01.01.1914, в. Гародня, Чарнігаўская вобл., Украіна –21.08.2003), украінскі паэт, перакладчык.
*Дакументы адклаліся ў выніку дзейнасці архівістаў па збору дакументаў.*
БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 366 за 1972. Верш «Білорусі».

КАЦОВІЧ Лазар Абрамавіч (05.10.1903, г. Мінск – 13.07.1953), пісьменнік.
*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі ў 1975 г.*
БДАМЛМ. Ф. 196. 89 адз. зах. за 1934–1973. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, дакументы розных асоб.

КАЦЭВІЧ Соф'я Васілеўна, працаўнік прамысловасці.
ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 9. 5 адз.зах за 1914–1994. Біяграфічныя дакументы.

КАЧАН Якаў Іосіфавіч (17.09.1918, в. Лампекі, Калінкавіцкі р-н, Гомельская вобл.), журналіст, удзельнік Другой сусветнай вайны.
*Дакументы ў НАРБ перададзены архіваўтваральнікам у 2005 г.*
НАРБ. Ф. 345 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны). Воп. 3. 16 адз. зах. 1941–2000. Аўтабіяграфія, калекцыя газет «Молодой партизан», дзённікі партызан М.Ф. Біруліна, І.А. Сенкевіча ды інш.

КАЧАТКОЎ Рыгор Аляксеевіч (19.01.1904, в. Шмялеўка, Цяцюшскі р-н, Татарстан – 15.10.1968), акцёр.
*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1973 г.*
БДАМЛМ. Ф. 172. Воп. 1. 109 адз. зах. за 1918–1966. Дакументы творчай дзейнасці біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

КАШКУРЭВІЧ Арлен (Арсен) Міхайлавіч (15.09.1929, г. Мінск – 26.08.2013), мастак- графік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1985 г.*

БДАМЛМ. Ф. 249. 131 адз. зах. за 1952–1984. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, фотаздымкі.

КАШЭЛЬНІКАВА Раіса Мікалаеўна (17.09.1904, в. Баршчоўка, Хойніцкі р-н, Гомельская вобл. – 29.11.1980), актрыса.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка і ад пляменніцы. У ДМГМТК – у 1991 г.*

БДАМЛМ. Ф. 96. Воп. 1–2. 124 адз. зах. за 1926–1980. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя, дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ДМГТМК. КП 65(1–65), 66. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КАЯЛОВІЧ Міхаіл Восіпавіч (02.10.1828, м. Кузніца, Беластоцкае ваяв., Польшча – 04.09.1891), гісторык, публіцыст.

РДАЛМ. Ф. 1077 (сямейны). Воп. 1. 5 адз. зах. за 1870–1915. У склад архіва ўваходзяць дакументы яго сына Міхаіла Міхайлавіча (1859–1916), журналіста.

КЕЖУН Браніслаў Адольфавіч (26.08.1914, г. Санкт-Пецярбург – 1984), рускі паэт, перакладчык.

*Дакументы перададзены жонкай Я. Дз. Кежун з Санкт-Пецярбурга ў 1988 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 336–354 за 1932–1984. Пераклады вершаў, лісты і паштоўкі Э. Агняцвет, В. Віткі, С. Грахоўскага, К. Кірэенкі ды інш., фотаздымкі.

КЕРКО Ганна Сцяпанаўна (н. 18.12.1925, в. Кіявец, Люблінскае ваяв., Польшча), працаўнік трыкатажнай прамысловасці, грамадскі дзеяч.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 20. Адз. зах. 1 за 1966–1979. Аўтабіяграфія, фотаздымкі ды інш.

КІВЕЙША Алена Іванаўна (н. 05.12.1932, в. Львоўшчына, Дзятлаўскі р-н, Гродзенская вобл.), навуковец у галіне эканомікі.

*Дакументы у БДАНТД перададзены архіваўтваральнікам.*

БДАНТД. Ф. 217. 55 адз. зах. за 1957–2003. Дакументы навуковай дзейнасці (артыкулы, дысертацыі, метадычныя рэкамендацыі ды інш.), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КІПЕЛЬ Вітаўт (н. 30.05.1927, г. Мінск), грамадскі і культурны дзеяч эміграцыі, кіраўнік БІНІМ, геолаг, бібліятэказнаўца.

Даследчыцкі цэнтр гісторыі эміграцыі ўніверсітэта Мінесоты. Ф. 1210. 20 бягучых футаў. Дакументы за 1950–2000. Асабістыя нататкі, ліставанне, даследчыцкія матэрыялы, фотаздымкі, калекцыя перыядычных выданняў і візуальнага матэрыялу з культурных фестываляў 1960–1970 гг.

КІПНІС Надзея Васільеўна (н. 27.12.1923, г. Санкт-Пецярбург), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 24. 6 адз. зах. за 1915–2000. Аўтабіяграфія, успаміны, фотаздымкі.

КІРКЕВІЧ [Аляксандр Іванавіч], журналіст.

ДА Гродзенскай вобл. Ф. 239 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 10. 28 адз. зах. за 1945–1979. Калекцыя ўспамінаў, біяграфічных дакументаў удзельнікаў Другой сусветнай вайны, артыкулы, лісты з фронта да маці за 1945 г.

КІРКЕВІЧ Уладзімір Міхайлавіч (н. 21.05.1938, г. Ак-Курган, Ташкенцкая вобл., Узбекістан), мастак.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 775 (Калекцыя дакументаў выдатных людзей Палесся). Воп. 1. 8 адз. зах. за 1950–1998. Аўтабіяграфія, дыпломы, пасведчанні, артыкулы ў газетах утваральніка і аб утваральніку, фотаздымкі індывідуальныя ў групах з роднымі, акварэль «Будаўніцтва сабора ў г. Пінску».

КІРКОР Адам Ганоры (21.01.1818, в. Слівіна, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл. – 23.11.1886), гісторык, археолаг, выдавец, грамадскі дзеяч.

*Асноўная частка асабістага архіва карэспандэнцыя ў 5 тыс. адз. зах. захоўвалася ў калекцыі А. Ельскага і была перададзена ў 1907 г. Віленскаму таварыству сяброў навук.*

Аддзел рукапісаў Ягелонскай бібліятэкі (Кракаў). № 1497, 4496.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі імя Асалінскіх (Вроцлаў). № 12036, 12273.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 79. (фонд Л. Абрамовіча) Воп. 1. Адз. зах. 82, 85, 262, 290, 437. Лісты.

БДАМЛМ. Ф. 43. (фонд А. Ельскага) Воп. 1. Адз. зах. 9, 12, 13. Лісты.

ДГАЛ. Ф. 1135 (Таварыства прыяцеляў навук у Вільні). Воп. 11. 25 адз. зах. 1854–1867. Карэспандэнцыя.

КІРЫЕНКА Канстанцін Ціханавіч (12.12.1918, в. Гайшын, Слаўгарадскі р-н, Магілёўская вобл. – 15.09.1988), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад дачкі. Апрацаваны ў 1999 г.*

БДАМЛМ. Ф. 415. 348 адз. зах. за 1930–1993. Дакументы творчай дзейнасці, нататнікі, ліставанне, фотаздымкі.

КІРЫЧЭНКА Павел Якаўлевіч (н. 14.01.1927, в. Кірава, Жлобінскі р-н, Гомельская вобл.), рэдактар раённай газеты, дзеяч культуры.

ЗДА ў г. Жлобіне. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры). Воп. 12. 9 адз. зах. за 1967–1997. Аўтабіяграфія, рукапісы артыкулаў, нарысаў.

КІСТАЎ Аляксандр Фёдаравіч (07.09.1903, г. Валгаград, Расія – 14.05.1960), акцёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад родных у 1963 г.*

БДАМЛМ. Ф. 45. 228 адз. зах. за 1921–1961. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, нататнікі, фотаздымкі, дакументы розных асоб, сабраныя дакументы для працы.

КІСЯЛЁЎ Уладзімір Мікалаевіч (28.04.1931, в. Шацк, Пухавіцкі р-н, Мінская вобл.), краязнавец, грамадска-палітычны дзеяч.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 2001 г.*

НАРБ. Ф. 743. 90 адз. зах. за 1891–2000. Біяграфічныя дакументы, дакументы навукова-краязнаўчай дзейнасці (спісы навуковых прац, кнігі, зборнікі, артыкулы), ліставанне (з навукоўцамі і ўстановамі), фотаздымкі, дакументы аб утваральніку.

КІСЯЛЁЎ Ціхан Якаўлевіч (12.08.1917, в. Агароднія-Кузьмініцкая, Гомельскі р-н – 11.01.1983), грамадска-палітычны дзеяч, першы сакратар ЦК КПБ (1980–1983).

*Дакументы ў НАРБ перададзены ў 1999 г. У НМГКБ – у 1984 г. жонкай Н.Ф. Лапіцкай-Кісялёвай.*

НАРБ. Ф. 551. 228 адз. зах. за 1933–1999. Біяграфічныя дакументы (асабістыя дакументы, віншаванні, запрашэнні, дакументы аб ім, дакументы жонкі), дакументы дзяржаўнай і грамадска-палітычнай дзейнасці (даклады, прамовы, інтэрв'ю, артыкулы), дароўныя надпісы, фотаздымкі, медаль.

НМГКБ. КП 37577(1–154). Пасведчанні, граматы, нататнікі, віншаванні, рэчы.

КІСЯЛЁЎ Кузьма Венедыктавіч (01.11.1903, в. Лабкавічы, Крычаўскі р-н, Магілёўская вобл. – 04.05.1977), грамадска-палітычны дзеяч, навуковец у галіне медыцыны, міністр замежных спраў БССР.

*Асабісты архіў быў перададзены на захоўванне ў НАРБ сынам архіваўтваральніка В.К. Кісялёвым у 1990 г.*

НАРБ. Ф. 592. 55 адз. зах. за 1937–1982. Біяграфічныя дакументы, дакументы службовай і творчай дзейнасці (выступленні, артыкулы), фотаздымкі, дакументы аб утваральніку.

НМГКБ. КП 37026–37065. Пасведчанні, фотаздымкі, пропускі, візітоўкі, віншаванні.

КІТ Барыс Уладзіміравіч (н. 06.04.1910, г. Санкт-Пецярбург, Расія), фізік, прафесар Мерыландскага ўніверсітэта, прафесар Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі.

*Дакументы перададзены з асабістага архіва, з Навагрудскага гісторыка-краязнаўчага музея, частка дакументаў сабрана супрацоўнікамі БДАНТД.*

БДАНТД. Ф. 175. 110 адз. зах. за 1928–2002. Дакументы навуковай дзейнасці, успаміны, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, дакументы аб утваральніку.

Беларускі музей у Ляймене (Германія).

КЛАДУХІН Яўген Васільевіч (1890, г. Кіеў, Украіна – 1958), тэатральны дзеяч.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад Н.А. Грудзінінай у 1967 г.*

БДАМЛМ. Ф. 117. 23 адз. зах. за 1921–1961. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, сабраныя дакументы.

КЛАЗ Ілья Сямёнавіч (17.03.1922, г. Магілёў – 22.12.1980), пісьменнік.

*Дакументы паступілі ад самога ўтваральніка ў 1974 г. і жонкі З.Р. Стасевіч ў 1982–1983 гг.*

БДАМЛМ. Ф. 199. Воп. 1–2. 75 адз. зах. за 1957–1974. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

КЛЕЙНБАРТ Леў Максімавіч (15.10.1875, г. Капыль, Слуцкі р-н, Мінская вобл. –20.11.1951), крытык, публіцыст.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад брата М. М. Клейнбарта ў 1973 г.*

БДАМЛМ. Ф. 157. 22 адз. зах. за 1920–1939. Дакументы творчай дзейнасці, дакументы да біяграфіі.

Інстытут рускай літаратуры РАН у Санкт-Пецярбургу (Пушкінскі дом). Ф. 586. 504 адз. зах. за 1896–1934. Біяграфічныя дакументы, дакументы дзейнасці.

КЛІКУШЫН Рыгор Філіпавіч (н. 14.12.1921, в. Садкава, Цюменская вобл., Расія), мастак-паліграфіст, графік.

*Дакументы ў архіў перададзены ўтваральнікам у 2004 г.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 1748. 103 адз. зах. за 1945–2005. Дакументы творчай і службовай дзейнасці (каталогі выстаў, кніга, лекцыі, выступленні, артыкулы), ліставанне, дакументы жонкі, дакументы аб утваральніку.

КЛІМАВА Аляксандра Іванаўна (01.10.1921, в. Затаболаўка, Кустанайская вобл., Казахстан – 13.05.2005), актрыса.

*Дакументы перадаваліся на працягу 1994–2007 гг. Спачатку самой А. І. Клімавай, а потым яе сынам А. А. Душачкіным. У ДМГТМК дакументы паступілі ў 2005 г.*

БДАМЛМ. Ф. 228. Воп. 1. Адз.зах 1–148; Воп. 2. Адз. зах. 1–203; Воп. 3. Адз. зах. 1–152 за 1913–2005. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы, рэчы, кнігі з дароўнымі надпісамі.

ДМГТМК. КП 8383–8394. Біяграфічныя дакументы.

КЛІМАЎ Іван Фролавіч (10.09.1903, в. Касцюкоўка, Гомельскі р-н – 09.10.1991), грамадска-палітычны дзеяч, намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета (1953–1968).

*Асабісты архіў перададзены жонкай архіваўтваральніка ў НАРБ у 1998.*

НАРБ. Ф. 877. 143 адз. зах. за 1936–1991. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, пропускі, запрашэнні, мандаты, пасведчанні), дакументы аб дзейнасці (даклады, пратаколы, рэцэнзіі, водгукі, кнігі),

успаміны аб Вільні 1939 г., аб розных асобах, калекцыя ўспамінаў удзельнікаў грамадзянскай вайны, партызан і падпольшчыкаў Другой сусветнай вайны, дзённікі і справаздачы партызанскіх атрадаў і г. д.

КЛІМЁНАК Максім Аляксандравіч (1902, в. Ніжнія Жары, Брагінскі р-н, Гомельская вобл. – 1992), працаўнік гаспадаркі.

ЗДА ў г. Глыбокае. Ф. 200 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжанння). Воп. 1. 7 адз. зах. за 1967–1988. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КЛІМЕНКА Васіль Парфір'евіч (н. 1922, в. Каіры, Гарнастаеўскі р-н, Херсонская вобл., Украіна), удзельнік Другой сусветнай вайны, вайсковец.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 34. 39 адз. зах. за 1942–1993. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, граматы, пасведчанні, артыкулы аб утваральніку), успаміны, артыкулы, выступленні, нарысы, ліставанне, віншаванні, фотаздымкі.

КЛІМЕЦ Міхаіл Паўлавіч (02.07.1938, Пружанскі р-н, Брэсцкая вобл.), краязнавец, удзельнік руху ў Заходняй Беларусі.

Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. КП 1852112 (1–17) за 1955–2000. Біяграфічныя і краязнаўчыя дакументы.

ДА Брэсцкай вобл. Ф. 233. 71 за 1940–1994. Калекцыя краязнаўчых дакументаў па гісторыі Брэсцкай вобласці, фотаздымкі, асабістыя дакументы.

КЛІМКОВІЧ Міхась (Міхаіл Мікалаевіч) (20.11.1899, в. Сілітрынкі, Барысаўскі р-н, Мінская вобл. – 05.11.1954), пісьменнік, крытык.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1975 г.*

БДАМЛМ. Ф. 44. Воп. 1–2. 587 адз. зах. за 1927–1968. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, нататнікі, фотаздымкі, дакументы жонкі, сабраныя дакументы, рэчы.

РДАЛМ. Ф. 631 (фонд Саюза пісьменнікаў СССР). Воп. 15. Адз. зах. 112 за 1936. Даклады на пленуме СП СССР.

КЛІМОВІЧ Адольф Юстынавіч (20.04.1900, в. Клюшчані, Астравецкі р-н, Гродзенская вобл. – 24.10.1970), грамадскі дзеяч, адзін з лідэраў БХД у Заходняй Беларусі, журналіст, выдавец.

*Асабісты архіў набыты АРКР ЦНБ НАН Беларусі ў 1972 г. у жонкі Веранікі Іосіфаўны Клімовіч.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 5. 139 адз. зах. за 1898–1972. Творчыя дакументы (матэрыялы да біяграфічнага слоўніка аб дзеячах беларускай культуры, артыкулы і пераклады), успаміны аб В. Шутовічу, дакументы службовай дзейнасці, ліставанне, фотаздымкі, біяграфічныя дакументы, зборы песень, фальклёру ды інш.

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя музея імя І. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах. 252 за 1937. Ліставанне з віленскім старастам наконт правядзення «Дня беларускай культуры».

КЛІШЭВІЧ Уладзімір Сідаравіч (12.03.1914, в. Краснадворцы, Салігорскі р-н, Мінская вобл. – 14.11.1978), паэт, перакладчык.

*Архіў знаходзіцца ў прыватнай уласнасці сям'і ў ЗША.*

КЛУМАЎ Аляксей Канстанцінавіч (07.08.1907, г. Масква – 25.09.1944), кампазітар, піяніст.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад сястры. Апрацаваны ў 1963.*

БДАМЛМ. Ф. 29. 30 адз. зах. за 1920–1944. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

КЛЮКОЎСКІ Ігнацій (пам. 30.05.1862), удзельнік паўстання 1830–1831, грамадскі дзеяч, мастак, мастацтвазнавец.

*Кнігі і дакументальныя зборы захоўваліся ў Ф. Вратноўскага, некаторыя рукапісы ў 1867 г. перададзены Л. Вейсенгофу. Потым, верагодна, трапілі да Б. Залескага. Пасля разам з яго дакументамі – у архіў Атэля Ламберта, частка якога перададзена ў бібліятэку ў Кракаў. Частка ўспамінаў можа захоўвацца таксама ў сямейным архіве Ромераў (АР ЦБАН Літвы. Ф. 138; ДГАЛ. Ф. 1135. Воп. 18.)*

Літ.: Гарбачова В. В. Архіўная спадчына Ігнацыя Клюкоўскага // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 9. / гал. рэд. Э.М. Савіцкі [ды інш.] – Мінск, 2008. – С. 314–321.

Бібліятэка князёў Чартарыскіх (Кракаў). Рукап 6944 II. 1861–1862. Лісты аб мастацтве да Э. Ромера і Б. Залескага.

Музей Адама Міцкевіча ў Парыжы. Рукап. 1025. Успаміны.

КЛЮЧАНОВІЧ Міхась, пісьменнік.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 231–234 за 1930–1932. Аповесці, лісты.

КЛЮЧЫЦ Мікалай Еўдакімавіч (н. 20.05.1922, в. Хлябы, Пінскі р-н, Брэсцкая вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, падпольшчык.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 3. 9 адз. зах. за 1939–1977. Аўтабіяграфія і асабісты лісток, характарыстыкі, дэпутацкія білеты, фотаздымкі індывідуальныя, успаміны, навуковыя працы па медыцыне, лісты ў архіў аб перадачы дакументаў.

КОБЕЦ Рыгор Якаўлевіч (сапр. Сандыг Міхаіл Мусіевіч) (24.07.1898, в. Малыя Рагачыкі, Кіравацградская вобл., Украіна – 09.09.1990), пісьменнік, сцэнарыст.

*Дакументы ў БДАМЛМ перададзены архіваўтваральнікам у 1967 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 106–111 за /1936/–1994. Дакументы творчай дзейнасці (кінасцэнарыі, п'есы, казкі).

КОЗЕЛ Васіль Паўлавіч (1890–1980), працаўнік гаспадаркі.

ЗДА ў г. Слуцку. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). 4 адз. зах. за 1960–1978 гг. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КОЗЕЛ Іван Васільевіч (21.05.1928, в. Качаны, Маладзечанскі р-н, Мінская вобл. – 30.01.1970), драматург.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі ў 1970 г.*

БДАМЛМ. Ф. 195. 25 адз. зах. за 1945–1970. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КОЗЫР Уладзімір Герасімавіч (н. 01.01.1920), удзельнік Другой сусветнай вайны, падпольшчык.

ДАГА Гомельскай вобл. Ф. 366 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 2. 5 адз. зах. за 1978–2002. Аўтабіяграфія, успаміны, публікацыі, фотаздымкі.

КОКІН Георгій Міхайлавіч (31.01.1907, в. Курба, Яраслаўская вобл., Расія – 30.11.1984), доктар тэхнічных навук, грамадскі дзеяч.

*Дакументы перададзены на дзяржаўнае захоўванне жонкай і дачкой.*

БДАНТД. Ф. 186. 45 адз. зах. за 1929–1987. Дакументы дзейнасці (лекцыі, артыкулы ды інш.), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КОЛАС Якуб (сапр. Міцкевіч Канстанцін Міхайлавіч) (03.11.1882, в. Акінчыцы, Мінская вобл. – 13.08.1956), пісьменнік, грамадска-палітычны дзеяч.

*Даваенны архіў амаль цалкам загінуў у пажары чэрвеня 1944 г. Збор рукапіснай спадчыны Я. Коласа пачаўся пасля яго смерці сынам Данілам Канстанцінавічам. У 1959 г. створаны мемарыяльны музей. Дакументы ў БДАМЛМ сабраныя архівістамі: паступілі ад С.М. Гарадзецкага ў 1966 і ад Р. Гарадзецкай у 1972 г., а таксама выдзелены з фонда Л.А.Бэндэ. Зараз дакументы аб Я. Коласе захоўваюцца ў шэрагу сховішчаў Беларусі і замежжа.*

Літ.: Класік сусветнай літаратуры Я. Колас [Электронны рэсурс] // Архивы Беларуси – Рэжым доступу: http://archives.gov.by/index.php?id=449200. – Дата доступу: 20.02.2011.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 174, 236, 237. за 1898–1905 гг. Рукапісы вершаў.

БДАКФФД. Фотадакументы 1912–1956 гг., фонадакументы (выступленні падчас розных мерапрыемстваў).

БДАМЛМ. Ф. 9 (збор дакументаў). Воп. 1–2. 349 адз. зах. за 1902–1956. Лісты Семыніну П. А., Гарадзецкаму С. М., вершы, фотакопіі дакументаў.

Інстытут сусветнай літаратуры РАН (Масква). Ф. 108. 20 адз. зах. за 1933–1946. Рукапісы на беларускай і рускай мовах, фотаздымкі.

Інстытут рускай літаратуры РАН (Пушкінскі дом). Ф. 586 (фонд Л. М. Клейнбарта).

НДАК НББ. Ф. 2 (Збор матэрыялаў дзеячаў навукі і культуры Беларусі). Воп. 1. Адз. зах. 25, 59–60. Лісты С. Маршака, С. Шувалава знойдзены ў Германіі ў 1945 г. сярод кніг Белдзяржбібліятэкі, вершы 1909–1919, фотаздымкі.

НАРБ. Лісты ў розныя ўстановы ў складзе некалькіх фондаў.

Літаратурны музей Якуба Коласа. Каля 9 тыс адзінак захоўвання пісьмовых дакументаў, а таксама кінафотафонадакументы за 1899–2005 гг.

НГАБ. Ф. 458, 342. Дакументы аб дзейнасці К. Міцкевіча ў пач. XX ст., радаводныя дакументы.

РДАЛМ. Ф. 1628 (фонд А. А. Фадзеева). Воп. 3. Адз. зах. 17. Нататкі; Ф. 1334. Воп. 1. Адз. зах. 1451. Фотаздымкі 1930–пач. 1940-х гг.

КОРБАН Уладзімір Іванавіч (12.08.1910, в. Барань, Аршанскі р-н, Магілёўская вобл.–30.11.1971), паэт, байкапісец.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 183. 229 адз. зах. за 1927–1961. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, рэчы, кнігі.

КОРБУТ Вольга Вікенцьеўна (н. 16.05.1955, г. Гродна), гімнастка.

ДА Гродзенскай вобл. Ф. 239 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 2. 7 адз. зах. за 1972–1975. Лісты ад розных асоб да В. Корбут на адрас Гродзенскага педінстытута, дзе яна навучалася. Перададзены А. Карпюком у 1980 г.

НМГКБ. КП 31190(1–23) за 1970–1972. Дыпломы, граматы, фотаздымкі.

КОРЖ Васіль Захаравіч (14.01.1899, в. Хорастаў, Салігорскі р-н, Мінская вобл. – 05.05.1967), камандуючы партызанскім і падпольным рухам у Беларусі падчас Другой сусветнай вайны.

БДМГВАВ. 16 адз. зах. за 1923–1944. Біяграфічныя дакументы.

НАРБ. Ф. 511. Воп. 2. Адз. зах. 16. Асабовая справа: асабісты ліст па ўліку кадраў, аўтабіяграфія; Ф. 4683. Воп. 3. Адз. зах. 712, 713 за 1941–1960. Дзённік за 1941–1942, успаміны ў 5 сшытках за 1940–1960.

КОРЗАН Тадэвуш (09.11.1839, г. Мінск – 08.03.1918), гісторык, гістарыёграф, дырэктар бібліятэкі Красінскіх.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава). № 5921–5950. Дакументы з фамільнага архіва Корзанаў і Прушынскіх за 1855–1918. Артыкулы, чарнавікі, нататкі, успаміны, альбом з малюнкамі, карэспандэнцыя, лісты і асабістыя паперы.

Навуковая бібліятэка НАН Украіны (Львоў). Артыкулы і рэцэнзіі другой паловы XIX ст.

КОРШАК Аляксей Ігнатавіч (22.02.1920, в. Вуглы, Капыльскі р-н, Мінская вобл. – 27.02.1945), паэт.

*Дакументы сабраны літаратурным музеем СШ № 150 г. Мінска, дзе захоўваюцца дакументы паэтаў, якія загінулі падчас Другой сусветнай вайны.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 393–402 за 1939–/1993/. Фотакопіі вершаў, паштовыя карткі, фотаздымкі, дакументы аб пісьменніку.

КОРШ-САБЛІН Уладзімір Уладзіміравіч (29.04.1900, г. Масква – 06.06.1974), кінарэжысёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1983 г.*

НМГКБ. КП 32041 (1–31). Біяграфічныя дакументы, узнагароды.

БДАМЛМ. Ф. 233. 52 адз. зах. за 1922–1975. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

КРАПІВА Кандрат (сапр. Атраховіч Кандрат Кандратавіч) (05.03.1896, в. Нізок, Уздзенскі р-н, Мінская вобл. – 07.01.1991), пісьменнік.

*Дакументы перададзены на захоўванне ў АРКР ЦНБ НАН Беларусі самім пісьменнікам у студзені 1982 г. У ДМГБЛ паступілі ў 1998 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 22. Воп. 1. 2214 адз. зах. Воп. 2. 615 адз. зах. за 1915–1993. Дакументы творчай дзейнасці (рукапісы і машынапісы п'ес, баек, фельетонаў, артыкулаў ды інш.), дакументы службовай і грамадскай дзейнасці, ліставанне з рознымі асобамі і ўстановамі, біяграфічныя дакументы, дакументы побытавага характару, матэрыялы аб утваральніку, фотаздымкі, збор аўтарэфератаў, брашур, артыкулаў ды інш.

ДМГБЛ. КП 14665–14933. Біяграфічныя дакументы, выразкі з газет, машынапісы твораў, афішы спектакляў.

КРАСКОЎСКІ Іван Ігнатавіч (24.06.1880, в. Дубічы, Беластоцкае ваяв., Польшча –23.08.1955), педагог.

*Архіў перададзены ў АРКР ЦНБ НАН Беларусі дачкой Людмілай Іванаўнай Краскоўскай з Браціславы. Апрацаваны ў 1995 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 16. 178 адз. зах. за 1893–1975. Біяграфічныя дакументы (паслужны спіс, артыкулы аб архіваўтваральніку), дакументы творчай і службовай дзейнасці (артыкулы, лекцыі, літаратурныя працы), дакументы родных, фотаздымкі (індывідуальныя, фотаальбом беларускай гімназіі ў Дзвінску), дакументы родных.

АР ЦБАН Літвы Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 240. Артыкулы.

КРАСНЯНСКІ Уладзімір Гаўрылавіч (09.07.1863, в. Руціна, Наўгародская вобл., Расія – 04.05.1930), архівіст, гісторык.

Літ.: Краснянский, В. Краткий очерк музейного строительства в Витебске. // Віцебскі сшытак. 2000. – № 4. – С. 206–211.

ВАКМ. н/а 1/19, 3/6, 8/12, 10/2, 42/1, 708, 1033/5. Асабістая справа, ліставанне.

КРАСОЎСКІ Яўген Яўстафіевіч (29.11.1908, г. Баку, Азербайджан – 14.07.1980), мастак.

*Дакументы паступілі ад утваральніка і ад жонкі М. І. Красоўскай у 1983 г.*

БДАМЛМ. Ф. 209. Воп. 1–3. 594 адз. зах. за 1930–1981. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы, рэчы, кнігі.

КРАСОЎСКІ Сцяпан Акімавіч (20.08.1897, в. Глухі, Быхаўскі р-н, Магілёўская вобл. – 21.04.1983), удзельнік ваенных падзей 1918–1921 гг. і Другой сусветнай вайны, маршал авіяцыі.

НМГКБ. КП 14430. 10 адз. зах. за 1935–1964. Біяграфічныя дакументы.

Магілёўскі абласны краязнаўчы музей. КП 3874–3911 (1–39) за 1944–1946. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КРАЎЦОЎ Валянцін Акімавіч (14.06.1902, пас. Шырачанка, Краснадарскі край, Расія – 15.01.1963), акцёр.

*Дакументы паступілі ў 1995 г. ад пасынка Л. І. Шацілы.*

БДАМЛМ. Ф. 397 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 41–71 за 1903–1993. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, кнігі.

КРАЎЧАНКА Усевалад Ігнатавіч (14.10.1915, в. Каплічы, Калінкавіцкі р-н, Гомельская вобл. – 27.08.1961), пісьменнік.

*Дакументы паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1964 г.*

БДАМЛМ. Ф. 51. 169 адз. зах. за 1927–1961. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, нататнікі, фотаздымкі, збор аўтографаў Я. Брыля, М. Лынькова ды інш., кнігі.

КРАЎЧАНКА Іван Сяргеевіч (11.09.1902, в. Дзмітраўка, Варонежская вобл., Расія – 13.06.1979), гісторык.

*Асабісты архіў перададзены ў АРКР ЦНБ НАН Беларусі ўдавой архіваўтваральніка Л. Е. Краўчанка ў 1980 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 19. 1358 адз. зах. за 1920–1979. Дакументы навуковай і службовай дзейнасці (манаграфіі, брашуры, артыкулы, успаміны і матэрыялы да іх), дзённік, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, збор аўтарэфератаў, кніг, газет ды інш.

КРАШЭЎСКІ Юзэф Ігнацы (28.07.1812, г. Варшава, Польшча – 19.03.1887), пісьменнік.

*Падчас Другой сусветнай вайны, былі поўнасцю спалены зборы Ю. І. Крашэўскага – гэта каля 100 скрыняў, якія захоўваліся ў аддзеле рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі ў Варшаве і ўтрымлівалі гістарычныя матэрыялы XVIII ст. У 1960 у м. Раманаў (Люблінскага ваяв.) у былой сядзібе Мальскіх і Крашэўскіх арганізаваны музей, у які перададзены дакументы ўнукам паэта Я. Крашэўскім. Копіі дакументаў з Ягелонскай бібліятэкі і Асалінеума захоўваюцца ў Архіве ПАН (Варшава).*

АР ЦБАН Літвы. Ф. 114. Воп. 1. 74 адз. зах. за 1839–1860.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава).

Аддзел рукапісаў Ягелонскай бібліятэкі (Кракаў). № 7922 за 1836–1887.

Нацыянальны музей (Кракаў). Творы, ліставанне.

КРОЛЬ Абрам Іосіфавіч (01.05.1909, г. Мінск – 24.06.1977), мастак.

*Дакументы ў Архіве НММ адклаліся ў выніку працы музея. Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі.*

Архіў НММ. Ф. 3 (Дакументы мастакоў, мастацтвазнаўцаў, іншых асоб, дзейнасць якіх звязана з гісторыяй, культурай, мастацтвам Беларусі). Воп. 10. 31 адз. зах. 1933–1980. Творчыя дакументы (альбомы, лісты з накідамі, фотарэпрадукцыі), біяграфічныя дакументы (пасведчанні, характарыстыкі, творчыя біяграфіі), фотаздымкі.

БДАМЛМ. Ф. 374 (Збор архіваў дзеячаў мастацтва). Воп. 1. Адз. зах. 1–27 за 1932–1988. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, калекцыя.

КРОЛЬ Ліпа Юльевіч (01.05.1913, г. Дзяржынск, Мінская вобл. – 03.02.1990), мастак.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі з музея Вялікай Айчыннай вайны, куды былі перададзены суседкай жонкі мастака.*

БДАМЛМ. Ф. 245. 134 адз. зах. за 1930–1979. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы.

КРУК Леанід Парфір'евіч (22.05.1940, в.Скрычалаў, Хойніцкі р-н, Гомельская вобл. –17.01.1982), акцёр.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1999 г.*

БДАМЛМ. Ф. 368. 93 адз. зах. за 1957–1982. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

КРУК Уладзімір Андрэевіч (1927–2008), фотакарэспандэнт.

БДАМЛМ. Ф. 464 (неап.).

КРУПЕНЯ Іван Ануфрыевіч (14.01.1908–15.06.1952), адзін з кіраўнікоў партызанскага руху падчас Другой сусветнай вайны, грамадска-палітычны дзеяч, міністр земляробства.

*Дакументы перададзены ў 1953 г. жонкай.*

БДМВАВ. КП 34518–34521; 37347–37723; 37724–37738 ды інш. Дакументы службовай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КРУЧКОЎ Васіль Ягоравіч (1921, в. Заокскае, Разанская вобл., Расія – 1985), лётчык, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 23. 6 адз. зах. за 1945–1984. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыкі, граматы, пасведчанні, працоўная кніжка, артыкулы аб утваральніку), фотаздымкі.

КРЫВАНОГАЎ Пётр Якаўлевіч (1922–2000), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Слуцку. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). 6 адз.зах за 1945–1985. Бія-

графічныя дакументы, артыкулы аб ім у перыядычных выданнях, фотаздымкі.

КРЫВАНОСАЎ Міхаіл Пятровіч (01.05.1929, г. Крычаў, Магілёўская вобл. – 11.11.1994), майстар спорту па кіданні молата.

НМГКБ. КП 21371–21387. 7 адз. зах. за 1952–1959. Біяграфічныя дакументы.

КРЫВЕЦ Сяргей Міхайлавіч (псеўд. Сымон Табала, Сярожа Пастушок) (1909, в. Сухінічы, Мастоўскі р-н, Гродзенская вобл. – 28.04.1945), паэт, пісьменнік.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд) Воп. 1. Адз. зах. 599, 600 за 1936. Апавяданні, пададзеныя на конкурс газеты.

КРЫЛОВА Марыя Купрыянаўна, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Адз. зах. 40 за 1985. Успаміны.

КРЫСКАВЕЦ Іван Пятровіч, удзельнік Другой сусветнай вайны, рэдактар раённай Клічаўскай падпольнай газеты.

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1244 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 23. Адз. зах. 1–10 за 1941–1969. Дзённікі, дакументы аб выданні газеты ў ваенны час.

КРЫШТОФІК Анатоль Іванавіч (н. 1917, г. Томск), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 13. 1 адз. зах. за 1944–1972. Успаміны, фотаздымак, копія характарыстыкі.

КРЭЙЦ Ю., латвійскі гісторык.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23 (Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры, літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 753–765 за 1930–1945. Артыкулы, ліставанне з дзеячамі беларускай культуры ў Латвіі, сабраныя дакументы.

КРЭТАР Сямён Давыдавіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. Адз. зах. 28–31. Аўтабіяграфія, кнігі, фотаздымкі.

КРЭЧЭЎСКІ Пётр Антонавіч (07.08.1879, в. Дубна, Мастоўскі р-н, Гродзенская вобл. – 08.03.1928), грамадска-палітычны дзеяч, паэт, драматург, гісторык.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 4 (фонд А. Станкевіча ). Воп. 1. Адз. зах. 95–98 за 1913–1923. Творчыя дакументы (вершы, драмы «Здрада», «Рагнеда»).

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя дакументаў імя І. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах. 254, 255 за 1924–1930.

НАРБ. Ф. 325 (фонд БНР). Воп. 1. Адз. зах. 14. Афіцыйныя лісты; Ф. 459 (фонд В. Русака). Воп. 1. Адз. зах. 27. Артыкул «Патрэбнасць дзяржаўных органаў за мяжой».

КСЯНДЗОЎ Рыгор Васільевіч (н. 1916, в. Рачкі, Веткаўскі р-н, Гомельская вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Магілёўскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 20. Адз. зах. 1 за 1955–1986. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыкі, граматы, пасведчанні, тэксты артыкулаў), ліставанне, фотаздымкі.

КУДРЭВІЧ Уладзімір Мікалаевіч (25.11.1884, г. Чавусы, Магілёўская вобл. – 04.01.1957), мастак.

БДАМЛМ. Ф. 230 (сямейны) (неап.).

КУДРЭВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч (02.05.1927, г. Мінск – 15.02.2003), акцёр.

БДАМЛМ. Ф. 230 (сямейны) (неап.).

КУЗІН Павел Рыгоравіч (н. 30.08.1906, в. Мар'ева, Шольскі р-н, Валагодская вобл., Расія), супрацоўнік органаў НКУС/МУС.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 22. Адз. зах. 1 за 1939–1984. Аўтабіяграфія, асабісты лісток па ўліку кадраў, граматы, пасведчанні, фотаздымкі.

КУЗМІЧ Мікалай Лявонцьевіч, удзельнік руху ў Заходняй Беларусі.

ДА Брэсцкай вобл. Ф. 500 (Калекцыя дакументаў членаў КПЗБ, удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Вялікай Айчыннай вайны, сабраная В.П. Ласковічам ). Воп. 7. Адз. зах. 1–7 за 1926–1987. Лісты родным за 1926–1931 гг. ды інш.

КУЗМЯНКОЎ Адам Васільевіч (н. 1913), удзельнік Другой сусветнай вайны, партыйны кіраўнік.

ЗДА ў г. Рэчыца. Ф. 834. 16 адз. зах. за 1941–2003. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КУЗНЯЕЎ Анатоль Аляксеевіч (28.12.1911, г. Златавуст, Чэлябінская вобл., Расія – 11.04.1988), гісторык, архівіст.

*Дакументы паступілі ад дачкі С.А. Кузняевай у 1997 г.*

НАРБ. Ф. 1463. 163 адз. зах. за 1924–1987. Дакументы дзейнасці (рукапісы кніг і артыкулаў, матэрыялы да іх), сабраныя дакументы (каталогі, картатэкі, паказальнікі, выпісы ды інш.)

КУЗНЯЦОВА Клара Барысаўна (н. 25.09.1934, г. Мінск), тэатразнаўца.

*Дакументы паступілі ад утваральніка у 1992 г.*

БДАМЛМ. Ф. 379 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 22–32 за 1924–1990. Ліставанне, фотаздымкі са спектакляў, праграмы, афішы.

КУЗНЯЦОЎ Іван Іванавіч (24.01.1919, в. Ціманава, Валуйскі р-н, Белградская вобл, Расія – 29.01.1986), кампазітар.

*Дакументы паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 2005 г.*

БДАМЛМ. Ф. 398. 132 адз. зах. за /1940-я гг./–1985. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, рэчы.

КУЗНЯЦОЎ Мікалай Аляксеевіч (н. 1907, г. Чаплыгін, Ліпецкая вобл., Расія), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 5. 11 адз. зах. за 1940–1982. Біяграфічныя дакументы (пасведчанні, граматы, аўтабіяграфія), фотаздымкі, ліставанне з музеямі і рознымі асобамі.

КУЗЬМІН Мікалай Назаравіч, удзельнік Другой сусветнай вайны, працаўнік сферы аховы здароўя.

ДА Віцебскай вобл. Ф. 1900 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны). Воп. 2. 16 адз. зах. Аўтабіяграфія, успаміны, пасведчанні, выразкі з газет.

КУЛАКОЎ Кузьма Львовіч (сапр. Рутштэйн) (16.09.1901, в. Шчадрын, Бабруйскі р-н, Магілёўская вобл. – 06.03.1979), акцёр.

*Дакументы паступілі ў 1979 г. ад жонкі Т.С. Дабралюбавай.*

БДАМЛМ. Ф. 244. 378 адз. зах. за 1929–1979. Дакументы творчай дзейнасці (акцёрскай, рэжысёрскай), успаміны, дзённікавыя запісы, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, дакументы сабраныя па розных тэмах.

КУЛАКОЎСКІ Аляксей Мікалаевіч (24.12.1918, в. Кулакі, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 09.04.1986), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад самога пісьменніка ў 1973 і 1975 гг.*

БДАМЛМ. Ф. 211. 100 адз.зах за 1942–1972. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, сабраныя дакументы розных асоб.

ДМГБЛ. КП 8077–8102. Ліставанне, фотаздымкі.

КУЛЬБАК Майсей Саламонавіч (20.03.1896, г. Смаргонь, Гродзенская вобл. – 17.07.1940), пісьменнік.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1975 г.*

БДАМЛМ. Ф. 182. 23 адз. зах. за 1924–1972. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КУЛЯШОЎ Аркадзь Аляксандравіч (24.01.1914, в. Саматэвічы, Касцюковіцкі р-н, Магілёўская вобл. – 04.02.1978), паэт, перакладчык.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад. А.Ф. Куляшовай у 1997 г.*

БДАМЛМ. Ф. 411. 557 адз. зах. за 1930–1989. Дакументы творчай дзейнасці (паэмы, вершы, артыкулы, нататкі, пераклады), ліставанне, дакументы да біяграфіі (дакументы пра яго), дакументы сабраныя па розных тэмах, фотаздымкі.

КУЛЯШОЎ Уладзімір Аляксеевіч (06.02.1914, в. Саматэвічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл. – 04.02.1978), акцёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ў 1982 і 1990 гг. ад самога акцёра. Частка дакументаў знаходзіцца ў Віцебскім краязнаўчым музеі.*

БДАМЛМ. Ф. 275. 53 адз. зах. за 1941–/1980-я гг./. Дакументы творчай дзейнасці (тэксты роляў, фотаздымкі ў ролях), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДА Віцебскай вобл. Ф. 2420. 102 адз. зах. за 1963–2001. Дакументы дзейнасці (фотаздымкі ў ролях, афішы, праграмы спектакляў, артыкулы, рэцэнзіі), фотаздымкі, дакументы жонкі.

КУНЕЙКА Антон Паўлавіч (1903–1991), член КПЗБ, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Навагрудку. Ф. 394. 5 адз. зах. за 1969–1984. Біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі.

КУНІЦКІ Яўген Анатольевіч (н. 12.07.1968), грамадскі дзеяч.

ДАГА Гомельскай вобл. Ф. 366 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 3. Адз. зах. 1–6 за 1998–2003. Аўтабіяграфія, артыкулы, фотаздымкі.

КУНЬКОЎ Фёдар Сямёнавіч (1900, в. Сухое, Іванаўскі р-н, Брэсцкая вобл. – 15.07.1969), удзельнік Другой сусветнай вайны, камісар партызанскай брыгады.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 5. 3 адз. зах. за 1943–1964. Аўтабіяграфія, копія характарыстыкі, фотаздымкі перыяду Другой сусветнай вайны.

КУПАЛА Янка (сапр. Луцэвіч Іван Дамінікавіч) (07.07.1882, в. Вязынка, Мінскі р-н – 28.06.1942), пісьменнік.

*Ёсць сведчанні, што частка дарэвалюцыйных дакументаў Купалы захоўвалася ў музеі І. Луцкевіча і ў архіве Б. Эпімах-Шыпілы, частка згінула падчас першай нямецкай акупацыі. У 1941 г. дом паэта ў Мінску і дача ў Ляўках згарэлі, а ў пажары загінулі архіў і бібліятэка. У другой палове 1940-х гг. жонка паэта Ўладзіслава Луцэвіч пачала збіраць раскіданы архіў Янкі Купалы, быў створаны Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы (дата афіцыйнага стварэння – 2 ліпеня 1942 г.). Дакументы аб дзейнасці Я. Купалы захоўваюцца ў шэрагу беларускіх і замежных сховішчаў.*

Літ.: Рукапісная спадчына Янкі Купалы: каталог / укл. А.У. Бурбоўская; навук. рэд. і аўтар прадмовы В.П. Рагойша. – Ч. 1–2. – Мінск, 2008–2010; Класік сусветнай літаратуры Я. Купала [Электронны рэсурс] // Архивы Беларуси – Рэжым доступу: http://archives.gov.by/index.php?id=365017. – Дата доступу: 20.02.2011; Запартыка Г.В. Гісторыя архіўнай спадчыны Янкі Купалы // Пра час «Узвышша»: Матэрыялы Ўзвышаўскіх чытанняў (Мінск, 2007). Вып. 4. – Мінск: РІВШ, 2008. – С. 4–15; Паляшчук, А. Матэрыялы аб жыцці і творчасці Янкі Купалы ў Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў // Ар-

хівы і справаводства. – 2007. – № 5. – С. 80–81; Шостак Г. Документы о Янке Купале в Белорусском государственном архиве научно-технической документации // Пра час «Узвышша»: Матэрыялы Ўзвышаўскіх чытанняў (Мінск, 2007). – Вып. 4. – Мінск: РІВШ, 2008. – С. 145–148.

БДАМЛМ. Ф. 8 (збор). Воп. 1–2. 29 адз. зах. за 1908–1945. Копіі лістоў Я. Купалы, што захоўваюцца ў архіве АН СССР (выделены з фонду Л. Бэндэ), дакументы творчай дзейнасці (паэмы, вершы), фотаздымкі, ліставанне, біяграфічныя дакументы; Ф. 3 (Калекцыя музея імя І. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах. 52, 120, 226, 259 ды інш. асобныя лісты і рукапісы вершаў Купалы.

БДАКФФД. Фоназапісы выступленняў Я. Купалы.

Бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане. Рукапіс паэмы «Курган» ды інш.

Інстытут сусветнай літаратуры РАН (Масква). Ф. 109. 14 адз. зах. за 1932–1940. Рукапісы вершаў на беларускай мове, аўтабіяграфія, фотаздымкі індывідуальныя і з Я. Коласам.

Літаратурны музей Янкі Купалы. Больш 4 тыс. адз. зах. за 1908–1982. Аўтографы, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, кнігі, кінадакументы.

Нью-Ёркская публічная бібліятэка. Рукапіс паэмы «Безназоўнае».

РДАЛМ. Ф. 66 (фонд І. Белавусава). Воп. 2. Адз. зах. 10. П’еса «Тутэйшыя», дароўны надпіс; Ф. 2563. Воп. 1. Адз. зах. 140. Фотаздымак. 1930-я гг. ды інш.

КУПРЭВІЧ Алег Васільевіч (н. 07.11.1920, в. Кленнікі, Смалявіцкі р-н, Мінскай вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, генерал-маёр артылерыі.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 31. 5 адз. зах. за 1942–1986. Біяграфічныя дакументы (анкета, характарыстыкі, граматы, пасведчанні), успаміны, фотаздымкі

КУПРЭВІЧ Васіль Феафілавіч (24.01.1897, в. Кальнікі, Смалявіцкі р-н, Мінская вобл. – 17.03.1969), батанік, фізіёлаг, заснавальнік глебавай энзімалогіі.

*Дакументы у АРКР ЦНБ НАН Беларусі перададзены сынам у 1989 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 49. 2405 адз. зах. за 1901–1979. Дакументы навуковай дзейнасці (манаграфіі, артыкулы, даклады, выступленні, матэрыялы да прац), дакументы службовай і грамадскай дзейнасці, ліставанне з рознымі асобамі і ўстановамі, біяграфічныя дакументы і дакументы бытавога характару, фотаздымкі і ілюстрацыйныя матэрыялы, сабраныя дакументы (аўтарэфераты дысертацый, адбіткі артыкулаў, брашуры, артыкулы, выразкі з часопісаў і газет)

НМГКБ. КП 22666 (1–22) за 1934–1970. Фотаздымкі, біяграфічныя дакументы.

КУСКОЎ Мікалай Сямёнавіч (н. 06.11.1931), будаўнік.

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 15. 18 адз. зах. за 1998–1958. Біяграфічныя дакументы.

КУЧАР Алесь (Айзік Эвелевіч) (27.06.1910, в. Прудзішча, Смалявіцкі р-н, Мінская вобл. – 09.07.1996), крытык, драматург.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад сына. Апрацаваны ў 2005 г.*

БДАМЛМ. Ф. 446. 421 адз. зах. за 1907–1990. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, сабраныя дакументы ўдзельнікаў Другой сусветнай вайны, успаміны, кнігі.

КУЧЫНСКІ Віктар Францавіч (н. 1958), грамадска-палітычны дзеяч, дэпутат палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

ЗДА ў г. Кобрыне. Ф. 611 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, войнаў-інтэрнацыяналістаў, грамадска-палітычных дзеячаў). 21 адз. зах. за 1958–2006 гг. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

КУШНЕР (сапр. Кнышаў) Павел Іванавіч (1889, г. Гродна – 1968), грамадскі дзеяч, этнограф і гісторык.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. 29030 (1–112) за 1908–1970. Біяграфічныя дакументы, ліставанне, успаміны, фотаздымкі, кнігі, брашуры.

КУШНЕРАЎ Цярэнцій Мітрафанавіч (н. 12.12.1919, в. Агародня-Гомельская, Добрушскі р-н, Гомельская вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 18. 1 адз. зах. за 1950–1999. Граматы, пасведчанні, фотаздымкі.

## Л

ЛАБАНОК Уладзімір Елісеевіч (03.07.1907, в. Востраў, Пухавіцкі р-н, Мінская вобл. – 04.11.1984), удзельнік Другой сусветнай вайны, адзін з арганізатараў падпольнага і партызанскага руху ў Беларусі.

БДМГВАВ. КП 19355–19361; 56291–56299 за 1943–1944. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ЛАБОВІЧ Арсен Аляксандравіч (н. 28.09.1923, в. Студзянкі, Падляскае ваяв., Польшча), мастацтвазнаўца.

ДМГТМК. КП 3529–3551. Біяграфічныя дакументы.

ЛАБОЙКА Іван Мікалаевіч (21.06.1786, в Золачаў, Харкаўская вобл., Украіна – 15.06.1861), гісторык, моваэнаўца, прафесар Віленскага ўніверсітэта.

*Дакументы ў ДГАЛ паступілі з Дзяржаўнага літаратурнага музея ў Маскве ў 1941 г. Апрацаваны ў 1951.*

АР РНБ, Ф. 440. 15 адз. зах. за 1820–1860. Ліставанне з З. Даленга-Хадакоўскім, Я. Балхавіцінавым, К. Калайдовічам, Я. Тышкевічам ды інш.

ДГАЛ. Ф. 791. 7 адз. зах. за 1821–1825. Ліставанне.

Інстытут рускай літаратуры РАН (Пушкінскі дом). Ф. 154. 119 адз. зах. за 1830–1869. Дакументы навуковай дзейнасці (працы па мовазнаўству і дакументы да іх, выступленні), успаміны, дзённік, развагі, характарыстыкі розных асоб, ліставанне.

ЛАГОЎСКАЯ Алена Іванаўна (12.12.1904, г. Чэрвень, Віцебская вобл. – 29.08.1981), актрыса.

*Дакументы ў архіў паступілі ад дачкі К. А. Ільінскай у 1996 і 1999 гг.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 1120 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 24–34 за 1939–1981. Дакументы да біяграфіі, фотаздымкі.

ЛАДА-ЗАБЛОЦКІ Тадэвуш (27.08.1811, в. Лугінавічы, Сенненскі р-н, Віцебская вобл. – 08.1847), паэт, перакладчык.

Аддзел рукапісаў Ягелонскай бібліятэкі (Кракаў). № 6458/4.

Навуковая бібліятэка НАН Украіны (Львоў). № 653.

ЛАДЗІСАЎ Алег Іванавіч (н. 24.11.1953, г.п. Обаль, Шумілінскі р-н, Віцебская вобл.), мастак.

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 19. 16 адз. зах. за 1986–2001. Дакументы дзейнасці, біяграфічныя дакументы.

ЛАЗАРОЎСКІ Андрэй Іванавіч (02.09.1909, в. Новікі, Мазырскі р-н, Гомельская вобл. – 2002), акцёр Мозырскага драматычнага тэатра імя І. Мележа, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Мазыры. Ф. 289 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг., партызанскага руху на Палессі, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі). Воп. 1. Адз. зах. 71–89 за 1942–2002. Біяграфічныя дакументы (пасведчанні, характарыстыкі, даведкі, граматы ды інш.), запрашэнні, віншаванні, праграмы, сабраныя артыкулы з газет, фотаздымкі індывідуальныя ў групах, сцэн са спектакляў.

ЛАЗОЎСКІ Вячаслаў Антонавіч (н. 04.01.1941), мовазнаўца.

БДАМЛМ. Ф. 377 (калекцыя) (неап.).

ЛАКШТАНАЎ Іосіф Пятровіч (22.08.1911, г. Сумы, Украіна – 11.09.1986), акцёр, рэжысёр.

БДАМЛМ. Ф. 355 (неап.)

ЛАНГБАРД Іосіф Рыгоравіч (18.01.1882, г. Бельск, Польшча – 03.01.1951), архітэктар, педагог.

Літ.: Шостак Г. И. Фонд архитектора Иосифа Лангбарда пополнили новые документы // Архівы і справаводства. – 2008. – № 4. – С. 99–101; Шостак Г. И. Творчество архитектора Иосифа Лангбарда [Электронны рэсурс] // Архивы Бела-

руси – Рэжым доступу: http://archives.gov.by/index.php?id=202804. – Дата доступу: 20.02.2011.

БДАНТД. Ф. 25. 131 адз. зах. за 1914–1950-я гг. Дакументы творчай дзейнасці (праекты, малюнкі), біяграфічныя дакументы.

ЛАПАЦІНА Таццяна Карнееўна (н. 1891), дзеяч мастацтваў, кіраўнік хору ў в. Азярышчы Рэчыцкага р-на.

НМГКБ. КП 10948 (1–33) за 1936–1964.

ЛАПІЦКІ Мікалай (31.12.1907, в. Грэлікі, Вілейскі р-н, Мінскай вобл. – 08.08.1976), грамадска-палітычны дзеяч, святар, настаяцель царквы Св. Ефрасінні ў Рэгенсбруку, ЗША.

*Дакументы захоўваюцца ў Рутгерскім універсітэце (штат Нью-Джэрсі, ЗША), апрацаваны Лёляй Касоўскай-Лапіцкай.*

ЛАРЧАНКА Міхась Рыгоравіч (14.11.1907, в. Хварасцяны, Слаўгарадскі р-н, Магілёўская вобл. – 31.07.1981), літаратуразнаўца, крытык.

БДАМЛМ. Ф. 461 (неап.).

ЛАСКОВІЧ Васілій Пятровіч (н. 18.02.1914, в. Франопаль, Брэсцкі р-н), удзельнік руху ў Заходняй Беларусі, гісторык, калекцыянер.

ДА Брэсцкай вобл. Ф. 500. 396 адз. зах. за 1931–2004. Асабістыя дакументы і вялікая калекцыя дакументаў (успаміны, ліставанне) удзельнікаў руху ў Заходняй Беларусі.

Брэсцкі абласны краязнаўчы музей. Біяграфічныя дакументы, частка калекцыі.

ЛАСКОЎ Іван Антонавіч (19.06.1941, г. Гомель – 02.06.1994), паэт, празаік, перакладчык, крытык.

БДАМЛМ. Ф. 410. 105 адз. зах. за 1961–1996. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, дакументы сабраныя для сваіх прац, кнігі.

ЛАСТОЎСКІ Вацлаў Юстынавіч (27.10.1883, б. засценак Калеснікаў, Глыбоцкі р-н, Віцебская вобл. – 23.01.1938), гісторык, грамадска-палітычны дзеяч.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 249, 250, 251, 252. Нарысы беларускай гісторыі (машынапіс), артыкулы, музейныя запісы.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23. Воп. 1. Адз. зах. 766–777 за 1906–1936. Запісы фальклорнага характару, ліставанне, фотаздымкі.

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя дакументаў музея імя І. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах. 256–259 за 1920. Дакументы дзейнасці.

Інстытут рускай літаратуры РАН у Санкт-Пецярбургу (Пушкінскі дом). Ф. 546. Воп. 1. Адз. зах. 116. Успаміны пра Я. Купалу.

ЦДАЛ. Ф. 582 (фонд БНР). Воп. 1. Адз. зах. 14, 43, 45, 47, 49; Воп. 2. Адз. зах. 58, 60; Воп. 8. Адз.зах 18. Біяграфічныя дакументы, дзённікавыя нататкі, ліставанне.

ЛАЎРОЎ Георгій Лаўрэнцьевіч (29.12.1895, в. Балханяны, Смаленская вобл., Расія – 23.06.1967), архітэктар.

*Дакументы ў БДАНТД перададзены дачкой у 1990 г.*

БДАНДТ. Ф. 112. 17 адз. зах. за 1913–1967. Працоўная кніжка, артыкул, фотаздымкі.

ЛАЎРЫНОВІЧ Эдуард Віктаравіч (1909–1982), удзельнік партызанскага руху падчас Другой сусветнай вайны.

БДМГВАВ. КП 13799–13804 за 1941–1950.Частка дзённіка партызанскай групы, нататнікі.

ЛАШКЕВІЧ Уладзімір Віктаравіч (21.09.1923, г. Добруш, Гомельская вобл. – 29.09.1993), партыйны, адміністратыўны работнік, архівіст, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. Адз. зах. 122–126. Біяграфічныя дакументы.

ЛАШКЕВІЧ (Драбышоўская) Елізавета Аляксееўна, удзельнік Другой сусветнай вайны, медсястра.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Воп. 1. Адз. зах. 126–132 за 1943–1980. Фотаздымкі, пасведчанні, выпіскі з загадаў.

ЛАШКОЎСКАЯ Соф'я Андрэеўна (н. 1909), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Брэсцкай вобл. Ф. 500 (Калекцыя дакументаў членаў КПЗБ, удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Вялікай Айчыннай вайны, сабраная В.П. Ласковічам). Воп. 5. 2 адз. зах. за 1987. Успаміны.

ЛЕБЕДЗЕВА Ганна Міхайлаўна, удзельнік Другой сусветнай вайны, урач.

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 10. 9 адз. зах. за 1943–1998. Біяграфічныя дакументы.

ЛЕВІН Аляксандр Маісеевіч (1918–1998), прафесар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 15. 18 адз. зах. за 1945–1994. Біяграфічныя дакументы.

ЛЕВІН Барыс Міхайлавіч (16.07.1914, г. Віцебск – 22.11.1990), акцёр.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. Апрацаваны ў 1987 г.*

БДАМЛМ. Ф. 265. 64 адз. зах. за 1920–1985. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ДА Віцебскай вобл. Ф. 1614. Воп. 1–2. 198 адз. зах. за 1939–1989. Фотаздымкі ў ролях, афішы і праграмы спектакляў, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

ЛЕВІНСОН Леў Барысавіч (1888–1979), член Савета салдацкіх дэпутатаў Бабруйскага гарвыканкама, грамадскі дзеяч.

ЗДА ў г. Бабруйску. Ф. 366 (Калекцыя малааб'ёмных фондаў асабістага паходжання). 3 адз. зах. за 1917–1967. Біяграфічныя (аўтабіяграфія, архіўныя даведкі, загады), успаміны, ліставанне, фотаздымкі.

ЛЕГАТОВІЧ Ігнат Сымонавіч (10.08.1796, в. Малая Капліца, Гродзенскі р-н – 10.10.1867), беларускі і польскі паэт, педагог.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 541–544 за 1852. Вершы на польскай мове, дзённік падарожжа з Мінска да Лагойска.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі імя Асалінскіх (Вроцлаў). № 3150. «Думкі» мінчаніна, паэта Ігнація Легатовіча, на польскай мове.

ЛЕЙКА Кандрат (17.09.1860, в. Збочна, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл.– 06.09.1921), пісьменнік, празаік, драматург і педагог.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 254, 256–258 за 1912–1915. Дакументы творчай дзейнасці.

ЛЕЙТМАН Фрума Львоўна (н. 14.11.1921, г. Гарадок, Віцебская вобл.), мастацтвазнаўца.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ у 1976–1977 гг. ад самой Ф. Л. Лейтман.*

БДАМЛМ. Ф. 91 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 115–212 за 1913–1977. Дакументы даследчыцкай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, дакументы сабраныя па цікавячых тэмах.

ЛЕЙТМАН Леў Мееравіч (01.03.1896, г. Петрыкаў, Гомельскай вобл. – 20.09.1974), мастак.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ у 1976–1977 гг. ад Ф. Л. Лейтман (жонкі).*

БДАМЛМ. Ф. 91 (сямейны). Воп. 1. 114 адз. зах. за 1913–1977. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ЛЕМЕШ Уладзімір Філіпавіч (22.03.1908, в. Падлессе, Слуцкі р-н, Мінская вобл. –14.08.1975), навуковец у галіне сельскай гаспадаркі, рэктар Віцебскага ветэрынарнага інстытута (1944–1970).

НМГКБ. 10 адз. зах. за 1924–1964. Біяграфічныя дакументы.

ЛЁСІК Язэп Юр'евіч (06.11.1883, в. Мікалаеўшчына, Стаўбцоўскі р-н, Мінская вобл. – 01.04.1940), грамадска-палітычны дзеяч, мовазнавец, пісьменнік.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 266. Ліст.

ЛЕЎЧЫК Гальяш (сапр. Ілля Ляўковіч) (20.07.1880, г. Слонім, Гродзенская вобл. – верасень 1944), паэт, празаік, публіцыст.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 260–264. Лісты, вершы.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23 (Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры, літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 357, 360. Вершы.

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя дакументаў музея імя І. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах. 261. Паштоўка да І. Луцкевіча
Слонімскі краязнаўчы музей. КП 5361–5412 (1–52) за 1914–1930. Біяграфічныя дакументы.

ЛЕЎШЧАНКА Леанід Іванавіч (псеўд. Лявон Леўш) (04.08.1882, г. Гомель – 24.08.1954), грамадскі дзеяч, літаратуразнаўца.
*Дакументы ў БДАМЛМ перададзены прыёмнай дачкой І. Р. Кузняцовай у 1986 г.*
БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 112–120 за 1910–1986. Асабістыя дакументы, успаміны, артыкулы пра яго, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

ЛІВЕНЦАЎ Віктар Ілліч (21.04.1918, в. Давыдаўка, Варонежская вобл., Расія – 28.09.2009), удзельнік партызанскага руху падчас Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычны дзеяч, дэпутат Вярхоўнага Савета.
БДМГВАВ. 10 адз. зах. за 1944–1969. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ЛІВІН Барыс Васільевіч, рэжысёр народнага драматычнага тэатра «Время».
ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 14. 14 адз. зах. за 1970–1999. Біяграфічныя дакументы, дакументы дзейнасці.

ЛІЗЮКОЎ Аляксандр Ілліч (26.03.1900, г. Гомель – 23.07.1942), военачальнік, удзельнік Другой сусветнай вайны.
*Дакументы братоў, таксама ўдзельнікаў Другой сусветнай вайны, Пятра (1909–1945) і Яўгена (1899–1944) захоўваюцца ў Гомельскім абласным краязнаўчым музеі Ф. 7 ( 27 і 22 адз. зах. адпаведна) за 1925– 1945 і 1910– 1944 гг.*
БДМГВАВ. 26 адз. зах. за 1926–1951. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.
Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. Ф. 7. 14 адз. зах. за 1925–1942. Біяграфічныя дакументы.

ЛІПСКІ Уладзімір Сцяпанавіч (н. 06.05.1940, в. Шолкавічы, Рэчыцкі р-н, Гомельская вобл.), дзіцячы пісьменнік, публіцыст.
БДАМЛМ. Ф. 458 (неап.).

ЛІС Арсен Сяргеевіч (н. 04.02.1934, в. Вётхава, Смаргонскі р-н, Гродзенская вобл.), фалькларыст, этнограф, літаратуразнавец.
АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 50 (неап.).

ЛІСНЕЎСКІ Іван Яўгенавіч (28.05.1915, г. Бабруйск – 24.04.2004), акцёр.
*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка.*
БДАМЛМ. Ф. 221. 327 адз. зах. за 1912–1983. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, калекцыя дакументаў акцёраў розных тэатраў.

ЛІСОЎСКІ Міхаіл Якаўлевіч (17.03.1931, в. Белы Мох, Мсціслаўскі р-н, Магілёўская вобл. – 01.10.1970), мастак.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1991 г.*
БДАМЛМ. Ф. 268. 128 адз. зах. за 1947–1982. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ЛІТВІНАЎ Леў Маркавіч (09.04.1899, г. Мінск – 21.03.1963), рэжысёр.
*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад сына. Апрацаваны ў 2004 г.*
БДАМЛМ. Ф. 335. 68 адз. зах. за 1924–1998. Дакументы творчай дзейнасці, фотаздымкі, сабраныя дакументы, дакументы сына.

ЛІХАДЗІЕЎСКІ Сцяпан Іванавіч (09.05.1911, в. Баслаўцы, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 14.02.1979), літаратуразнаўца, перакладчык.
*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1980 г.*
БДАМЛМ. Ф. 242. 97 адз. зах. за 1925–1979. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, фотаздымкі, узнагароды.

ЛІХАЧОЎ Мікалай Кузміч (н. 16.12.1906, в. Махаватка, Семілукскі р-н, Варонежская вобл., Расія), удзельнік Другой сусветнай вайны.
ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 27. 10 адз. зах. за 1944–1987. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, характарыстыкі, граматы, пасведчанні, артыкулы аб утваральніку), успаміны, выступленні, артыкулы, ліставанне з рознымі асобамі і арганізацыямі, фотаздымкі.

ЛІЦКАЯ Зіновія Якаўлеўна (07.11.1904, в. Шчорсы, Навагрудскі р-н, Мінская вобл. – 20.04.1970), актрыса.
*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад А.І. Сянько.*
БДАМЛМ. Ф. 238 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 238–253 за 1911–1978. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ЛОБАН Мікалай Паўлавіч (27.10.1911, в. Чаплічы, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 28.12.1984), пісьменнік, літаратуразнаўца, моваэнаўца.
*Дакументы у БДАМЛМ паступалі ў канцы 1970-х і на працягу 1980-х гг. Спачатку ад самога ўтваральніка, пазней ад жонкі Б. Л. Лобан.*
БДАМЛМ. Ф. 148. Воп. 1–2. 295 адз. зах. за 1945–1977. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, матэрыялы якія адклаліся ў фондзе.

ЛОЙКА Алег Антонавіч (01.05.1931, г. Слонім, Гродзенская вобл. – 19.11.2008), літаратуразнаўца, паэт.
БДАМЛМ. Ф. 240 (неап.).

ЛОКУН Валянціна Іванаўна (06.08.1946, в. Цепянец, Пінскі р-н), пісьменніца, кандыдат філалагічных навук.
ЗДА ў г. Пінску. Ф. 775 (Калекцыя дакументаў выдатных людзей Палесся). Воп. 5. 29 адз. зах. за 1960–2006. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, выпіска з працоўнай кніжкі, дыпломы, граматы, дакументы аб навучанні), дакументы літаратурнай дзейнасці

(нататкі, артыкулы апублікаваныя ў газетах, літаратурна-крытычныя артыкулы), фотаздымкі індывідуальныя, з роднымі, сябрамі.

ЛОСЕЎ Нікіфар Арцемьевіч (н. 1893), урач-акуліст, кандыдат медыцынскіх навук.

ЗДА ў г. Жлобіне. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры). Воп. 2. 23 адз. зах. за 1956–1967. Біяграфічныя дакументы, успаміны, дакументы дзейнасці (даклады, справаздачы).

ЛОСЬ Еўдакія Якаўлеўна (01.03.1929, в. Старына, Ушацкі р-н, Віцебская вобл. – 03.07.1977), паэтка.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка і ад сястры, у ДМГБЛ у 2001 ад сястры М.Я. Ярашэвіч.*

БДАМЛМ. Ф. 141. Воп. 1–3. 542 адз. зах. за 1945–1995. Дакументы творчай, службовай, грамадскай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ДМГБЛ. КП 18057 (1–52). Фотаздымкі, рэчы, кнігі.

ЛУБЯКА Васілій Нікітавіч (26.04.1891, г. Горкі, Магілёўская вобл. – 16.06.1950), аграном, эканаміст, акадэмік АН БССР.

НМГКБ. КП 24576–24581 (1–6) за 1921–1948. Біяграфічныя дакументы.

ЛУЖАНІН Максім (сапр. Каратай Аляксандр Амвросевіч) (20.10.1909, в. Прусы, Салігорскі р-н, Мінская вобл. – 13.10.2001), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка. У АРРК ЦНБ дакументы перадаваліся самім пісьменнікам напрацягу дваццаці гадоў з 1980 па 1999 г. Ад унучкі беларускага пісьменніка Тодара Кляшторнага Тамары Малючэнка былі атрыманыя кнігі з дароўнымі надпісамі.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 17. 2577 адз. зах. за 1921–2001. Творчыя матэрыялы (вершы, паэмы, апавяданні, аповесці, даклады, выступленні, пераклады), дзённікі, нататнікі, дакументы службовай і грамадска-культурнай дзейнасці ў якасці дэпутата Вярхоўнага Савета БССР, у Саюзе пісьменнікаў, кінематаграфістаў ды інш., ліставанне, біяграфічныя дакументы, дакументы аб утваральніку, матэрыялы бытавога характару, фотаздымкі індывідуальныя, групавыя, родных і блізкіх; мастацкія выявы; альбомы, паштоўкі, кнігі, артыкулы з дароўнымі надпісамі, архіў жонкі Я.Э. Пфляўмбаўм.

БДАМЛМ. Ф. 140 (сямейны). Воп. 1–2. 434 адз. зах. за 1930–1965. Дакументы творчай і грамадскай дзейнасці (кнігі, зборнікі, раманы, аповесці, пераклады, вершы, паэмы ды інш.), біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, дакументы сабраныя для працы.

ЛУЖЫНСКІ Васіль Стэфанавіч (1791, в. Старая Рудня, Жлобінскі р-н, Гомельская вобл. – 26.01.1879), уніяцкі (праваслаўны) архіепіскап.

*Архіў, што захоўваўся ў маёнтку Любашкава Сенненскага пав. Віцебскай губ., перавезены ў Віцебскі архіў у 1919 г. Далейшы лёс невядомы. У архіве захоўвалася ліставанне па пытанні скасавання ўніі.*

ЛУКАС Дзмітрый Аляксандравіч (16.06.1911, г. Швэнчоніс, Літва – 13.10.1979), кампазітар.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка і ад жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 139. 220 адз. зах. за 1911–1979. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ЛУКАШУК Георгій Іванавіч (н. 1923), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Кобрыне. Ф. 611 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, войнаў-інтэрнацыяналістаў, грамадска-палітычных дзеячаў). 19 адз. зах. за 1933–1980 гг. Біяграфічныя дакументы, успаміны, фотаздымкі.

ЛУКША Валянцін Антонавіч (н. 16.11.1937, г. Полацк, Віцебская вобл.), паэт, публіцыст.

*Дакументы ў БДАМЛМ адклаліся ў выніку дзейнасці архівістаў па збору дакументаў.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 320–321. Апавяданні.

ДМГБЛ. КП 4319–4454. У асноўным кнігі з дароўнымі надпісамі.

ЛУК'ЯНЕНКА Віктар Рыгоравіч (н. 1953), мастак, гісторык.

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 17. 18 адз. зах. за 1971–2000. Біяграфічныя дакументы.

ЛУЦКЕВІЧ Іван Іванавіч (09.06.1881, г. Шаўляй, Літва – 20.08.1919), грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, этнограф, публіцыст.

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя дакументаў музея імя. І. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах. 260–263 за 1909–1919. Асабістыя дакументы, артыкулы.

ЛУЦКЕВІЧ Антон Іванавіч (17.01.1884, г. Шаўляй, Літва – 23.03.1942), грамадска-палітычны дзеяч, гісторык, публіцыст.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 55, 221–226, 277–308, 317, 321–378, 2176–2178 за 1918–1934. Ліставанне, артыкулы, пераклады, дзённік, лекцыі ды інш.

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя дакументаў музея імя. І. Луцкевіча ў Вільні). Воп. 1. Адз. зах. 260–261, 264–275 за 1909–1937. Асабістыя дакументы, артыкулы; Ф. 377. Воп. 4. Дакументы сямейнага архіва Луцкевічаў.

ДГАЛ. Ф. 582 (фонд БНР). Воп. 1. Адз. зах. 46 за 1908. Дакументы з асабістага архіва.

ЛУЦЫБА Грэта Міхайлаўна (н. 02.07.1941, г. Віцебск), актрыса.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 775 (Калекцыя дакументаў выдатных людзей Палесся). Воп. 4 (вопіс спраў удзельнікаў тэатра «Дыяген»). Адз. зах. 32–35 за 1948–2002. Дакументы да біяграфіі (аўтабіяграфія, пасведчанні, дыпломы, граматы), дакументы педагагічнай дзейнасці, праграмы і фотаздымкі спектакляў, фотаздымкі індывідуальныя з сям'ёй, калегамі.

ЛУЧЫНА Янка (сапр. Неслухоўскі Іван Люцыянавіч) (24.06.1851, г. Мінск – 16.07.1897), паэт.

*Пасля смерці паэта архіў знаходзіўся ў яго жонкі Ганны Неслухоўскай (Грыневіч), трапіў да пляменніцы, потым (па меркаванні А. І. Мальдзіса) разам з сямейным архівам у Лондан.*

Літ.: Запартыка Г. В. Дар пані Мар'і (пра архіўныя матэрыялы Янкі Лучыны, Антона Неканда-Трэпкі і іх славутага роду) // Архівы і справаводства. – 2008. – № 4. – С. 95–98.

АРАН у СПб. Ф. 104 (фонд П. В. Шэйна). Воп. 2. Адз. зах. 275. Лісты.

БДАМЛМ. Ф. 435 (неап.).

ЦДГАУ ў Кіеве. Ф. 262 (фонд М. В. Доўнар-Запольскага). Адз. зах. 169. Лісты.

ЛЫНЬКОЎ Міхаіл Ціханавіч (30.11.1899, в. Зазыбы, Віцебскі р-н – 21.09.1975), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 191. 688 адз. зах. за 1926–1980. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, калекцыя.

ДМГБЛ. КП 298–344. Асабістыя дакументы, рэчы.

Бабруйскі краязнаўчы музей. 9 адз. зах. за 1953–1956. Біяграфічныя дакументы.

ЛЮБАН Ісак Ісакавіч (23.03.1906, г. Чэрыкаў, Магілёўская вобл. – 08.11.1975), кампазітар.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Апрацаваны ў 1991 г.*

БДАМЛМ. Ф. 303. 72 адз. зах. за 1935–1975. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ЛЮБАЎСКІ Мацвей Кузьміч (13.08.1860, в. Вялікія Мажары, Разанская вобл., Расія –22.11.1936), расійскі гісторык, даследчык гісторыі ВКЛ.

Літ.: Дегтярев А.Я., Иванов Ю.Ф., Карев Д.В. Академик М.К. Любавский и его наследие. // Любавский М.К. Обзор истории русской колонизации с древнейших времен и до XX века – М.: МГУ, 1996. – С. 8–73.

НДАР РДБ. Ф. 364. 150 адз. зах. Нататкі і выпісы па гісторыі і гістарычнай геаграфіі Польшчы і Літвы, матэрыялы да прац па гісторыі Літоўска-рускай дзяржавы (выпісы з кніг Метрыкі ВКЛ).

ЛЮБАЧКА Іван (01.05.1915, Полацкі альбо Магілёўскі пав. – 20.07.1977), гісторык.

*Дакументы захоўваюцца ў Стэнфардскім універсітэце (Каліфорнія, ЗША) і ў архівах г. Блюмінгстон (Індыяна, ЗША).*

ЛЮБЕНКОВА Паліна Рыгораўна (н. 26.05.1916, в. Баброва, Лепельскі р-н, Віцебская вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, урач.

ЗДА ў г. Оршы. Ф. 107. 32 адз. зах. за 1939–2002. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ЛЮТАРОВІЧ Павел Вікенцьевіч (17.11.1907, в. Гарадное, Столінскі р-н, Брэсцкая вобл. – 19.10.1973), партыйны работнік, гісторык, дзеяч культуры, архівіст.

БДАМЛМ. Ф. 298 (неап.).

ЛЯВОНАВА Ганна Нікіфараўна (15.02.1921, в. Барлакуль, Здзвінскі р-н, Алтайскі край, Расія – 1997), грамадска-палітычны дзеяч, першы сакратар Кастрычніцкага р-на КПБ г. Віцебска.

*Дакументы перададзены на захоўванне ўтваральнікам у 1997 г.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 75п. 96 адз. зах. за 1921–2001. Успаміны, тэксты лекцый, ліставанне, фотаздымкі, дакументы брата.

ЛЯВОНЦЬЕВА Тамара Еўдакімаўна (н. 16.01.1924, г. Южа, Іванаўскай вобл., Расія), архівіст.

*Дакументы ў НАРБ перададзены ў 2001 г. архіваўтваральнікам.*

НАРБ. Ф. 1106 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 8–12, 22–25, 44–53 за 1939–2001. Аўтабіяграфія, анкеты, граматы, фотаздымкі.

ЛЯЛЕВЕЛЬ Іяахім (22.03.1786, г. Варшава, Польшча – 29.05.1861), гісторык.

Аддзел старажытных кніг і рукапісаў Публічнай бібліятэкі (Варшава). Навуковыя працы, ліставанне.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава). № 6559–6576, 7109–7111.

АР БВУ. Ф. 12. 588 адз. зах. за 1728–1938.

Архіў Польскай акадэміі навук (Варшава). Лекцыі за 1822, копіі дакументаў з 11 сховішчаў: Дзяржаўнага архіва ў Кракаве, Ягелонскай бібліятэкі, Курніцкай бібліятэкі, Бібліятэкі ПАН (Кракаў), Бібліятэкі Рачыньскіх (Познань), Публічнай бібліятэкі (Варшава), Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава), Сілезскай бібліятэкі, Бібліятэкі Ўніверсітэта Мікалая Каперніка ў Торуні, Універсітэцкай бібліятэкі ў Лейпцыгу, Бібліятэцы Вільнюскага ўніверсітэта, Нацыянальнага музея ў Празе.

Бібліятэка Рачыньскіх (Познань). Навуковыя працы, ліставанне.

Курніцкая бібліятэка Польскай акадэміі навук (Познань). Артыкулы, ліставанне.

НМГКБ. КП 14643–14674, 28076, 28207. 33 адз. зах. за 1914–1957. Пасведчанні, фотаздымкі, запрашэнні, рэчы.

НІСНЕВІЧ Ізідар Герасімавіч (21.12.1914, г. Мінск – 25.10.1977), музыказнаўца.
*Дакументы паступілі ад самога музыказнаўцы ў 1967 г. і ад яго сястры С.Г. Нісневіч у 1979 г.*
БДАМЛМ. Ф. 236 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 440 за 1910–1984. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, калекцыя.

НІСНЕВІЧ Сіма Герасімаўна (02.02.1914, г. Чэрвень, Мінская вобл. – 05.03.1985), музыказнаўца.
*Дакументы паступілі ад утваральніка ў 1966 і 1979 гг. і ад В. М. Бархатавай (удавы І. Г. Нісневіча).*
БДАМЛМ. Ф. 236 (сямейны). Воп. 2. Адз. зах. 1–148 за 1910–1984. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, дзённікі, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

НОВІК Ганна Аляксееўна (1914, г. Аўгустаў, Сувалкаўскае ваяв., Польшча – 1997), паэтка, удзельнік палітычнага руху ў Заходняй Беларусі.
АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 429–430 за 1936–1937. Вершы.
ЗДА ў г. Маладзечна. Ф. 274. 21 адз. зах. за 1936–1996. Творчыя дакументы (рукапісы паэм, вершаў, апавяданняў ды інш.), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

НОВІКАЎ Іван Рыгоравіч (н. 26.01.1918, в. Нязнань, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), пісьменнік, дзеяч культуры.
*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад утваральніка.*
БДАМЛМ. Ф. 353. Воп. 1–2. 559 адз. зах. за 1910–1994. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, нататнікі, біяграфічныя дакументы, сабраныя ўспаміны па Віцебскаму і Мінскаму падполлю, кнігі, фотаздымкі.

НОВІКАЎ Мікалай Мікітавіч (09.05.1923, в. Воранава, Рагнедзінскі р-н, Бранская вобл. – 2000), удзельнік Другой сусветнай вайны, танкіст.
ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў

у Афганістане). Воп. 14. 6 адз. зах. за 1944–2000. Аўтабіяграфія, фотакопіі пасведчанняў, артыкулы ўтваральніка і аб ім.

НОВІК-ПЯЮН Сяргей Міхайлавіч (27.08.1906, в Лявонавічы, Нясвіжскі р-н, Мінская вобл. – 26.08.1994), літаратура, паэт, празаік.

*Дакументы ў БДАМЛМ перададзены архіваўтваральнікам у 1988 г. У ДМГТМК – у 1994 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 139–164 за 1988–2007. Лісты і паштоўкі З. Верас да ўтваральніка, вершы і ўспаміны З. Верас.

ДМГТМК. КП 650 (1–42), 653 (1–11) за 1929–1993.

НОРДМАН Эдуард Баляслававіч (25.02.1922, г. Рэчыца, Гомельская вобл. – 13.06.2006), партызан, супрацоўнік органаў дзяржбяспекі.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 27. 10 адз.зах за 1943–2006. Ліставанне з архівам аб перадачы дакументаў, дакументы дзейнасці (кнігі), асабістыя дакументы (пасведчанні, дакументы аб удзеле ў партыйных пленумах), запрашэнні, артыкулы аб утваральніку, фотаздымкі.

НОСАЎ Віктар Іванавіч (1918, в. Ларынава, Танкінскі р-н, Горкаўская вобл., Расія – 1995), паэт-франтавік.

ЗДА ў г. Маладзечна. Ф. 272. 55 адз. зах. за 1945–1995. Дакументы творчай дзейнасці (паэмы, аповесці, п’есы, вершы ды інш.), ліставанне, біяграфічныя дакументы і дакументы службовай дзейнасці.

НЯДЗВЕДСКІ Уладзіслаў Іосіфавіч (24.07.1929, в. Рахавічы, Старобінскі р-н, Мінская вобл. – 18.10.1973), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі ў 1973 г.*

БДАМЛМ. Ф. 217. 143 адз. зах. за 1948–1973. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

НЯКРАСАЎ Генадзь Канстанцінавіч (08.09.1918, г. Росаш, Варонежская вобл., Расія – 05.08.1987), акцёр.

БДАМЛМ. Ф. 348 (неап.).

НЯКРАСАЎ Ігар Яўгенавіч (н. 19.06.1925, хут. Замалінне, Іванаўскі р-н, Брэсцкая вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 21. 21 адз. зах. за 1944–1996. Аўтабіяграфія, успаміны, дакументы палітычнай і грамадскай дзейнасці (загады, распараджэнні, даведкі, лісты ад грамадзян, выступленні), біяграфічныя дакументы (граматы, пасведчанні), артыкулы з газет.

НЯЛЮБІН Віталь Паўлавіч (н. 07.12.1935, г. Барнаул, Алтайскі край, Расія), грамадскі дзеяч, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР.

ЗДА ў г. Барысаве. Ф. 707 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, працаўнікоў тылу і сацыялістычнага будаўніцтва, дзеячаў культуры). Воп. 10. 12 адз. зах. за 1983–1989. Аўтабіяграфія, дакументы дзейнасці (пратаколы, ліставанне).

НЯМЦЭВІЧ Юльян Урсын (16.02.1758, в. Скокі, Брэсцкі р-н – 21.05.1841), пісьменнік, гісторык.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава). Дзённікі, творы, пераклады.

Аддзел рукапісаў бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта (Варшава). № 216 ды інш.

Архіў ПАН (Варшава). Копіі дакументаў з бібліятэк Рачыньскіх (Познань) і Чартарыйскіх (Кракаў)

Бібліятэка Рачыньскіх (Познань). Творы, карэспандэнцыя.

Бібліятэка князёў Чартарыскіх (Кракаў). Успаміны, нататкі, ліставанне.

Музей літаратуры імя А. Міцкевіча (Варшава). Ліставанне.

НЯФЁД Уладзімір Іванавіч (27.01.1916, г. Шахты, Растоўская вобл., Расія – 23.04.1999), тэатразнаўца, драматург, крытык, педагог.

*Дакументы паступілі у 2002 г. ад жонкі А. І. Шах-Парон.*

БДАМЛМ. Ф. 471 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 1–430 за 1918–2009. Дакументы творчай дзейнасці (рукапісы, даследаванні, нарысы ды інш.), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, дакументы сабраныя падчас паездак у розныя краіны ды інш.

НЯХАЙ Рыгор Восіпавіч (05.01.1914, в. Сяліба, Чэрвенскі р-н, Мінская вобл. – 25.07.1991), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад утваральніка і жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 88. Воп. 1–3. 603 адз. зах. за 1937–1975. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, успаміны, нататнікі, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя ўспаміны франтавікоў.

## О

ОРДА Напалеон (11.02.1807, в. Варацэвічы, Іванаўскі р-н, Брэсцкая вобл. – 26.04.1883), мастак, музыкант, педагог

Літ.: Перечень архивных документов Н. Орды в Национальном историческом архиве в г. Гродно [Электронны рэсурс] // Архивы Беларуси – Рэжым доступу: http://archives.gov.by/index.php?id=720735. – Дата доступу: 20.02.2011; Козлов В. Л. Малоизвестные документы из жизни Наполеона Орды [Электронны рэсурс] // Национальный исторический архив Беларуси – Рэжым доступу: http://niab.belhost.by/vid_lich/napaleon/ – Дата доступу: 20.02.2011.

НГАБ. Ф. 295 (фонд Канцэлярыя Мінскага грамадзянскага губернатара). Воп. 1. Адз. зах. 3530 за 1880–1880. Дакументы аб правядзенні вобыска на кватэры Н. Орды.

НГАБ у г. Гродна. Фф. 1, 2, 4, 1143. Дакументы аб удзеле Н. Орды ў антыўрадавым руху, канфіскаваныя дакументы за 1826–1866
Польская бібліятэка ў Парыжы. Рукапісы № 508, 1616/1, 1617/1, 1671 ды інш. Ліставанне, біяграфічныя дакументы.

# П

ПАВЕЛКА Ганна Рыгораўна (н. 1920), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Слуцку. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). 3 адз. зах. за 1945–1990. Дакументы да біяграфіі, артыкулы аб утваральніку, фотаздымкі.

ПАГАРЭЛАЎ Леў Мікалаевіч (27.06.1929, г. Ачакаў, Нікалаеўская вобл., Украіна – 29.12.2010), архітэктар.

*Дакументы ў БДАНТД перададзены архіваўтваральнікам у 2004 г.*

БДАНТД. Ф. 222. 44 адз. зах. за 1957–2004. Дакументы дзейнасці (праекты, фотаздымкі будынкаў, граматы), фотаздымкі індывідуальныя.

ПАДАБЕД Аляксандр Станіслававіч (н. 30.05.1951, г. Мінск), акцёр, рэжысёр.

БДАМЛМ. Ф. 291 (неап.).

ПАДЗЯВА Тамаш (06.02.1906, в. Пярхулёва, Дзісненскі р-н, Віцебская вобл. – 02.10.1975), святар, грамадскі дзеяч, філосаф.

Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане. Дакументы дзейнасці (нататнік з развагамі, артыкулы, катэхезы, філасофска-рэлігійныя тэксты), асабістыя дакументы (пашпарт, пасведчанне).

ПАДКАВЫРАЎ Пётр Пятровіч (16.10.1910, г. Чэлябінск, Расія – 25.10.1977), кампазітар.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 247. 214 адз. зах. за 1930–1977. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы, рэчы.

НМГКБ. КП 33278 (1–17). Атэстаты, членскія білеты, ганаровыя граматы, фотаздымкі, нотныя рукапісы.

ПАДЛІПСКІ Аркадзь Міхайлавіч (н. 18.03.1946, г. Віцебск), гісторык, краязнаўца.

*Дакументы ў ДА Віцебскай вобл. перададзены ўтваральнікам у 1994 і ў 1999–2000 гг.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 406. Воп. 1–2. 202 адз. зах. за 1946–2001. Дакументы даследчыцкай дзейнасці (даведнікі, артыкулы, нарысы, нататкі), ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, дакументы членаў сям’і, кнігі.

ПАДЛІПСКІ Адольф Фердынандавіч, удзельнік падзей 1918–1921 гг.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3531 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). Адз. зах. 3. Успаміны, фотаздымкі, даведкі.

ПАЛАЖЭНЦАЎ Фёдар Іванавіч (н. 1900, г. Пінск), удзельнік ВАВ, палітрук партызанскага атрада В.З. Каржа.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 11. 4 адз. зах. за 1943–1967. Успаміны, фотакопіі даведак, фотаздымкі індывідуальныя.

ПАЛЕЕС Сендер (Аляксандр Давідавіч), (31.07.1898, г. Мінск – 26.09.1964), мастацтвазнаўца.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі. Дакументы ў архіве НММ, сабраны супрацоўнікамі музея Н. Вусавай, А. Рэсінай.*

Літ.: Усава Н. М. Асноўны фонд С. Палееса як крыніца па гісторыі беларускай і габрэйскай культур // Архіўныя чытанні I–III: Матэрыялы навук. канф., Мінск, 2003–2005 гг. – Вып. 1. – Мінск: РІВШ, 2006. – С. 21–27.

Архіў НММ. Ф. 3 (Дакументы мастакоў, мастацтвазнаўцаў, іншых асоб, дзейнасць якіх звязана з гісторыяй, культурай, мастацтвам Беларусі). Воп. 4. 36 адз. зах. за 1921–1998. Фотаздымак І. Рэпіна, зроблены С. А. Юркоўскім, з дароўным надпісам А. Сапунову (2-ая пал. 1890-х гг.), машынапісы артыкулаў, копіі біяграфічных дакументаў, спіс прац Ю. Пэна, дакументы родных, выяўленчыя матэрыялы.

БДАМЛМ. Ф. 382. 810 адз.зах за 1926–1996. Дакументы навуковай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраная картатэка па гісторыі архітэктуры, мастацтва і рамёстваў, кнігі.

ПАЛЕСКІ Вячаслаў (сапр. Станкевіч Вячаслаў Пятровіч) (03.11.1912, в. Астрагляды, Брагінскі р-н, Гомельская вобл. – 18.06.1971), драматург.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 274. 93 адз. зах. за 1929–1982. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ПАЛІКАРПАЎ Аляксандр Іванавіч (1914–2001), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Слуцку. Ф. 805 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). 3 адз. зах. за 1943–1981. Артыкулы, дакументы да біяграфіі (граматы, пасведчанні, падзякі), фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

ПАЛІКАРПОВІЧ Канстанцін Міхайлавіч (18.03.1889, в. Белая Дуброва, Касцюковіцкі р-н, Магілёўская вобл. – 20.02.1963), археолаг.

*Архіў быў знойдзены А. А. Чубурам у пачатку 1990-х гг. на гарышчы дома сваячкі навукоўца ў в. Юдзінава Пагарскага р-на Бранскай вобл.*

Пагарскі краязнаўчы музей (Бранская вобл.). 115 адз. зах. за 1907–1960. Дакументы службовай дзейнасці (справаздачы археалагічнай камісіі Інбелкульта за 1926–1928, пратаколы і г. д.), дакументы навуковай дзейнасці (манаграфіі, артыкулы, рэцэнзіі), дзённікі за 1908–1958, лісты ад А. Д. Кавалені, А. Н. Ляўданскага, С. Шутава, фотаздымкі з краявідамі беларускіх гарадоў.

ПАЛІТЫКА Дзмітрый Антонавіч (02.05.1915, в. Гарывец, Чашніцкі р-н, Віцебская вобл. – 18.04.1965), літаратуразнаўца, крытык.

*Дакументы на захоўванне перададзены роднымі.*

БДАМЛМ. Ф. 167. 113 адз. зах. за 1948–1967. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне.

ПАЛОНСКІ Самуіл Уладзіміравіч (14.09.1902, г. Гайсін, Вінніцкая вобл., Украіна – 02.05.1955), кампазітар.

*Дакументы ў архіў паступілі ад жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 30. 428 адз. зах. за 1925–1956. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ПАЛОСІН Яўген Максімавіч (06.01.1912, в. Урыўкі, Ялецкі р-н, Ліпецкая вобл., Расія – 25.05.1981), акцёр.

ДМГТМК. КП 64 (1–26). Тэксты роляў, праграмы спектакляў, пасведчанні, тэлеграмы ды інш.

БДАМЛМ. Ф. 352 (сямейны) (неап.).

ПАЛЬЧЭЎСКІ Аляксандр Восіпавіч (03.01.1905, в. Прусінава, Уздзенскі р-н, Мінская вобл. – 26.04.1979), пісьменнік.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад самога пісьменніка ў 1962, 1965, 1976 г., жонкі Т.Г. Цулукідзе ў 1984 г., ад мастацтвазнаўцы Ю. Канэ ў 1992 г.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 20. 339 адз. зах. за 1926–1980. Дакументы творчай дзейнасці (аповесці, апавяданні, артыкулы, даклады, рукапісы твораў), ліставанне, біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфіі, характарыстыкі, пасведчанні), дакументы аб утваральніку, фотаздымкі сям'і, родных, фотаздымкі з пісьменнікамі ды інш., сабраныя выразкі з газет, вершы, дакументы родных.

БДАМЛМ. Ф. 50 (сямейны). Воп. 1. 98 адз. зах.; Воп. 2. 60 адз. зах.; Воп. 3. 132 адз. зах.; Воп. 4. 53 адз. зах.; Воп. 5. 18 адз. зах. за 1910–1991. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах, з дароўнымі надпісамі, сабраныя запісы беларускіх народных песень, афарызмаў і інш

ПАЛЯКОЎ Іван Яўцэевіч (12.11.1914, в. Нова-Беліца, Гомельскі р-н – 08.02.2004), грамадска-палітычны дзеяч, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета (1977–1985).

*Дакументы ў архіў паступілі ад самога ўтваральніка ў 2003 г.*

НАРБ. Ф. 1373. 243 адз. зах. за 1933–2004. Біяграфічныя (пасведчанні, мандаты, граматы, узнагароды), дакументы дзейнасці (аб удзеле ў Другой сусветнай вайне, даклады, прамовы, артыкулы ды інш.), дакументы аб утваральніку (артыкулы, некралогі), фотаздымкі індывідуальныя, у групах, падчас мерапрыемстваў, візітаў.

ПАЛЯКОЎ Іван Стэфанавіч (08.03.1900, в. Макрэнь, Чачэрскі р-н, Гомельская вобл.–13.06.1983), грамадска-палітычны дзеяч, арганізатар банкаўскай сістэмы БССР у пасляваенны час.

*Дакументы ў архіў паступілі ад жонкі.*

НАРБ. Ф. 706. 47 адз. зах. за 1907–2000. Біяграфічныя дакументы (асабістыя дакументы, віншаванні, узнагароды), дакументы службовай дзейнасці (справаздачы, даклады), фатаграфіі (індывідуальныя, з роднымі, падчас мерапрыемстваў), дакументы жонкі М. Ф. Паляковай, сына А. І. Палякова, дачкі Н. І. Паляковай.

ПАНАМАРЭНКА Панцеляймон Кандратавіч (27.08.1902, б. хут. Шалкоўскі, Беларэчанскі р-н, Краснадарскі край, Расія – 18.01.1984), грамадска-палітычны дзеяч, першы сакратар ЦК КПБ у 1938–1947, старшыня СНК БССР у 1944–1948.

*Дакументы паступілі ад унучкі С. В. Панамарэнка. Калекцыя фотаздымкаў дзеячаў літаратуры і мастацтва перададзены ў БДАМЛМ жонкай В. Г. Панамарэнка ў 1986 г.*

БДАМЛМ. Ф. 309 (Калекцыя фатаграфій дзеячаў літаратуры і мастацтва). 26 адз. зах. за 1938–1982. Фотаздымкі П. К. Панамарэнкі індывідуальныя, у групах з дзеячамі літаратуры і мастацтва, фотаздымкі ўдзельнікаў дэкады беларускага мастацтва ў Маскве 1940 г., фатаграфіі сцэн са спектакляў тэатра імя Я. Купалы падчас гастроляў у Маскве (1948), фотаздымкі З. І. Азгура, І. М. Балоціна, Я. Коласа, Я. Купалы, Л. М. Шымко.

НАРБ. Ф. 1466. 12 адз. зах. за 1930–1982. Дакументы дзейнасці (даклады, выступленні, рукапісы манаграфій, даведнікаў ды інш.), дакументы сабраныя па гісторыі Заходняй Беларусі і па гісторыі Другой сусветнай вайны, фотаздымкі.

ПАНІЗНІК Сяргей Сцяпанавіч (н. 10.05.1942, в. Бабышкі, Міёрскі р-н, Віцебская вобл.), паэт.

БДАМЛМ. Ф. 32 (неап.).

ПАНЧАНКА Пімен Емяльянавіч (23.08.1917, г. Талін, Эстонія – 02.04.1995), паэт.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. (неап.).

БДАМЛМ. Ф. 430. 128 адз. зах. за 1911–1999. Дакументы дзейнасці (рукапісы вершаў, артыкулы, рэцэнзіі, пераклады), ліставанне, біяграфічныя дакументы, сабраныя дакументы, фотаздымкі, кнігі.

ДМГБЛ. КП 17457 (1–228). Рукапісы вершаў, граматы, пасведчанні, афіцыйнае ліставанне, выразкі з газет.

ПАНЧЫШНЫХ Сяргей Аркадзьевіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Полацку. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 7. 7 адз. зах. за 1944–1995.

ПАНЯТОЎСКІ Станіслаў Аўгуст (17.01.1732, в. Воўчын, Камянецкі р-н, Брэсцкая вобл.– 12.02.1798), апошні кароль Рэчы Паспалітай.

*Архіў Станіслава Аўгуста (Архіў Кабінета караля Станіслава Аўгуста, архіў Каралеўства Польскага, Archivum de Varsovie ды інш.) складаўся з афіцыйных дакументаў Рэчы Паспалітай, дакументаў каралеўскага двара, прыватнай карэспандэнцыі, калекцыі рукапісаў, і можа быць умоўна аднесены да архіва асабістага паходжання. Захаваннем і апісаннем архіва апекаваліся Я. Альбертрандзі, А. Нарушэвіч ды інш. Пасля смерці Панятоўскага перайшоў ва ўладанне яго брата Юзэфа, потым быў раскіданы: частка вывезена ў Пецярбург, частка аказалася ў Порыцкай бібліятэцы Чацкага (потым у музеі Чартарыйскіх) і г. д. Спроба рэканструкцыі на падставе захаваўшыхся вопісаў зроблена П. Банькоўскім у 1958 г.*

Літ.: Bańkowski, P. Archiwum Stanisława Augusta / P. Bańkowski; Naczelna Dyrekcja Archiwów Państwowych. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1958. – 315 s.

Аддзел рукапісаў бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта (Варшава). Карэспандэнцыя і архіў Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў справах касцёла 1775–1779.

Аддзел рукапісаў Ягелонскай бібліятэкі (Кракаў). Ліставанне з Ю. Панятоўскім. 1776–1797.

ДАСА. Ф. 14. Карэспандэнцыя з рознымі асобамі за 1792–1797.

ПАПАРАЦЬ Рыгор (сапр. Сапун Рыгор Макаравіч) (17.11.1902, в. Шэлягі, Пухавіцкі р-н, Мінская вобл. – 01.06.1948), паэт.

*Дакументы ў архіў паступілі ад жонкі Л. К. Арловай і пляменніцы Н. К. Радзінскай. Частка дакументаў перададзена ў Пухавіцкі раённы краязнаўчы музей.*

БДАМЛМ. Ф. 414. 40 адз. зах. за 1917–1945. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, кнігі.

ПАПКОЎ Лазар Еўдакімавіч (20.03.1909, в. Славені, Шклоўскі р-н, Магілёўская вобл. – 1987), грамадскі і партыйны дзеяч.

*Дакументы перададзены ў архіў у студзені 1988 г. жонкай Л. Ф. Аляксеевай.*

НАРБ. Ф. 175 (Калекцыя дакументаў партыйных, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў). Воп. 10. 13 адз. зах. за 1938–1987. Біяграфічныя дакументы (пасведчанні, аўтабіяграфія, даведкі), дакументы службовай і грамадскай дзейнасці, запісы ўспамінаў аб сустрэчах, фотаздымкі (індывідуальныя, у групах).

ПАПОЎ Аляксей Сцяпанавіч (08.09.1915, в. Соіна, Мезенскі р-н, Архангельская вобл., Расія – 31.01.1984), мастак.

БДАМЛМ. 138 (неап.).

ПАПОЎ Іосіф Сцяпанавіч (21.09.1915, в. Соіна, Мезенскі р-н, Архангельская вобл., Расія – 31.01.1984), акцёр.

*Дакументыў архіў паступілі ў 1989 і 1991 г. ад жонкі Т. І. Чарнышовай .*

БДАМЛМ. Ф. 354. 61 адз. зах. за 1937–1979. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ПАПОЎ Фёдар Восіпавіч (09.07.1907, в. Вялікае Южакова, Кацельніцкі р-н, Вяцкая вобл., Расія – 09.09.1970), архівіст, загадчык партыйным архівам ЦК КПБ, гісторык.

*Дакументы ў архіў і музей былі перададзены ў лістападзе 2000 г. дачкой В.Ф. Паповай.*

Літ.: Сверчков В. Неизвестная дорога партийного архива (Из воспоминаний заведующего партархивом ЦК КП(б)Б Ф. О. Попова об эвакуации партархива в г. Уфу в начале Великой Отечественной войны) // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 2. / Р. П. Платонаў (гал. рэд.) ды інш. – Мінск, 2003. – С. 275–301.

НАРБ. Ф. 355 (Калекцыя дакументаў старэйшых архівістаў Беларусі). Воп. 2. 21 адз. зах. за 1932–2000. Біяграфічныя дакументы, артыкулы, аўтарэферат дысертацыі, успаміны аб дзейнасці Партархіва ў гады Другой сусветнай вайны, фотаздымкі.

Музей гісторыі г. Магілёва. Калекцыя фотаздымкаў за 1920–1960 гг., калекцыя кніг і часопісаў (у тым ліку і з публікацыямі аўтара), біяграфічныя дакументы (працоўная кніжка, пасведчанні, атэстаты, граматы).

ПАРСАДАНАЎ Георгій Арцёмавіч (10.09.1911, г. Уладзікаўказ, Расія – 15.10.1989), архітэктар.

*Дакументы ў БДАНТД паступілі ад жонкі.*

БДАНТД. Ф. 111. 62 адз. зах. за 1927–1989. Дакументы дзейнасці (праекты, артыкулы па пытаннях архітэктуры, спіс праектаў), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі беларускіх краявідаў.

ПАРХОМЕНКА Генадзь Герасімавіч (н. 05.02.1944, г. Жлобін, Гомельская вобл.), краязнаўца, паэт, трэнер.

ЗДА ў г. Жлобіне. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры) Воп. 22. 12 адз. зах. Біяграфічныя дакументы, дакументы дзейнасці (зборнікі, нарысы, артыкулы), фотаздымкі, дакументальныя фільмы аб дзеячы.

ПАРЧЭЎСКІ Альфонс Юзэф Ігнацы (15.11.1849, в. Вадзерады, Ласкі пав., Польшча – 21.04.1933), гісторык.

ДГАЛ. Ф. 1135 (Таварыства прыяцеляў навук у Вільні). Воп. 16. 1139 адз. зах. за 1493–1939.

ПАСЛЯДОВІЧ Аляксандра Ануфрыеўна (07.01.1923, г. Мінск – 23.04.1988), графік.

*Дакументы паступілі ў БДАМЛМ ад самой А. А. Паслядовіч у 1979 г., а ў 1994 г. ад сястры З. А. Грыдзінай. У Архіў НММ дакументы перададзены з аддзела захавання НММ.*

БДАМЛМ. Ф. 235 (сямейны). 143 адз. зах. за 1930–1988. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, сабраныя дакументы, рэчы, кнігі.

Архіў НММ. Ф. 3 (Дакументы мастакоў, мастацтвазнаўцаў, іншых асоб, дзейнасць якіх звязана з гісторыяй, культурай, мастацтвам Беларусі). Воп. 5. 7 адз. зах. за 1939–1973. Дакументы творчай дзейнасці, фотаздымкі.

ПАЎЛАЎ Уладзімір Андрэевіч (н. 25.10.1935, в. Замошша, Любанскі р-н, Мінская вобл.), пісьменнік.

БДАМЛМ. Ф. 373 (неап.).

ПАЎЛОЎСКІ Мікалай Восіпавіч (1903–1960), военачальнік, удзельнік Другой сусветнай вайны.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. КП 25949 (1–75) за 1920–1956 гг. Біяграфічныя дакументы.

ПАЎЛЮКОЎСКІ Уладзіслаў (13.05.1895, в. Ініца, Стаўбцоўскі р-н, Мінскай вобл. – 08.09.1955), паэт, празаік, этнограф, краязнавец, мастак.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 455–457 за 1942–1943. Гістарычныя і этнаграфічныя артыкулы, народныя песні, запісаныя ў 1929 г.

ПАЦЕЙ Пётр Купрыянавіч, настаўнік, дырэктар Полацкага педвучылішча.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. КП-2 (1510–1520); КП-8 (4655–4661). Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ПАЦЕХІН Васіль Васільевіч (22.04.1906, г. Масква, Расія – 03.10.1963), акцёр.

*Дакументы ў архіў паступілі ад жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 150. 236 адз. зах. за 1928–1967. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, дакументы сабраныя па розных тэмах, дакументы жонкі.

ПАЧАНІН Сцяпан Захаравіч (25.04.1913, в. Ківаці, Кузаватаўскі р-н, Ульянаўская вобл., Расія – 24.03.2001), гісторык, архівіст, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

*Дакументы паступілі ў НАРБ у 2002 г. ад сына В.С. Пачаніна.*

НАРБ. Ф. 355 (Калекцыя дакументаў старэйшых архівістаў Беларусі). Воп. 3. 42 адз. зах. за 1934–1999. Біяграфічныя дакументы (аўтабіяграфія, пасведчанні), ліставанне, дакументы навуковай дзейнасці (спіс навуковых прац ды інш.), успаміны, фотаздымкі.

ПАЧОБУТ-АДЛЯНІЦКІ Марцін (30.10.1728, в. Саломенка, Гродзенскі р-н – 08.02.1810), астраном, матэматык, прафесар Віленскага ўніверсітэта.

АР БВУ. Ф. 16. 24 адз. зах. за 1631–1798.

ПАЧОПКА Баляслаў Антонавіч (13.09.1884, б. засценак Уляны, Віленскі пав. – 26.12.1940), грамадскі дзеяч, грэка-каталіцкі святар, публіцыст.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 443–445 за 1918–1922 гг. Артыкулы, ліставанне.

ПАШКЕВІЧ Мікалай Арсеньевіч (20.05.1936, в. Гарадзішча, Мядзельскі р-н – 14.03.1972), літаратуразнаўца, краязнаўца.

*Дакументы перададзены ад настаўніцы з в. Святкі Мядзельскага р-на В.І. Пястун.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 165–181 за 1961–1996. Лісты Л. Акаловіча, М. Аўрамчыка, Г. Бураўкіна, В. Быкава ды інш.

ПАШКЕВІЧ Мікалай Мікалаевіч, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Полацк. Ф. 1164 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). Воп. 3. 8 адз. зах. за 1944–1966.

ПАШКЕВІЧ (Цётка) Алаіза Сцяпанаўна (03.07.1876, в. Пешчын, Шчучынскі р-н, Гродзенская вобл. – 05.02.1916), паэтка.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. 220 адз. зах. за 1944 г. Рукапісы.

БДАМЛМ. Ф. 3 (Калекцыя дакументаў музея імя І. Луцкевіча). Воп. 2. 4 адз. зах. за 1901–1912. Біяграфічныя дакументы.

НМГКМ. КП 31290. Фотаздымак.

ПЕКУР Павел Аляксеевіч (13.02.1909, г. Вільня, Літва – 01.10.1982), акцёр.

*Дакументы паступілі ад дачкі Т. П. Касцюнінай у 1999 г.*

БДАМЛМ. Ф. 433. 144 адз. зах. за 1930–1998. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, узнагароды.

ПЕЛЯСА Уладзімір (01.05.1918, г. Ліда, Гродзенская вобл. – 24.04.2004), выдавец, грамадскі і царкоўны дзеяч.

Архіў пры царкве св. Ефрасінні Полацкай у Саўт-Рыверы. Дакументы беларускага кангрэсавага камітэта Амерыкі, арганізацыі «Амерыканскія прыхільнікі БЦР».

ПЕРКІН Навум Саламонавіч (15.02.1912, г. п. Тураў, Жыткавіцкі р-н, Гомельскай вобл. – 02.10.1976), літаратуразнаўца.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 304. Воп. 1–2. 212 адз. зах. за 1936–2002. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ПЕРНО Ян Фрыцавіч (09.12.1888, маёнтак Сірале, Ліфляндская губ., цяпер Латвія – 20.04.1951), партыйны дзеяч.

НМГКБ. КП 24425(1–16) за 1917–1946. Біяграфічныя дакументы.

ПЕРЦАЎ Уладзімір Мікалаевіч (15.07.1877, г. Курск, Расія – 03.06.1960), гісторык, грамадскі дзеяч.

*У 1965 г. пасля смерці навукоўца архіў праз натарыуса быў перададзены супрацоўнікам Інстытута гісторыі АН у ЦНА НАНБ, а таксама ў НМГКБ.*

НМГКБ. КП 19701 (1–123) за 1880–1959. Віншаванні, граматы, пасведчанні, пропускі, даведкі, характарыстыкі, спіс прац, фотаздымкі.

ЦНА НАН Беларусі. Ф. 3. 25 адз. зах. Дакументы навуковай дзейнасці (манаграфія, артыкулы, бібліяграфія, выпісы), дакументы службовай дзейнасці.

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 23 (Калекцыя матэрыялаў па гісторыі, навуцы, культуры, літаратуры) Воп. 1. Адз. зах. 781–784 за 1948–1954. Дакументы навуковай дзейнасці, сабраныя дакументы.

ПЕСІН Абрам Якаўлевіч (н. 18.03.1923, г.п. Стрэшын, Жлобінскі р-н, Гомельская вобл.), кандыдат эканамічных навук, член Саюза журналістаў.

*Дакументы перададзены ў архіў утваральнікам у 1994 г.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 1441. 35 адз. зах. за 1945–1994. Дакументы навуковай дзейнасці (буклеты, артыкулы), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, кнігі.

ПЕТРАШКЕВІЧ Алесь (Аляксандр Лявонавіч) (н. 01.05.1930, в. Пярэвалачня, Талачынскага р-на, Віцебскай вобл.), пісьменнік, драматург.

БДАМЛМ. Ф. 450 (неап.).

ПЕТРАШКЕВІЧ Ануфрый (14.09.1793, фальв. Бурдыкаўшчына, Навагарудскі р-н, Гродзенская вобл. – 25.11.1863), паэт, грамадскі дзеяч.

*Петрашкевіч з'яўляўся збіральнікам т. зв. «Архіва філаматаў», здолеў захаваць яго падчас выгнання. Праз 36 гадоў, вярнуўшыся ў Вільню, зрабіў апрацоўку. Архіў пасля яго смерці захоўвалі яго віленскія сваякі З 1908 па 1930-я гг. архіў знаходзіўся ў Кракаве і яго частка была апублікавана. У канцы 1950-х частка архіва была перададзена спадкаемцамі ў аддзел рукапісаў Віленскага ўніверсітэта, другая – у Бібліятэку Каталіцкага ўніверсітэта ў Любліне, яшчэ адна трапіла ў Музей літаратуры імя А. Міцкевіча ў Варшаве. У архіве акрамя дакументаў па гісторыі Таварыства філаматаў, захоўваліся творы і ліставанне за 1819–1823 гг. А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана ды інш. Частка дакументаў захоўваецца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта, Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы.*

ПЕТРУННІКАЎ Аляксандр Емяльянавіч (н. 14.11.1936, в. Пірэвічы, Жлобінскі р-н, Гомельская вобл.), гісторык.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 23. 1 адз. зах. за 1973–2004. Аўтабіяграфія, дыплом, публікацыі ды інш.

ПЕТУХОЎ Аляксандр Прохаравіч (22.05.1917, в. Пекалічы, Парыцкі р-н, Гомельская вобл. – 05.10.1991), удзельнік Другой сусветнай вайны, працаўнік гаспадаркі.

ЗДА ў г. Жлобін. Ф. 868 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, партызанскага руху, Герояў Савецкага Саюза і Сацыялістычнай працы, дэпутатаў Саветаў, дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў народнай гаспадаркі і культуры). Воп. 4. 7 адз. зах. за 1945–

1977. Біяграфічныя дакументы, успаміны, артыкулы ў газетах, успаміны.

ПЕЦЮКЕВІЧ Мар'ян Язэпавіч (24.09.1904, в. Цяцеркі, Браслаўскі р-н, Віцебская вобл. – 13.09.1983), этнограф, грамадскі і культурны дзеяч, літаратар.

*Дакументы атрыманыя аддзелам рукапісаў праз гісторыка Ю. Туронка ў перыяд 1984–1990 гг. Асноўны масіў дакументаў захоўваецца ў Польшчы ў розных месцах згодна распараджэнню ўтваральніка.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 60. 102 адз. зах. за 1924–1983. Дакументы дзейнасці (артыкулы ды інш.), успаміны, ліставанне з рознымі асобамі і арганізацыямі, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы пра Я. Драздовіча, вершы Я. Аніські, Л. Шпакоўскага, Л. Геніюш, У. Дубоўкі, выразкі з газет, выпісы.

ПЕЦЮРЭНКА [Уладзімір Канстанцінавіч] (06.08.1921–1942), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ДА Мінскай вобл. Ф. 1262 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху, Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі Мінскай вобл.). Воп. 32. Адз. зах. 5 за 1942. Лісты.

ПЕШКУР Іван Іванавіч (21.12.1921, в. Вострава, Капыльскі р-н, Мінская вобл. – 12.10.1980), мастак тэатра.

БДАМЛМ. Ф. 391 (неап.).

ПІГАРЭВІЧ Барыс Аляксеевіч (27.05.1898, в. Ільіно, Смаленская вобл., Расія – 07.10.1961), удзельнік Першай сусветнай вайны і Другой сусветнай вайны.

НМГКБ. КП 8939–8971 (1–32) за 1917–1958. Біяграфічныя дакументы.

ПІГУЛЕЎСКІ Уладзімір Васільевіч (09.03.1889, г. Гродна – 16.06.1958), празаік, драматург, перакладчык, грамадска-палітычны дзеяч.

*Асабісты архіў набыты АРКР ЦНБ НАН Беларусі ў 1975 г. ва ўдавы В. В. Пігулеўскай.*

АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 6. 100 адз. зах. за 1913–1975. Дакументы творчай дзейнасці (вершы, п'есы, апавяданні, пераклады, артыкулы, рэцэнзіі), дакументы службовай дзейнасці (праграма Люцынскай гімназіі ды інш.), дзённікі, ліставанне (лісты ад Я. Маўра, П. Мядзёлкі, Р. Шырмы ды інш.), біяграфічныя дакументы (паслужны спіс, пасведчанні ды інш.), фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ПІГУЛЕЎСКІ Мікалай Андрэеевіч (20.04.1917, г. п. Глуск, Магілёўская вобл. – 28.11.2002), канструктар.

*Дакументы ў архіў перададзены ўтваральнікам.*

БДАНТД. Ф. 213. 26 адз. зах. за 1927–2001. Дакументы дзейнасці (пералік вынаходніцтваў, пасведчанні на вынаходніцтвы ды інш.), біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ПІКАРДА Гай (20.07.1931, г. Лондан, Вялікабрытанія – 21.04.2007), англійска-французскі адвакат, музыказнаўца, даследчык беларускай культуры.

Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане. Архіў складаецца з некалькіх неразабраных скрыняў, сярод якіх утрымліваецца ліставанне, творы, матэрыялы да іх.

ПІЛЮЗІНА Ніна Васільеўна (н. 25.08.1944, в. Васілева, Глінкаўскі р-н, Смаленская вобл.), мастачка.

БДАМЛМ. Ф. 439 (неап.).

ПІНЧУК Пётр Іванавіч (н. 1895, в. Любонічы, Кіраўскі р-н, Магілёўская вобл.), эканаміст, рэктар сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, удзельнік ваенных дзеянняў 1918–1921 гг.

Бабруйскі краязнаўчы музей. 31 адз. зах. за 1922–1956 гг.

НМГКБ. КП 12767–12771 (1–11) за 1916–1938. Біяграфічныя дакументы.

ПІСКУН Марк Герасімавіч (н. 12.12.1914, в. Морчыцы, Пінскі р-н, Брэсцкая вобл.), удзельнік Другой сусветнай вайны, абаронца Брэсцкай крэпасці.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 367 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, сацыялістычнага будаўніцтва Брэсцкай вобл. і ўдзельнікаў баявых дзеянняў у Афганістане). Воп. 18. 7 адз. зах. за 1932–1986. Аўтабіяграфія, успаміны, артыкулы з газет аб утваральтніку, фотакопіі дакументаў, граматы, фотаздымкі пасляваенных гадоў.

ПІТАЛЕНКА Дзіна Мікалаеўна, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Орша. Ф. 169 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы Дубровенскага, Аршанскага, Сенненскага, Талачынскага р-наў Віцебскай вобл.). 20 адз. зах. за 1941–2004. Успаміны аб Другой сусветнай вайне, асабістыя дакументы, граматы, фотаздымкі.

ПІТАЛЕНКА Іван Васільевіч Мікалаеўна, удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Орша. Ф. 169 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы Дубровенскага, Аршанскага, Сенненскага, Талачынскага р-наў Віцебскай вобл.). 24 адз. зах. за 1941–2004. Успаміны, асабістыя дакументы, фотаздымкі.

ПІЧЭТА Уладзімір Іванавіч (09.10.1878, г. Палтава, Украіна – 23.06.1947), гісторык-славіст, першы рэктар БДУ.

*Асноўная частка архіва была перададзена жонкай А. П. Пічэтай у АРАН у Маскве ў 1967–1968 гг., у 1974 г. астатнія матэрыялы ў колькасці 17 адз. зах.перададзены дачкой. Таксама дакументы перадаваліся гісторыкам І. М. Бяляўскім. Дакументы і кнігі з бібліятэкі Пічэты знаходзяцца ў НББ, а таксама ў Музеі гісторыі БДУ і бібліятэцы БДУ. Некаторыя дакументы захоўваюцца ў НАРБ (дакументы службовай дзейнасці) і НМГКБ (перададзены дачкой).*

Літ.: Гесь А. М. Дакументы Нацыянальнага архіва пра дзейнасць У. І. Пічэты // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання. Матэрыялы да міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння Ў. І. Пічэты. Мінск. 23–24 красавіка 1998. – Мінск: Белдзяржуніверсітэт, 1998. – С. 111–112; Иванова О. С. Личные архивы как исторический источник (на примере архивов учёных-историков В. И. Пичеты и Н. Н. Улащика) // Академический архив в прошлом и настоящем: Сборник научных статей к 280-летию Архива Российской академии наук / ПФА РАН; Отв. ред. И. В. Тункина – СПб.: Нестор-История, 2008. – С. 414–420; Королюк В. Д. Рукописное наследство академика В. И. Пичеты // Учёные записки / Ин-т славяноведения. – 1949. – № 3. – С. 174–175; Сільнова Л. Д. Прыватная калекцыя Ў. І. Пічэты ў кніжных фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі // Гістарычныя крыніцы: праблемы класіфікацыі, вывучэння і выкладання. Матэрыялы да міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння Ў. І. Пічэты. Мінск. 23–24 красавіка 1998. – Мінск: Белдзяржуніверсітэт, 1998. – С. 116–118; Шумейко М. Ф. Личный архивный фонд первого ректора Белорусского государственного университета в Архиве Российской академии наук // Архівы і справаводства. – 2010. – № 5. – С. 102–114.

АРАН (Масква). Ф. 1548. Воп. 1–4. 1031 адз. зах. за 1853–1973. Дакументы навуковай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, дакументы членаў сям’і.

НДАК НББ. Ф. 2 (Збор матэрыялаў дзеячаў навукі і культуры Беларусі). Воп. 1. Адз. зах. за 2–5 за 1939–1940 гг. Рукапіс «Гісторыі Беларусі» у двух тамах.

НМГКБ. КП 25038–25059. Біяграфія ў трох сшытках, напісаная дачкой Ксеніяй Уладзіміраўнай у 1979 г., фотаздымак помніка і мемарыяльнай дошкі, асабістыя рэчы, сямейны альбом за 1909–1947 гг.

ПІШЧУЛЁНАК Міхаіл Уладзіміравіч (25.05.1953, в. Цімошкава, Міёрскі р-н, Віцебская вобл. – 08.2008), гісторык, архівіст.

*Дакументы перададзены ў архіў утваральнікам у 2006 г.*

ДА Віцебскай вобл. Ф. 2252. 85 адз. зах. за 1930–2006. Дакументы навуковай і службовай дзейнасці (дысертацыя, дакументы аб архіўнай службе вобласці ды інш.), біяграфічныя дакументы, сабраныя дакументы (аб забойстве Ю. Пэна, аб праваслаўнай царкве, аб архіўнай справе ды інш.), фотаздымкі.

ПІШЧЫКЕВІЧ Барыс Тарасавіч (24.07.1899, в. Сасноўка, Слонімскі р-н, Гродзенская вобл. – 15.01.1974), удзельнік Другой сусветнай вайны.

БДМГВАВ. 3 адз. зах. за 1957–1965 гг. Біяграфічныя дакументы.

Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. 5 адз. зах. за 1944–1957 гг. Біяграфічныя дакументы.

ПЛАВІНСКІ Мікалай Фёдаравіч (н. 1924), гісторык, краязнаўца.

БДАМЛМ. Ф. 377 (Збор дакументаў дзеячаў беларускай культуры) (неап.).

ПЛАТНЕР Ісак (Айзік Хаімавіч) (17.11.1895, г. Саколаў-Падляскі, Польшча – 26.07.1961), пісьменнік.

*Дакументы ў архіў паступілі ад жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 73. 155 адз. зах. за 1921–1990. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ПЛАТОНАЎ Расціслаў Пятровіч (10.04.1930, г. Слуцк, Мінская вобл. – 19.11.2001), гісторык, архівіст.

*Асабісты архіў перададзены на захоўванне ў НАРБ ад самога ўтваральніка і яго жонкі ў 2001–2002 г. Доступ да дакументаў абмежаваны.*

Літ.: Запартыка А. М. Асабісты фонд Расціслава Пятровіча Платонава ў НАРБ // Мінулае павінна служыць людзям...: матэрыялы архіўных чытанняў «Р. П. Платонаў і пытанні архівазнаўства, археаграфіі, крыніцазнаўства і гісторыі Беларусі XX ст.» (Мінск, 14 снежня 2005 г.) прысвеч. 75-годдзю з дня нараджэння Р. П. Платонава / адк. рэд. Ю. У. Несцяровіч, У. В. Фядосаў – Мінск, 2006. – С. 23–29.

НАРБ. Ф. 1178. 535 адз. зах. за 1922–2002. Біяграфічныя дакументы (асабістыя дакументы, дакументы службовай дзейнасці, узнагароды, дакументы родных, дакументы аб ім), творчыя дакументы (археаграфічныя зборнікі, манаграфіі, дысертацыі), выяўленчыя дакументы, кнігі з дароўнымі надпісамі, узнагароды.

ПЛАТОНАЎ Барыс Віктаравіч (06.08.1903, г. Мінск – 15.01.1967), акцёр.

*Дакументы паступілі ў архіў ад жонкі І. Ф. Ждановіч у 1978 г. і ад дачкі І. Б. Платонавай у 1984 г. У музей дакументы перададзены ў 1973 г. жонкай І. Ф. Ждановіч.*

БДАМЛМ. Ф. 220 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 1–198; Воп. 2. Адз. зах. 18–96 за 1910–1994. Дакументы творчай і службовай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, ліставанне, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

НМГКБ. КП 31343 (1–51). Граматы, фотаздымкі, запрашэнні, пасведчанні.

ПЛЕСКАЧЭЎСКІ Анатоль (28.02.1911, г. Глыбокае, Віцебская вобл. – 31.03.1980), грамадска-палітычны дзеяч эміграцыі.

*Дакументы захоўваюцца ў архіве пры царкве св. Ефрасінні Полацкай у Саўт-Рыверы.*

ПЛЕШАВЕНЯ Аляксандр Мікітавіч (05.08.1923, в. Азломль, Любанскі р-н, Мінская вобл. – 24.03.1993), архівіст, краязнаўца.

ДА Гродзенскай вобласці. Ф. 377. 187 адз. зах. за 1958–1993. Творчыя дакументы (артыкулы, тэматычныя падборкі дакументаў, даклады), службовыя дакументы (дакументы аб удзеле ў канферэнцыях), біяграфічныя дакументы.

ПЛУГ Адам (сапр. Пяткевіч Антоні) (23.10.1823, в. Замосце, Слуцкі р-н, Мінская вобл. – 02.11.1903), польскі і беларускі пісьменнік і публіцыст.

Аддзел рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі (Варшава). № 6023. Паэма.

ПОЛА Вера Мікалаеўна (25.01.1901, г. Мінск – 15.10.1989), актрыса.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка.*

БДАМЛМ. Ф. 338. 104 адз. зах. за 1921–1989. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы Ў. М. Крыловіча.

ДМГБЛ. КП 3752–3759. Біяграфічныя дакументы.

ПОПКА Юрый (07.10.1912, хут. Высокі Гуд, Пружанскі р-н, Брэсцкая вобл. – 29.04.1990), грамадска-палітычны дзеяч, выдавец, пісьменнік.

*Заснаваў у 1982 г. Беларускі музей у Ляймене, дзе захоўваецца яго асабісты архіў.*

Літ.: Іваноў М. Гісторыя заснавання і дзейнасць Беларускага музея ў Ляймене (1982–1992) // Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 5. Культура беларускага замежжа; Беларуска-амерыканскія гістарычна-культурныя ўзаемадачыненні / рэд. У. Конан, А. Мальдзіс. – Мінск, 1995. – С. 105–110.

ПРАГІН Гірш Літманавіч (03.04.1903, г. Мсціслаўль, Магілёўская вобл. – 21.04.1984), дзеяч культуры, кіраўнік устаноў культуры.

*Дакументы ў архіў паступілі ад пляменніка В. А. Фрэйдзіна ў 1985 г.*

БДАМЛМ. Ф. 98 (сямейны). Воп. 1. Адз. зах. 55–126 за 1933–1985. Дакументы творчай і службовай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ПРАКАПЧУК Андрэй Якаўлевіч (н. 04.07.1896), дэрматолаг, акадэмік АН БССР.

НМГКБ. КП 14682, 15796. 33 адз. зах. за 1919–1965.

ПРАКУЛЬНЕВІЧ В. (22.12.1720–09.06.1805), пісьменнік.

АР ЦБАН Літвы. Ф. 21 (Віленскі беларускі фонд). Воп. 1. Адз. зах. 451. Рукапіс твора «Крывавы падзел: Драмы ў чатырох дзеях з часоў апошніх».

ПРАНЕВІЧ Сцяпан Андрэевіч (н. 1904, в. Жарэбкавічы, Ляхавіцкі р-н, Брэсцкая вобл.), член КПЗБ.

ЗДА ў г. Баранавічы. Ф. 131 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, руху ў Заходняй Беларусі, Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў працы, дзеячаў культуры і навукі). Воп. 5. Адз. зах. 1 за 1927–1966. Успаміны, аўтабіяграфія.

ПРАНУЗА Паўлюк (Павел Кузьміч) (18.03.1918, в. Вылева, Добрушскі р-н, Гомельская вобл. – 2007), паэт, перакладчык.

*Дакументы ў архіў перададзены ўтваральнікам у 1966 г.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячаў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 182–186 за 1942–1969. Вершы, пераклады твораў В. Дуніна-Марцінкевіча, фотаздымкі індывідуальныя і ў групах.

ПРАХАРЭНКА Валянціна Мінаўна, настаўнік.

ЗДА ў г. Мазыры. Ф. 286 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг., партызанскага руху на Палессі, дзеячаў культуры і народнай гаспадаркі). Воп. 6. 2 адз. зах. за 1993–2001. Біяграфічныя дакументы, артыкулы, успаміны, фотаздымкі.

ПРОКШ Леанід Януаравіч (19.04.1912, г. Полацк, Віцебская вобл. – 09.12.1994), пісьменнік.

БДАМЛМ. Ф. 64 (неап.).

ПРОТАС Яўген, грамадскі дзеяч.

Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны ў Лондане. Дакументы дзейнасці (афіцыйныя дакументы грамадскіх установаў (пратаколы, ліставанне, арганізацыйныя дакументы).

ПРОХАРАЎ Уладзімір Уладзіміравіч, грамадскі дзеяч.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3135 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў). 1 адз. зах. за 1952. Артыкулы па гісторыі г. Гомеля.

ПРОХАРАЎ Якаў Васільевіч (25.10.1870, в. Пажаркі, Калужская вобл., Расія – 1942), кампазітар, этнограф, педагог.

*Дакументы ў архіў паступілі ад дачкі.*

БДАМЛМ. Ф. 188. 138 адз. зах. за 1880–1941. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы.

ПРУДНІКАЎ Алесь (Аляксандр Трафімавіч) (14.04.1910, в. Стары Дзедзін, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл. – 05.08.1941), паэт.

*Паступілі ад П.І. Прудніквава ў 1991 г., які ў сваю чаргу атрымаў дакументы ад удавы брата паэта.*

БДАМЛМ. Ф. 55 (Збор архіўных фондаў дзеячоў літаратуры). Воп. 1. Адз. зах. 188–208 за 1928–1939. Паэма, вершы фатаграфіі ды інш.

ПРУДНІКАЎ Павел Іванавіч (14.04.1910, в. Стары Дзедзін, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл. – 05.08.1941), паэт.

БДАМЛМ. Ф. 332 (неап.).

ПРУСАВА Роза Кандратаўна (н. 1923), працаўнік Мінскага трактарнага завода.

НМГКБ. КП 20137–20151 (1–14) за 1960-я гг.

ПРЫБЫЛЬСКІ Аркадзь Пятровіч (28.05.1914–17.04.1945), удзельнік Другой сусветнай вайны.

ЗДА ў г. Бабруйску. Ф. 366 (Калекцыя малааб’ёмных фондаў асабістага паходжання) 3 адз. зах. за 1945–1990. Пасведчанні аб смерці, успаміны сястры, ліставанне.

ПРЫВАРОЦКІ Рыгор Маркавіч, удзельнік падзей 1917 г. на Гродзеншчыне.

ДА Гомельскай вобл. Ф. 3531 (Калекцыя дакументаў удзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, грамадска-палітычных дзеячаў) 1 адз. зах. за 1969. Успаміны.

ПРЫТЫЦКІ Сяргей Восіпавіч (19.01.1913, в. Гаркавічы, Саколкаўскі пав., Польшча – 13.06.1971), грамадска-палітычны дзеяч

НАРБ. Ф. 1354 (збор). 158 адз. зах. за 1933–1973. Біяграфічныя дакументы (фотакопіі пастаноў суда), дакументы службовай дзейнасці (фотакопіі пастаноў, тэлеграм, справаздач, артыкулы і выступленні), службовае ліставанне, успаміны, альбом фотаздымкаў.

НМГКБ. КП 21081 (1–137), 21152 (1–42) за 1936–1971. Збор фотакопій дакументаў.

ПТАШНІКАЎ Іван Мікалаевіч (н. 07.10.1932, в. Задродзе, Лагойскі р-н, Мінская вобл.), пісьменнік.

*Дакументы у БДАМЛМ паступілі ад архіваўтваральніка.*

БДАМЛМ. Ф. 405. 356 адз. зах. за 1940–1995. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, сабраныя дакументы, кнігі.

ПТАШЫЦКІ Станіслаў Львовіч (12.04.1853, в. Кузава, Медынскі р-н, Маскоўская вобл. – 20.12.1933), гісторык, архівіст.

АР ЦБАН Літвы. 20 адз. зах. за 1907–1915.

ДГАЛ. Ф. 1135 (Таварыства прыяцеляў навук у Вільні). Воп. 17. 217 адз. зах. за 1494–1932. Арыгіналы папскіх бул і каралеўскіх прывілеяў, выпісы з літоўскай метрыкі, хроніка М. Стрыйкоўскага з заўвагамі, падрыхтоўчыя матэрыялы да выдання Метрыкі, вопіс дакументаў Радзівілаў.

ПУГАЎКА Леанід Канстанцінавіч (04.03.1917, в. Паўлава, Глыбоцкі р-н, Віцебская вобл. – 1990), працаўнік гаспадаркі.

ЗДА ў г. Глыбокае. Ф. 200 (Калекцыя дакументаў асабістага паходжання). 10 адз. зах. за 1944–1989. Біяграфічныя дакументы, фотаздымкі.

ПУКСТ Рыгор Канстанцінавіч (14.11.1900, г. Гомель – 12.11.1960), кампазітар.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі.*

БДАМЛМ. Ф. 10. 233 адз. зах. за 1918–1961. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, фотаздымкі.

НМГБК. КП 1–126 за 1910–1960.

ПУКСТ Варвара Канстанцінаўна (н. 01.12.1907, г. Гомель ), спявачка.

*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад утваральніка.*

БДАМЛМ. Ф. 130. 8 адз. зах. за 1927–1937. Дакументы творчай дзейнасці, біяграфічныя дакументы, калекцыя.

ПУЛХАЎ Яўген Пятровіч (н. 18.02.1908, г. Баранавічы), мастак.

ЗДА ў г. Пінску. Ф. 775 (Калекцыя дакументаў выдатных людзей Палесся). Воп. 3. 7 адз. зах. за 1916–2000. Аўтабіяграфія, пасведчанні, даведкі, дыпломы, граматы, малюнкі, артыкулы аб утваральніку, фотаздымкі індывідуальныя, з роднымі і сябрамі.

ПУНТУС Васіль, грамадскі дзеяч эміграцыі.

Даследчыцкі цэнтр гісторыі эміграцыі (Мінесота, ЗША) Ф. 2206. 5 бягучых футаў. Біяграфічныя дакументы, дакументы дзейнасці.

ПУРОЎСКІ Канстанцін Васільевіч (06.04.1894, г. Мінск – 01.07.1965), спявак, фалькларыст.

*Дакументы паступілі ад пляменніцы І. В. Лебедзевай у 1995 г. і з музея Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь.*

БДАМЛМ. Ф. 406. 168 адз. зах. за 1908–1965, 1994. Дакументы творчай дзейнасці, ліставанне, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, кнігі.

ПУТЯТА Сцяпан Міхайлавіч (1903–1967), эканаміст.
НМГКБ. 72 адз. зах. за 1920–1963.

ПУШКАРЭВІЧ Канстанцін Аляксеевіч (03.11.1890, г. Слонім, Гродзенская вобл. – 28.02.1942), філолаг, славяназнаўца.
АРАН СПб. Ф. 792. 86 адз. зах. за канец XIX ст.–1941. Рукапісы, матэрыялы да іх.

ПУШЧА Язэп (Плашчынскі Іосіф Паўлавіч) (05.05.1902, в. Каралішчавічы, Мінскі р-н – 14.09.1964), паэт.
*Дакументы ў БДАМЛМ паступілі ад жонкі.*
Літ.: Кекелева Т. Фонд Язэпа Пушчы ў БДАМЛМ // Пра час «Узвышша»: Матэрыялы навук. канф. узвышаўскіх чытанняў (Мінск, 1999–2002) / Навук. рэд. М. І. Мушынскі. – Мінск: БДАМЛМ, БелНДІДАС, 2002. – С. 205–211.
БДАМЛМ. Ф. 26. 132 адз. зах. за 1922–1967. Дакументы творчай, службовай, грамадскай дзейнасці, ліставанне, нататнікі, біяграфічныя дакументы, фотаздымкі, дакументы розных асоб, што адкláліся ў фондзе.

ПФЛЯЎМБАЎМ Яўгенія Эргардаўна (01.11.1908, г. Мінск – 13.01.1996), паэтка.
*У АРРК ЦНБ дакументы захоўваюцца ў складзе фонду М. Лужаніна (мужа). Дакументы ў БДАМЛМ перададзены М. Лужаніным (мужам) у 1995 г. і захоўваюцца ў складзе сямейнага фонду.*
БДАМЛМ. Ф. 140 (сямейны). Воп. 2. Адз. зах. 290–317 за 1930–1965. Дакументы творчай дзейнасці (вершы, пераклады), лісты і паштоўкі фотаздымкі.
АРКР ЦНБ НАН Беларусі. Ф. 17. Воп. 1. Адз. зах. 2277–2567 за 1927–2000. Творчыя дакументы (кнігі, вершы, пераклады), нататнікі, ліставанне з асобамі і арганізацыямі, біяграфічныя дакументы і дакументы бытавога характару, дакументы аб утваральніку, кнігі з дароўнымі надпісамі.

ПШЧОЛКА Антоній Іванавіч (1818–1871), архівіст.
ДГАЛ. Ф. 933. 45 адз. зах. за 1845–1879.

ПШЫРКАЎ Юльян Сяргеевіч (31.10.1912, в. Кісцяні, Рагачоўскі р-н, Гомельская вобл. – 23.12.1980), літарaратуразнаўца, крытык.
*Асабісты архіў перададзены ў АРКР ЦНБ НАН Беларусі ўдавой у 1982 г.*
